Хрысціна
ЛЯЛЬКО

СВІТАНАК НАД БЯРОЗАМІ



Хрысціна
ЛЯЛЬКО

СВІТАНАК НАД БЯРОЗАМІ

Аповесць
Апавяданні



Мінск
«Юнацтва»
1989

ББК 84 Бел 7
Л 97

Для старэйшага школьнага ўзросту

Мастак В. І. Валынец

Память неумолимо возвращает молодого героя повести лауреата премии Ленинского комсомола Белоруссии К. Лялько «Лес», фотографа Андрея Багунца, в детские годы, совпавшие с трудным, порой драматичным периодом коллективизации в белорусской деревне.

В судьбах героев рассказов психологически убедительно отражена наша современность.

4803120200—096
Л————————— 68—88
М307(03)—89

ISBN 5-7880-0065-3

Выдавецтва «Юнацтва», 1989.

АПОВЕСЦЬ



ЛЕС

Ні адно дрэва не шуміць так трывожна і глуха, як елка. Асабліва тады, калі закіне раптам пасля лютых, траскучых маразоў адліжны паўднёвы вецер і пухкі лёгкі снег на яловых лапах стане цяжкі і пластаваты. Яліна тады, злосная, раз'ятраная, пачне з усяе сілы махаць шырокімі абцяжаранымі лапамі, спрабуючы яго скінуць, адкінуць ад сябе і ўрэшце скіне, абтрасе і стане ў вачах ярчэйшаю, зелянейшаю, як быццам памаладзее. І заблішчыць ад вільгаці на ствале яе засохлая, скамянелая за зіму жывіца, і загудзе абуджана магутны камель. І будзе трывожна і глуха шумець яна праз усю ноч, а на золку супакоіцца, заціхне, палагаднее і сустрэне першую адлігу пасля зацяжных, доўгіх маразоў.

Старая, разлапістая, яна стаіць канцы Паўлюковай хаты і памятае яшчэ той час, калі хаты гэтай, доўгай, крытай

шэраю дранкаю, тут не было. Шумеў толькі воддаль стары Кунцавічаў бор, з якога яна сама паходзіла, а ўнізе, вакол яе, падымаўся, дужэў часты і роўны падлесак.

Даўно ўжо адгаманіў той стары, пракаветны бор, даўно нізкі падлесак стаў лесам і, не паспеўшы пакрасавацъ, гэтаксама бясследна знік адсюль, а яліна выстаяла, выжыла і толькі яшчэ мацней абняла зямлю, урасла ў яе вузлаватым дужым карэннем. І толькі шум яе, густы, трывожны, будзіць па начах наваколле. І яго, неспакойна ўзіраючыся ў цемень свае пустой хаты, бывае, праз усю ноч ні на хвілю не звёўшы вачэй, напята слухае Паўлюкова Анюта...

Шуміць канцы хаты яліна, гамоніць з нізкімі хмарамі і расказвае ім тое, што знае і помніць. А помніць яна шмат. Яшчэ з тае свае ярка-зялёнай маладосці, калі даўным-даўно пад'ехалі конна да яе двое маладых мужчын, прыпынілі тут сваіх коней і адзін з іх, каравокі, з густымі, зухавата падкручанымі вусамі, у даматканай світцы, падпяразанай па вузкім, танклявым стане жоўтым раменьчыкам, з башлыком на плячах, нецярпліва скочыў з каня, азірнуў яе знізу ўверх і цвёрда, рашуча паляпаў па ствале рукою: «Калі пан каморнік дасць згоду, то хацеў бы тут мець сабе дзялку».

Каравокі пазіраў на рыжаватага, шчуплага мужчыну, што ўсё яшчэ сядзеў на кані. Каморнік зарагатаў і праз смех адказаў каравокаму нечакана моцным, густым голасам: «Пане Багунец жартуе. У гэтых кшаках[1] толькі вароны кублуюцца. Будзеш памагаць мне намяраць дзялкі, выбераш сабе, якую захочаш. Надарыцца йшчэ мажлівасць. А тут што — покуль кусты гэтыя вылупіш — пуп трэсне».

Але каравокі ўсё не адымаў ад ствала цёплай цвёрдай далоні, стаяў на сваім: «Тут буду прасіць пана каморніка даць згоду ўкапаць слупак».

І пра нешта сваё падумаўшы, хітравата ўсміхнуўся:

---

[1] Кустах *(польск.)*.

«Сямейка ў мяне дай божа, кожны па кусціку выдзярэ — вот і поле гатова».

Зноў недаверліва зірнуў на Паўлюка Багунца пан каморнік, але тут жа зарагатаў весела, бесклапотна, смехам гэтым без слоў даючы сваю згоду.

А яліна раптам пачула, як затрымцела яе нутро, аж пайшоў высока, у самую верхавіну, нецярпліва-радасны гуд...

Яна бачыла, як доўга хадзілі Багунец з каморнікам, спыняліся раз-пораз, укопвалі ў зямлю новыя дубовыя слупкі, пра нешта між сабою гаварылі, махаючы рукамі, а потым, стомленыя, але вясёлыя, вярнуліся зноў да яе, бо тут, пры ёй, пакінулі сваіх коней. Адвязаўшы іх, адпусцілі пахадзіць воддаль, а самі, было відно, ад'язджаць не спяшалі. Прыселі прост на зямлю, прытуліліся спінамі да ствала, і новы гаспадар яе давольна крэкнуў, асцярожна выцягнуў з кішэні паўбутэлек «паньствовай», заціснуў яго між каленяў, з другой дастаў вялікую жоўтую цыбуліну і дзве лусты чорнага хлеба, загорнутыя ў чыстую крамную анучку. Разлучыў іх, густа пасыпаныя соллю, падаў адну каморніку, і той адразу ж заварушыўся, яшчэ больш павесялеў, пажвавеў увесь і ўжо не адгаворваў гаспадара, а, наадварот, супакойваў, паляпваў па плячы і ўсё зіркаў на пузаценькі празрысты паўбутэлек, як усё роўна баяўся, што Паўлюк раптам перадумае, адмовіцца ад дзялкі і гэта чыстая, як сляза, «чакушачка», якая так нечакана і так дарэчы з'явілася на свет божы, возьме ды зноў знікне ў цёмнай бездані Багунцовай кішэні.

Але страх пана Мятовіча быў марны, бо Паўлюк зусім не думаў мяняць свайго намеру. Адкаркоўваючы паўбутэлек, не пераставаў гаварыць-марыць: «А тут во, прост на гэтым месцы, ы-ых, халера ясна, і закаркавана ж, пастаўлю хату, во тут, каля елкі гэтай. Глянь, якая ладная, што паненка. Хай шуміць сабе, дзетак калыша...»

«Го-го-го,— рагатаў густым басам, аж адбівалася рэха ў Кунцавічавым лесе, рыжы пан Мятовіч.— Го-го-го, ён

ужо й няньку сабе нагледзеў, малайчына Паўлюк. Widze, że nie pszepadniesz» [1].

І ў такт гэтаму смеху, весела, згодна махала лапамі яліна.

...Горка плакала Паўлюкова жонка Зося, калі першы раз прыйшла сюды, на сваю дзялку, і ўбачыла, якую зямлю выбраў яе гаспадар. Папракала, што зноў яны будуць без хлеба, што лісцем з гэтых кустоў пяцёра дзяцей не пракорміш.

Колькі сілы і працы забраў гэты лес, колькі, і праўда, прыйшлося пагаладаць з-за яго і выцерпець — усяго не ведала нават старая яліна. Але як бы там ні было, у Багунца падрасталі дзеці і на вачах гэтаксама хутка рос, падымаўся і лес.

Перад самаю вайною Паўлюк з сынамі абгарадзіў яго наўкола ў тры жэрдкі, паставіў дубовыя слупкі, падцерабіў, падабраў і спаліў галлё, і стала ў лесе хараша, як у садзе.

Не мог нацешыцца ім, налюбавацца не мог сваім лесам Паўлюк. Сярэдначы, бывала, уставаў, выходзіў на ганак і доўга слухаў, як шуміць ён побач. Малады, дужы, прыгожы.

Лес быў мяшаны. Каля хаты, адразу за брамаю, вольна разбягаліся белакорыя гонкія бярэзіны, далей бярозкі губляліся ў ельніку, а ў даліне рос малады выносны алешнік.

У алешніку пракідаліся танклявыя, з сіваватымі гладкімі стваламі асіны, на ўзбярэжку глыбокага раўчука купкамі кусціліся чаромха з калінаю і даверліва туліў да ствалоў дужэйшых дрэў свае зялёныя кучаравыя галовы малады ялаўчык.

Там, у алешніку, была ў Багунцоў сенажаць, там штолета, як жар хто рассыпаў, чырванелі ў густой траве буйныя, духмяныя паземкі, і па іх, мнучы траву, цішком украдаліся ад братоў і бацькі малодшыя Паўлюковы дочкі.

Вайна разгарадзіла Багунцоў лес, паламала, патрушчыла жэрдкі, павыкідала з гнёздаў моцныя дубовыя слупкі.

---

[1] Бачу, што не прападзеш. *(польск.)*.

Параскідала па свеце Паўлюковых дзяцей, і апусцела, асірацела прасторная хата.

Двое Багунцовых сыноў не вярнуліся з фронту, трэці, самы старэйшы, уцёк з палону, прыбіўся дахаты і загінуў у партызанах у Кунцавічавым лесе перад самым вызваленнем. Яго, скрываўленага, прывезлі ноччу ў драбінах сюды, пад яліну: яна чула, як, душачы ў сабе крык, стагнала над ім Зося, змываючы кроў з сынавага твару.

Серадольшую дачку немцы вывезлі ў Германію, і ніхто пра яе так нічога і не дазнаўся. У хаце асталася самая малодшая, Анюта...

Ні адно дрэва не шуміць так трывожна і глуха, як елка. І ні адна елка не шуміць так, як гэта: старая, пракаветная, разлапістая, што расце канцы Багунцовай хаты. Шуміць, гамоніць з ветрам і з зорамі, з Паўлюковаю хатаю і з Анютаю, калі знойдзе тая вольную хвіліну пастаяць увечары на падворку. Удзвёх яны тут асталіся. Толькі ўдзвёх. Яліна шкадуе Анюту. Калі ўсходзіцца моцны вецер, апусціць парывіста свае шырокія галіны, захіне Анюту, і стаяць яны так, бывае, доўга-доўга... Асабліва цяперашнімі красавіцкімі адвячоркамі, калі пахне ўжо скрозь вясною і абедзве яны, і яліна і Анюта, кожная пасвойму, чуюць у сабе трапяткое, трывожнае абуджэнне...

Анюта, худзенькая, невысокая, прыкметна ссутуленая, як бы пастаянна трымае за плячыма вечную ношку сваіх нялёгкіх гадоў, стаіць у ватовачцы, у тонкай суконнай хусцінцы, у нязменных гумовіках. Дзе ты без іх абыдзешся? Круглы год усё ў іх ды ў іх. Ногі ўжо ад гумы гэтай пакруціла, а нічога не зробіш. З раніцы як абуецца, так да вечара і пратупае. Спаць кладучыся, зрывае іх з ног, напацелыя ўсярэдзіне, непадатлівыя, і, раскручваючы ў сенцах вільготныя, смярдзючыя анучы, не ўтрывае, сама сабе скажа, сама сябе пашкадуе: божа мой, божа, калі гэта пекла кончыцца?.. Але ж перад тым абавязкова пастаіць канцы хаты, пад сваёю ялінаю, і душа яе

гэтымі красавіцкімі адвячоркамі спакваля поўніцца нейкім невыказна харошым, трапяткім пачуццём. Што гэта за пачуццё такое — хто яго знае. Яшчэ з маладосці жыве яно ў душы. Як бы чаканне, ці што, чагосьці ўсё яшчэ добрага, нязнанага. Як бы прадчуванне ўсё яшчэ свайго недабранага за жыццё шчасця. І смех і грэх, калі падумаць, а от штовесну з'яўляецца ў душы ў яе гэта трывожнае, светлае чаканне... І хай сабе таемна і глуха шуміць яліна, хай сабе напамінае ёй пра адзіноту і пра невясёлую яе жытку, а яна ўсё роўна чуе, як кружыць галаву пах веснавога ветру, і па-маладому хвалюецца, і па-маладому неспакойна ўглядаецца сваімі глыбокімі сінімі вачыма ў мяккі шараваты паўзмрок красавіцкага вечара...

Хутка, хутка пацягнуць з поўдня птушыныя чароды, і зашамаціць паветра ад тугіх крылаў. Любіць Анюта, калі вяртаюцца з выраю птушкі. Нікому не кажа, а сама даўно ведае: прылятаюць не проста птушкі — вяртаюцца адвеяныя душы яе родных і блізкіх. Душы тых, пра каго яна штохвіліны помніць і думае... А як жа. Прыляціць кнігаўка і галосіць над полем. Заране, дурненькая, прылятае. Яшчэ й маразы, бывае, усхопяцца, прыціснуць і снег зямлю выбеліць, а яна лётае над полем і крычыць, прытулку шукае. Ажно ахрыпне. І да садку прыб'ецца, і сялібу ўсю колькі разоў абкружыць... Анюце здаецца, што гэта душа сястры яе старэйшай, серадольшай іх, Яні, што ў Германіі без вестак прапала, нарэшце дахаты вярнулася...

Або ў полі жаўрука Анюта пачуе, галаву падыме, глядзіць, як ён там трапеча, званочак яго пералівісты слухае і Казіка, брата свайго старэйшага, успамінае. Глядзіць доўга, ажно вочы слязіцца пачынаюць, і шэпча сама сабе, паўтарае: гаспадарык мой мілы, чаму ж ты так высока ўзняўся?..

А на звеставанне бацяна першага прычакае і тады абавязкова пра бацьку здумае, скажа ціхутка: пазляталіся мае родныя, пазбіраліся, прычакалі вяснічкі.

У маі, дасць бог, на зялёнае ўжо дрэва родным мат-

чыным голасам абзавецца ў садзе зязюля і пачне шчодра лічыць Анюце гады: жыві, дачка, працуй. Адна ты тут асталася, на адну цябе ў зямелькі гэтай толькі надзея. І Анюта, збіўшыся з ліку, махне рукою, засмяецца ўсцешана: дармо, пажыву яшчэ. Трэба пажыць. Андрэя — адзінага сына — яшчэ падтрымаць трэба. Хто яму паможа ў тым горадзе... І адкіне на хвіліну работу, і пачне загінаць на руках пальцы: колькі ж асталося да тых наступных выхадных, калі Андрэйка мае дахаты прыехаць.

Цяпер Анюта спала. Цяпер была яна далёка і ад роднай хаты, і ад старой, неспакойнай яліны. Блукала Анюта па тлумных вуліцах вялікага, незнаёмага горада, шукала сына. Шукала доўга і марна, прадзіралася праз натоўп чужых, мітуслівых людзей, роспачна кідалася паміж шэрых, халодных камяніц і не знаходзіла. Зноў блудзіла і блудзіла, зноў клікала свайго Андрэя. І збавенне ёй мог прынесці толькі ранак, які гэтым халодным прадвеснем усё яшчэ наступаў паволі і неахвотна, а ноч здавалася гадавою.

Перад самым світанкам аціхла, супакоілася старая елка. Стаяла, чуйна прыўзняўшы галіны, узіралася ў глыбокае, вызаранае на пагоду неба. Было ясна і ціха. Марозік, што ўсхапіўся яшчэ звечара, пасля дзённай шарай адлігі, трымаў праз цэлую ноч, і ў паветры чуўся яго свежы і хрумсткі солад.

Маўчала старая елка. Ранішнія сцішанасць і спакой, што так уладна пануюць у прыродзе перад самым світанкам, узялі і яе ў свой палон, і яна як зачараваная слухала наваколле. Апошнім часам елка амаль не спала. Старыя дрэвы, як і старыя людзі, спяць трывожна і мала. Яна глядзела сваімі зялёнымі вачыма ўдалеч, і глыбокі сум халоднаю колкаю шэранню асмужваў яе галіны. Перад ёю ляжала нямая і голая пустка. Колькі ўжо часу прайшло з тае зімы, як тут, зусім побач, у яе на вачах, паміралі спілаваныя дрэвы, а ёй усё чуецца той іх перадсмяротны стогн і

здаецца, што ўсё яшчэ адчувае яна, як уздрыгвае скалелае цела зямлі ад глухіх, цяжкіх udараў... І тады міжволі ўздрыгвае і яна, і сыплецца на шорсткі наздраваты снег рыжая, мёртвая ігліца. Рэдка глядзіць старая елка ў гэту пустую далеч. Няма там за што зачапіцца воку, няма чым пацешыць сэрца. Ёй больш даспадобы ўзірацца ў глыбокае, таемнае неба або аглядаць падворак. А перад самым світанкам вось так аціхнуць і чакаць. І дачакацца, калі, быццам наяве, адчыняцца шырокія форткі дзвярэй у хляве і выйдзе адтуль стары Паўлюк, выведзе, як некалі, маладога гнедага жарабца. І не паспее апамятацца яліна, як узарве перадсвітальную цішыню гулкі імклівы цокат і ажно недзе за чыгункаю сумным рэхам адаб'ецца працяжнае конскае ржанне... Потым, на які час, зноў стане пуста і глуха вакол, аж пакуль на далёкім раз'ездзе не гукне пранізліва першы ранішні цягнік, даючы настойлівы знак, што ў свеце ўсё ідзе сваім будзённым і звыклым парадкам. Зноў зашуміць канцы Багунцовай хаты старая елка і будзе хіліць на бакі цёмны крыж верхавіны, як бы намагаючыся яшчэ раз угледзець свайго Гаспадара, які на адно толькі імгненне з'явіўся перад ёю і знік бясследна да наступнай ранішняй зоркі...

Гэту ноч асабліва трывожна і цяжка спала Анюта і ў сне, як ніколі пакутна, настойліва шукала сына, пэўна, яшчэ і таму, што ўчарашнім надвячоркам здарылася ў Плісцы бяда: упаў у студню і захліснуўся пяцігадовы сынок Драздзюковай Галі, Андрэйка.

Студня ў Драздзюкоў нізкая, а вады ў ёй напрадвесні, як потым ужо казалі, прыбыло на цэлых пяць бетонаў. Ды што там тыя бетоны і тая глыбіня: ці шмат трэба дзіцяці, каб утапіцца... Чаго потым ужо, па часе, пазбягаўшыся хто адкуль на Драздзюкоў падворак, ні гаварылі: і так, і гэтак, і каб быў хто побач на той момант ці хоць бы дзе блізка, і каб тое, і каб другое, і пятае, і дзесятае. А што ўжо гаварыць па часе. Яно ж так заўсёды:

на бяду, як кажуць, і курыца заспявае. Нікагуткі побач не было, калі малы бегаў-гуляў на падворку; нікога не было і блізка, калі абрыдла яму, сумна стала гуляць аднаму; і ён, шукаючы сабе забавы, падбег да студні і паступіўся на вузкую лавачку, на якой звычайна стаяла дзіравае, пабітае ржою вядро. Лавачка была слізкая, і ён, як толькі перахіліўся над зрубам, відаць, паслізнуўся, п слабыя ручкі не паспелі знайсці апоры.

Потым ужо расказвалі, што матка яго, Галя, спала ў гэты час п'яная ў хаце. Разбудзіў, сцягнуў яе на падлогу і пачаў біць нагамі ачмурэлы ад гора муж яе, Лёнік. Можа, і затоўк бы ён яе на той падлозе, каб не наляцеў Драздзюк і не адцягнуў ад п'янай дачкі, не пачаў таўчы зяця, якога ўвесь гэты час ціха ненавідзеў, хаваючы да пары да часу гэту нянавісць. Цяпер жа не мог стрымаць сябе: малаціў Лёніка пудовымі кулакамі і хрыпеў, аж выступала на пасінелых губах пена: «Праз цябе, праз цябе, недарэка ты, усё гэта. Праз цябе п'е яна. Загубіў ты яе, з'еў. Ты, ты — дачку маю адзіную і ўнучка майго, ты з'еў,ануча ты аблезлая, падла, заб'ю...»

І каб не Драздзюкова Алена, якая, даведаўшыся пра смерць унучка, без духу ляцела з фермы, каб не суседзі, якія пазбягаліся хто адкуль, невядома, чым бы скончылася ўсё гэта... Анюта, дачуўшыся пра бяду, прыляцела да Драздзюкоў разам з бабамі ад капцоў, дзе яны ўвесь дзень перабіралі насенную бульбу. На падворку ўжо тапталіся колькі мужчынаў і галасіла над унукам, ірвала на сабе валасы Алена. Да Анюты падкацілася малая, з рабым, як у цяцеркі, тварам, Макунова Стэпка, зашаптала, азіраючыся: «От як, Анютачка. Дагуляліся Драздзюкі. Бог пакараў. А што ты думаеш... Мала гіцаль гэты бяды людзям нарабіў? Ты думаеш, хто твайго бацьку ў магілу звёў? Ён. Хваліўся, я на свае вушы чула, хай, кажа, Багунец мне за лес «дзякуе»... А колькі гадоў пілі, гулялі? Начальнікі... Думалі, канца не будзе. А тут во як сталася. За ўсё адцерпяць. Дачка спілася. Унук во...» Анюта ажно пера-

смыкнулася ад гэтага злога Стэпчынага шэпту, нядобра зірнула ў яе розныя — адно татава, другое маміна — вочы. «Якая ж паганая баба,— падумала сама сабе.— У людзей такое гора, а яна чорт ведае што гародзіць». Не даслухала, строга перапыніла: «Сціхні, Стэпка. Не можна так. Чым дзіця гэта вінавата? Што, каму яно зрабіла дрэннага, чым саграшыла? І Галя... Харошая яна. Нешчаслівая толькі. Бяда такая — гарэлка гэта. Хвароба...»

— Хваро-о-ба! — Стэпка азірнулася на мужчын, што стаялі непадалёк, каля плота, і ўжо грамчэй, каб чулі і яны, злосна загаварыла: — Распуста гэта, а не хвароба. Драздзюк аб грашах сваіх век не знаў, пры начальстве ўсё круціўся, цягнуў, дзе мог і як мог. І дачку адзіную разбэсціў. У чортаву скуру ўлезла.

Анюта махнула рукою, адступіла далей, каб не чуць, не слухаць.

Чужое гора сціснула грудзі, пякучым туманам заслала вочы. Хацелася падысці туды, пад хату, дзе ляжаў на лаўцы малы Андрэйка, загаласіць над ім разам з Аленаю немым голасам... А калі выбегла з хаты растрапаная, страшная ў сваёй роспачы Галя і ўпала перад тою лаўкаю на калені, Анюта не ўтрывала, пайшла з надворка.

Потым, у сваёй ужо хаце, увесь той адвячорак, куды б ні йшла і што б ні рабіла, мучыў яе роспачны Галін крык: «Сыночак, Андрэечка, крывіначка мая...»

Шкадавала Галю. Што б там ні гаварылі і як бы там ні было — шкадавала. Думала ўвесь час пра тое, што так во неяк усё жыццё выходзіла, што яны, Багунцы, з Драздзюкамі былі нечым звязаны. То благім, то добрым. Бацька Анюцін, Паўлюк, дружыў з Яськам Драздзюком, з Селівонавым бацькам, да самай Яськавай смерці. Яська быў ціхі, працавіты. Селівон зусім не падобны на яго. Пайшоў у матку. Высокую, чорную, звяглівую бабу. Такі ж гультаяваты і хітры. З маладога ўсё выгадваў, каб лягчэй пражыць, каб лепей, каб да начальства бліжэй.

Селівон — равеснік Анюцінага старэйшага брата, Казі-

ка. У вайну Казік у партызанах загінуў, а гэты ўхітрыўся прасядзець у хаце як мыш пад венікам. Затое пасля вайны актывістам стаў, калгас узяўся арганізоўваць. І ўсе ў яго кулакі былі, усе ворагі. Каб на той час, не дай бог, не Царэнка, а хто другі быў тут у раёне, а потым у іх за старшыню, невядома, дзе хто з гэтых «кулакоў» і «ворагаў» апынуўся б.

Бацька не любіў Селівона. Не раз казаў: з Яськам душа ў душу жылі, а сына яго бачыць не хачу. І таму, калі Селівон памыкнуўся сватацца да яе, Анюты, бацька сказаў як адрэзаў: пакуль жыву, яго нагі ў гэтай хаце не будзе. А яна, можа, і пайшла б тады за Драздзюка. Падабаўся ён ёй: высокі, чарнявы, быстры. Ды проці бацькавай волі ісці не магла. А тут якраз прыехаў у Пліску Валуеў і засланіў свет... Але гэта ўжо іншае.

Не любіў Селівона бацька. Іначай як гарлапанам і гіцлем ніколі не называў. Асабліва пасля таго, як сталася гэтак з лесам і ўсе адразу загаварылі, што старшыню Бучка набухторыў Драздзюк, каб насаліць Багунцу... Пэўна, што так яно і было. Бо лес Драздзюка як магнітам цягнуў, а бацька не даваў яму там разгарнуцца.

Потым дзеці іх падраслі: Галя Драздзюкова і яе Андрэй. Разам у школу пайшлі. Дружылі з маленства. Успомнілася, як хадзілі яны з Аленаю ў школу, на выпускны вечар, як і адна і другая не маглі адвесці вачэй ад сына і дачкі, нацешыцца не маглі. Пасля ўжо, калі ішлі дахаты, Алена першая сказала пра тое, што мела ў душы і Анюта: «Хай бы бог даў пажаніліся яны...»—«Хай бы»,— адказала тады Анюта.

Але павярнулася ўсё іначай. Пакуль Андрэй быў у войску, Галя выйшла замуж. «Ну, што ж,— думалася Анюце.— Доля такая дзявочая: бяруць — ідзі. Не зладзілася, пэўна, у іх нешта з Андрэем, калі пайшла яна за другога». Анюта Галю не вінаваціла. Наадварот, шкадавала потым, калі чула, што не клеіцца ў яе жыццё з Лёнікам, перажывала, калі дазналася, што піць яна пачала... Учора на падворку тым глянула на яе і здумелася: так непазнана змянілася за гэты час Галя. Віну сваю перад ёю адчула. Не ведала, за

што, але падумала адразу, што магло й не быць у Галі гэтага гора, каб... А што «каб», што яна, Анюта, магла змяніць, паправіць, што і за каго рашыць...

Прыйшоўшы дахаты, увечары, села пісаць Андрэю ліст. Выводзіла першыя словы і тут жа крэсліла, зноў пачынала і зноў крэсліла. У вушах усё стаяў роспачны Галін крык... Праз цэлы вечар не знаходзіла сабе месца. Намагалася павярнуць думкі да іншага, пачынала ўспамінаць Андрэя, але ўсё роўна звязвалася ўсё з Галяю, з толькі што перажытым горам.

Апошні час усё больш і больш упэўнівалася Анюта ў тым, што не так нешта павярнулася ў сынавым жыцці. І ўпэўненасць гэта прыходзіла найчасцей тады, калі яна бачыла Андрэя. Нейкая разгубленасць чулася ў ім, нейкая незразумелая, чужая і страшная Анюце абыякавасць з'явілася ў яго натуры. Не казала нічога, не ўмела пакуль, не ведала, як сказаць пра гэта, а сама ўсё думала, што так жыць няможна, нельга так жыць. Катора пара ў тым горадзе, а ўсё па чужых кутах, а ўсё без пэўнасці, як і што будзе далей. Ён там адзін, яна тут, у гэтай во пустой хаце, адна. А прыедзе і кожны раз адно і тое: «Не бядуй, мама, я жыву добра. Работа лёгкая, хазяйка харошая, комната асобная».—«Ах, сынок ты мой, сынок, чаму ж гэта ўсе вы цяпер лёгкага шукаеце? А хто ж цяжкае рабіць будзе?»— скажа яна. А ён: «Кожнаму сваё, мама...»— «А ці ж сваё яно? Усё ў цябе і над табою то хазяйка харошая, то хазяін. Калі ж ты ўжо сам хазяінам будзеш?» А ён: «А я ўжо прывык, мама, ніякага клопату: прыйшоў, пайшоў». Страшна робіцца Анюце пасля такіх размоў з сынам. Знебылася яна ўшчэнт ад думак розных, а сказаць няма каму. Антона Тамашэвіча, настаўніка старога, сустрэла нядаўна, яму пра ўсё, як на споведзі, расказала. А ён і кажа ёй тады: «Майго сына, Анюта, вайна забрала. І сына. І жонку. Мне наракаць за сваю адзіноту на яе, праклятую, трэба. А твайго сына ад хаты роднай адбілі і ад цябе адлучылі Бучкі і Царэнкі». (Яны тады з Тамашэвічам якраз гаварылі пра тое, як кал-

гас утвараўся ў Плісцы, як іх, Багунцоў, лес знішчылі.) Яна здзівілася: «Пры чым жа тут Бучкі і Царэнкі?»—«А пры тым... Ты думаеш, усё гэта так сабе, само сабою, без аніякае прычыны апусцелі вёскі нашы? Ты думаеш, так сабе нам прыходзіцца закрываць школы ў такіх во Плісках? Усё яно вунь калі пачалося, спусташэнне гэта. Якраз з Бучкоў і з Царэнкаў, са здзеку над бацькам тваім і над такімі, як ён. Я сам не разумеў тады, што да чаго. Бяды не адчуваў, якая за ўсім тым стаяла. Памятаеш, сам да вас прыходзіў бацьку твайго ў калгас агітаваць: ён усё заяву не падаваў. Каня жалезным путам путаў і пута замыкаў, каб сілаю не павялі...»

Анюта помніла ўсю тую мітрэнгу з калгасам, помніла спрэчкі і сваркі ў хаце. Яна першая запісалася ў калгас і як магла прасіла, угаворвала бацьку: усё ж будзе наша, чаго баяцца. І зямля, і лес, і конь. Будзе агульнае, усіхнае, ■ разам і наша. Бацька не хацеў нават слухаць, стаяў на сваім: агульнае, усіхнае — не тваё, не маё — значыць, нічыё. А раз нічыё, то раблю з ім, што хачу і як хачу. Толку не чакай...

Так яно і выйшла. Колькі гадоў ужо калгас, а парадку як не было, так і няма. Яшчэ пры першым, пры Царэнку, хоць трохі дысцыпліна была. Хоць рукамі ўсё чыста рабілі, але ж рабілі: на палях не аставалася, не гніло. Зямлю абраблялі як след, не запускалі. А потым і пайшло. Што год, то, як кажуць, лепш. З Бучка пачалося і ўсё ажно дагэтуль цягнецца. Праўду сказаў ёй тады Тамашэвіч: «Такія Бучкі дзесяткі гадоў выхоўвалі ў чалавеку не гаспадара, а раба. А чалавек рабом быць ніколі не жадаў. Вось і ўцякае моладзь у гарады, свабоды шукаючы. І Андрэй твой таксама. Думаць нам трэба, як іх назад вярнуць. Да зямлі. Думай, Анюта, як сына вярнуць дахаты...»

Яна думае. У галаве ўжо думкі не месяцца. А прыдумаць нічога не можа.

* * *

Першы раз за столькі гадоў Андрэю прысніўся дзед Паўлюк. Сядзеў, як бывала, на печы, звесіўшы босыя ногі, і, злёгку прыплюшчыўшы вочы, спяваў:

Ой, рэчанька, рэчанька,
чаму ж ты няпо-о-ўная-а-а?

Голас быў глухаваты, моцны. Андрэй баяўся зварухнуцца — так шчымліва пераліваласся песня ў яго ў душы. Здаецца, ён як бы й памятаў, знаў у сне, што гэта толькі сон, што варта прачнуцца — і дзед знікне.

А дзед Паўлюк раптам усміхнуўся, загаварыў: «Не бойся, я буду з вамі. З табою і з маткаю... Цяжка вам. Я знаю. Ты мне толькі вершык свой раскажы. Пра лес... Ну, чаго ты спалохаўся. Не бойся, кажу. Помніш, той, што з Казахстана прывёз...»

Андрэю здалося, што дзед наважыўся злазіць з печы, ужо нават спускае свае вялікія белыя ногі, і ён, задыхаючыся, таропка зашаптаў: «Сядзі, сядзі там, не злазь, я зараз, зараз успомню вершык, я зараз раскажу. Во, слухай:

О, лес мой, лес мой залаты,
Прысніся зноў, прысніся ты!
І не знікай, хоць я прачнуся.
Ты будзь са мною, я... я...»

Андрэй адчуў, што далей забыў. Забыў, хоць плач.

А дзед сядзеў і чакаў. І хмурнеў яго твар, і сурова ссоўваліся на пераноссі густыя белыя бровы...

Страх агарнуў Андрэя. Як калісьці ў маленстве, баючыся, што зараз дзед дастане з-пад бэлькі дубец, ён роспачна азірнуўся, шукаючы вачыма, куды б зашыцца, схавацца, але хавацца не было дзе. Зноў загаварыў дзед Паўлюк: «Забыў ты ўсё, унучак. І вершык, і мяне, і лес. Як жа ж ты́ гэта, га?» І не было ўжо ў дзедавым голасе злосці, а былі толькі крыўда і жаль. У Андрэя трывожна заныла нутро. «Я зараз, зараз успомню, пачакай...» Зноў і зноў ён пачынаў ліхаманкава шаптаць-паўтараць свой даўні дзіцячы верш, але даходзіў да

апошняга радка і аніяк, хоць забі, не мог прыпомніць таго адзінага слова, якім ён канчаўся: «Ты будзь са мною, я...» На гэтым «я» ўсё абрывалася.

Хто — я? Што — я?

Шэпт, моцны, выразны, паўтараўся зноў і зноў. Было ў ім нешта вельмі дакучлівае, непрыемнае. У першы момант Андрэю здалося, што гэта шэпча ён сам, і тут жа абудзіўся.

Знікла печ, не стала дзеда Паўлюка. У акно, збоку, сінявата свяціў начны ліхтар. Андрэй прыслухаўся, зразумеў: шэпт далятаў з-за дзвярэй, з гаспадынінага пакоя.

З ім, гэтым шэптам, вярнулася рэальнасць, аціхла, адступіла з душы радасць ад дзедавай песні. Адчуў, як звініць і кружыцца галава, прыпомніў учарашні вечар.

Бліскучыя чорныя вочы Клаўдзі Пятроўны, яе святочны, таксама бліскучы халат, пляшку каньяку на стале і невысокага лысаватага мужчыну з маленькім носам на шырокім грубавата-чырвоным твары. Заезджы шафёр, або Курносік, як ласкава называла яго сама гаспадыня, аб'яўляўся ў гэтай кватэры раз у месяц і нязменна прывозіў с сабою пляшку малдаўскага каньяку і плітку шакаладу «Пінгвін».

Клаўдзя Пятроўна жыла адна. Муж яе памёр гадоў сем назад. Згарэў з гарэлкі. Адзіны сын ужо другі раз адбываў тэрмін. Як і пра мужа, пра сына гаспадыня ўспамінала рэдка і неахвотна, дый Андрэй ніколі не лез да яе з роспытамі. Адно дапамагаў іншы раз забіваць і надпісваць пасылкі, якія Клаўдзя Пятроўна рэгулярна адпраўляла сыну.

Высокая, мажная, яна выдавала маладзейшаю за свае гады і хавала ад усіх, што ўжо другі год на пенсіі. Як і раней, рабіла на заводзе.

Звычайна стрыманая і вечна занятая, Клаўдзя Пятроўна непазнана мянялася, калі прыязджаў Курносік. Рабілася тады вясёлая, гаваркая, і чорныя вочы яе пачыналі блішчэць, як перамытыя слівы. Па гэтым бляску гаспадыніных вачэй Багунец найперш і дазнаваўся, што прыехаў Курносік.

Учора ў Клаўдзі Пятроўны быў дзень нараджэння, а та-

му да малдаўскага каньяку далучыліся яшчэ й шампанскае з гарэлкаю.

З самай раніцы Андрэй падараваў гаспадыні букет цюльпанаў і ўвечары быў запрошаны да святочнага стала. Неспадзеўна прасядзеў у кампаніі з Курносікам, гаспадыняю і рыжаю суседкаю Алінаю цэлы вечар.

Гаварыў пераважна Курносік. Ён не горш, чым у малдаўскім каньяку, разбіраўся ў палітыцы, мог бясконца разважаць пра падзеі ў Іране і ў Іраку, не прамінаючы пры тым ушчыкнуць за бок рыжую Аліну, калі Клаўдзя Пятроўна адлучалася на кухню.

Потым яны фатаграфаваліся на памяць. І Андрэй не шкадаваў плёнкі. Потым спявалі. Спявала найбольш сама імяніннiца і найчасцей сваю любімую: «Фсе падружкі па парам разбрэлісь па амбарам, толька я ў этат вечар засідзелась адна».

Андрэй п'янавата ўсміхаўся, гаварыў жанкам камплі-менты, падымаў тосты за іх хараство і здароўе, прымушаў раз за разам уставаць камлюкаватага разамлелага шафёра. Таму гэта, відаць, не падабалася, ён недавольна моршчыў свой кірпаты нос, шумна ўздыхаў, мякчыўся, але з-за стала выцярэбліваўся.

Калі ўжо ўсё было выпіта, усхапілася рыжая Аліна,— пачаліся развітальныя пацалункі, як усё роўна яна адыходзіла не ў сваю кватэру насупраць, а выпраўлялася на край свету.

Потым і Андрэй гэтак жа доўга дзякаваў гаспадыні, за штосьці (сам не ведаў за што) прасіў прабачэння ў Курносіка і з пацалункамі развітваўся, адыходзячы ў свой пакой. І калі ўжо выключыў святло і лёг, рыпнулі дзверы, асцярожна зайшла гаспадыня. Доўга шамоталася, з бразгатам даставала з-за шафы раскладушку. Так было кожны раз, калі прыязджаў Курносік. Андрэй здагадваўся, што рабілася гэта з-за яго, кватаранта. Так, мусіць, Клаўдзі Пятроўне было зручней. Яму, аднак, заўсёды станавілася

прыкра, хацелася ўстаць і куды-небудзь пайсці адсюль. Але ісці не было куды.

Цяпер, сярэдначы, усё тое адразу ўспомнілася, пакруцілася ў галаве. І зноў зрабілася прыкра. Да таго ж страшэнна хацелася піць. На кухні ў халадзільніку стаяла малако, але каб да яго дабрацца, трэба было ўстаць і прайсці праз гаспадынін пакой. А там, чуў, не спалі. Як і раней, шаптаў і шаптаў Курносік, ціхенька, давольна смяялася Клаўдзя Пятроўна.

Андрэй уздыхнуў, перавярнуўся на другі бок, накрыў галаву падушкаю.

І як толькі прыплюшчыў вочы, перад ім зноў з'явіўся дзед Паўлюк. Але не было ўжо ў Андрэевай душы ні таго страху, ні радасці, як нядаўна ў сне. Цяпер адчуваў, што аднекуль з глыбіні падымаецца, палоніць яго ўсяго незразумелая і даўкая, як прадчуванне бяды, трывога. «Забыў ты ўсё, унучак...» Андрэй хацеў тут жа адмахнуцца, зазлаваў: «Што забыў? Нічога не забыў...»—«Забыў. І лес. І вершык. І мяне».—«Вершык забыў. Падумаеш, вершык. Калі тое было...»

І з чаго б гэта раптам? З чаго... Толькі цяпер, ачуўшыся, Андрэй успомніў пра ліст. Пстрыкнуў выключальнікам і, жмурачыся ад яркага святла, зябка пацепваючы плячыма, падышоў да пісьмовага стала. Канверт ляжаў на краёчку, спехам, абы-як разарваны. З яго вытыркаліся белыя ражкі фотаздымкаў. Побач, удвае складзены, бялеў аркуш паперы ў косую лінейку. Андрэй машынальна ўзяў яго, разгарнуў. Вечарам так спяшаўся, што нават не пачытаў. Глянуў толькі здымкі.

«Спяшаўся. Куды, каб хто спытаў...»

У роце было суха і горка, да звону ў вушах кружылася галава. Дробна трымцеў у руцэ спісаны акуратным каліграфічным почыркам лісток з вучнёўскага сшытка. Андрэй доўга, нічога не разумеючы, углядваўся ў гэты почырк, потым пачаў чытаць.

«Дарагі Андрэй! Нядаўна быў я на радзіме, у нашай

Плісцы. Пацягнула раптам. Развітацца, ці што? Бачыў школу. Стаіць яна, аказваецца, даўно пустая, замкнёная, нікому не патрэбная...»

Андрэй падняў вочы ад ліста, пакруціў яго ў руках, глянуў на подпіс у самым канцы. Так, гэта пісаў ён, першы Андрэеў настаўнік — Антон Антонавіч Тамашэвіч. Тамашэвіч даўно ўжо, ці не тады, калі Андрэй закончыў пачатковую школу, выехаў з Пліскі. Але ўспамінаў яго Андрэй рэдка і неахвотна. На тое была свая прычына. Ён і цяпер адчуў, што за столькі гадоў не выветрылася з душы даўняя дзіцячая насцярожанасць. І ліст гэты чытаў цяпер таксама, чуючы ў сабе ўсё тую ж насцярожлівую непрыязнасць. Так глядзеў ён некалі на самога Тамашэвіча. Глядзеў са свае «камчаткі» спадылба, баючыся сустрэцца з настаўнікам вачыма. Гэтак жа, адводзячы вочы ўбок, адказваў на яго пытанні...

Андрэй прысеў каля стала, яшчэ раз прабег ліст спачатку: «Бачыў нашу школу. Стаіць яна, аказваецца, даўно пустая, замкнёная, нікому не патрэбная». Пэўна ж, стаіць, а што ёй астаецца, калі на ўсю Пліску тры вучні пачатковых класаў. «Выпадкова сустрэў тваю маці, разгаварыліся. Запрасіла мяне ў госці. Часу да цягніка яшчэ аставалася, і я пайшоў туды, да вас, за чыгунку. Ішоў і не пазнаваў нічога. Адмянілася ўсё. Лесу вашага, аказваецца, ужо няма...»

«Аказваецца, аказваецца... Амерыку адкрыў!» — Андрэй адчуў, як нарастае ў ім глухая раздражнёнасць, і раптам успомніў, што ў нядаўнім сне дзед Паўлюк быў вельмі падобны да Тамашэвіча. Цяпер ясна прыпомнілася хударлявае настаўнікава аблічча, яго сівая, заўсёды злёгку адкінутая назад галава. Дзед Паўлюк жа меў волас цёмны, сівізна толькі-толькі пачала прабівацца ў яго на скронях — ужо незадоўга да смерці. Дый галаву ён ніколі не адкідваў назад, хадзіў, асабліва апошні час, усё больш занураны ў сябе.

А вот голас быў дзедаў. І песня дзедава. Гэтакая ж выразная, ясная, як яго, Андрэева, туга па ім...

Раздражнёнасць у душы асела, і ён, паспакайнелы і

аціхлы, зноў паднёс да вачэй ліст. «Гаварылі з мацерою, успаміналі цябе. Яна сказала, што стаў ты фатографам, што працуеш у музеі. Гэта, пэўна, цікава. Я сам заўсёды любіў фатаграфаваць, ты ж памятаеш, праўда? Дык прыехаў ад вас дахаты, палез у свае «архівы» і знайшоў некалькі здымкаў таго вашага лесу. Здымкі аматарскія, ім ужо больш за дваццаць гадоў, але я падумаў, што табе ўсё роўна прыемна будзе сустрэцца з лесам свайго маленства, аднавіць у памяці сёе-тое...»

«Што яны да гэтай памяці?.. І дзед, і ён...— Андрэй злавіў сябе на тым, што думае пра дзеда, як пра жывога.— «...аднавіць у памяці сёе-тое». Калі так, то наўрад ці ўдасца паверыць мне, дарагі Антон Антонавіч, што з мацераю маёю вы сустрэліся выпадкова...»

Андрэй скептычна хмыкнуў: дзіўныя гэтыя старыя. Прыслухаўся, тут жа ўспомніўшы пра Курносіка і Клаўдзю Пятроўну. З-за дзвярэй чуцён быў толькі храп. «Угаманіліся адуванчыкі...»

Яму ўспомнілася нядаўняя размова з Рымаю — у яе ў «салоне». Гэта немаладая, распешчаная жанчына, якая апошнім часам так моцна займала яго думкі, нечакана таксама пачала праяўляць да яго ўвагу. Неяк доўга распытвала пра ўсё і асабліва пра яго сям'ю, пра маці... Седзячы перад ёю ў крэсле, ён чырванеў, як школьнік на экзамене. Гаварыў блытана і нецікава, а яна ўсё выпытвала і выпытвала. Іменна ў той вечар Андрэй адкрыў для сябе, што нічога толкам не ведае пра сваю маці, што ніколі ўсур'ёз не думаў пра яе жыццё, пра душу матчыну...

Расказаў Рыме, як разышлася яна з бацькам (матцы было тады трыццаць сем гадоў), як вярнуліся яны з Казахстана зноў у Беларусь да дзеда Паўлюка, як працавала яна ў калгасе і дома, як цяжка было ім, асабліва тады, калі так нечакана памёр дзед... І ўсё. А што болей? Што ён мог яшчэ расказаць пра сваю матку? Усё звычайна і проста. Як і ва ўсіх. І калі Рыма пачала дзівіцца, як гэта маці жыла ўвесь час адна, такая яшчэ маладая, ён зазлаваў. Як жыла? Звы-

чайна. Працавала, гадавала яго, Андрэя... На хвілінку, толькі на хвілінку прыпомніў тады Тамашэвіча, але тут жа адмахнуўся ад гэтага прыпаміну. Бо вельмі добра знаў, што нічога сур'ёзнага ў мацеры з ім не было. Так, рамантычная закаханасць старога настаўніка ў яго маладую, прыгожую мацеру. А маці... што маці?.. Тамашэвіч ніколі не зайшоў нават да іх у хату. Ніводзін мужчына пасля бацькавага ад'езду і дзедавай смерці не пераступіў іхняга парога. Хіба толькі стары Лукаш, матчын дзядзька, які штогод калоў ім свіней. І ўсё...

Калі ён сказаў пра гэта Рыме, так вот і сказаў, як пахваліўся, яна здзіўлена прыўзняла свае тонкія, падведзеныя броўкі: «Дык што, твая маці не жанчына? Як жа яна жыла?» — «Так і жыла. Працавала. Калі ёй было думаць пра нешта такое...»—«Ну, ведаеш, гэта ўжо занадта...»—«Можа, й занадта... Можа».

Андрэй адсунуў убок так і недачытаны да канца ліст, расклаў перад сабою фотаздымкі. Іхні, Багунцоў, лес глядзеў на яго з гэтых здымкаў. Забытыя бярозы і вольхі, вялізны мурашнік пад маладою асадзістаю елачкаю, алешнік, заліты вадою і сонцам. На адно кароткае імгненне Андрэю здалося, што ён пачуў шчаслівы матчын смех у гэтым алешніку. І тут жа ўбачыў, успомніў...

Яны ішлі проста па вадзе, праз алешнік — маці і Тамашэвіч. Маці наперадзе, прыпадымаючы адною рукою падолак стракатай спаднічкі, а другою тулячы да грудзей вялізны букет чаромхі. Маці азіралася раз-пораз назад, на Тамашэвіча, і смяялася. Звонка. Шчасліва. Смех разлягаўся па алешніку і, здавалася, па ўсім свеце.

Тамашэвіч, без шапкі, ужо тады белы, як голуб, у высока падкасаных штанах, з фотаапаратам на плячы, ішоў ззаду, штосьці напаўголаса гаварыў...

Як і чаго апынуўся тады ў алешніку Андрэй, ён ужо не памятаў. Сядзеў, як заяц, на купіне, прыхаваўшыся за ялаўцовым кустом, і плакаў. Няўцешна і горка.

Як ненавідзеў ён у той момант гэтага сівога высокага чалавека, а разам з ім і матку з гэтым яе шчаслівым смехам, з усім, што нечакана ўгледзеў у ёй, а найбольш адчуў у гэта адно імгненне — жаночага, вабнага, чужога, незразумелага. Як бы й не на матку глядзеў, а на чужую, ніколі раней нязнаную жанчыну. Глядзеў упершыню як мужчына, уражаны ёю, яе смехам, яе харастwом, яе ружаватымі, аголенымі каленьмі, якіх ніколі раней не заўважаў, не бачыў. Глядзеў неадрыўна. Роспачна, нечакана адчуўшы ў сабе дзіўную, незразумелую яшчэ тугу...

І дзікая рэўнасць, і сорам, і нянавісць, і гэта незразумелая туга, і разам жаласць да сябе, забытага, пакінутага, нечакана залілі, як веснавая вада алешнік, Андрэеву душу, затапілі яе да краёчку, і ён плакаў і плакаў...

Вечарам, убачыўшы ў хаце на стале букет чаромхі, пачуўшы яе п'янкі, горкі пах, крыкнуў мацеры злосна, роспачна: «Ненавіджу цябе. І твайго Тамашэвіча. Ненавіджу вас. Кіну цябе, паеду да бацькі. Хоць куды паеду. Памру. Жыві з ім тады, смейся...»

І выбег з хаты, і схаваўся ў садзе, і сядзеў там, затаіўшыся, да паўночы, чуючы, як яны — маці з дзедам Паўлюком — ходзяць і шукаюць яго папоцемку, клічуць. Чуў, як плакала маці, а дзед Паўлюк свяціў ліхтаром і ціха лаяўся, грозячы спусціць з яго тры скуры...

Неўзабаве Тамашэвіч выехаў з Пліскі, і яны больш ніколі не бачыліся. Ніколі з мацераю не ўспаміналі пра яго.

Хіба кожны паасобку. Бо трохі пазней, калі ўжо ён сам, Андрэй, пачаў пацііху зазірацца на Драздзюкову Галю і, хаваючыся, складаць першыя вершы, алешнік той адгукнуўся ў ягонай душы:

Алешнік па калені у вадзе,
І сонца гладзіць голыя калені.
А я свае схіляю у маленні
Перад вясною, што ў наш край ідзе...

Іншы раз ён заўважаў матчыны заплаканыя вочы, іншы раз чуў, абудзіўшыся выпадкова ноччу, як маці ціхенька

плакала, але ніколі не аклікнуў яе, ніколі не падышоў, не запытаў, чаго яна плача. Адчуванне свае віны, неўсвядомленае, спадкаемнае, даўкае, душыла яго ў такія моманты, і ён не знаў, што рабіць з усім гэтым, як і што паправіць, змяніць.

Тады яму заўсёды ўспамінаўся бацька, іхняя паездка да яго ў Казахстан...

Ён помніў, што напачатку ад бацькі прыйшоў ліст і здымак. Вот як бы й цяпер яму ад Тамашэвіча. Толькі на здымку тым каля заляпанага чорнаю, як дзёгаць, гразёю газіка стаяў смуглявы ўсмешлівы мужчына ў скураной, туга падпяразанай шырокім рамянём тужурцы і ў зухавата ссунутай набок шапцы. Маці сказала, што гэта яго, Андрэеў, бацька. І ён адразу паверыў. А як жа, нарэшце, і ў яго ёсць бацька... Насіўся колькі дзён з тым здымкам па ўсёй Плісцы і паказваў хлопцам, хваліўся.

Старэйшыя бралі ў яго здымак, таксама ўважліва глядзелі, успаміналі Афанасія Валуева, які прабыў тут, у Плісцы, зусім нядоўга, можа, гады тры. Арганізоўваў калгас, працаваў трохі сакратаром сельсавета, ажаніўся з Багунцоваю Анютаю і нечакана, пакінуўшы яе з малым сынам на руках, паехаў у свет. І, бач ты, ажно праз сем гадоў аб'явіўся і, чутно, забірае Анюту з сынам да сябе. І глядзелі то на здымак, то на Андрэя з асабліваю цікавасцю, гаварылі, што ён — выліты бацька, крошкі бацькавы пабраў — гэтакі ж чарнявы, зрынкаты, але ехаць туды, да яго, асабліва родныя, чамусьці не раілі.

А дзед Паўлюк павёў сапраўдную вайну супроць іхняга ад'езду. Што ён ні гаварыў і што ні рабіў. Хадзіў колькі разоў у кантору да Царэнкі, каб не адпускаў дачкі, угаворваў малога Андрэя. І ўсё ж маці настаяла на сваім, і яны пачалі збірацца...

Памірала скошанае і застагаванае ў лугах лета. Збіралася на парыжэлых паплавах у шумныя шпачыныя чароды,

клекатала на старой яліне маладым буслiным клёкатам, гатовае да адлёту і развітання.

Адвячоркамі, як ніколі доўга, нехаця сядала за лесам сонца, а наранаачку на прыволклым ад першых тумаНоў шыльніку, на адсырэлым моху з'яўляліся белыя пухіркі грыбніцы, і ў лесе спакусліва пахла грыбамі. Самаю горшаю пакутаю было Андрэю ўяўляць, што вось-вось, зусім скора, з'явяцца першыя баравікі і нехта другі, а не ён, знойдзе тут, на яго грыбовішчах, гэта крамянае, халоднае ад расы шчасце... І ўжо зайздрасць да таго, некага, і ўжо сум па ўсім, што мусіў пакінуць, забіралі ў свой балючы палон усю яго істоту. Але ж хіба гэта магло быць прычынаю, каб не ехаць да бацькі? Да бацькі, які нарэшце знайшоўся ў тым далёкім і невядомым, ніколі не бачаным стэпе...

І яны паехалі. І напачатку ўсё было добра, а галоўнае — цікава. Андрэй зусім нават і не ўспамінаў ні пра лес, ні пра баравікі, ні пра дзеда Паўлюка...

Усё пачалося трохі пазней. Як і чаму яно пачалося і што з ім было? Маці казала, што гэта была хвароба і ён ледзьве не памёр. Бацька спачатку смяяўся, называў гэта капрызам. Потым, калі ўсё зацягнулася, злаваў і крычаў на маці, што яму сорамна перад людзьмі, што яна распусціла сына, распесціла яго і ён толькі й робіць, што слухае, чаго хоча яго левая нага.

Андрэю было крыўдна за маці, хацелася ўстаць, абараніць яе, сказаць, што ўсё зусім не так, але нейкая незразумелая, цяжкая стома прыціскала яго да ложка, скоўвала ўсе рухі, адбірала мову. Бацька крычаў, маці ціхенька плакала і прасіла Андрэя ўстаць, паесці ці хоць бы сказаць, што яму баліць. А яго сасмяглыя вусны вымаўлялі адно толькі слова: лес. Такое кароткае і такое доўгае, бясконцае — ле-е-ес. Ён, мусіць, і цягнуў яго гэтак бясконца, доўга, ажно стамляўся, і больш нічога сказаць не мог.

Маці плакала, бацька хадзіў і хадзіў з кута ў кут па іх доўгім і нізкім, як скрыня, бараку, і цяжкія крокі яго болем аддаваліся ў Андрэя ў скронях. Усё было як у сне. Усё было

сном. Яваю, светлаю, чароўнаю, быў лес. Іхні лес, дзедаў. Той, што адразу за хатаю. Залаты, асенні, з крамянымі, халоднымі, здаецца, адчуваў іх сваімі гарачымі далонямі, здаецца, чуў іх пах, баравікамі. З усімі ляснымі куточкамі і сцежкамі, з усімі знаёмымі да кожнага сучочка, да кожнай галінкі дрэвамі і дрэўцамі. Моцна, да рэзкага болю пад павекамі, заплюшчваў вочы, і тады дзіўна набліжаўся, бліжэў лес. Ціхенька звінелі сваім лёгкім, што сцякала ажно да зямлі, голлем бярозы, і нешта шапталі яму, і некуды звалі. І ён, утрапёна, роспачна, кідаўся праз падворак да брамы, але бег так павольна, што пакуль дабягаў, яна абавязкова, з рыпам, зачынялася. Ад роспачы і адчаю ён задыхаўся...

Тады зноў бухалі бацькавы крокі і непрыемна гучаў яго голас. (Ці то, можа, рыпела брама?)

І зноў Андрэй бег. І, нарэшце, паспяваў дабегчы, і ўжо чуў, як лёгка яму становіцца дыхаць, і ўжо бачыў, замiраючы ад радасці, як скачуць па дрэвах агніста-рыжыя вавёркі і дражняць яго сваімі хітрымі вочкамі. Вавёркі былі ручныя. Яны спускаліся нізка-нізка па ствалах, ён кідаўся ад дрэва да дрэва, падстаўляў ім свае раскрытыя далоні, а яны, смешна тыкаючы ў іх халоднымі пыскамі, бралі сінявcovered драбочкі цукру...

«О, лес мой, лес мой залаты. З'явіся зноў, з'явіся ты. І не знікай...» Словы не вымаўляліся, выдыхаліся. Цяжка, з хрыпам. Лес з'яўляўся, прыходзіў да яго зноў і зноў. Абдымаў сваім шолахам, мучыў гаркава-салодкім водарам апалага лісту. Лісту было шмат, і дзед Паўлюк зграбаў яго ў вялізныя горбы. Дзед зграбаў, і яны з Мішкам Крыўцом давалі нырца ў іх. Разбягаліся і зашываліся ў ліст. Андрэй задыхаўся і не мог вынырнуць.

Доктар, якога ўрэшце прывёў бацька, сказаў, што гэта — хвароба і што яго трэба везці назад, дахаты...

Андрэй памятаў шэрую бясконцую стужку дарогі, разбіты, бразгатлівы газік, у якім яны доўга трэсліся да станцыі.

Пасля быў пусты перон, халоднае купэ з мулкімі лаў-

камі і закураным столікам, на якім можна было пісаць або маляваць пальцам. Кісла пахла мазутаю і вуглем.

Андрэй глядзеў праз бруднае, мутнае акно на бацьку. Той адзінока стаяў на пустым пероне, чамусьці без шапкі — прыціскаў яе неяк бездапаможна да грудзей і разгублена ўсміхаўся.

А маці стаяла пры акне, апіралася рукамі аб столік, як усё роўна баялася ўпасці, і неадрыўна, моўчкі таксама глядзела праз акно на бацьку.

Калі Андрэй пасля ўспамінаў бацьку, то чамусьці заўсёды бачыў яго неяк цьмяна, невыразна, як бы ўвесь час глядзеў на яго праз тое закуранае вагоннае акно...

Больш яны не ўбачыліся ніколі. Ад бацькі прыходзілі колькі гадоў грашовыя пераводы. Ён часта пераязджаў з месца на месца. Іншы раз прысылаў мацеры лісты, абяцаючы прыехаць. Але замест яго прыходзілі фотаздымкі, надпісаныя Андрэю Валуеву. Бацька так і не дазнаўся, што дзед Паўлюк адразу пасля таго, як яны вярнуліся, пайшоў у сельсавет і перапісаў унука на сваё прозвішча. А матцы, калі яна ўскінулася сварыцца, сказаў: «Маўчы, калі не разумееш. Вот каб прыжыўся ён у тым стэпе — быў бы Валуеў, а так — Багунец, нашай пароды». І маці змірылася.

Пасля доўга не было ад бацькі ні пераводаў, ні лістоў, ні фотаздымкаў. А неяк напрадвесні, адразу пасля дзедавай смерці, прыйшло кароткае афіцыйнае паведамленне, што дванаццатага студзеня тысяча дзевяцьсот шэсцьдзесят сёмага года Валуеў Афанасій Трафімавіч трагічна загінуў. Дзе, як, пры якіх абставінах — папера не паведамляла...

Так у адзін і той жа год страцілі яны дзеда і бацьку. Маці тады, адразу пасля паведамлення, хацела перапісаць Андрэя зноў на бацькава прозвішча, але потым раздумалася: «Дойдзеш да гадоў, будзеш палучаць пашпарт, сам рашыш...» Андрэй рашыў астацца Багунцом. Памяць пра дзеда была, як і раней, жывою, балючаю. Бацька ж успамінаўся, як даўні, забыты сон, выклікаючы ў душы адно лёгкі смутак.

«...маці расказала, як змарнавалі тады ваш лес, як памёр дзед Паўлюк. Ты й сам разуееш, што дзед яшчэ жыў бы, каб не сталася гэтак з лесам. А я не пісаў бы табе гэтага ліста, каб лёс выпадкова не звёў мяне з чалавекам, які ва ўсім тым вінаваты. І, як аказалася, не толькі ў тым, а і ў многім іншым. Цяпер ён залез высока і ўжо рашае лёсы не такіх лясоў, як ваш... Я разумею, ты можаш сказаць, што стары дзівак не мае чаго рабіць і дурыць табе галаву, і ўвогуле можаш адмахнуцца і забыць пра мой ліст. Але сам я пасля паездкі ў Пліску не магу спаць спакойна. Не дае мне жыць думка, што такія гора-гаспадары, як вядомы табе Бучок, рашаюць лёс нашай зямлі, яе лясоў і рэк, яе людзей. Не знаю, што можаш ты, але ж ты малады, Андрэй... Праца ў музеі, як і ўсякая чэсная праца,— гэта добра, але думаю, што кожны павінен дбаць пра нешта большае... Паглядзі на гэтыя здымкі, Андрэй, на гэтыя дрэвы... Іх даўно няма, цяпер там пустка. Пустка на 12 га. Маці казала, што й трава там не расце нават, вымакае... Ды ты сам усё лепш за мяне ведаеш.

Калі што якое — пішы. Я буду рад.

Твой настаўнік А. А. Тамашэвіч».

Андрэй акуратна склаў ліст, засунуў яго ў канверт. Тыя непрыязнасць і раздражнёнасць, што з'явіліся, як толькі пачаў чытаць ліст, зноў варухнуліся ў душы. «Аглядзеўся рак,— падумаў грубавата, са злосцю.— Ну й што, Бучок залез наверх, кіруе (чым ён там кіруе, не піша стары маралізатар), ну й што ты яму зробіш, скінеш яго адтуль, солі на хвост насыплеш? Ну, паеду я, знайду яго, наб'ю морду, а лес усё роўна не вырасце і дзед з магілы не ўстане». Андрэй пацепнуў плячыма, як бы атрасаючы з сябе гэтыя нечаканыя думкі. «Галава й так звініць, а хутка раніца і трэба ўставаць, перціся раней на работу: у лабараторыі цэлая гара старых здымкаў і негатываў, а дзеўкі з экспазіцыйнага не злазяць з карка — патрэбны копіі для чортведама якой па ліку выставы. Звіхнуліся на выставах. Робяць, но-

сяцца, а тыдзень пастаіць, і ўсё здымаюць, усё ў сметніцу, і зноў — новая ідэя, і зноў «ствараюць». Знай толькі «кляпай», не разгінайся... Вот і думай яшчэ пра нешта, акрамя «чэснай працы»... Седзячы ў вёсцы ці ў нейкім там мястэчку, на пенсіі, без жаднага занятку, можна чортведама да чаго дадумацца...» Але думкі ўпарта вярталіся да Тамашэвіча, да ягонага ліста, да гэтых нечаканых старых здымкаў дзедавага лесу. Хацелася з некім гаварыць, спрачацца, але побач нікога не было. Дый увогуле, тут, у гэтым горадзе, не было ніводнай жывой душы, якой бы мог ён усё гэта расказаць і пра лес, і пра дзеда, і пра ўсіх бучкоў. Нікому гэта нецікава... Ды, зрэшты, хіба адзін Бучок такі? Вунь узяць іх самага першага старшыню, таго ж Восіпа Царэнку.

Андрэй помніў Царэнку чамусьці лепш, чым Бучка. Пэўна, таму, што быў Восіп Царэнка ў іх Плісцы доўга, а Бучок мо гады два, не болей. Дый непрыкметны нейкі быў Бучок — малы, шэры, твар меў невыразны. Мала пабыў — шмат нарабіў. Лес спляжыў, дзеда ў магілу звёў. Усё так... А Царэнка цэлую вёску звёў. Самадур быў — факт. У галаве не ўкладваецца. Жылі людзі спакон веку, вайну перажылі не адну, а тут прыехаў нейкі г... і, бачыце, не спадабалася яму вёска, і ён распарадзіўся яе лёсам...

Андрэю запомнілася першая сустрэча з Восіпам Царэнкам. Калі тое было, у якім годзе, якою парою: зімою, летам, вясною? Елка канцы хаты была, як заўсёды, зялёная і шумлівая. І каля яе, асадзіўшы на месцы разгарачанага каня, спыніўся аднаго разу незнаёмы ў бліскучых, з высокімі халявамі ботах. Чамусьці найбольш запомніліся тыя наваксаваныя да бляску Царэнкавы храмовікі. Можа, таму, што самога Царэнкі той першы раз не паспеў як след разгледзець, пазнаў адразу каня, на якім ён прыехаў, і закрычаў здзіўлена, радасна: «Дзед, дзед, наш Гнеды вярнуўся». Дзед абазваўся недзе ажно з дрывотні, і тут жа заржаў раз і другі, затанцаваў на месцы Гнеды. Незнаёмы ў бліскучых ботах нацягваў, што меў сілы, павады, але конь занараві́ўся, і раптам яго пярэднія, у белых «шкарпэ-

тачках» ногі падламіліся, і ён як стаяў, так і рухнуў на зямлю. Падаючы, мусіць, прыціснуў Царэнку нагу, бо той глуха ўскрыкнуў, але тут жа вызваліў адну нагу, потым другую з стрэмя, вылез з сядла. Конь не ўставаў, адно касіў шалёна вывернутым вокам, хроп. Царэнка рваў павады, ажно звінелі цуглі. Не могучы даць рады, раз'ятрана, злосна пачаў біць Гнедага нагамі. Маланкава мільгаў востры насок бліскучага бота.

Моўчкі падышоў дзед Паўлюк, моўчкі забраў у Царэнкі з рук павады.

Праз які час Гнеды падняўся. З шырока раздзьмутых ноздраў у яго падала кускамі ружовая пена, ходырам хадзілі бакі і трымцела на баках і на шыі тонкая, далікатная скура...

Як паехаў тады ад іх Царэнка і чаго ён прыязджаў, Андрэй не помніў. Помніў толькі, што потым, прыціснуўшыся да вушака, адвярнуўшыся ад усіх, доўга стаяў дзед Паўлюк і часта-часта ўздрыгвалі яго апушчаныя плечы.

Андрэй добра помніў Царэнку яшчэ й таму, што пра яго ў Плісцы гаварылі і ўспаміналі вельмі часта. Колькі ўжо часу прайшло, колькі старшыняў памянялася, а пра першага гаварылі найбольш.

Паходзіў Восіп Восіпавіч Царэнка аднекуль з Усходняй Украіны і па нейкіх сваіх, аднаму яму вядомых, абставінах пасля вайны не захацеў вяртацца дадому. Адны казалі, што нікога ў яго з сям'і не асталося, таму цяжка яму ехаць да сябе на радзіму. Другія пагаворвалі, што сюды, у блізкае ад Пліскі мястэчка, прыбілася ў часе вайны ці то яго жонка, ці то каханка, якую ён пакуль што не вязе ў Пліску, але дзеля якой тут, паблізу астаўся. Рознае гаварылі, а як там было напраўду, ніхто толкам не знаў.

Быў Царэнка яшчэ малады. Высокі, шыракаплечы, з адкрытаю белазубаю ўсмешкаю, з сінімі вачыма на смуглявым валявым твары, ён закахаў у сябе адразу ўсіх амаль пліскаўскіх дзяўчат і маладзіц.

Ды што казаць пра маладых. Расказвалі, што старая

Тэкля, ці не самая старэйшая з усяго наваколля, якая памятала яшчэ прыгон, перастрэўшы Царэнку першы раз на вуліцы, так і застыла, не могучы сысці з месца. Колькі часу стаяла як укопаная і ўсё глядзела на яго, а разгледзеўшы, перабраўшы ўсяго знізу да верху бляклымі, але ўсё яшчэ відушчымі вачыма, заплямкала разгублена вялікімі, мокрымі, як перастаялыя казякі, губамі, загаварыла, не хаваючы здзіўлення: «А паночак, а дзе ж ты такі ўрадзіўся? Колькі паноў перажыла, а такога харошага не бачыла...»

Селівон Драздзюк, якога тады якраз паставілі ўчотчыкам і які хадзіў увесь час, ганарліва задраўшы галаву, след у след за Царэнкам, аслупянеў ад нечаканасці і страху: «Т-ты што, старая дурніца, які ж гэта табе паночак, гэта ж таварыш прысядацель, старшыня наш....»

«А Селівонка, а родны,— перапалохалася й Тэкля, убачыўшы, як збялеў Селівон.— Я ж нічога лядайкага не сказала, бачу — чалавек чыста апрануты, не раўня нам з табою, то й кажу... І харошы ж надта...»

Яшчэ больш пакрыўджаны гэтаю «нераўнёю», Драздзюк аж слінаю запырскаў ад злосці і, мусіць, кінуўся б на Тэклю з кулакамі, каб не зарагатаў нечакана весела сам Царэнка: «Да што вы, Селівон Іванавіч!..» Прыгнуўся, зазірнуў старой у твар і асцярожна пагладзіў яе па згорбленых, худых плечуках...

Аднак быў ён чалавек няпросты, дзікаваты, празмерна запальчывы. Меў нораў круты і рашучы, але ўмеў сябе, дзе трэба, стрымаць, не паказаць свае наравістасці. І таму бачылі яго больш вясёлым, часцей чулі, як раскаціста ён рагоча, чым сварыцца ці некага за нешта прабірае. Хоць і гэта, апошняе, прыпраўляючы натацыю словам добра прасоленым, Царэнка ўмеў рабіць адмыслова.

Хадзіў ён у вайсковым фрэнчы, у галіфэ, у наглянцаваных, з высокімі халявамі, ботах. І гэта напаўвайсковае адзенне неяк асабліва падкрэслівала яго акуратнасць і цвёрдасць. Заўсёды ўсё на ім было чыстае і адпрасаванае. Ніколі не бачылі Царэнкі непаголеным, ад яго і ў будні дзень за вярсту пахла дарагім адэкалонам.

Пра гэту Царэнкаву фарсістасць у Плісцы гаварылі шмат і рознае. Але найбольш любілі расказваць пра тое, як аднаго разу яна падвяла старшыню. Было гэта на першым часе, як толькі арганізаваўся калгас і сёй-той з пліскаўцаў яшчэ ўсё «блытаў» сваё з калгасным. Асабліва ў касавіцу, калі так спакусліва пахла маладое, толькі-толькі пастаўленае ў копы сена. Як было не ўзяць дзяружку-другую цішком, уночы, хоць бы і з былое свае сенажаці.

Аб'ездчык, пристаўлены пільнаваць копы, не хацеў нікога ўдаваць, і Царэнка ўзяўся вартаваць сам. Але як ён ні стараўся, ночы навылёт у капе праседжваў, вокам баяўся звесці — ніхто не пападаў. А сена па-ранейшаму кралі. Раніцою, абыходзячы сенажаць, Восіп Царэнка мацюкаўся ад злосці: сена бралі зусім з процілеглага краю, а туды, дзе ён сядзеў, ніхто і блізка не падыходзіў. Наступны раз старшыня мяняў месца «дыслакацыі», цішком залазіў у капу ўжо з таго, процілеглага краю, але зноў яго абводзілі вакол пальца. Дзіва брала Царэнку, як гэта зладзеі ўгадвалі, у якім баку ён сядзіць. Не мог дадумацца, што выкрываў яго з галавою рэзкі пах адэкалону. Пах гэты быў такі адметны сярод мурожнага водару, што варта было толькі павеяць ветрыку, як усё станавілася ясна...

Але такія «фокусы» ўдаваліся рэдка. Царэнка быў хітры, упарты, умеў бачыць чалавека навылёт і любіў, каб яго заўсёды і ва ўсім слухалі.

Да калгаса «Перадавік» належала пяць вёсак. Пліска была цэнтрам, астатнія, аддаленыя на колькі кіламетраў, лічыліся брыгадамі. Дападны старшыня за дзень паспяваў пабываць ва ўсіх брыгадах. Ездзіў конна, і гнеды Багунцоў жарабец толькі хроп пад ім.

Належала да «Перадавіка» і самая далёкая вёсачка Халопішкі, прадмет асаблівага клопату Восіпа Царэнкі. У Халопішках было хат пятнаццаць, не болей. Стаялі яны блізка адна каля аднае паабапал вузкай, як возам праехаць, пясчанай вулкі. Хаты ўсе невялічкія, і людзі жылі там, быццам з аднаго гнязда выбраныя — усе невысокія, дробнень-

кія, чарнявыя, што блізняты, з адтапыранымі, як палукашачкі, ніжнімі губамі. І гаварылі ўсе аднолькава: паволі, доўга цягнучы асобныя словы. Неўзлюбіў іх Восіп Царэнка з першага дня: звод народу, і ўсё тут.

Каб не дапусціць гэтага «зводу», задумаў Царэнка рассяліць Халопішкі па ўсіх вёсках «Перадавіка».

«Две-три семьи на большую, полноценную деревню — не страшно. Смотришь, через пятилетку-другую ассимилируются...»

Але людзі ў Халопішках хоць малыя былі, ды ўпартыя. Колькі ні загадваў старшыня, ніводзін з наседжанага месца не зрушыўся. І што ўжо ні прыдумваў Царэнка, чым ні пераманьваў іх: і лес даваў, і грашовую пазыку, і падводы для перавозкі — нічога не памагала. Тады крэпка раззлаваўся Восіп Царэнка. Узяў аднаго разу новы, што толькі-толькі з'явіўся ў калгасе, чырвоны калёсны трактар, сам прыгнаў яго ў Халопішкі, падчапіў плугі і пераараў колькі разоў вуліцу.

Казалі, што ніхто не выйшаў тады з хаты, ніхто не паспрабаваў спыніць старшыню, ніхто ні аб чым не папрасіў яго. Людзі як вымерлі. Над вёскаю стаяла жудлівая, нязвыклая цішыня. І нават рокат новага трактара не мог парушыць яе. Ён быў як бы сам па сабе, а цішыня — сама па сабе.

Непамысна рабілася Восіпу Царэнку ад гэтай цішыні і бязлюддзя і, каб схаваць сваю непамыснасць, ён глыбей і глыбей апускаў у збіты, цвёрды грунт вузкай вулкі новыя вострыя плугі...

Назаўтра, надвечар, калі старшыня прыскакаў у Халопішкі, вуліца была, як і раней, роўная і гладкая. Быццам усё ўчарашняе прыснілася яму ці прымроілася, быццам і не варочаў ён «до седьмого пота эту идиотскую отсталость плугами новой колхозной жизни».

Колькі разоў яшчэ ён там варочаў усё дагары нагамі, цяпер сказаць цяжка. Але вядома адно: колькі ён варочаў, столькі Халопішкі ўсё раўнялі. І першы не вытрываў, адступіў старшыня.

2 — 1305

Дакладней, не адступіў, а змяніў тактыку барацьбы з упартаю вёскаю. Паступова адлучыў, адрэзаў яе ад усяго свету: не даў правесці электрычнасці, забараніў завозіць хлеб у маленькую вясковую крамку, перагнаў брыгадных коней за сем кіламетраў у Пліску. І Халопішкі мала-памалу, хто раней, хто пазней і хто куды, усё ж вымушаны былі разысціся, раз'ехацца, рассяліцца... На месцы тым асталося пару старых, карчыстых сліў і вялізны куст бэзу, што рос калісьці за канцом вёскі каля высокага амшэлага крыжа, а цяпер, на самоце, невядома да каго цягнуў свае крывыя, пакручаныя «раматусам» галіны і ўпарта, штовесну, прыбіраўся ў буйную духмяную квецень.

Пад раніцу, калі ўжо заплюшчыў сіняватае вока вулічны ліхтар, заснуў і Андрэй. Спаў нядоўга і ў тым кароткім сне бачыў вялізную, вымеценую сухавейнымі вятрамі пустку. Ці то быў забыты ўжо, бачаны толькі аднойчы ў маленстве стэп, ці мо тое гала за роднаю хатаю, дзе колісь шумеў дзедаў лес, ■ можа, апусцелая далонь зямлі, на якой стаяла, жыла, радавалася й гаравала колькі дзесяткаў гадоў назад маленькая вёска Халопішкі. Невядома. Але астаўся ў душы ад сну вярэдлівы неспакой і пасля не пакідаў Андрэя праз цэлы дзень.

Вецер і сонца — з самага ранку. Вецер моцны, напорысты, але ўжо цёплы, лагодны. Не дзьме — лашчыць, абдымае, апальвае першым загарам твар і рукі.

Шапаціць, варушыцца, як жывая, на раскрытых капцах леташняя салома, насыхае і рэзка пахне зямлёю, мышамі і гнілою бульбаю. Колькі тут гэтай бульбы, што як каша распаўзаецца ў пальцах — страх глядзець. Закрылі з восені мокраю саломаю. І так амаль штогод: то салома мокрая, то маразы занадта вялікія, то зямлі зверху мала насыплюць. Гніе бульба, марнуецца.

Пліскаўскія жанкі пяты дзень ужо з раніцы да вечара ў гэтых капцах сядзяць і рады даць не могуць. Анюта ўчо-

ра не ўтрывала, Мішку Крыўцу, галоўнаму аграному, выгаварыла: «Куды ж вы, начальнікі, глядзелі ўвосень, чаму не дапільнавалі?» А ён разгарачыўся, зазлаваў: «Чаму гэта ўсё начальнікі, як нянькі ў яслях, хадзіць за кожным павінны? А той, хто закрываў, што, вачэй не меў ці розуму? Нябось свой капец такою саломаю не закрыў бы...» І то праўда: свой не закрыў бы, а калгасны, выходзіць, халера яго бяры...

Сёння сюды, да капцоў, Анюта ішла каля Груда. Там ужо Сцёпка Парэйчык пад яравыя араць пачаў. Пастаяла яна, паглядзела на яго работу. Апусціў плугі на ўсю глыбіню і варочае жоўтым наверх — не азірнецца нават. Здаецца, каб прымела, спыніла б трактар, выцягнула б за кудлы такога аратага.

Раней хоць прыцэпшчыкі былі, сачылі, дзе глыбей плуг апусціць, дзе падняць. А што цяпер робіцца? Мала што ўгнаеннем гэтым зямлю спустошылі, дык яшчэ і чарназём нішчыцца. Зноў у абед запыніла Анюта Мішку, зноў пра ўсё сказала, а потым ажно пакаялася, нашто казала, пашкадавала хлопца: і так ён чыста выпетраў, п'яніц ганяючы. А дзе ты за імі ўсочыш, дзе ты ўгледзіш за кожным, калі яны прапілі і сумленне, і розум... Не радуе Анюту ні сонца, ні вецер. Сядзіць, унурыўшыся над капцом, бульбу перабірае і думае. Пакуль што яна адна тут, пасля абеду раней за ўсіх прыйшла, першая. Зараз бабы папрыходзяць. Стэпка Макунова прыкоціцца, з фермы Алена Драздзюкова прыбяжыць, Рэня Крыўцова прыйдзе — от табе, лічы, і ўся пліскаўская брыгада. Пенсіянеркі адны. Зрабі шмат такою сілаю, пастарайся. А што будзе, калі і яны не замогуць? Нават бульбы не будзе каму адабраць на насенне...

Успомніла зноў нядаўнюю гаворку з Тамашэвічам. Канешне, трэба вяртаць дзяцей да зямлі, але як, якім чынам, калі зямля гэта іх не цягне ні трохі, калі халодная яна ім, нямая, не чуюць яны яе?

От хоць бы і Андрэй яе. З малога прывучала да працы, памагаў увесь час. І цяпер памагае. Але ж бачыць яна, што неяк не так ён усё робіць, як праз сілу ўсё роўна, як не сва-

2*

імі рукамі, без ахвоты і любасці. Так, абы зрабіць. Скажа яна, маці, торкне пальцам, пакажа — зробіць, не — дык і не, не ўбачыць, не заўважыць, не здагадаецца. Фотаапарат на плячо і пайшоў. Або кнігу ў рукі і на канапу. Ці да тэлевізара гэтага як прыліпне, цэлы божы дзень можа прасядзець. Яна іншы раз не ўтрывае, спытае: «Ты ж малады яшчэ, сын, як гэта ты без жаднага руху можаш сядзець гэтулькі або ляжаць?» Ён, як у добрым гуморы,— смяецца, а то і пакрыўдзіцца, надзьмецца: «Што, мне ўжо ў роднай хаце і паляжаць нельга?»

Шчодра свеціць сонца, не шкадуе зямлі цяпла і лагоды. Тугі вясновы вецер падварушвае, сушыць салому і трэпле на скроні сівую пасмачку Анюціных валасоў. А яна сядзіць у капцы, на сонцы і ветры, і думкі яе плывуць і плывуць.

Успамінае Анюта халоднае прадвесне тысяча дзевяцьсот шэсцьдзесят пятага года, калі ў Плісцы перавыбіралі старшыню. Якраз з тых перавыбараў усё і пачалося. Колькі іх было пасля, такіх сходаў, колькі гаспадароў «Перадавіку» прызначалі і колькі праз год-два мянялі — палічыць ужо цяжка. Але той, на якім «здымалі» Царэнку і «ставілі» Бучка, Анюта помніла добра.

...У калгасным клубе на сцэне за сталом, накрытым чырвоным бліскучым плюшам, сядзела прыезджае начальства. У другім радзе тулілася чалавек пяць сваіх праўленцаў.

Царэнка сядзеў сярод прыезджых. Побач з ім, унурыўшыся да самага стала, гнуўся шчуплы малады чалавек у шэрым гарнітуры. Ён раз-пораз уздымаў галаву і нясмела, коратка пазіраў у біткам набітую залу. На яго глядзелі таксама, яго прыдзірліва абмацвалі позіркамі, бо ўжо ведалі, што гэта ён прывезены сюды на месца Восіпа Царэнкі. Агледзіны тыя, напачатку маўклівыя, былі не на яго карысць.

Недавольны гул стаяў у зале, асабліва ў тых радах, якія цалкам займалі пліскаўскія падлеткі, мяшаўся там з маладым рогатам і жартамі, хвалямі каціўся да сцэны, выклікаючы здзіўленне і незадаволенасць прыезджых начальнікаў.

Хтосьці з іх нецярпліва звінеў алоўкам па графіне, хтосьці парываўся супакоіць залу словамі, але гул не сціхаў.

Тады падняўся з-за стала Царэнка, моўчкі абвёў усіх позіркам, і ў клубе адразу зрабілася ціха. За трыбуну выйшаў высокі сівы сакратар райкома, доўга гаварыў пра заслугі Восіпа Царэнкі перад калгасам «Перадавік», нарэшце скончыў, узяў са стала скрыначку, выняў адтуль бліскучы круглы гадзіннік...

Анюта помніла, як трымаў у высока ўзнятых над галавою руках гэты бліскучы гадзіннік іх старшыня, як разгублена, сумна ўсміхаўся. Пэўна, ён штосьці й гаварыў тады, але словы сцерліся, выпалі з памяці.

Затое добра помнілася, як стаяў пасля за трыбунаю іх новы старшыня Анатоль Бучок і як зноў каціўся па зале недавольны гул. Бучок стаяў доўга, бледны, натапыраны, злы, але так і не дачакаўся цішыні і ўвагі.

Усхапіўся сакратар райкома і, перакрываючы шум, строгім моцным голасам крыкнуў: «Хопіць! Пашумелі, і хопіць. Хто чым недавольны, прашу выйсці і сказаць. Толькі не хорам, па аднаму давайце, таварышы».

Людзі сцішыліся, адно йшлі па радах нясмелыя перашэпты. Анюта пачула, што рыпнула недзе блізка каля яе крэсла. Павярнулася ў той бок, убачыла, як паволі ўставаў са свайго месца бацька, пачула яго глухаваты голас: «Чаму згоды ў людзей не спыталі, чаму не параіліся: мяняць старшыню ці не? Сагналі, як быдла, і вот вам — новы пастух! Што вы нам яго, гэтага хлопца, як ката ў мяшку, прывезлі? Хто ён такі, адкуль? Мы чулі, што ён ужо нагаспадарыў недзе, нам такіх гаспадароў не трэба!»

Бацькавы словы патанулі ў гуле. Пачуліся крыкі: «Правільна. Не адпусцім Царэнкі... Хай кіруе!.. Не трэба нам новага! Не хочам... Чулі пра яго!»

Новы старшыня сядзеў бледны, спадылба, нядобра зыркаў у залу. Царэнка сумна ўсміхаўся, хітаў раз-пораз галавою. Хто-хто, а ён, мусіць, ведаў, што нічога ўжо не зменіш...

На сцэне з-за шырокай спіны сакратара райкома нечака-

на ўсхапіўся Селівон Драздзюк, абурана замахаў рукамі: «Што ж гэта робіцца, га? Што ж гэта вы, людзі, падурнелі, ці што? Новага гаспадара так прывячаеце?.. Царэнка, Царэнка. Што Царэнка? Пабыў, і хваціць! Начальства рашыла перамясціць яго на другую должнасць, а над намі, вот — таварыша Анатоля Пятровіча Бучка ставяць. Начальству відней, таварыш Багунец,— Драздзюк уперыўся позіркам у бацьку,— і начальства не далжно ў цябе пытаць, каго яму ставіць. Я, таварышы, прашу ўсіх дружна прагаласаваць за Анатоля Пятровіча Бучка, за нашага новага хазяіна».

Драздзюк высока ўзняў руку і, гэтак трымаючы яе, сеў.

У клубе завісла маўчанне. Анюта бачыла, як апусціў галаву Царэнка, як пасмялела зірнуў у залу Бучок...

Зашалясцела каля капца салома, і Анюта ажно ўздрыганула, падняла вочы. У ватоўцы, у чорнай, завязанай «пад бараду» хустцы, з кошыкам на руцэ стаяла каля яе Драздзюкова Алена. І гэта чорная хустка, і сцятыя ў горы Алеміны вусны ўмомант нагадалі пра нядаўні, хоць і чужы, але блізкі і зразумелы боль... Загаварыла, спагадаючы Алене, уздыхнула і нахілілася да капца, не ведаючы, аб чым яшчэ пагаманіць. Прыціхлі абедзве. І зноў, міжволі, у думках, вярталася Анюта да таго даўняга, перажытага...

Новы старшыня «Перадавіка» Анатоль Бучок адразу шчыра ўзяўся за справу. Найпершым яго дарадцам і памочнікам стаў Селівон Драздзюк. І калі былы старшыня Восіп Царэнка ўмеў, выслухаўшы такіх «дарадцаў», зрабіць пасвойму, то Бучок з першага дня падпаў пад уплыў Драздзюка і да канца свае бытнасці ў «Перадавіку» з-пад гэтага ўплыву вызваліцца так і не змог.

І Селівон стараўся, не вылазіў з канторы, раскрываў новаму гаспадару вочы: «Жывуць тут усе, як кулакі, таварыш прысядацель. Распусціў Царэнка. Робяць, што хочуць. Савецкай улады на іх няма. Па трыццаць пяць — сорак сотак, а то і болей, кожны мае каля хаты. А яшчэ ж і садкі, і лужочкі, і лясочкі, і ўсякая трасца. Гэта ж не калгаснікі палучаюцца, а шляхта засцянковая. Кулакі.— І даверліва

нахіліўшыся, дадаваў: — Не дай бог, начальства ў раёне дазнае — каюк вам будзе. Думаеце, чаго Царэнка паляцеў адсюль? Уведалі нябось, якія ён тут парадкі завёў. Падказаў нехта...»

Бучок з апаскаю пазіраў на худога, даўгавідага, чорнага, што грак, Селівона і ніякавеў пад пранізлівым поглядам яго маленькіх, глыбока пасаджаных вачэй. Вочы гэтыя, здэцца, свідравалі наскрозь.

— Дак што ж, Селівон Іванавіч, вы раіце? — няўпэўнена прыгладжваў рэдкія рудыя валасы Бучок і знізу ўверх нясмела пазіраў на Драздзюка.

Селівон «раскусіў» Бучка яшчэ раней, як толькі ўбачыў на справаздачна-выбарчым сходзе. Глянуў, як стаяў той на сцэне — натапыраны, злы, і ўсё адразу зразумеў. У новага старшыні злосці, як кажуць, поўныя косці, а яна звычайна бывае ад бяссілля. «Слабы хлопец,— падумаў ён тады сам сабе.— Гэта не Царэнка. Будзе ва ўсіх шукаць падтрымкі». Таму й не марудзіў: ускочыў на сходзе, закінуў слова, калі Бучка засыпаць пачалі. Яго б, канешне, не засыпалі і без Селівона: раз начальства рашыла, прывезла яго, то й паставілі б. Тут справа была не ў тым: важна было, каб Бучок адразу ўбачыў, хто яго падтрымаў. А такія, як ён, гэта любяць і цэняць. І Селівон не памыліўся: Бучок з першага дня наблізіў яго да сябе, зрабіў сваёю праваю рукою.

— Дак што ж,— паўтараў старшынёва пытанне Селівон,— дак тут іначай, таварыш прысядацель, нічога не параіш: трэба тэрмінова збіраць праўленне і прымаць пастанову па сотках. Трэба замераць усё: і падворкі, і садкі, і лужкі. А як жа ж... Хопіць, напанаваліся за Царэнкам. Забылі, што ў калгасе жывуць...

Праўленне тут жа сабралі і пастанавілі: строга пераглядзець прысядзібныя ўчасткі калгаснікаў, устанавіць норму карыстання зямлёю ў памеры 20—25 сотак на адну калгасную сям'ю.

І разгарнулася ў калгасе «Перадавік» кампанія...

Вясна той год прыйшла ранняя, цёплая. Пара была садзіць соткі, а іх толькі пачалі мераць. Коней не давалі нават навазіць гною. І кожны з самай раніцы вызіраў, ці не заявіцца да яго з «казою» на плячы Селівон Драздзюк. За Селівонам звычайна каціўся круглы, як гарбуз, Антак Макун і, зашчаміўшы пад пахаю шэрую канторскую кнігу, дэбала на тоўстых, што навоі, нагах дзябёлая аграномка Дуся...

Пакуль гэта прадстаўнічая камісія дайшла за чыгунку, да Багунцоў, стала на добрае цяпло. Вясна ўбіралася ў сілу.

Паўлюк не знаходзіў сабе месца. Перасыхала на вачах зямля. Храсцілася ў мяхах і таксама сохла парэзаная, прышыкаваная на насенне бульба.

Паўлюк штодня выходзіў да поля, хадзіў па абмежку, браў у жменю зямлю, камячыў яе, размінаў у пальцах — ужо сухую, цёплую — і чуў, як востры боль становіцца ў грудзях, бы хто ўпёр туды знячэўку нож.

— Не магу пераносіць,— казаў Адаму Рубцу, які, убачыўшы суседа на сотках, адразу валюхаўся да яго з свайго поля.

— Ведаеш што, не набірай у голаў.— Таўсматы, чырванатвары Адам цяжка дыхаў. Крэкчучы, таксама нагінаўся да зямлі, браў камячок у тоўстыя пальцы, яшчэ больш чырванеў.— Што ты зробіш, сухая ўжо, цёплая зямелька, хоць сам, ведаеш што, кладзіся.

Адам ціхенька, сіпла смяяўся.

— Жывы не ляжаш.— Паўлюк недавольна ссоўваў густыя бровы.— А вот картофлю будзем у попел кідаць...

— Можа, дождж пойдзе...

Старыя разам задзіралі галовы. Неба было высокае і чыстае. Густая, напоеная шчодрым сонцам сінька яго адбірала вочы.

— Ага, якраз пойдзе, табе па заказу... Каб яны па свеце не хадзілі, Адамка. Гэта ж такі здзек і над зямлёю, і над чалавекам. Пастуху якому ў мазгі стрэліць, надумае дурніцу, а ты, чалавек, мусіш жыць па яго распарадку. На

зямлі седзячы, мусіш чакаць, покуль яго халуі табе яе высуляць. Ці не крыўда, скажы ты мне?

Адам заклапочана ссоўваў на патыліцу шапку, выкасваў белы, не загарэлы пад шырокім брылём лоб, цяжка дыхаў:

— Ведаеш што, Паўла, чую я, што йшчэ не такая крыўда будзе. Папомніш маё слова. Яны тут скора разгорнуцца. Ты ж Драздзюка сам знаеш. Гэты чорт каго хочаш набухторыць...

— А ўжо ж, разгорнуцца. У бараноў рог іх згорне,— Паўлюк рашуча шоргаў рукою аб крысо марынаркі; з пальцаў сыпалася зямля.

— Ведаеш што, не петушыся, Паўла. І нічога не зробіш — рады не дасі... Царэнка хоць круты быў, але розум меў. З ім пагаварыць можна было...

— Э, што ты раўняеш Царэнку з пастухом нейкім,— Паўлюк ажно крэкнуў ад прыкрасці.

— Ну, во. Правільна. А з гэтым — ні полем, ні дарогаю. Я, ведаеш што, пашоў неяк саломы выпісаць. Зайшоў у кантору — сядзіць. Даў дабрыдзень і кажу: так і так, прысядацель, кароўкі да вясны не дахаваю, корму не хопіць. Памажыце хоць саломаю. А ён, што нямы: сядзіць і глядзіць. І я перад ім, ведаеш што, як парабак перад панам, шапку зняўшы, стаю. Эх-х... А я, Паўла, ты ж ведаеш, з Урангелем ваяваў. Леніна, вот як цяпер цябе, зблізку відзеў... Крыўда, Паўла, а нічога не зробіш.

У Багунца мералі соткі ажно пасля першага мая. Увесь красавік быў сухі і цёплы. Зрэдку, праўда, пралляталі дажджы, але былі яны кароткія і таксама цёплыя. Поле ўжо ўзялося травою, зазелянела. Паўлюк на яго не мог узірацца.

Каля ганка цвілі слівы, вот-вот меліся зацвітаць яблыні, трымалі напрыгатове свае ружовыя, тугія булбаткі нераскрытых пакуль пялёсткаў. Прыбраўся ў далікатнае маладое зяленіва Багунцоў лес, і аднае раніцы, выйшаўшы на ганак, Паўлюк пачуў, як недзе за садам нясмела паспраба-

вала свой голас зязюля. Гулкае «ку-ку» адбілася далёка ў лесе і прапала. Паўлюк доўга яшчэ стаяў, слухаў, але больш у той ранак зязюлі не пачуў... «Ну, што ж,— сказаў нябачнай птушцы,— не хочаш ты мне ўжо лічыць гады,— як знаеш. Але добра хоць, што закувала не на голы лес. Усё, значыць, парадкам ідзе. Усё добра».

І ўсё ж чуў Паўлюк у сабе нейкі гнятлівы неспакой, як бы што парушылася і ў свеце, і ў ім самім. Было такое цяпло, але ўсё яшчэ аблогаю ляжала зямля каля хаты. Паўлюку нават снілася, як ідзе ён па свежай, разворанай раллі, чуе яе, уробленую, мяккую, босымі нагамі і поўнаю жменяю рассявае перад сабою жыта. Прахопліваўся сярэдначы і, не могучы больш заснуць, горка думаў, што жыта гэту весну ён ужо не пасее — спазніўся. Бульбу то йшчэ нічога, кіне ў зямлю. Рана-позна — вырасце. А вот жыта ўжо не пасее. А яму, як ніводзін год, хацелася пасеяць жыта. Гаварыў штодня пра гэта Анюце і ўжо, мусіць, надакучыў дачцэ, бо неяк яна не вытрывала, папікнула: «Ну, што вы, тата, чыста дзіця малое: жыта, жыта. Такой бяды. Засадзім усё картофляю. Колькі яны йшчэ намераюць тых сотак — невядома. Кажуць, і падворкі, і садкі, і межы — усё ў соткі лічаць...»

Да іх Селівон Драздзюк з сваімі памагатымі заявіўся надвечар.

Анюта толькі прыйшла з работы, варыла ў хаце вячэру. Паўлюк на падворку штукаваў калгасны воз... Колькі ён перарабіў, колькі паправіў такіх вазоў пры Царэнку — не злічыць. Усё дабівалася ўмомант. Паўлюк надзівіцца не мог. Толькі возьмуць ад яго новы, харошы воз, праз тыдзень ужо цягнуць назад: то вось зламалася, то перадок раскалоўся, то драбіна трэснула. Толькі паспявай правіць. Добра, што матэрыял пад бокам, пайшоў у лес і выбраў.

...Драздзюк на падворак да Багунца не заходзіў. Прыпёр да яліны сваю «казу», сам адышоў далей, сеў канцы саду пры маладой бярозе. У Селівона была даўняя, закарэлая крыўда на Багунца. Колькі гадоў існаваў калгас у Плісцы, столькі Драздзюк з Багунцом варагавалі. Драздзюк, як ні-

хто з Пліскі, любіў пажывіцца ў Багунцовым лесе. Ён пілаваў там зімою і летам, і колькі ён пілаваў, столькі Паўлюк яго лавіў. Зімою па слядах прыходзіў да Драздзюка ажно на падворак, лёгка знаходзіў прыкіданую галлём бярозу і, ні слова не кажучы, ішоў у кантору. Царэнка выклікаў Драздзюка, строга папярэджваў, іншы раз нават штрафаваў, але праз колькі часу Паўлюк зноў знаходзіў у лесе свежы бярозавы пень. Усё паўтаралася спачатку...

Драздзюк сядзеў пад бярозаю, чакаў, пакуль Макун з Дусяю нап'юцца вады, а сам тым часам азіраў дагледжаны, свежапабелены садок, зіркаў праз яблыні на падворак, дзе цяпер гаманілі з гаспадаром яго, Драздзюковы, памагатыя. Чуў найбольш глухаваты спакойны голас Багунца, і яго пачынала разбіраць злосць. «Сядзіць тут, як пан,— думаў сам сабе раздражнёна, нядобра.— Садок, падворак, лес. Абняў, прынаравіўся. Але ўжо хопіць, галубок. Мінуліся табе мяккія пірагі. Паглядзім цяпер, як ты паскачаш...» Нецярпліва падхапіўся з-пад бярозы, крыкнуў: «Дуся, Антак, дзе вы там?» Не чакаючы, пакуль падыдуць, сам узяў мерку...

Праз якую гадзіну ўсе стаялі каля хаты. Драздзюк абмераў соткі, падворак, садок і цяпер, спёршыся грудзьмі на плот, па памяці называў лічбы. Дуся, раскрыўшы на слупку сваю канторскую кнігу, запісвала. Побач натомлена пыхкаў Макун, як бы гэта не Драздзюк, а ён толькі што лётаў з «казою» па сотках.

Паўлюк стаяў воддаль, прысланіўшыся плячыма да сцяны.

З хаты выйшла Анюта, вынесла збанок з бярозавым сокам і паліваны блакітны кубачак.

— Адпачніце, работнічкі. Папіце во соку. Халодненькі.

Селівон распростаўся, невядома нашто ўзяў і адставіў далей мерку. Яму чамусьці заўсёды было боязна глядзець на Анюту. Страх гэты астаўся яшчэ з тае хлапечай, кавалерскай яго пары, калі ён праводзіў Анюту з танцаў сюды во, дахаты. Потым Селівон і сватоў да яе засылаў. Ажно двой-

чы. І двойчы яна адмаўляла яму. Селівону ўвесь час здавалася, што вінаваты ў тым быў найбольш стары Багунец. «Дый яна добрая цаца,— думаў не раз з кпліваю злосцю.— Усё выбірала, перабірала.— Селівон знаў, што да яе шмат хто з пліскаўскіх хлопцаў удаваўся.— Выбрала, чорт ведае, валацугу нейкага. Ах, Валуеў, Валуеў. Во табе — Валуеў. Нажыла ты з ім, нацешылася. Хлопца адной гадаваць прыйшлося...» І ўсё ж чуў, што акрамя злосці абзываецца заўсёды ў душы, калі бачыць Анюту, нешта яшчэ — балючае, шчымлівае. Ці то было шкадаванне, ці то быў сум па маладосці, па той адзінай у яго жыцці, хоць і горкай, але такой жаданай і ўжо незваротнай любові... Абзывалася ўсё яно ў душы, і Селівон хаваў вочы, баяўся сустрэцца позіркам з Анютаю. Асабліва тады, калі яна вот, як цяпер, усміхалася.

Ён амаль вобмацкам узяў у яе з рук кубак, абдзіраючы горла халодным сокам (і дзе яны яго толькі трымаюць?), хутка выпіў, перадаў кубак Дусі і ўталопіўся ў раскрытую на слупку канторскую кнігу. Хацеў аднаго: каб Анюта хутчэй пайшла з гэтым збаном у хату. Ведаў, што пры ёй не пасмее сказаць старому Багунцу ўсяго, што так даўно ўжо сказаць карцела.

Паўлюк стаяў усё гэтак жа воддаль, прысланіўшыся плячом да сцяны, моўчкі пазіраў, як паіла Анюта сокам Дразджюка і яго памагатых. «А то ж яны ўмарыліся, засмяглі чыста. Дагаджаць ім яшчэ тут...» Чуў, як варушыцца ў душы непрыязнасць да ўсіх траіх: «Начальнікі, іці іх макаўку. Шлындаюць ужо трэці тыдзень, ледзьве варушацца. У каго паснедаюць, у каго паабедаюць — упадабалі занятак. І ўсе ім стараюцца наравіць, а як жа — лішнюю мерку зямлі накінуць. Дажылі. І гэта туды ж,— глянуў, як налівала дачка Макуну сок, адвёў вочы.— Ага, яшчэ й на вячэру хацела запрасіць. Раней з работы прыляцела, бутэльку гарэлкі прыперла аднекуль. Праўда, цыкнуў толькі — сунялася, асела».

Анюта падышла да бацькі, паставіла каля сцяны збан.

— Ну што, напаіла? — Паўлюк глянуў на дачку недавольна, строга. Яна, як не пачула, спытала пра іншае:

— Ці паказалі ж хоць граніцу, колькі намералі?

Паўлюк махнуў рукою на Драздзюка:

— Лічаць яшчэ, не бачыш. Гэтулькі намералі, што ўтрох палічыць не могуць.

— Палічылі, не бойцеся,— Селівон пачуў, падняў вочы ад мітуслівых Дусіных лічбаў. На Анюту стараўся не глядзець. Гаварыў знарок паволі, стрымана, хаваючы злосць:

— Надворак у вас велькі. На халеру такі падворак — ажно дванаццаць сотак. І садок пятнаццаць. Вот ужо маеце дваццаць сем. І на полі, з абмежкамі, трыццаць. Адным словам, трэба рашаць...

— А ты ж яшчэ не ўсё замераў.— Паўлюк падышоў да плота.

— Як гэта? — Селівон здзіўлена нахмурыўся.

— А так,— у Паўлюковым голасе чулася прытоеная насмешка.— Мераць дак ужо мераць. Што ж ты, падворак, садок памераў, а лес пакінуў...

— Пры чым тут лес? — Селівонаў твар увачавідкі наліўся густою чырванню.— Лес калгасны.

— Дык яно, выходзіць, усё калгаснае. Нічога майго няма. І падворак, і садок, і соткі, і мы во з Анютаю, і Андрэйка, унук — усё. Праўду я кажу. Еўдакія? — Багунец хітра падміргнуў Дусі. Аграномка няўпэўнена паціснула плячыма, захіхікала.— Смеху тут няма, дзеўчына.— Паўлюк акінуў маладую, загарэлую аграномку пастражэлым позіркам. «Што з гліны злепленая,— падумаў сам сабе.— Хоць бы што ёй. Гойсае за Драздзюком з кнігаю гэтаю, і галава ёй ні па чым не баліць. Нехта за яе думае, рашае... Так во і прывыкаюць з маладых гадоў чужым розумам жыць».

— Няма тут смеху, дзеўчына,— паўтарыў ціха.— Відзіш, цяпло ўжо катора пара стаіць, трава высыпала, лес зазеляннеў, а зямля як ляжала аблогаю, так і ляжыць. А ты ж аграномка, павінна чуць зямлю, павінна дбаць пра яе...—

Паўлюк не спускаў з дзяўчыны пранізлівага позірку, і Дуся прыкметна пачырванела, апусціла вочы.

— А што я, дзядзька Паўлюк? Старшыня, праўленне рашылі...

Селівон недавольна крэкнуў, але змоўчаў.

— Ну, вот. Старшыня, праўленне! А ты для чаго, кніжку гэту насіць і палачкі ставіць? — Паўлюк на астатніх не глядзеў, гаварыў толькі да аднае Дусі.— Я, здэцца, каб мог, каб меў сілу — гной на сабе выцягнуў бы. Ласкі вашай не чакаў бы. І ў плуг сам запрогся б. Але ж плуга і таго няма... На поле не магу выходзіць, глядзець не магу — сэрца баліць. Мучыце вы і зямлю і людзей...

— Ну, ты, Павел Антонавіч, не гарачыся.— Макун абціраў бруднаю насоўкаю шырокі, чырвоны твар. Вочкі яго блішчэлі.— Нічога з тваёю зямлёю не станецца, паспееш. Ніхто не бядуе, і ты не перажывай.

— Як гэта не пераживай? Як гэта можна — жыць і ні за што не пераживаць? Яно ж само пераживаецца...

— А-а, вы, старыя, усе смешныя.— Антак махнуў рукою.— Мой бацька такі самы — зямля, зямля. Папрывыкалі вы некалі на сваіх гаспадарках, што зямля — гэта ўсё, самае большае багацце. Раней, можа, й было так, а цяпер — што гэта зямля, хто за яе трымаецца? Людзі вунь праўдамі і няпраўдамі пашпарты вырабляюць, бягуць ад зямлі вашай на край свету, у гарады едуць. І жывуць. Лепей за нас. Лягчэй.

— Я думаў, ты разумны, Антак, а ты — цьфу, гаварыць не хачу нават.— Паўлюк адвярнуўся.

Макун не пакрыўдзіўся, зарагатаў:

— Добра, Антонавіч, час пакажа, хто з нас разумны.

— А ўжо ж.

— Ладна, хопіць вам міцінгаваць.— Драздзюк ціскануў на лоб шапку, спадылба, нядобра зіркнуў на Паўлюка: — Пра лес, Багунец, не турбуйся, прыйдзе час — разбярэмся і з лесам.

— А ўжо ж, ты разбярэшся, гаспадар такі.

— А як ты думаў — гаспадар.— Драздзюк узяў каля плота «казу», закінуў на плячо. Адыходзячы, упершыню павярнуўся да Анюты: — Глядзі, каб заўтра кукурузу ў амбары забрала. Насенне. На полі — дзесяць сотак пад кукурузу займеце, астатнія — вашыя, што хочаце сейце.

— Дзякуй, благадзецель,— Паўлюк сцягнуў з галавы шапку, знарок нізка, здзекліва пакланіўся.

* * *

Раніцою, не паспеў Андрэй спусціцца ў лабараторыю, рэзка зазваніў тэлефон: яго выклікала дырэктарка...

Пятроўская стаяла каля акна, курыла. Не ўсміхнулася, як звычайна, не падала рукі. Моўчкі кіўнула ў адказ на прывітанне і паказала на крэсла.

Андрэй сеў. Маргарыта Вітольдаўна зноў павярнулася да акна, як бы тут жа забыла, што побач нехта ёсць, раз-пораз, моўчкі, нервова зацягвалася дымам. Попел з цыгарэты падаў на паліраваны стол.

Андрэй здагадаўся, што ў музеі нешта здарылася. Але што? І пры чым тут ён?

— Я хачу з вамі параіцца,— нечакана павярнулася да яго Пятроўская. Позірк яе светлых, ажно празрыстых вачэй быў спакойны і строгі.— У калектыве непрыемнасць. Толькі што прыйшла папера з міліцыі на Гапкіну і Падлужную — пілі ў парку.

Андрэй міжволі ўсміхнуўся, тут жа ўявіўшы маленькую плаксівую Гапкіну і цыбатую Падлужную ў аддзяленні міліцыі.

— Усё гэта не так смешна, як вам здаецца, Андрэй Апанасавіч,— недавольна нахмурылася Пятроўская.— Гапкіну і Падлужную мы занадта добра ведаем, каб здзівіцца нават такому абуральнаму факту. Але ўся справа ў тым, што ў музеі тут жа распаўзлася чутка, як быццам з імі была Харашынская... Вы разумееце?

Андрэй кіўнуў, хоць і не разумеў. «Ну, была, ну, і што? Запраста магла быць. Яна з імі часта ходзіць, сам не раз бачыў».

— Дык вось...

Пятроўская нарэшце адышла ад акна, цяжка апусцілася ў сваё дырэктарскае крэсла, прыціснула ў попельніцы недакурак.

— Дык вось...— паўтарыла раздражнёна, падняла на Андрэя вочы.— А Харашынская, як вы ведаеце, сакратар камсамольскай арганізацыі. І скажу вам больш: нядаўна ў райкоме я ставіла пытанне аб прыёме яе ў партыю. Вы разумееце?..

Андрэй здзіўлена глянуў на сваю «шафіню». Звыклая маска спакойнай ветлівасці сышла ў яе з твару; на ім праступалі цяпер толькі раздражнёнасць і злосць, непрыемна яго мянялі.

— У калектыве ведаюць пра мае добрыя адносіны да Харашынскай. І я іх не збіраюся хаваць. Яна — здольная, інтэлігентная, мілая дзяўчына. Актыўная камсамолка. Я ўпэўнена, што гэта плётка. Брудная плётка. Томачка з харошай, культурнай сям'і. Я даўно ведаю яе бацькоў, а таму дапусціць, каб яна ў адной кампаніі з гэтымі, выбачайце, Гапкамі...

У музеі Падлужную і Гапкіну за тое, што яны заўсёды і ўсюды хадзілі разам, звалі коратка — Гапкі. Цяпер, пачуўшы гэта ад свае карэктнай «шафіні», Андрэй зноў ледзьве стрымаў усмешку.

Ён не любіў Харашынскай. Яе акуратная, маленькая, як галубінае яечка, галоўка была вечна забіта агульнымі, прыдатнымі на ўсе выпадкі жыцця фразамі. На сходах яна гаварыла заўсёды шмат, нудна і правільна. І ўсё ў яе ішло гладка, як па аднойчы завучанаму экскурсу.

Звычайна большую палову дня Харашынская праседжвала ў дырэктарскім кабінеце, вырашала з Пятроўскай «важныя» пытанні музейнага жыцця або «тэрмінова» бегла па неадкладных справах у райком камсамола.

План па экскурсіях за Харашынскую выконвалі Гапкі. І ў парку папаліся Гапкі, а яна выкруцілася. Андрэй быў упэўнены, што Харашынская была разам з імі...

— Дык вось, Багунец,— перабіла Пятроўская Андрэевы думкі.— Вы адзіны з камсамольцаў музея, на каго я магу спадзявацца. Нам трэба правесці камсамольскі сход. Зараз я паклічу сакратара партарганізацыі, а таксама Харашынскую, і мы ўсе разам памяркуем, калі гэта лепш зрабіць. Можа, нават сёння, у крайнім выпадку — заўтра. Адкладваць нельга. Мы павінны даць ацэнку недастойным паводзінам камсамолак Гапкінай і Падлужнай і спыніць плёткі...— голас Пятроўскай памякчэў.— Вам трэба выступіць, Андрэй... Абараніць Тамару, калі што якое...

Андрэй здзіўлена прыўзняўся, упершыню за ўвесь час разгублена спытаў:

— Як гэта?

— А вы падумайце, як...

Пятроўская быццам і не заўважыла яго разгубленасці, рашуча паднялася з-за стала.

Колькі яна ўжо балбоча: гадзіну, болей?

Андрэй падняў вочы, уважліва глянуў на расчырванелую Харашынскую. Тэма іх сходу: «Маральны воблік камсамольца пачатку 80-х гадоў». Харашынская ў сваю прамову сцягнула ўсё, што магла: і БАМ, і палітыку, і новабудоўлі, і фермы... Толькі пра музей — ні слова. Пра тое, што вось так яны амаль штодня марнуюць час, што кожны дзень у іх сходы, канферэнцыі, паседжанні, сустрэчы, палітінфармацыі... І словы, словы, словы. І ўсім яны ўжо даўно абрыдлі, але ў кожнага выпрацаваўся свой, асабісты, імунітэт на гэту бясконцую гаварыльню.

Вунь, напрыклад, таўстун Вовік Шарко — Шарык, іхні заўгас. Ён і цяпер, як заўсёды, дрэмле, а можа, прыплюшчыўшы вочы, ціхенька сабе маракуе, як збыць імпарт. Вовік даўно займаецца фарцоўкаю. Усе пра гэта ведаюць. Ды ён і не хавае: спакойна перапрадае тут жа ў музеі набытае ў «Інтурысце»...

Вунь бледны, высокі, як тычка, Раланд Мышкун... Сагнуўся над сталом і нешта засяроджана чэрціць на лісце паперы, які Харашынская падсунула яму для пратакола. Ён так заўсёды чэрціць. Рол — інжынер. Закончыў політэхнічны і сядзіць у музеі на дзевяноста рублях, але таксама, як і Вовік, мае недзе нейкі прыварак.

Гапкі на сходах звычайна хіхікаюць, пішуць адна адной запісачкі: абмываюць косці супрацоўнікам або абмяркоўваюць планы на вечар. Сёння ім, праўда, не да таго. Сядзяць наструненыя, чакаюць, калі Харашынская возьмецца за іх «воблік»...

Уважліва слухаюць Томачку хіба сама Пятроўская і Стасюлевіч — сакратар партарганізацыі, ён жа вучоны сакратар музея, мужчына паважны і ўжо сталы.

— Ну, значыць, так...

Андрэй уздрыгнуў ад рэзкага, моцнага голасу Светкі Падлужнай. Нават не заўважыў, калі скончыла сваю прамову Харашынская і падхапілася Падлужная.

— Значыць, я ўсё па парадку.— Светка абвяла прысутных вясёлым позіркам маленькіх хітрых вачэй, як бы збіралася расказаць анекдот.— А калі што прапушчу, Гапкіна мяне дапоўніць. Праўда, Гапачка?

Гапкіна, не падымаючы ад стала вачэй, пакорліва кіўнула.

— Падлужная, не блазнуйце, вы на камсамольскім сходзе. Раскажыце таварышам, як дакаціліся да такой ганьбы. Навуковыя супрацоўніцы музея! Культурнай установы! І помніце, што сваімі паводзінамі вы ганьбіце не толькі сябе, але і ўсіх нас! — Голас у дырэктаркі задрыжэў, яна нервова махнула рукою: — Гаварыце...

— Маргарыта Вітольдаўна,— Светка пакрыўджана падціснула ярка нафарбаваныя вусны.— Вы што, сур'ёзна? Вы паверылі гэтай паперцы? Я ўсё зараз раскажу. Усё, як было...

Андрэй зірнуў на Харашынскую. Томачка сядзела апус-

ціўшы голаў і штосьці старанна запісвала. Пэўна, не давяраючы Ролу, узялася сама весці пратакол.

— Значыць, сядзелі мы з Гапкаю ў парку. Лавачкі амаль усе вольныя. Людзей мала: холадна яшчэ. Мы цыгарэты дасталі і толькі закурыць сабраліся, глядзім, мільтон на дарожцы з'явіўся. Як з-пад зямлі вырас. І адразу — да нас. Падышоў і «пад казырок»: так і так, гражданачкі, сядзець на халоднай скамейке врэдна. Думаем — жартуе. Закурылі, гігікаем: гэта чаму ж «врэдна»? А ён пачырванеў адразу — малады такі, вясковы наскрозь, бачна, што толькі пасля арміі ў сталіцу прыплыў...

— Падлужная, вы нам анекдоты не расказвайце. Сур'ёзна давайце, па сутнасці. Характарыстыка міліцыянера нас не цікавіць...— зноў нецярпліва перабіла Падлужную дырэктарка.

— Ну, тады я не знаю, што гаварыць.— Светка пакрыўджана змоўкла.

Андрэй узняў галаву. Падлужная стаяла ссутуліўшыся, разгублена моргала, неяк па-дзіцячы смешна, крыўдліва падціскала ярка нафарбаваныя вусны. Чамусьці ўпершыню яму стала шкада яе. За гэтай заўсёднай самаўпэўненасцю і крыклівай, моднай апраткаю раптам угледзеў у ёй звычайную бездапаможнасць і разгубленасць ужо далёка не маладой жанчыны. Падумаў, што сама ж недзе ў душы таксама, як і той міліцыянер, «наскрозь» вясковая. Па ўсім жа відаць, не схаваеш гэтага, як ні хавай. І Гапка гэта таксама. Куды падзелася ўся іх дзёрзкасць і фанабэрыя. Дык няўжо трэба абавязкова атрымаць пстрычку па носе, каб успомніць, хто ты і адкуль? А ты, ты сам хіба не такі? Андрэй апусціў галаву і ўжо не бачыў, як справілася Светка з сабою, як перамагла хвілінную разгубленасць і гаварыла далей як ні ў чым ні бывала.

— ...думаем, кліны забівае сяржант. А ён, бачу, утаропіўся пад куст і не міргне. Ажно мяне цікавасць узяла! Зірнула я і самлела. Вот паверыце? — Светка, як бы прося-

чы спагады, абвяла ўсіх вачыма: — Адразу ледзь не самлела...

— Дык самлела ўсё-такі ці не самлела? — не падымаючы галавы ад сваіх «чарцяжоў», здзекліва спытаў Раланд.

— Ну, Рол! Канешне, не зусім, не ў прамым сэнсе...— У голасе Падлужнай загучалі гуллівыя ноткі.

— Таварышы! — Стасюлевіч пастукаў алоўкам у стол, дакорліва зірнуў на Падлужную: — Што вы ўбачылі, Святлана Іванаўна? Працягвайце.

— Што ўбачыла? Бутэльку пад кусцікам. Пустую! Акуратненька так ляжыць, як бы хто яе знарок падлажыў. «Ркацытэлі». Сухое. Шчаўлік гэты нагнуўся, падняў бутэльку: «Яс-на, дзевачкі. З вамі ўсё ясна: ракам да цэлі, значыць». Гэта ён так «Ркацытэлі» расшыфраваў. І зноў «пад казырок», і без жартаў: «Распіваць спіртныя напіткі ў непалажаным месцы забаронена!»

Звіхнуцца можна. Мы да яго: якія напіткі, толькі цяпер бутэльку ўбачылі! А ён аж пасінеў ад злосці. Надзьмуўся ўвесь, напыжыўся і жалезным такім тонам на нас: «Прайдзёмце!»

Бачым, у яго рацыя на шыі целяпаецца... Усталі і папляліся з Гапкаю, як дурныя авечкі, у тое іх аддзяленне. Ну, і пачалося... Допыт нам учынілі. Лізку да слёз давялі. А я раззлавалася і сказала: і прозвішчы, і дзе робім. А што? Мы невінаватыя. Невінаватыя мы, Маргарыта Вітольдаўна! Нам во сёння Вовік сказаў, што ў іх, у міліцыі, таксама свой план ёсць. Ну, як у нас па экскурсіях...

— Ясна, сядайце, Падлужная. Вядзіце сход, Харашынская,— напомніў Стасюлевіч і зноў пастукаў алоўкам у стол.

Падлужная села. Паднялася Харашынская, абвяла ўсіх заклапочана-сур'ёзным позіркам:

— Хто хоча выказацца, таварышы? Нам трэба прыняць рашэнне, а таму...

— Якое рашэнне? — перабіў яе Вовік.— Каб міліцыя папрасіла прабачэння ў Падлужнай і Гапкінай?

Томачка прыкметна пачырванела, змоўчала.

— Што вы хочаце гэтым сказаць, Шарко? — у голасе Маргарыты Вітольдаўны пачулася раздражнёнасць.

— А тое, што ўсё гэта смешна.— Вовік хмыкнуў.

— Што смешна? Што камсамолкі музея п'юць у парку і трапляюць у міліцыю, так, Шарко? — Пятроўская паволі ўстала, недавольная, павярнулася да Вовіка: — Вы ведаеце, чым усё можа скончыцца?

Ціхенька захліпала за сваім сталом Гапкіна.

— Нічым гэта не скончыцца,— Вовік таксама ўстаў, прываліўся плячом да сцяны.— І ўрэшце: каму мы павінны верыць, Маргарыта Вітольдаўна, сваім дзяўчатам ці нейкаму мільтону?

— Што гэта за жаргон, Шарко? Што за «мільтон»? Вы дзе ўсе знаходзіцеся, таварышы камсамольцы?

Андрэй ніколі не бачыў свае «шафіні» ў такім гняўлівым настроі, ніколі не чуў ад яе такога крыку.

— Паслухаць толькі Падлужную... Сорам! Хіба можна паверыць, што яна працуе ў музеі, што яна не прыбіральшчыца, выбачайце, а старэйшы навуковы супрацоўнік... Я здзіўлена, таварышы. Я страшэнна здзіўлена і абурана.

Апошняе Пятроўская сказала нечакана ціха, амаль шэптам, і села.

— І ўсё ж прабачце, Маргарыта Вітольдаўна, мне хацелася б ведаць, што думае аб усім гэтым сакратар нашай камсамольскай арганізацыі.

Спакойны Вовікаў голас прымусіў усіх падняць галовы. Цяпер усе глядзелі на Харашынскую.

— Вы ж, Тамара, лепш за нас дзяўчат ведаеце, сябруеце з імі.

Харашынская здзіўлена ўскінула на Вовіка густа падсіненыя вееі:

— Вы, Шарко, узяліся выступаць, дык і выступайце. Гэта камсамольскі сход, а не сяброўская вечарына. Я запісваю ваша выступленне, ясна?

— Тады ў мяне ўсё.

Вовік сеў. Наступіла маўчанне.

— Харашынская, вядзіце сход,— зноў напомніў Стасюлевіч.— Таварышы, яшчэ раз прашу вас аднесціся да ўсяго сур'ёзна. Гэта не жарты. Прыйшла афіцыйная папера, і нам трэба на яе адрэагаваць. Маргарыта Вітольдаўна мае рацыю: сход павінен вынесці сваё рашэнне.— Хто хоча выступіць? Раланд? Андрэй?

Андрэй адчуў, што Харашынская глядзіць на яго, і не падымаў галавы. Увогуле яму было нядобра і прыкра. Захацелася ўстаць і сказаць усё, што думаў. Сказаць, што ўсё гэта глупства, што кожны раз яны знарок, для галачкі, прыдумваюць сабе гэтыя зборы-разборы і без патрэбы марнуюць час. Кожны раз на гэтых засядалаўках яму здаецца, што спынілася жыццё. Сказаць, як абрыдла гэта ўсё, бо ні ён, ніхто іншы не верыць правільным, прыгожым словам Харашынскай, бо, урэшце, ён упэўнены, што Гапкі ні ў чым не вінаваты, што... Андрэй узняў вочы. Харашынская стаяла спакойная і як заўсёды ўпэўненая, і здалося, чуючы яго думкі, іранічна ўсміхалася. Ён хутка адвёў позірк, адмоўна хітнуў галавою.

Слова ўзяла Пятроўская. Што-што, а гаварыць Маргарыта Вітольдаўна ўмела. Гаварыла сваім звыклым, роўным голасам, і ўжо цяжка было паверыць, што дзесяць хвілін назад яна магла так злосна, віскліва крычаць. Гаварыла натхнёна і доўга. Шчодра цытавала класікаў і прыводзіла прыклады са свайго камсамольскага юнацтва...

Нарэшце скончыла і вынесла катэгарычна-адміністрацыйны прысуд: за недастойныя паводзіны аб'явіць камсамолкам Падлужнай і Гапкінай строгія вымовы з занясеннем ва ўліковыя карткі.

Знарок ці не, але рашэнне гэта паставіць на галасаванне забыліся. Усім усё надакучыла, усе заспяшаліся — канчаўся працоўны дзень.

...У парку гаркава пахлі таполі. На ўжо чыстых ад снегу клумбах, там, дзе днём прыгравала сонца, вытыркаліся бледна-зялёныя парасткі зімовых кветак. Па-веснавому ўзбуджана крякалі недзе на дальняй алеі каўкі. У цёмных

кронах старых ліпаў настойліва-весела ценькалі нябачныя сініцы. Ва ўсім чулася блізкая вясна. Нават у сіняватым, яшчэ азырна-халодным тумане, што наплываў у парк ад блізкай ракі.

Андрэй любіў прадвесне, гэтае абуджэнне прыроды, калі іначыўся ўвесь свет. Іначылася і сама душа, прагла дабра і ачышчэння.

Ён доўга, да самага змяркання, блукаў у парку. Хацелася адзіноты, і думка пра вяртанне на кватэру да Клаўдзі Пятроўны здавалася невыноснай. На душы ўсё яшчэ стаяла прыкрасць ад нядаўняга сходу, ад усяе гэтай пустой балбатні і гульні ў прынцыповасць, ад свае і чужой маладушнасці...

І ўсё ж тут, у парку, было лягчэй. Дрэвы супакойвалі, вярталі душы раўнавагу, напаміналі аб нечым больш важным, істотным.

Андрэй падышоў да ракі, абапёрся на халодны каменны парапет. Вада ў рацэ была цёмная, зверху льснілася разлітаю мазутаю, круціла, несла ў сваёй глыбіні бруд і смецце, выбіваючы наверх трэскі і абрэзкі дошак. Потым на нейкі час здавалася падманна чыстаю і — зноў блішчэла мазутаю, зноў выплёсквала і не магла выплеснуць з сябе ўсю тую брыдоту, якою гадамі завальваў яе горад...

Андрэй прыгадаў ліст Тамашэвіча: «Не дае мне жыць думка, што такія гора-гаспадары, як вядомы табе Бучок, рашаюць лёс нашай зямлі, яе лясоў і рэк, яе людзей. Не знаю, што можаш ты, але ж ты малады, Андрэй...»

«Так, я малады. Але што я магу? Што?» Цяпер у яго душы не было раздражнёнасці, як тады, калі чытаў ліст, а толькі разгубленасць. Стаяў доўга, адзінокі, азяблы, знобка туліў галаву ў высока абстаўлены каўнер балоневай курткі. «Няўжо й праўда, магу толькі вот так стаяць, спёршыся на гэты халодны парапет, глядзець, як плыве мёртвая ўжо рака, слухаць, як цяжка дыхае, здушаны смогам, горад, і ўсё?»

«А што ты можаш яшчэ, ты — звычайны музейны фа-

тограф? Хіба што-небудзь залежыць ад цябе, акрамя ўчасна аформленай выставы, акрамя дасканала зробленых копій для экспазіцыі і астатняй музейнай драбязы?»

«Праца ў музеі, як і ўсякая чэсная праца,— гэта добра,— пярэчыў яму ў сваім лісце стары настаўнік,— але думаю, што кожны павінен дбаць пра нешта большае...»

Пра што дбаць?

«А хоць бы пра памяць,— нечакана сказаў Андрэю яго ўнутраны голас.— Ты ж забыў усё і ўсіх: і лес, і дзеда, і нават маці...»

Андрэй падумаў, што, і праўда, даўнавата не быў дома. Аднак работы асаблівай у вёсцы пакуль няма, чаго ездзіць без патрэбы?..

І ўсё ж адчуваў, што душэўны спакой яго парушыўся і адбылося гэта нават не цяпер, а яшчэ раней, калі чытаў Тамашэвічаў ліст і глядзеў здымкі дзедавага лесу. Цяпер усё тое як бы наблізілася, здавалася не менш рэальным, чым яго сённяшняе жыццё.

Андрэй упершыню, здаецца, зразумеў, што ўсё ў жыцці звязана між сабою: ад таго, што было некалі, нават у маленстве, і што дасюль здавалася неістотным, залежала, аказваецца, усё ў яго сённяшнім дні. І нават тое, што стаяў ён цяпер вот тут, у гэтым сталічным парку, адзінокі, азяблы, не маючы, па сутнасці, куды пайсці, упершыню адчуваючы свае непрыкаянасць і непатрэбнасць у гэтым горадзе.

Прыгадаліся сябра і аднакласнік Мішка Крывец, іх спрэчка, ледзь не сварка ў апошні Андрэеў прыезд у Пліску.

Яны тады сядзелі за сталом удвух. Маці толькі сабрала ім перакусіць і пайшла да суседзяў.

Быў ужо вечар. Па тэлевізары ішла праграма «Час», але яны слухалі больш адзін аднаго.

Андрэй тады захацеў чым-небудзь здзівіць Мішку і дзеля жарту дастаў са шкафчыка маленькі пузаценькі графінчык.

Наліў па кроплі ў чаркі залацістай, што ажно іскрылася на святле, вадкасці.

— Давай, таварыш аграном, адгадай, што гэта за пітво.

Мішка асцярожна, як баючыся расціснуць, узяў тонкую чарку на доўгай ножцы, спачатку прыскаліў вока, разглядзеў яе на святло, потым, як журавель, апусціў нос у чарку і доўга прынюхваўся, нарэшце паспрабаваў на смак і, не чакаючы напамінку, кульнуў усю адразу. Сядзеў, цмокаў языком, няўцямна пазіраў на Андрэя.

— Во сяло, хто ж так п'е? — Андрэй расчаравана паківаў галавою.— Эх ты, дэгустатар, гэтак жа век не распазнаеш. Ну, дык?..

— А халера яго ведае,— Мішка ніякавата паціснуў плячыма.— Не хачу цябе пакрыўдзіць, але нечым, як для мяне, дык вельмі знаёмым дыхнула.

— Ну-ну, цікава. Чым жа, калі не сакрэт?

— Які там сакрэт. Усё той жа высокаразвітай хіміяй. Калі хочаш, магу і больш дакладна...

— Ну, во, я ж і кажу — сяло.— Андрэю аж дух перахапіла.— Гэта ж віно матка рабіла па вельмі старым рэцэпце, гэта ж віно калісь шляхта піла...

Не зважаючы на Андрэеў крыўдлівы тон, Мішка хітра прыскаліў левае вока і гэтак, як глядзеў на віно ў чарцы, глянуў на Андрэя:

— Ну, і з чаго ж маці рабіла гэта віно?

— З васількоў, таварыш аграном! З васількоў, ясна табе?

— Ясна, чаму ж. Я ж і кажу, аміячком пахне. Ну, што ты глядзіш на мяне? Дзе васількі маці збірала? На калгасным полі, у жыце ці каля жыта, так?

— Ну, дапусцім...— Андрэй нерашуча адставіў сваю некранутую чарку ўбок, разгублена глянуў на Крыўца.

Той заўважыў гэту Андрэеву разгубленасць, зарагатаў, высока закідваючы тонкую шыю з вострым кадыкам:

— Ды пі ты, пі, не бойся. Хлеб жа ясі... Рамантык сталічны.— Віно-о... Па старым рэцэ-эпце... Шляхта піла,— усё яшчэ смеючыся, перадражніў Андрэя.— Шляхта,

дарагі мой, віно рабіла трохі з іншых васількоў, і ўвогуле...

Андрэй таксама ўсміхнуўся, махнуў рукою:

— Ладна, хацеў здзівіць цябе — не ўдалося...

І, закусваючы духмянаю бабкаю, сур'ёзна глянуў на Мішку, спытаў:

— Цяжка табе прыходзіцца з гэтаю высокаразвітаю хіміяй?

— Цяжка з ёю, цяжка без яе, горш другое,— таксама сур'ёзна адказаў Крывец.— Другое, брат, забівае, жыць не дае: залежнасць. Поўная залежнасць.

— А ты як хацеў, сам сабою кіраваць? Табою нехта і ты некім. Усюды так.

— Ды не пра тое я,— раздражнёна перабіў Мішка.— Я пра тое, што нейкі там крук з раёна ці вобласці, седзячы за дваццаць, а часам і за сто кіламетраў у сваім кабінеце, дыктуе табе, дзе, што, якою парою сеяць, які кавалак засяваць раней, а які пазней, якія ўгнаенні ўносіць і колькі. Як бы ён гэту зямлю лепей за мяне ведае...

Мішка той вечар шмат гаварыў пра свае праблемы, і тады, помніцца, Андрэй спачуваў яму і ўсё паўтараў: «Цяжка табе прыходзіцца. Цяжка...» Цяпер жа, успомніўшы сябра, нечакана пазайздросціў яму. Як бы там ні было, а ён справаю займаецца, на сваёй зямлі, сярод сваіх людзей. А тут... Сядзі гадзінамі і вырашай: пілі Гапкі ў парку віно ці не пілі. Як бы ад гэтага залежыць што. Адчуў, як зноў плыве ў душу прыкрасць, асядае там, бы гэты халодны азырны туман, і робіцца яму яшчэ больш непрытульна і пагана.

Не мог прыпомніць, як яны тады счубіліся сварыцца. Усё ж гаварылі спачатку пра зямлю, пра хімію. Мішка, урэшце рассмакаваўшы, пахваліў тое матчына віно:

— А шляхта, знаеш, не дурная была: харошае віно. Васількамі ўсё ж пахне, як ні круці.

— Што, і хімія ні пры чым? — смеючыся, спытаў Андрэй.

— Халера яе, гэту хімію. Іншы раз галаву схіляеш перад ёю, каб гэта ўсё з розумам, каб асцярожна, у меру.

А так... Як сыпнуць, бывае. Дзе густа, дзе пуста. І хоць трэсні, за ўсімі не ўсочыш. А што значыць — сыпнуць лішняе, перакарміць? Усё ў сцябло прэ: жыта як лес стаіць, а колас дробны, пусты. Гэта ж, як чалавека, кармі лішне — закорміш: распухне, тлушчам заплыве, які з яго толк, правільна?

Андрэй зноў тады засмяяўся:

— Ну, ты параўнаў. Хаця, яно, канешне...

— Вот табе й канешне. Ты згаджаешся, а другому — хоць страляй, не дакажаш. Раз начальнік, значыць, разумнейшы за цябе. І самае страшнае, што, «кормячы» так зямлю, мы ўжо скалечылі яе, разрушылі гумус. Я, калі ў інстытуце вучыўся, не так усё гэта ўяўляў. Ты думаеш, на чырвоны дыплом дзеля гонару цягнуў? Ні чарта! Думаў, вот вярнуся да сябе ў «Перадавік» і ўсё перайначу, думаў, што веды мае патрэбны будуць, што ад агранома на зямлі ўсё залежыць. А прыехаў — пяты год кручуся і ўсё аніяк толкам не пайму, што ж тут ад мяне залежыць. Адно адчуваю, што сам ад кожнага залежу...

— А ты не згаджайся, сваё даказвай!

— Разумны ты, брат. Я і сам спачатку так думаў.

— Ну, дык што, лапы ўгору?

— А гэта мы яшчэ паглядзім! — Мішка цяжка ссунуў густыя цёмныя бровы.

Андрэй ведаў, што гэтак ён хмурыўся заўсёды ў маленстве, калі збіраўся з кімсьці пабіцца або проста злаваў.

Яны тады доўга маўчалі. Потым Андрэй перахапіў Мішкаў скептычны позірк: той ужо колькі разоў зіркаў сваім цыганістым вокам на этажэрку, дзе вісеў фотаапарат. Андрэй здагадваўся, пра што Мішка хоча спытаць. Ён заўсёды так пытаў: «Ну, й чым ты, майстра-ламайстра, цяпер плёнку заляпаў?»

Але той раз Мішка пачаў здаля:

— Я вот усё пра сябе ды пра сябе, а ты маўчыш. Расказаў бы, як ды што, як там сталіца, што чуваць?

— А што чуваць? Тое, што й усюды.

— Ды ўжо ж...

Мішка памаўчаў, зноў насупіў бровы:

— Я вот думаю, ты прабач, канешне: на халеру ты штогод адно і тое ж здымаеш? Тут жа нічога не мяняецца: тая ж самая Пліска, тыя ж палі, чыгунка. А ты штогод кляпаеш і кляпаеш. Каму гэта трэба?

Андрэй, помніцца, маўчаў.

— Ну, што? Дзе тыя здымкі твае? Хоць бы глянуць даў...

— А што табе глядзець? Ты ўсё ў натуры бачыш.

— Шмат чаго ўжо не бачу...

— Ну, вот. Сам сабе пярэчыш. Толькі што казаў: нічога не мяняецца.

— Казаў, казаў,— невядома чаго Мішка пачаў тады злаваць.

— А ты не злуй,— Андрэй адчуў, як і сам пачынае заводзіцца.— Сядзіце тут і крышыце ўсё падрад. Што раз прыедзеш, то «змены» знойдзеш: там балотца перааралі, там лясок выдралі, там ручаёк у канаву launched...

— А ты, бедны, не паспеў увекавечыць яе, так?

— Не паспеў...

— Ах, бяда. Во гэта бяда! А каб паспеў, то што? Што змянілася б на свеце? Каму лягчэй ад таго стала б?

— А вам усе мала — зямлі мала? Цімафееўкі гэтай мала, што гніе кожны год, пад нагамі валяецца?

— Не крычы, філосаф! Без мяне пляц гэты пляжылі. Хлопчыкі-практыканты, тыя, што ад калгаса нашага ў сельгасінстытуце вучацца. От цяпер яны практыку ў нас праходзяць...

— Хар-рошая практыка,— Андрэй скрыгатнуў зубамі,— я б за такую практыку...

— Што б ты? А што ты... Дзіўлюся я з цябе, Андрэй...— Мішка раптам паспакайнеў, у хрыплаватым голасе пачуліся

стома і абыякавасць.— Ты вот вершы пісаў, на журфак паступаў, цяпер фатографам недзе там працуеш...

— Не недзе, а ў музеі!

— Ну, адзін чорт. Усё роўна фатографам, так?

— Ну, так. І што далей?

І тады Мішка сказаў тое, што найбольш закранула Андрэя:

— А тое, дарагі сябра, што фатографам у тым тваім музеі мог працаваць хто заўгодна — які-небудзь сталічны хлюст, выбачай, а во тут, у гэтай во самай Плісцы, за якую ты як быццам перажываеш, тым жа загадчыкам клуба, кінамеханікам, проста механікам і яшчэ, і яшчэ, і яшчэ — павінен працаваць ты, ты — Андрэй Багунец. А не алкаш Цімакоў, які прайшоў паўсвету і якому на ўсе Пліскі і на ўсе іх Юльчыны і Вульчыны сялібы, на ўсе дрэўцы-кусцікі глыбока напляваць, панятна? Ён сёння тут, заўтра там, панятна?

— Ты загнуў! Ачамярэў, ці што? — Андрэй ажно з крэсла прыўстаў.— Выходзіць, што адзін ты на сваім месцы, а ўсе мы: і Антоська Рубец на БАМе, і Віцька Ігнатаў недзе на граніцы, і брацельнік твой, Раман, на заводзе — усе мы за некага, не за сябе робім?

— А ты што думаеш? Так яно і ёсць.— Мішка гаварыў спакайней, але бровы не пераставаў хмурыць, а значыць, усё яшчэ злаваў.— Я вот іншы раз думаю пра ўсё, і такая крыўда разбірае: як бы тут, во тут во,— ён грукнуў ботам аб падлогу,— яно само ўсё павінна рабіцца, кожны чамусьці думае, што тут і без яго абыдзецца, што там недзе, далей ад хаты, ён больш патрэбны.

Мішка прашыў Андрэя гарачым позіркам цёмных вачэй, толькі сінявата бліснулі бялкі.

— Ды не халеры вы не думаеце. Вам абы вырвацца, абы далей, абы ў горад. А там — хоць фатографам, хоць падмятайлам якім...

— Т-ты давай лягчэй, не загібай, а то і я загнуць магу. Што табе фатограф? Чым табе не падабаецца, ты што думаеш, гэта лёгка і проста?

—А цярпець не магу, калі чалавек праз шкельца на свет глядзіць, ненавіджу, калі адным вокам свет бачыць, а другое прыжмурана пастаянна. Шмат вас цяпер такіх — фатографаў!..

У Андрэя перад вачыма заскакалі чырвоныя мухі. Ён адчуў тады, як міжволі сціснуліся кулакі, і, ужо ледзь стрымліваючы сябе, засіпеў ціхім ад хвалявання голасам:

— Т-ты, конюх, ці ведаеш ты, што такое сапраўдны фатограф? Гэта ж мастак! Гэта ж... Ці бачыў ты хоць раз сапраўдныя мастацкія здымкі?

— Ды не пра тое я,— Мішка раптам абмяк, голас яго зрабіўся ціхі і абыякавы. Як бы й не пачуў ён гэтага абразлівага Андрэевага тону і слоў яго.— Не пра тое я... Не паняў ты ні халеры, мастак! А таму не паняў, што фатограф. Убачыў — зафіксаваў. А каб што змяніць, каб умяшацца, каб не даць, спыніць, каб на дрот калючы пайсці, а сваё адстаяць — няма вас. Вот пра што я, паняў? Усё чуеце, усё бачыце, усё разумееце, і што? Што далей, я пытаю? Дый бычыце вы толькі тое, што хочаце бачыць, астатняе вас не цікавіць.

Гэта было ўжо занадта... Апошняе Андрэя забрала за жывое, і чырвоныя мухі перад вачыма зліліся ў адну вялізную пляму, якая заслала свет. Ён рэзка падняўся, ажно зазвінеў на стале посуд.

Паволі ўстаў са свайго крэсла і Крывец.

Гарачы туман схлынуў у Андрэя з вачэй. Мішка стаяў перад ім, як хлапчук, невысокі, шчуплы. Пад вачыма на бледным стомленым твары рэзка абазначыліся цёмныя кругі. Андрэй тут жа адчуў няёмкасць перад сябрам: запрасіў, называецца, у госці. І ўжо злуючы на самога сябе, праз зубы выціснуў:

— Ладна. Хопіць. Пагаварылі.

— Няўжо? — Мішка здзекліва хмыкнуў.— А я думаў, з цэлымі рэбрамі адсюль не выйду. Што ж ты так слаба?

— Сказаў, хопіць! — Андрэй апусціў галаву, асунуўся на крэсла.

— Ды не ўжо, давай, чаго ты! Цікава нават: даўно ні з кім не біўся.

Андрэй змоўчаў.

У хаце стаяла напятая цішыня. Мішка часта, адрывіста дыхаў, стаяў, упёршыся пучкамі ў стол, падаўшыся наперад, як усё роўна чакаючы тае хвіліны, калі можна будзе кінуцца ў бойку.

Андрэй сядзеў, усё гэтак жа нізка да стала апусціўшы галаву, і слухаў, як за спінаю шорхае па акне галінкаю бэзу вецер.

Доўга маўчалі. Нарэшце рыпнула крэсла, Мішка таксама сеў, уздыхнуў:

— Эх ты, Андрэй Апанасавіч! Крыўдлівы стаў, як баба, паняць не хочаш. Думаеш, я цябе аднаго віню. Не, брат.

— Ты вініш усіх, акрамя сябе. Адзін ты ў нас герой, святы чалавек. Думаеш, калі вярнуўся ў вёску, ажаніўся, дзяцей напладзіў, дык ужо й свет уратаваў?

— Не думаю я так, Андрэй. І сябе, як і ўсіх, віню аднолькава. Усе мы вінаваты, панімаеш? Усе. Кожны за сваё, кожны па-свойму. І калі кажу — фатограф, то не прафесію тваю зневажаю, паймі ты. Усе мы ў нечым фатографы. Усе толькі фіксуем тое, што бачым, усе толькі наракаць, гаварыць умеем, а перайначыць, змяніць штонебудзь не можам. І не хочам. Няўжо не паняў ты?

Тады Андрэй сапраўды «не паняў» ці, дакладней, не захацеў паняць. Цяпер жа неяк адразу і вельмі лёгка ўбачыў, колькі горкай праўды было ў Мішкавых словах. І найбольш у дачыненні да яго, Андрэя.

— Усё на нейкага дзядзьку спадзяёмся,— з сумам гаварыў Мішка,— указаў зверху чакаем. Чужыя мы і гэтай зямлі, і ўсяму гэтаму... Я знаю, адчуваю ўсё, а паняць, чаму так — не магу. Чаму так сталася, што нават жывучы тут, на зямлі, працуючы на ёй, людзі абыякавыя да яе зрабіліся? Я ўжо не кажу пра маладых. Нават старэйшыя. Летась вунь у жніво Макуна запыніў на дарозе. Пажылы ж ужо чалавек, скора на пенсію. Шафёрам робіць. Дык

вот збожжа вазілі. І ён таксама. Еду раз на матацыкле за ім, гляджу, шчыліна паміж бартамі, як руку прасунуць, і збожжа цурчыць у пясок, а ён пыліць, хоць бы што. Я абагнаў, спыніў. Кажу, што ж гэта вы, дзядзька, барты як след закрыць не можаце, збожжа сыплецца? Дык ён, падла, з машыны нават не вылез, не паглядзеў нават. Не перажывай, кажа, усё не высыплецца. І на газ націснуў...

Яны доўга маўчалі. Потым Мішка ўзняў галаву, паглядзеў на Андрэя і, здалося, без усялякай сувязі раптам сказаў:

— Я часта дзеда твайго ўспамінаю, Паўлюка. Дый усіх старых. Як яны за зямлю трымаліся! Ого-о-о... І куды што падзелася?

Сапраўды, куды што падзелася? А не магло ж яно проста так некуды падзецца: знікнуць, і ўсё. Не магло.

Андрэй ужо каторы дзень, пасля таго як атрымаў Тамашэвічавы здымкі дзедавага лесу, думае пра гэта. І ўспамінаючы, доўга не можа прагнаць з душы даўкага пякучага болю.

* * *

— Я табе, мілая мая, акуратна яго разбяру. Ніхто так не разбярэ! Колькі я гэтага свінства за свой век перавёў — не злічыць.

Лукаш Багунец з закасанымі па локці рукавамі, у запэцканым у кроў фартусе разбіраў у Анюты парсюка.

Быў ён вельмі падобны да свайго брата-нябожчыка, Паўлюка. Гэтакі ж чарнявы, шырокі ў косці, але значна ніжэйшы ростам. Меў гэтакія ж карыя, глыбока пасаджаныя вочы, гэтакія ж густыя, напусклівыя бровы, такі ж вялікаваты, з прыкметнаю гарбінкаю нос і моцны, шырокі падбародак. На свае семдзесят з гакам выглядаў яшчэ ўсё даволі крэпкім, рухавым мужчынам. І Анюта, раз-пораз пазіраючы на дзядзьку, у душы цешылася, што ён такі яшчэ дужы, так упэўнена, лоўка ходзяць каля работы яго вялікія, з





цёмнымі пукатымі шнарамі жылаў, рукі. Міжволі так во, пазіраючы на Лукаша, успамінала бацьку і думала, што хоць і падобныя яны, здаецца, ва ўсім, але ж, разам з тым, зусім розныя. Лукаш гаваркі, усмешлівы, рухавы. Бацька ж быў больш маўклівы, стрыманы. Рабіў усё паволі і дакладна, і на твары яго, на ўсёй высокай, трохі ссутуленай постаці ляжаў вечны адбітак нейкай глыбокай задуменнасці ці, можа, нейкага вечнага клопату, якога ён так і не змог пазбыцца. Цяпер, успомніўшы бацьку, адразу адчула, як балюча сціснулася ў грудзях сэрца і на вочы навярнуліся слёзы. Як праз туман убачыла, што дзядзька лоўка ўжо выразае «акенца» ў парсюковай грудзіне, хуценька шарганула рукою па твары.

Лукаш адкінуў на лаву пахкі кусок грудзіны, што ажно слюдзяна блішчэў тлушчам, павярнуў галаву да Анюты:

— Дзе ты там, дачка? Дай якую пасуду на кроў.

Анюта падала шклянку, збан, прыпынілася збоку.

Ён зіркнуў на яе, усміхнуўся ў пракураныя, радкаватыя вусы:

— Раней, бывала, пад каляды або во, як цяпер, перад вялікаднем, як пайду з хаты — тыдні два не прыпыняюся. І наеты, і напіты, і жонка з дзецьмі па скварцы не бядуюць. А сённяшнім часам свайго заколеш і таго няма каму есці. Які інтэрас ісці каму калоць?

Зноў засмяяўся, запусціў шклянку ў прарэзанае «акенца» і зараз жа дастаў яе, паўнюткую цёмна-чырвонай юхі. Над шклянкаю і над яго запэцканаю рукою цёпла курэлася саладкава-прэсная пара.

— Вот глядзі, колькі калю свіней, першая шклянка крыві — мая.

Анюта не паспела ахнуць, як дзядзька хутка апаражніў шклянку, выцер тыльнаю стараною шырокай далоні запэцканыя ў кроў вусы. Змеціў, як Анюта гідліва скрывілася, весела запытаў:

— Не прывыкнеш ніяк, гадзішся? Не гадзься. Гэта на пользу — цёплая кроў. Сілу дае. Жыць доўга буду.

3 — 1305

— А няхай яе, і праўда, гаджуся. Тата, здэцца, ніколі не піў.

— Не піў, то й памёр без пары.

— Або ад гэтага што залежыць. Лес яго ў магілу звёў.

— Э-э,— Лукаш крэкнуў, распростаўся.— Я табе скажу, дачка, няма горшай халеры, як наглая смерць. І няма горшай бяды, як бацькам дзіця сваё хаваць. Дзецям — бацькоў то йшчэ сяк-так. Гэта я во пра Драздзюкоў здумаў, пра Галінага малога. Во дзе крыўда. Толькі нарадзіўся чалавек, толькі з цемры на свет выйшаў, на табе — зноў цемра.

— Не гавары, дзядзечка, я ўжо якую ноч спаць не магу. Толькі засынаць пачну, крык Галін чую. Здэцца, во на падворку, пад самым акном. Месца сабе не знаходжу...

Анюта адышлася да пліты, адвярнулася, чуючы, як наварочваюцца на вочы слёзы.

Лукаш узяў з прыпека брусок, шаргануў пару разоў аб яго нажом, ізноў павярнуўся да парсюка і ўжо тады толькі загаварыў:

— А бацька што ж... Таксама жыць мог, паўвечны пайшоў. Але ты не бядуй. Не бядуй. Не вернеш.

Анюта ўнесла з сяней начоўкі, падставіла да лавы. У начоўкі праз які час выкінулі цёплыя сінявата-ліловыя кішкі, пацягнутыя белаю павучынаю тлушчу.

— Не вернеш...— сказала глуха, як бы сама сабе, і ўсхліпнула.— Колькі ўжо гадочкаў прайшло, а не магу прывыкнуць. Куды ні гляну — сэрца заходзіцца. Усё яшчэ яго праца мне служыць: у гумне яго грабельцы, цапы вісяць, на гарышчы — кошыкі, цэлая гара, на ўсё жыццё мне назапасіў, у каморы — кадушачкі, цабэркі — усё яго работа.

— Не плач, дзеткі. Нічога не парадзіш...

— Не плачу, дзядзечка... Бывала, вясною тою, як яго пахавалі, выйду за браму, гляну — пнічкі бярозавыя і тыя плачуць. Ружовыя пні скрозь, і сок плыве, плыве... Душа млела...

— Ну, не трэба, не трэба. Не дадавай сабе жалю. Лепей

во скажы мне, як сала раскроіць: гэтак ці гэтак? — Лукаш шаргануў канцом нажа па расхіленых раўчовінаю свіных плячах.— У чым саліць будзеш, у скрыні ці ў кубельцы, каб не кроіць на кускі лішне?

— У кубельцы.

— Ну, во. Значыць, так будзем рэзаць. А сала нічога, на пальцы чатыры будзе. Прыедзе твой мужчына з горада, будзе мець за што ўчапіцца.

Выцер анучкаю шырокае лязо нажа, павярнуўся да Анюты:

— От, скажы ты мне такую штуку. Я ўсё часта сам сабе думаю: ён жа ж, як малы быў, Андрэй твой, як вы тады ў той стэп паехалі, ты ж расказвала, як ён там захварэў, ледзь не памёр. Усё лес яму сніўся, і доктар сказаў дахаты яго везці. Дык от, скажы, чаму ўсё так змянілася? Як толькі вырас, то сам, па сваёй ахвоце з хаты паехаў і хоць бы што, жыве, не хварэе. Праўда, лесу няма. Але ж хата родная ёсць, матка адна...

Лукаш хітра прыжмурыўся, зірнуў на Анюту.

Анюта апусціла галаву, знарок пашукала нешта на прыпеку, нехаця адказала:

— Хто яго знае, як яму там прыходзіцца.

— А ўжо ж, прыходзіцца. Во прыедзе, сумку свежыны наладуеш, і паедзе. Лёгка і добра...

Лукаш недавольна гмыкнуў, піхнуў дзверы ў камору, але тут жа, як што ўспомніўшы, прыпыніўся на парожку.

— Ці ведаеш ты, як бацька ў сваты ездзіў? — спытаў нечакана зусім пра іншае і зарагатаў.

— Калі? — Анюта здзіўлена павярнулася ад пліты, дзе ўжо кіпела і пахла ў гаршку свежаніна.

— Ага, вот і не ведаеш, што мачыху магла мець за сябе маладзейшую.

— Што вы кажаце? — Анюта адкрыла гаршчок на пліце і з накрыўкаю ў руках падышла да лавы.

Лукаш хітра пазіраў на яе, усміхаўся.

— А я думаў, ты ведаеш пра гэта.

3*

— Нічагуткі. Вы, пэўна, жартуеце? Калі ж гэта ён мог ездзіць у тыя сваты?

— Калі? Ну, вот тады якраз, як ты з хлопцам да Апанаса свайго, на цаліну, паехала...

— Што вы кажаце? — Анюта ажно на краёк лавы прысела.

— Што я кажу? Тое, што было, тое й кажу. Ты, дачка, жыла і бацькі свайго не ведала...

Лукаш зноў зарагатаў.

— Пачакай трохі. Во скварку спарадкую, сядзем палуднаваць, я табе раскажу. Пэўна, брат мне даруе, што праз столькі гадоў сакрэты яго раскрываю. Хачу павесяліць цябе трохі.

...— Ну, скажу я табе, як вы паехалі, цяжка яму было. Я яго пару разоў у лесе спаткаў. Сам не свой ходзіць, з дрэвамі размаўляе. За тыдзень учарнеў, асунуўся. Андрэйку дужа шкадаваў. Змарнуе, кажа, хлопца. Павезла ў свет. Вырасце ён там і забудзе бацькаўшчыну. А гэта ўжо, лічы, няма чалавека.

Ну, я яму і так і гэтак давай угаворваць. Кажу, цяжка табе, Паўлючок, бо адзін ты ў хаце: ні загаварыць да каго, ні абмыць каму, ні зварыць.

Спачатку ён і гаварыць не даваўся: «Нічога няцяжка, я ўсё сам магу...»

А потым неяк усё ж прызнаўся: дрэнна ў хаце без гаспадыні. Пачакай, кажу, апытаю дзе па вёсках кабету харошую, упраўную, ды пасватаем. Што там надта. А ён памяўся, памяўся і просіць: «Апытай, Лукаш, але каб не старую. Старыя няхай ужо за Пясэцкага замуж ідуць, а мне такую, каб кроў маю трохі разагрэла...»

Лукаш зірнуў на Анюту, зарагатаў.

— Во табе бацька, а ты кажаш.

— Ну-ну...— Анюціны сінія вочы таксама свяціліся прытоеным смехам.

— Ну, апытаў я праз тыдзень-другі ажно ў Задроздзі дзеўку. Ведаеш, не ўдаву, а дзеўку. Яшчэ маладую, дзябё-

лую. У дзеўкі тае братоў ажно трох, а яна адна. І хто да яе ні сватаецца, усе з гарбузом астаюцца. У чым там мітрэнга была, хто яе ведае. Думаю, а дзе наша не прападала. Хоць павесялю брата. Сталі шыкавацца. Паўлюк жарабца свайго гнедага, на якім Царэнка ездзіў, у конюха выпрасіў. Брычку мы ўзялі. Самі падфасоніліся, запрэглі і паехалі. Ага, за свата Вацючка Сільвестравага ўзялі. Ну, ты ж ведаеш. Покладам яго празываюць. Сват гэты — смех. І чаму мы яго ўзялі, халера яго знае. Паўлюк захацеў. Кажа, калі што якое, то гэты хоць маўчаць будзе. Ён і праўда цельпукаваты, маўклівы. А Покладам яго празвалі, ведаеш чаму?

Лукаш зноў зарагатаў.

— Не ведаеш? Ну, гэта ж ён яшчэ як у польскім войску служыў. Лісты дахаты пісаў і ў кожным лісце, у канцы, прыпісваў: «Поклад цёці Рузаліі». Гэта значыць, паклон. А нехта ж, акрамя сваіх, хатніх, пэўна, той «поклад» убачыў, прачытаў, ну й панеслі. Вацючок з войска прыйшоў Покладам.

Адным словам, паехалі мы ў Задроздзе тое. Прыязджаем. А маладая — Вікця — высокая, чарнявая, крамяная такая. І вочы, як вішні ў расе, блішчаць. І браты яе — хлопцы як на падбор, усе трое. Увідзелі нашага маладога і, бачу, пасміхаюцца: застары, маўляў. Ну, яно ж, пэўна. Яна, каб табе не зманіць, на гадоў трыццаць маладшая за бацьку была. Але, бачу, Паўлюку спадабалася. Глядзіць ён, вачэй не зводзіць. Што, смяюся, нічога дзеўку я табе апытаў? Ой, кажа, братка, дух займае. Пабарацца за такую не грэх...

А тут, сама ведаеш, як у вёсцы: дачуліся кумы, дзядзькі пасыходзіліся. Стаімо на падворку, курым, гамонім. А ў яе брат самы старэйшы — відно, дзёрзкі надта. Што мы ні скажам, ён усё папярок, усё падсмяяць стараецца... Мы і так з Паўлюком і гэтак. А сват наш — цяльпук цельпуком, стаіць і міргіча, як авечка котная. Ён усё нам і папсаваў. Але гэта потым было. А напачатку брат гэты Вікцін старэйшы сляпіцаю ў вочы лезе і ўсё Паўлюка падцінае: колькі, маўляў, гадоў маладому? Раззлаваў ён Паўлюка не на жарт.

Добра, кажа. Гады гадамі, не ўсё яны рашаюць. Сіла і спрыт усё рашаюць.

Глядзяць на яго ўсе. І брат гэты. А Паўлюк: «Ну, што глядзіцё? Ідзіце, сястру клічце». А яна, знаеш, зашылася ў хату і сядзіць там з маткаю, у акно толькі вызірае.

Пайшоў старэйшы брат клікаць яе. А Паўлюк наш тым часам жарабца з брычкі выпраг і на падварок, пад ганак прывёў.

І Вікця на ганак выйшла, да вушака прыперлася, глядзіць, усміхаецца:

«Хто тут з вас самы малады?» — пытае Паўлюк у тых, што сабраліся. Пераглянуліся яны, не ведаюць, што тут да чаго. Нарэшце выйшаў адзін. Я, кажа, самы малады. Статны такі хлопец, нічога. Сусед яе, адным словам. Ну, Паўлюк у яго й пытае: «Пераскочыш цераз майго жарабца?»

Хлопец на жарабца зірнуў, пачырванеў, патаптаўся і назад да мужчын шмыгнуў.

«Ну, хто смелы?» — зноў пытае Паўлюк. А я стаю і дадумаць не магу, што гэта ён вырабляе. Мужчыны галовы паапускалі, і брат яе старэйшы язык прыкусіў, стаіць, толькі гыгыкае.

А жарабец той з нагі на нагу пераступае, сыты, харошы, аж блішчыць. Скура на ім тонкая, трымціць, вокам ён косіць. Да яго падысці боязна, не тое што скакаць цераз яго.

Тады Паўлюк мне павады кінуў, сам на Вікцю глянуў, вусы зухавата падправіў:

«Глядзі, дзеўчына, хто тут самы малады і спрытны». Лёгка так цераз жарабца гэтага — раз і скочыў. Стаіць на тым баку і смяецца. Паверыш, ахнулі ўсе. А Вікця далоньмі твар закрыла і ў хату. Тады толькі браты яе й нас давай запрашаць. Я свату маргнуў: даставай гарэлку з брычкі. І во, пабажыцца магу, каб не сват — наша была б Вікця...

Лукаш, смеючыся, глянуў на Анюту. Яна сядзела за сталом, таксама ўсміхалася, недаверліва ківала галавою.

— Усё, як было расказваю, ні грама не выдумваю. Але ўжо давяду да канца. Слухай.

Селі мы за стол. Усё чэсць па чэсці. Выпіваем, гаворым. Гляджу, Вацючок, сват наш, захмялеў, зачырванеў, языком менціць, дзе і словы бяруцца. Але ўсё такую дурніцу нясе, што аж брыдка. Я яго ўжо й штырхаю, і так і гэтак. А ён сам на гэту Вікцю, як кот на кілбасу, глядзіць і аблізваецца...

А на дварэ ўжо й прыцямнела тым часам. Ехаць нам няблізка. Ты ж ведаеш, дзе тое Задроздзе. Яны, праўда, людзі неблагія, відзяць — такое дзела, матка й кажа: то што, мужчынкі, аставайцеся, пераначуйце, а заўтра раненька паедзеце. Ну, мы й радыя. Браты яе жарабца нашага ў хлеў завялі, Вікця з маткаю пасцелі паслалі. Гляджу, сват наш на двор сабраўся. Ну, ці мала што. Трэба чалавеку, хай сходзіць. Схадзіў. Доўга не было, потым прыходзіць. Ну, а матка маладой пытае: «Як жа ж там, сваток, на дварэ, цёмна ці не?» А ён: «Ой, цётачка, цёмна, хоць на воўка збіся. А неба, што столь, ні зорачкі не відно...»

Праз якую хвіліну і мы з Паўлюком выйшлі. Глядзім — на дварэ відната, месячык поўны свеціць, а зорак — хоць прэшчамі збірай.

«Слухай,— кажу на маладога свайго,— дзе ж гэта наш сват быў, што яму неба столлю здалося?» А ён толькі крэкнуў: іці яго муху, кажа. Я яшчэ ў хаце падумаў, што не так тут нешта: не чутно было, каб сват на двор выходзіў... Здагадаліся мы пра ўсё, адным словам. І так нам брыдка зрабілася, хоць скрозь зямлю праваліся...

— Во, жаніхі, во гэта жаніхі,— Анюта выцірала ражком хусты вочы.— Ну й што ж вы рабілі?

— Не-не, усё. Не пытай.— Лукаш замахаў рукамі.— Хопіць. Як і што потым было, не раскажу. Брыдка. Ён зарагатаў. Мачыхі табе, адным словам, мы не прывезлі. А ў хуткім часе вы з Андрэйкам вярнуліся, бацька й аціх адразу з жаніцьбаю...

* * *

Андрэй адзінока сядзеў у кутку на канапе і ў душы дакараў сябе, што зноў не ўтрываў, прыпёрся ажно на другі канец горада, у гэты Рымін «салон». Колькі разоў заракаўся не бываць тут, не дакучаць лішне, а ўсё роўна прыязджаў амаль штовечара. Яго як магнітам цягнула ў гэту невялікую ўтульную кватэру. Рымін «салон» быў адзіным месцам, дзе Андрэй мог хоць на нейкі час забыць пра сваю непрыкаянасць, якую так балюча і востра пачаў адчуваць апошнім часам. Прайшла, неяк сама сабою мінулася задаволенасць ад працы ў музеі. Раздражняла аднастайнасць заказаў, усе гэтыя бясконцыя фотакопіі, рэтушы, якія вымагалі адно дакладнасці і акуратнасці. А мара яго пра творчую фатаграфію, пра мастацтва так і заставалася мараю. Ён адводзіў душу, толькі калі прыязджаў у Пліску. Таму так балюча закранула яго тады Мішкава грэблівае — «фатограф». І ўсё ж Андрэй адчуваў, што трэба нешта мяняць у жыцці. І чым хутчэй, тым лепш. Але якім чынам, пакуль што не ведаў.

Сёння Андрэю было асабліва трывожна і непамысна. Нават тут, сярод гэтай утульнай старой мэблі, сярод мноства кніг на ашклёных паліцах, сярод дарагіх карцін і абразоў у цёмных акладах, якімі былі завешаны ўсе сцены. Невядома, чаму ўсё гэта пачынала раздражняць. Нечакана ўспомніў, што абразы тут вісяць і ў калідоры, над самымі дзвярыма. Падумаў, што гэта тое самае, калі б яго маці павесіла абраз у парозе або ў чалесніку. Захацелася падняцца і пайсці адсюль, збегчы, як толькі што збег з пустэльнага, абнятага халодным туманам, парку. Але з парку ён збег сюды, а адсюль мог паехаць толькі ў свой цесны пакойчык да Клаўдзі Пятроўны. І таму пакуль што сядзеў, адно зручней распростаў пад нізенькім столікам ногі. Злёгку прыплюшчыў вочы. Да слыху далятаў адгалоскі гаманы і Вовікава настойліва-раздражнёнае «алёканне» па тэлефоне.

Шарык наладжваў тут, у «салоне» ў Рымы, свае гешэфты. Сюды сыходзіліся ўсе нітачкі сувязей, прыходзілі яго

сябры, такія ж, як ён, фарцоўшчыкі і «кліенты». Другі пакой у кватэры быў завалены імпартам: расфарбаваныя, як манекены, дзяўчаткі выбіралі сабе тое, што іх цікавіла, прымяралі, абмяркоўвалі, спрачаліся з Вовікам, лічылі грошы. Потым, склаўшы пакупкі ў сумкі, падоўгу сядзелі за гэтым нізенькім столікам, сярод карцін і абразоў, курылі і глядзелі перад сабою абыякава-пустымі вачыма. Андрэя заўсёды бянтэжылі гэтыя іх невідушчыя позіркі. Незразумелая, ненатуральная стомленасць адчувалася і ў грэбліва расслабленых позах, у тым, як дзяўчаткі курылі, як лена, неахвотна, быццам прыходзілася плаціць за кожнае слова, перамаўляліся між сабою.

Што іх цікавіла, акрамя Вовікавых імпартных шмотак, было невядома.

Сёння тут было пакуль што спакойна. У кутку каля высокага таршэра ціха гаманілі Раланд з малазнаёмым Андрэю журналістам, на кухні шумеў млынок — Рыма збіралася гатаваць каву.

Вовік нарэшце кінуў трубку, зайшоў у пакой. Быў ён на свае гады ненатуральна тоўсты, відаць, проста хворы. Круглы, поўны, як у жанчыны, твар блішчэў потам. Пульхныя вусны былі вільготныя: Вовік іх пастаянна аблізваў.

Пацертыя шырокія джынсы трымаліся, як зрэбнікі ў старога дзеда,— ніжэй жывата. Целяпаліся без патрэбы адшпіленыя падцяжкі. Блакітная імпартная сарочка не сыходзілася на шырокай грудзіне.

Андрэй міжволі ўсміхнуўся:

— Ты як пасля бойкі ўсё роўна.

— Ой, Андрэ,— Вовік цяжка плюхнуўся ў крэсла.— Складана ў наш час быць дзелавым чалавекам, а не дзелавым быць немагчыма. Ты ж разумееш, Андрэ, сёння я магу ў гэтай кватэры апрануць самага патрабавальнага кліента не горш, чым у салоне Кардэна, а што з таго? Што я з гэтага маю? Фігу. Усё яно як прыплывае, так і сплывае.— Вовік азірнуўся на дзверы.— Рымачка наша любіць шыкануць, а

ёй адмовіць я не магу, ты ж разумееш. Без яе я ні сюды ні туды...

— Без яе кватэры, ты хочаш сказаць? — удакладніў Андрэй.

— Ну да. Усё роўна. Ты ж разумееш.— Вовік ізноў азірнуўся.— Гэты ж яе рэстаўратар ні фіга ёй не прывозіць, акрамя абразоў. Трымае ў чорным целе. А я яе не абіжаю! Усё, што трэба, даю! Гэта ён, мудак, хату абразамі завешаў і думае, што ўсё, ашчаслівіў жонку.

Андрэй ні разу не бачыў Рымінага мужа: той увесь час быў у камандзіроўках, рэстаўрыраваў, як казала Рыма, храмы. Мяркуючы па сценах у гэтай кватэры, «рэстаўрыраваў» ён іх пасляхова.

Андрэй адкінуўся да спінкі канапы, зноў прыплюшчыў вочы. Падумаў, што добра было б яшчэ й вушы заткнуць.

— А ты ведаеш, Андрэ, Гапкі ўсё-такі невінаватыя.

Рэзкі паварот Вовікавай балбатні прымусіў Андрэя расплюшчыць вочы:

— Ты адкуль гэта ўзяў?

— Узяў?! Купіў. Невінаватыя Гапкі. А мы ім па вымове ўляпілі...

— Ну, не мы, дапусцім, а «шафіня».

— Але з нашай згоды.

— Ладна, адкуль ты ведаеш? — Андрэй пачынаў ужо траціць цярпенне.

Вовік пакруціў па баках круглаю вялікаю галавою.

— Я скажу табе, але, ты ж разумееш, нікому ні слова. Мільтон у парку сказаў. Той, што іх падчапіў. Ён у мяне джынсы браў. «Мантану». Расказваў, зараза, і рагатаў. Плакалі, кажа, абедзве ў аддзяленні. Ён з імі, аказваецца, пажартаваць хацеў, а яны адразу на ражон палезлі, угнявілі, адным словам. Граматныя, кажа, занадта... Я б яму, Андрэ, «партрэт» трохі папсаваў, канешне, рукі ў мяне свярбелі, але, ты ж разумееш, ён жа, зараза, ведае, чым я займаюся...

— Ага, ведае і сам у цябе джынсы купляе, а дзевак ні за што ў аддзяленне завалок, яшчэ й «цялегу» на работу

прыслаў. Ну, сволач...— Андрэй усхапіўся, рэзка адпіхнуў столік.— І ты харош гусь, ты што, не мог папрасіць, каб ён паперку сваю прыйшоў забраў?

— Андрэ! — Вовік бездапаможна пазіраў знізу ўверх.— Ты звар'яцеў. Ды ён жа не ведае, што я іх ведаю, што я разам з імі ў музеі працую. Ён проста расказваў дзеля смеху, і так супала...

— Хлопчыкі, што здарылася? У чым справа, мілень-кія? — Рыма стаяла каля іх з падносам, на якім дымілася і востра пахла ў маленькіх кубачках кава.

Вовік падхапіўся, прыняў у яе з рук паднос:

— Нічога, нічога, Рымачка. Поўны ажур. Гэта мы так. Ты ж разумееш, адна ўстанова, сумесная праца, праблемы...

Андрэй адчуў, што чырванее, моўчкі сеў у свой куток на канапу.

— Ой, умарылі! Ну, артысты! У вас што, акрамя работы, ніякіх праблем няма? Ну-у...— Рыма капрызна надзьмула маленькія, ярка нафарбаваныя губкі.

Была яна ўся маленькая, асадзістая, як купінка. Толькі галава з высокаю пышнаю прычоскаю выдавала ненату-ральна вялікаю і нейкаю як бы зацяжкаю для свае гас-падыні.

— Раланд, Вадзім,— Рыма павярнулася да хлопцаў, што ўсё яшчэ сядзелі ў далёкім куце пакоя і аб нечым ажыўлёна гаманілі,— кава стыне! І ўвогуле,— мне без вас сумна. Андрэй і Вовік — нікудышныя кавалеры...

Раланд паволі падняўся, пакорліва схіліў перад гас-падыняю галаву, і ў гэты момант смешна нагадваў жоўты таршэр, побач з якім стаяў.

— Рыма Януараўна, літаральна пяць хвілін, калі ласка, дазвольце. Мы не дадзім вам сумаваць, праўда, Вадзік?

Чарнявы, худзенькі Вадзім сарамліва ўсміхнуўся.

— Дарэчы, кава няхай астывае. Гарачай кавы, Рыма Януараўна, піць нельга, і я вам раю не рабіць гэтага ніколі.

— Чаму, Раланд? — тонкія вышчыпаныя Рыміны броўкі папаўзлі ўверх.

— Ой, Рымачка, не слухай ты яго,— Вовік з цяжкасцю вылез з-за століка, крануў Рыму за плячо.— Рол запалохае каго хочаш. Слухай мяне, і ўсё будзе добра. Чалавеку карысна тое, што яму падабаецца, што ён любіць. Любіш гарачую каву — выдатна, любіш мужчын — цудоўна!

Рыма дробненька засмяялася, села ў крэсла.

Андрэя непрыемна кальнуў гэты яе смех, у якім чулася штосьці ненатуральнае, гадкае. Ён уважліва зірнуў на Рыму і быццам упершыню ўбачыў яе — задаволеную сабой, гладкую, як сказалі б у іх у Плісцы, што арэхамі кормленую. Успомніў, як нядаўна танцаваў з ёю ў гэтым амаль цёмным тады пакоі і як яна, моцна прыціскаючыся да яго тугімі грудзямі, шаптала: «Вы — цуд, Андрэй, вы не такі, як усе яны. Вы — марсіянін. У вас такая непасрэдная, чыстая душа...»

А ён, развесіўшы вушы, слухаў усё гэта і потым хадзіў колькі дзён ачмурэлы, амаль закаханы ў Рыму. І гэтулькі думаў пра яе, і пёрся сюды штовечар, спадзеючыся на яе ўвагу, чакаючы пяшчотных слоў, ловячы шматзначныя позіркі, не заўважаючы, аслеплы, што словы такія і позіркі яна раздорвала ўсім, направа і налева, што гэта была толькі яе маска. Маска ветлівай гаспадыні...

Андрэй спехам праглынуў бутэрброд, апякаючыся, хутка выпіў гарачую каву.

— Куды вы так спяшаеце, Андрэй? — Рыма глядзела на яго і жмурылася ад лёгкай гуллівай усмешкі.— Заўтра выхадны, выспіцеся.

Ці то ад выпітай кавы, ці то ад нейкай унутранай стомленасці і роспачы Андрэю раптам зрабілася горача. Злуючы на сябе, рэзка адхіліў рукаў пінжака, зірнуў на гадзіннік. Была толькі дзевятая гадзіна вечара. А заўтра сапраўды меўся быць выхадны. І паслязаўтра таксама... Андрэй падхапіўся, падкрэслена пачціва схіліў галаву:

— Дзякуй вам, Рыма Януараўна, але я спяшаю. А палове дванаццатай у мяне цягнік...

У халодным вагоне, на мулкай верхняй паліцы, Андрэй доўга не мог заснуць. Ляжаў і атупела слухаў перастук колаў, які час ад часу перарываўся храпам суседа по купэ — нейкага бывалага службіста, што прывык, відаць, да камандзіровак, да свайго вандроўнага жыцця і спаў у вагоне не горш, чым у хатнім ложку. Андрэй не паспеў яго нават як след разгледзець: той, як толькі выясніў, дзе яго месца, адразу ж запіхнуў пад столік партфель, распрануўся і пачаў прывычна і лоўка рассцілаць пасцель... І цяпер спаў сабе як пшаніцу прадаўшы, трубіў носам, што той паравоз.

Урэшце незаўважна закалыхала і Андрэя. Ён заснуў, як праваліўся ў глыбокае цёмнае прадонне. І на мулкай вагоннай паліцы прысніўся яму чорны голы алешнік каля хаты.

Той, у якім яны з мацераю граблі штовосені шапаткі, з гаркавым тытунёвым пахам ліст на капец. І рухомы, шэры вугал дзікіх гусей над самым алешнікам. Андрэй сачыў за ім, высока задраўшы галаву. Гусі ляцелі моўчкі, не чутно было іх звыклага развітальнага гагання. Гусіны вугал доўга калыхаўся, то распрамляючыся, выцягваючыся ў шнур, то зноў вяртаючы ранейшую форму, вагаўся на адным месцы. Потым рэзка выпраміўся, расцягнуўся і пачаў хутка зніжацца. І толькі Андрэй паспеў пашкадаваць, што няма пад рукамі фотаапарата, як тут жа, уражаны, убачыў, што гэта ніякія не гусі, а даўжэзны вузкі ліст шэрай паперы. Андрэй не верыў сваім вачам, а ліст, не абрываючыся, усё зніжаўся і зніжаўся, яго круціла ветрам і адносіла некуды за алешнік. Баючыся не знайсці яго, Андрэй кінуўся праз кусты ў той бок, куды панесла гэты таямнічы ліст. Выбег з алешніку і ўбачыў: ліст паслаўся на жухлай траве, як раскручаны сувой палатна, і не відно было, дзе ён пачынаўся і дзе канчаўся. Андрэй нахіліўся і толькі цяпер заўважыў, што ён спісаны роўнымі слупкамі прозвішчаў. Іх было бясконцае мноства, знаёмых і незнаёмых, ніколі раней не чутых. Сунучыся на паслабелых ад страху нагах уздоўж ліста, Андрэй шукаў сваё. Як бы хто

сказаў яму, што яно, ягонае прозвішча, тут ёсць і што па гэтых спісах будуць забіваць людзей. Усіх, хто пазначаны. «За што? Навошта?» — хацелася яму крыкнуць, але язык у роце зрабіўся вялікі і шорсткі, не даваў дыхаць.

«Навошта? Навошта столькі крыві?» — нарэшце ўсё ж вымавіў ён ціха, задыхаючыся. І раптам сціснуўся, пачуўшы сіплы голас тоўстага Вовіка: «Не бойся, крыві не будзе». Андрэй рэзка крутануўся, і ў той жа момант у вачах пацямнела ад болю,— Андрэй моцна выцяўся галавою аб нізкую верхнюю паліцу. Прабудзіўся, чуючы, як гулка калоціцца ў грудзях сэрца. Цягнік стаяў на невялікім асветленым паўстанку. Па вагоне сюды-туды снавалі пасажыры, узбуджана перамаўляліся, шукаючы свае месцы. Рэзка ляпалі дзверы, ганялі зябкі начны холад...

— Птушак ужо не кармлю, закрыла іхнюю сталоўку. Пацяплела, снег злазіць, не бяда: корму хапае. Сінічкі, як толькі маразы паслаблі, адразу ад хаты адлучыліся, а гэтыя канаплянікі лянівыя прывыклі, ні рады — пасядуць на слівах каля плота і чакаюць. І рана, і вечар, і ў абед. А я ім усё пасыпаю, ды яшчэ й пільную, каб сарокі не ляцелі. А потым падумала — не, хопіць ужо, давайце, родненькія, самі пожыву шукайце, а то разгультаіліся за зіму, упадабалі на ўсім гатовым.

Маці тупала каля пліты і ўсё гаварыла. То пра птушак, то пра суседзяў, але Андрэй адчуваў, што нешта, самае важнае, яна яму не гаворыць. Не рашаецца ці пакідае на потым. Адчуваў на сабе яе пільны, заклапочаны позірк і ніжэй схіляўся над талеркаю... На душы не было таго звыклага спакою і лагоды, якія заўсёды запаноўвалі ім, калі прыязджаў дахаты. Штосьці перашкаджала абвыкнуцца, уздыхнуць на поўныя грудзі... Можа, нядаўні, саснёны ў вагоне сон? Ён пакінуў у душы непрыемны, калючы халадок перажытага страху. А можа, матчыны трывожныя вочы, гэты яе позірк, які Андрэй пастаянна адчуваў на сабе?

Ён адсунуў парожнюю талерку, падняўся з-за стала.

Высокі, шыракаплечы, адразу заняў сабою амаль усю кухню. Падышоў да маці, нахіліўся, абняў яе за плечы. Адчуў, якая яна ўся па-птушынаму шчуплая, худзенькая, і тут жа здрадліва затрымцела ў яго ўсярэдзіне жаласць, сціснула горла. Упершыню заўважыў, як пастарэла і змянілася за гэты час матка. Стаяла каля яго маленькая, разгубленая ад гэтай яго нечаканай ласкі.

«Сінічка ты мая родная»,— сказаў ціха, ледзь чутна, прыгарнуў яе да сябе. І так стаялі яны моўчкі і доўга, і Андрэй чуў, як б'ецца матчына сэрца: неспакойна і часта. Потым маці зноў гаварыла. Андрэй сядзеў каля акна, глядзеў праз мутную, запацелую шыбу на вуліцу, а маці гаварыла. І зноў яму здалося, што не пра тое яна, што нешта самае галоўнае, важнае адцягвае, пакідае на потым.

А можа, й гэта было для яе важна, гэтаксама важна, як і ўсё астатняе?..

«Учора ў магазіне была. Хлеба нешта доўга не прывозілі, то ўсе пазбіраліся і стаялі пад магазінам, чакалі. І Антак Макун падышоў якраз. Стаімо, гаворым і відзім — верабей каля слупачка сядзіць. Крылца адтапыранае, растармэханы ўвесь, няйначай, у ката ў лапах пабыў. Макун таксама змеціў гэтага вераб'я і пайшоў да яго. Думаю, падыме, цераз плот перанясе, каб хто не наступіў незнарок. А ён падышоў і ботам птушанё гэтае як шпурляне, яно, беднае, аж пад яблыню адляцела. І ўсе стаяць, глядзяць. Мужчыны гыгыкаюць, хоць бы што ім. Я не стрывала і пытаю: ну й што ж ён зрабіў табе, верабейчык гэты? А каб яны паздыхалі, кажа, курам дасі ў карыціку на падворку, то пазлятаюцца і ўсё выдзеўбуць. Ага, кажу, ужо ж аб'елі яны цябе чыста. Збяднеў ты. Стары чалавек, а дурны, сэрца не маеш...

Зазлаваў на мяне, але трохі й заўстыдаўся. Вочы адвёў, пачырванеў. Вот табе, якія людзі бываюць. А сам усё сынавым адвакацтвам хваліцца: «Фрэдзік мой людзей спасае...»

Андрэй працёр рукою запацелую шыбу і ажно ўздрыгнуў, калі маці спытала:

— Што ты там вызіраеш? Выкарчавалі Вульчыну сядзібу. Ты ж яшчэ той раз, калі прыязджаў, бачыў.

— Бачыў. Але ж там бяроза аставалася, пры дарозе. Цяпер гляджу і ўсё паняць не магу: нечага не хапае.

— Зрэзалі і бярозу нядаўна.

Андрэй угледзеў цёмную горбачку галля на тым месцы. Цяпер прыкмеціў, што такія горбачкі цямнелі па ўсім Вульчыным пляцы. А вочы ўсё роўна нечага шукалі. Колькі сябе помніў, увесь час бачыў з гэтага акна Вульчыну маленькую хату ў зарасніках бэзу, старыя ліпы на падворку і бярозу. Яна стаяла пры дарозе, адна. І, мусіць, ад таго, што расла на прасторы, вольна, была такая прамая і гожая. «Як на карціне»,— гледзячы на яе, не раз казала маці. Аказваецца, камусьці замінала.

— Хто гэта зрабіў, мама?

Яна здзівілася, недавольна перапытала:

— Хто, хто? А ты не ведаеш? Калхоз. Прыехалі свае ж, вясковыя падшыванцы і за паўдня ўсё вынішчылі. Хату ж зяць яшчэ раней разабраў.

Маці не зразумела, што Андрэй пытаў толькі пра бярозу. Яму ўспомнілася, як крычаў мінулы раз Мішка, калі ён дапытваў у яго пра Вульчыну сядзібу: «Без мяне гэты пляц пляжылі. Хлопчыкі-практыканты...» Як быццам «практыканты» з неба зваліліся. Свае ж, пліскаўскія. Андрэй адвярнуўся ад акна.

— Ну, а Вулляна ж жыве?

— Жыве, а што з таго? Што яна зробіць? Не дасць ім, ці што? Яна ж у дачкі цяпер...

— Правільна. А дачка, сыны? Яны ж недалёка, у райцэнтры.

— Ой, сынок ты мой, ты чыста дзіця малое. У дачкі і ў сыноў кватэры ў горадзе, яны ўжо да гэтай сялібы матчынай ніякага дзела не маюць.

— Як гэта не маюць? Яны ж тут нарадзіліся, гэта ж іх бацькаўшчына.

— Ну й што ж? Зямля ж калхозная... — Маці глядзела на яго ціхімі сумнымі вачыма.— Вот і я памру, а ты далёка, і таксама ўсё выпілуюць, выражуць, травою засеюць...

Сказала яна гэта спакойна, нават, здалося, раўнадушна, як даўно для сябе вырашанае, даўно абдуманае. І яго ўразілі не так матчыны словы, як іх тон. Выходзіла, што ўсё яно так і трэба. Аджыло, знікла, быццам і не было нічога, і ўсё. На імгненне адчуў у сабе халодную пустату і ажно здрыгануўся. Ніколі не думаў пра гэта як пра нешта рэальнае, непазбежнае. Маці заўсёды здавалася яму ўсё яшчэ маладою, дужаю. Ніколі ні на што не скардзілася, рабіла і рабіла, як тая вавёрка ў вечным коле, круцілася без супынку, і ён не бачыў, калі яна клалася, калі ўставала, калі проста сядзела або адпачывала. Яна й цяпер, гаворачы з ім, не магла пастаяць проста так. Ён сядзеў, а яна й посуд за гэты час перамыла, і нешта ўсё на пліце парадкавала, і яшчэ, ведаў добра, пра сотню работ думала, на цэлы дзень прыкідвала. Але кола не магло круціцца вечна... Не вечная была маці на гэтай зямлі, і не вечны быў гэты родны куток: і хата, і старая яліна, і дзедаў садок, і ўсё тут, што ён так любіў і ад чаго сам адкаснуўся, сам адлучыў сябе, прыязджаючы адно зрэдку дарагім госцем і так во, староннім вокам, на ўсё пазіраючы. Невядомы раней страх абняў душу. Андрэй ажно галавою пакруціў: не, не. Ён не зможа без усяго гэтага. У горадзе, нават на чужой кватэры, сярод чужых людзей, ён адчуваў сябе спакойна і ўпэўнена, бо ведаў: што б там ні было, у яго ёсць маці і родная хата. У любы момант ён можа да іх вярнуцца... А інакш... Не, інакш проста нельга, немагчыма інакш. Ён жа так любіў сваю Пліску, так часта думаў пра яе. І калі быў далёка, у горадзе, і тады, калі хадзіў поблізу, па чыгуначным насыпе з фотаапаратам, і яна бачылася як на далоні. Глядзеў і наглядзецца не мог.

Вёска й праўда чымсьці нагадвала пліску — невялічкую, хвастатую птушку. Толькі от няўмольная рука часу вырывала ў птушкі гэтай «пярыну» за «пярынаю», і яна цяпер зябка тулілася адным бокам да чыгункі. Дый ад «хваста» яе, некалі доўгага, шырокага, не асталося амаль нічога. Нядаўна яшчэ адну «пярынку» вырвалі — няма ўжо Вульчынай сялібы.

Цяпер тут, за чыгункаю, у «хвасце» асталося хатаў сем, не болей. А добры дзесятак знік толькі на яго, Андрэевай, памяці... Ці даўно тут штовечара прыходзіў да іх Адам Рубец, і яны з дзедам Паўлюком вялі свае бясконцыя гамонкі? Ці даўно весяліў усё наваколле пералівісты Базылёў гармонік?

А хіба дзед Паўлюк даўно спяваў сваю «Рэчаньку», седзячы во на гэтай печы? І хіба даўно шумеў тут ягоны лес?...

* * *

Лес шумеў адразу за хатаю. Адлiжны вецер гуляў адталым голлем у густых кронах і ўнізе, каля камлёў, пахла звільгатнелым мохам і адсырэлаю жывою карою.

Вызірала на рэдкіх праталінах ярка-зялёная, як перамытая, дзераза, а ў наледзянелых яшчэ гнёздах ляжалі палушчаныя за зіму яловыя шышкі, пакуль што цярпліва чакалі свае пары круглыя, з павыцінанымі беражкамі, лісты пралесак.

Але ўжо жывы дух цяпла і неспакою панаваў у лесе. І ніводная расліна, ніводзін парастак, ніводнае дрэва і ні адна жывая істота не думала ў такі час пра смерць. Такой існай гармоніяй дыхала ўсё жывое, такой адзінай, непадзельнай стыхіяй імкнулася жыць, і любіць, і нараджаць новае, бясконцае ў сваім працягу жыццё, што здавалася, няма на свеце такой сілы, якая б магла спыніць, суняць гэта спрадвечнае, неадольнае імкненне... І хіба адна толькі старая елка не падзяляла гэтай радасці вясновых народзін: шумела трывожна, глуха. І толькі адзін Паўлюк чуў і разумеў яе шум і трывогу. Яны адбіваліся ў яго сэрцы гнятлівым прадчуваннем блізкай і немінучай бяды.

А прырода ажывала, і з кожным днём усё шырэй і смялей разнімала свае абдымкі вясна.

Не мог уседзець у хаце Паўлюк, неадольная сіла цягнула яго ў лес, але цяжкія і непаслухмяныя рабіліся ногі, як

толькі выходзіў з хаты, да млосці праціўна ныла нутро, і часта слабы халодны пот прабіваў крамную сарочку на худых плячах, едкаю расою высыпаў на лбе. Паўлюк знясможана сядаў на стары ўчарнелы пень сярод лесу, сцягваў шапку, выціраў тыльнаю стараною далоні ўзмакрэлы лоб і падоўгу сядзеў, услухоўваўся ў суцэльны, вільготны шум лесу. Ён слухаў і чакаў, што адгукнецца раптам душа на гэты вясновы гоман, затрымціць, разальецца ў ёй радасць, змые гэту трывогу. І, як штогод вясною, адчуе ён зноў прагу жыць і рабіць, і абудзіцца тады ў душы песня, і будзе гучаць доўга, бясконца, і будзе жыць вечна, як гэта прырода... Але маўчала Паўлюкова душа, маўчала амярцвела, цяжка. Нішто не кранала яе. Як усё роўна не бачыў і не чуў ён нічога. Адно пратыкаў душу яго, як пратыкае старое пластаватае лісце зялёны парастак, балючы, трывожны неспакой. Невядома было, адкуль ён лезе, дзе пусціў свой корань, але было чутно, што ўжо не вырвеш яго, не выкінеш з душы...

То была апошняя Паўлюкова вясна.

Яна была апошняю для ўсяго гэтага ўзгадаванага ім, выпеставанага і выняньчанага ляснога свету. Надыходзілі моманты, калі Паўлюк вельмі ясна адчуваў гэты канец, і тая роспач, якую ён сціраў з душы, як халодны пот з ілба, рабілася неабдымнай і такой страшнай, як перад канцом свету. Ён змагаўся з ёю зацята і моўчкі, перамагаў яе і не мог перамагчы. І станавіўся ўсё больш маўклівы і пануры. А каму ты што скажаш, як і якімі словамі растлумачыш? Няма такіх слоў...

Няма такіх слоў і няма паратунку ад непазбежнага.

Вясна ішла ранняя, дружная, асабліва неўтаймаваная і бурная ў Багунцовым лесе. Усё адразу і разам пацягнулася да жыцця, расло, буяла і спяшала, як баялася спазніцца, не паспець.

Здаецца, ніколі так не галавілася, не шчыравала птаства, ніколі так доўга і ярка не цвілі пралескі і не шугаў так пышна белы кураслеп. Рэдкія ў гэтым лесе медуніцы цяпер то

тут, то там вызіралі сваімі рознакаляровымі вочкамі, раней, чым звычайна, вытыркаў з кучаравага зяленіва чырвоныя вушкі лясны гарошак. Купчаста сядзеў залацісты першацвет, нізка апускалі паніклыя леечкі фіялетавыя ворлікі і фасоніста паказваў бэзавыя пазногцікі далікатны луннік.

Не паспявала адкрасавацъ адно, зацвітала другое, распускаліся дрэвы, гаркава пахла маладым клейкім лістам, і на захадзе сонца на ўзлеску да моцнага водару зялёнага чараўніку дамешваўся тонкі, ледзь улоўны пах фіялак.

Ніколі так пышна не раскашавала прырода, як у тую вясну. І ніколі з такой жорсткасцю і ярасцю, як у тую вясну, не паляваў у лесе пліскаўскі пастух — ліліпут Бронька. Ён не выпускаў з рук свае вядомай усяму наваколлю рагаткі. Выструганая з лёгкай сухой ялаўчыны, адпаліраваная, адгладжаная рукамі, з туга нацягнутай чорнай гумаю, з круглым, ёмкім гняздом для ладнага каменьчука, яна страляла часта і без промаху. Бронька біў па ўсяму, што трапляла на вочы. Усё, што магло варушыцца, жыць і што было меншае, слабейшае за Броньку, было аб'ектам яго жорсткай расправы. Нават пліскаўскія хлапчукі, што, бывала, пырхалі за ім пудлівай чародкаю, зайздросцячы гэтай рагатцы і Бронькавай цэлкасці, цяпер трымаліся воддаль, назіралі за ім здаля, са страхам выцікоўвалі, каго ж цяпер выбера ён сваёю ахвяраю.

Хіба што толькі Антоська Рубец яшчэ сяды-тады слухаўся Броньку, залазіў на высокія маладыя елкі, даставаў з варонiных гнёздаў бездапаможна цёплых, у рэдкім сізым пушку варанят. Яны княкалі, як дзеці, калі Бронька запускаў руку Антоську за пазуху і выцягваў іх адтуль, трымаючы за тонкае, трымтлівае горлачка.

Енчылі, кружылі над лесам старыя вароны, зніжаліся да самай зямлі і мусілі зноў узлятаць пад прыцэлам Бронькавай рагаткі.

Андрэю здавалася, што з тае свае вышыні яны бачаць, як стаіць на пяньку, калываецца на кволых ножках, шырока разяўляючы дзюбку, іх неразумнае птушаня. Бачылі, але

нічога зрабіць не маглі. А тым часам, адпушчаны жорсткай рукою, ляцеў камень. І тут жа бязвольна схілялася тонкая шыйка, вывальваўся з дзюбы жоўты язычок, і вараня падала ў траву.

Бронька рагатаў вісклівa і доўга. І гэты смех, і вочы яго, круглыя, ненатуральна вялікія на малым зморшчаным твары, здаваліся ў такія моманты здзічэлымі.

Пліскаўскія хлапчукі затойвалі дыханне. Хаваліся птушкі, пачуўшы трашчоткі Бронькавага статка.

Бронька не любіў выганяць кароў у чыстае поле. Там не было чаго асабліва крышыць і ламаць. Ён або пасвіў у лесе, або гнаў кароў на балота.

У маі, калі ў прагрэтых сонцам завоінах аж кішэлі апалонікі, ліліпут начэрпваў іх разам з вадою ў іржавую бляшанку ад кансерваў і ставіў яе, як на трыножку, на прыладжаныя кружком камяні сярод цяпельца. Стаяў, памешваў у банцы шыпулём, чакаў, пакуль закіпіць вада і пачнуць свой перадсмяротны танец цёмныя трымтлівыя істоты. І тады зноў Бронька рагатаў — віскліва, захлёбіста.

Якім вялікім і дужым ён тады сам сабе здаваўся, можна было толькі здагадвацца...

Аднаго разу страх у Андрэевай душы ўсё ж быў пераможаны. І калі зноў закрычалі птушкі, Андрэй не вытрываў. Скочыў з-за куста, у адно імгненне, пакуль Бронька цэліўся, выхапіў птушанё з-пад рагаткі і, тулячы яго да грудзей, штомоцы кінуўся прэч.

Бег доўга. Апомніўся, толькі ўскочыўшы ў вялікую цёплую лужыну. Азірнуўся. Увесь у купінках і астраўках жоўтай лотаці, наскрозь прагрэты сонцам, навокал яго, па калені ў вадзе, стаяў алешнік. Не хацелася верыць, што сярод гэтага хараства і спакою чынілася штосьці жорсткае і страшнае. У лесе, чутно было, усё яшчэ крычалі вялікія птушкі. Андрэй разняў пальцы і ў роспачы ўбачыў, што ўратаванае ім птушаня нежывое. Ён плюхнуўся на калені, чэрпаў далонькаю цеплаватую ваду, ліў на сціснутую ру-

жовую дзюбку, спрабаваў яе расчапіць і адчуваў, як халадзее нядаўна жывое і цёплае цельца.

...Не так даўно, праглядаючы ў бібліятэцы новыя часопісы, Андрэй натыкнуўся на словы, якія напачатку здаліся яму дзіўнымі: «Лічачы сябе страшыдлам, яно хацела аднаго — пахаваць сябе ў адзіноце, і толькі крохкасць ахвяр бясконца рабілі яго забойцам, вось у чым справа. Значыць, пакуль на гэтым свеце існуе тое, над чым можна ўчыніць гвалт — што можна паламаць, разарваць, спаліць, чаму можна пусціць кроў, што можна задушыць,— страшыдлу не астаецца нічога іншага, як бясконца чыніць гвалт. У паводзінах страшыдлы ўвогуле не было нічога новага. Само страшыдла — не што іншае, як вынаходства сваіх ахвяр...» Але хіба «крохкасцю ахвяр» можна апраўдаць чые б то ні было паводзіны і, тым болей, з'яўленне самога страшыдлы?.. Андрэй помніў, што й тады, у маленстве, і потым, калі вырас, успамінаючы ліліпута Броньку, найперш адчуваў жаласць да яго...

Ды свет ніколі не абмяжоўваўся такімі Бронькамі. «Крохкасць ахвяр» і жаданне «чыніць гвалт» нараджаюць безліч іншых страшыдлаў. І самае горшае, што іх вельмі цяжка ўбачыць, распазнаць адразу. Вонкава, знешне — гэта зусім звычайныя людзі. І толькі іх дзеянні, учынкі выяўляюць у іх страшыдлаў...

Незаўважна, хутка мінула тая апошняя дзедава вясна, у вечных турботах, у клопаце прамільгнулі лета і восень і прыйшла зіма. З моцнымі, ажно трашчалі вуглы ў хатах, маразамі. І каб яны хоць трохі адліглі, старая Адаміха падгаворвала жартам малых — Андрэя, Мішку Крыўца і Галю Драздзюкову: «Дзеці, лічыце лысых, усіх, каго ведаеце ў Плісцы». І сама, першая, пачынала: «Адам Рубец — раз...»— загінала вялікі палец левай рукі.

Адам недавольна крактаў на печы: «Дзе гэта ты лысіну ў мяне ўгледзела? Не слухайце яе, дзеці». Адаміха рагатала і зноў гнула сваё: «Адам — раз, Лукаш — два, Ігнась —

тры...» А яны пасля кожнага «лысага» хорам паўтаралі: «Мароз трэсь!» — «Паўлюк — чатыры» — лічыла далей Адаміха.

«Дзед Паўлюк не лысы!» — пакрыўджана перабіваў яе Андрэй, і Адаміха, мажная, вялікая, рагатала, ажно калыхалася ўся, смешна трасла падбародкам з сівымі доўгімі валасінамі. «Не лысы твой Паўлюк, не лысы...»

А дзед Паўлюк каторы ўжо дзень амаль не злазіў з печы. Андрэева маці штодня, ледзь не плачучы, угаворвала яго з'есці хоць крошку чаго, але дзед прасіў толькі піць. І яна падавала на печ сіні кубачак бура-чырвонага маліннікавага адвару.

Гэты маліннік кожную раніцу ламаў Андрэй у садзе каля плота. Намерзлы, ён быў крохкі, ламаўся хутка і лёгка.

Часта па начах усходжваўся вецер, і тады мяла і гуляла на дварэ завея, залятала ў комін, бразгала юшкаю і праціўна выла. Часам нельга было разабраць, ці то вые на падворку Галас, ці то завея галосіць у коміне. Усе тыя ночы іхні стары сабака выў і душыўся брэхам — браў кагосьці так, што рыпеў і трашчаў ланцуг. І тады, крэкчучы, злазіў з печы дзед Паўлюк, здымаў са сцяны стрэльбу.

Скочвалася з ложка маці. Андрэй, абудзіўшыся ад шолаху ў хаце, бачыў, як матлялася ад печы да парога яе белая сарочка, чуў шэпт. Яна прасіла, угаворвала дзеда: «Татачка, родненькі, не выходзь, не страляй. Яшчэ, не дай бог, падстрэліш каго. Хай бяруць, хай цягаюць, татачка. Усё роўна ўжо...»

Дзед штосьці бурчэў, але рабіў сваё. Нацягваў паверх бялізны кажух і, свецячы крамнымі нагавіцамі, усоўваў ногі ў галёшы, выходзіў на ганак.

Трохі счакаўшы, ляскаў сухі кароткі стрэл.

Яшчэ мацней пачынаў якатаць на ўвязі Галас, ірваўся ў лес. Дзед вяртаўся ў хату, цяжка ўздыхаючы, зноў лез на печ. Гэтак, выходзячы з цяпла на холад, ён моцна застудзіўся.

Тою марознаю зімою Бучок пілаваў Багунцоў лес.

За дзень напілаванае не паспявалі звозіць на пілараму. Возчыкі не спяшалі. Затое па начах храплі, аж душыліся, завальваючыся ў снег, цягнучы цяжка наладаваныя сані, калгасныя коні. Па начах, хто як мог і хто колькі мог, цягалі з лесу намерзлыя, звонкія кускі бярозы. Цягалі не толькі пліскаўскія. Завея замятала сляды... Нараніцы шоргалі на падворках пілы, стукалі сякеры і роўнымі слупамі ўставалі над стрэхамі дымы: адляталі ў неба светлыя душы Паўлюковых бяроз.

А сам дзед Паўлюк ужо колькі дзён ляжаў на печы абыякавы і да ўсяго безуважны.

...Аднае ночы маці разбудзіла Андрэя. Яны ціхенька апрануліся і выйшлі з хаты.

Ветру не было. Толькі трашчаў па-за вуглах мароз. Над садам стаяла поўня і дрыжэлі ад холаду ў глыбокім небе яркія бліскучыя зоркі.

Маці выцягнула з адрыны вялікія самаробныя санкі, і яны пайшлі.

Лес пачалі пілаваць не ад іх хаты, а з другога канца, ад алешніку. Напачатку здавалася, што аніякай бяды няма і лес як стаяў, так і стаіць. Асветлены месяцам, прыцярушаны снегам, ён быў урачысты і ціхі. Толькі хрупаў пад нагамі снег.

Але цішыня ў лесе была падманная. Хутка яны пачулі, як на бялявіне, там, дзе раслі асабліва роўныя, гонкія бярэзіны, пфыркае конь і рыпіць вупраж.

Маці прыпынілася, узяла Андрэя за локаць. Там, на бялявіне, пазвоньвала піла і чуліся мужчынскія галасы.

Андрэй пазнаў: Драздзюк з Макуном.

Яны з маці пайшлі ў другі бок. Лес нечакана парадзеў: пачыналася вырубка. На ўтоптаным снезе валяліся кавалкі распілаванага дрэва, цямнелі горбы галля і яловых лапаў, трашчалі пад нагамі сухія сучкі і галінкі.

Усе кавалкі былі тоўстыя, цяжкія. За які з іх яны ні браліся, не тое што падняць, нават зрушыць з месца не

маглі. Абмінаючы завалы, пайшлі далей, да зложанай у кубы бярозы. Агледзелі адзін кавалак, які ляжаў на самым краі, падставілі санкі. Маці ўперлася рукамі ў гэты кавалак, папхнула, і бервяно, цяжкое, намерзлае, гулка гупнула на санкі. Крэкнулі палазы, але вытрымалі, не зламаліся.

Потым праз увесь лес яны цягнулі тое бервяно і амаль дацягнулі, але на самым выхадзе з лесу санкі ўехалі ў нейкую яміну і заселі там. Андрэй помніў, што яны з мацерою вельмі доўга тузаліся, пакуль іх адтуль вывалаклі, помніў, як потым, абхапіўшы галаву рукамі, сядзела маці на гэтым бервяне, на марозе, а ён стаяў побач і не ведаў, што зрабіць і што сказаць ёй. Маўчалі над імі дрэвы, і праз голле падміргвалі яму з вышыні буйныя азяблыя зоркі.

Адам прыйшоў надвечар. Паўлюк, пачуўшы яго, перамог у сабе слабасць, паволі ссунуўся з печы. Сеў на ўслончык, прытуліўся плячыма да цёплых кахляў. Глядзеў у акно. Падталая за дзень шыба зноў пачынала ляледзець. Зырчэлі, балюча адбіваліся ў ёй чырвоныя прамяні нізкага сонца. Мароз крапчаў.

Рабочыя з лесу пакуль не йшлі. Рукавіцы іхнія, сухія, каравыя, ад самага абеду горбаю ляжалі на прыпеку. Зойдуць, паскідаюць мокрыя, разбяруць сухія і пойдуць. Ні дзякуй, ні на... Як гэта так і трэба. А яна, дачушка яго любімая, дагаджае. На якую халеру!

Але ведаў Паўлюк, што рабочыя ні ў чым не вінаваты, што Анюта інакш не можа: людзі цэлы дзень на такім марозе. І ўсё ж злаваў. На ўвесь свет. І на іх таксама. Ведаў за што. За неміласэрнасць.

Пілуюць, як нежывое, пілуюць і не думаюць, што робяць. І яго разам пілуюць. А што ім?! У гэтага малога, як блыха, з Халопішак убачыў сёння ў вачах насмешку. Злую, нядобрую. Уведалі, што ездзіў да Царэнкі і што вярнуўся ні з чым. Ім смех, ім радасць. Чаму так? І не толькі гэты малы, усе радуюцца. Пілуюць, нішчаць і радуюцца.

Адам кхекаў у парозе, цёр вялікія счырванелыя ад

холаду рукі, тэпаў аб падлогу намерзлымі , цвёрдымі, што касцякі, галёшамі. «Ведаеш што, пастаю тут, не хачу табе холаду наносіць...»

Зайшла ў хату Анюта з поўным вядром вады, запрасіла:

— Праходзь, дзядзька, пасядзі. Нешта наш бацька заслаб зусім.

Адам умасціўся на лаве каля акна, шырокаю спінаю засланіў усю шыбу.

— Пакуль дамясіўся да вас, чыста ўпрэў,— сказаў, расшпіляючы ватоўку, зняў шапку. Рассыпаліся па шырокім ілбе белыя, усё яшчэ густыя валасы. Спытаў:
— У горад ездзіў, да Царэнкі?

Паўлюк кіўнуў.

— І як ён там, наш начальнік?

— Сказаў, што ўжо не начальнік, што бяссільны зрабіць нешта.

— А што ты думаеш. Пэўна ж, не бог ён...

— А-а-а,— Паўлюк роспачна махаў рукою.— Не бог, не бог. Каб хацеў, то зрабіў бы. Усё начальства ў раёне ведае. Але каму што абыходзіць, каму што баліць? Я яму адно, ён мне другое. Кажа, пара табе, Антонавіч, ужо адвыкнуць, што лес твой. І рагоча, як блазен. Не перажывай, кажа, хай робяць, што хочуць, іх права, яны для таго прыстаўленыя, гаспадары. Вот, Адамка, дажылі мы з табою. Кажу яму: яны гаспадары, а я — хто ж, па-твойму? Зноў рагоча: а ты, кажа, Антонавіч, калхознік. Якія ж яны гаспадары, яны ж ворагі, яны ж нішчаць без патрэбы ўсё... Гэта табе, кажа, так здаецца, што без патрэбы, яны лепш знаюць... Вот з тым і прыехаў. І злёг зусім.

— Пэўна ж, і прыехаў. А што ты зробіш... От, я табе скажу, у Бібліі яшчэ напісана: «Не рабіце шкоды ні зямлі, ні мору, ні дрэву». А што выходзіць? Усё наадварот... Хто нас з табою паслухае, Паўла? Яны ўсё знаюць. Панаязджалі з усяго свету, што ім да гэтых лясоў, да зямлі гэтай? Чужое ўсё, душа не баліць. А калі душа не баліць, рукі

што хочаш зробяць. А ты, чалавек, і не пікні. Не тваё — калхознае...

Адам памаўчаў. Потым зноў закхекаў, зноў загаварыў:

— І мае ж дубы, Паўла, таксама выразалі. І пні выдралі. Знаку не асталося. А якія ж былі дубы... Ты ж помніш, што табе казаць. Шапка злятала, як на верхавіну глянеш. Сонца за іх чаплялася, заходзіць не хацела. А цяпер няма за што яму прытрымацца. Раз — і пакацілася. Выразалі, Паўла. Няма. Здаецца, й не было. Так во, калі ўспомніцца. Дубоў няма, Паўла, а я, ведаеш што, жыву. Нічога не зробіш.

— А калі-та вашы дубы выразалі, дзядзька?

Анюта павесіла вядро і ўсё стаяла ў парозе, слухала.

— Калі? Зараз скажу табе.

Адам чухаў сівую патыліцу.

— А ўжо даўнавата. У пяцьдзесят шостым, здаецца... Ну, так, у пяцьдзесят шостым. Праз пару гадоў, як зямлю аб'ядналі. Тады ж гэта, ведаеш што, усё будавалі: свірны, фермы, млын ставілі. Тады панятна. Царэнка так і сказаў: трэба, бацька. Ну, трэба дык трэба. Я — што? Я дзве вайны прайшоў. Не дубамі — дубы клаліся. Я — нічога, што я...

— Ага, тады не крыўда, праўда, дзядзька. А цяпер во — нашто, каб хто спытаў, на якую патрэбу?— Анюта баязліва зірнула на бацьку, сказала амаль шэптам: — Уночы коні толькі храпуць: хто дужшы, той лепшы. Цягаюць як могуць. Усё ж дымам пойдзе, усё за зіму спаляць...

— Гэта сатана гэты, Драздзюк, пастуха падбіў. Сёння сам на свае вушы ў магазіні чуў, усе гавораць. Злы ён на цябе, Паўла, што пры Царэнку ты яго пару разоў залавіў у лесе. Помніш, тады, калі шалік знайшоў яго і ў кантору занёс, Царэнку, а той штраф уляпіў Драздзюку.

— Знаю я ўсё, Адам. Хто, што і як. І Драздзюк, і другія. А ён найболей, гіцаль гэты. Ты вот кажаш, чужыя, прыезджыя, а свае каторыя, чым яны лепшыя. Як пастух гэты, Бучок, толькі заехаў, ён яго першым дзелам сюды, у лес, прывёз, на агледзіны. Я тады іх сустрэў на бялявіне, і ногі паслабелі. У вазку, як панкі, сядзяць, а Драздзюк пугаўём

усё ў бярозы тыкае — сюды-туды, здэцца, каб мог, то зараз бы распасцёрся і грыз бы.

Паглядзеў я, усё, думаю, канец. Так яно й вышла.

...Што смерць і што вечнасць? На яе, старую яліну, кажуць вечназялёная. Людзі не бачаць, як адмірае яе ігліца, як сохнуць сучкі і галінкі, пад'едзеныя яловаю губкаю, гэтым страшным паразітам, які пакідае на целе белыя палосы — свае смяротныя знакі. Людзі не бачаць, як няўмольна трэскае і лушчыцца на ёй кара і заводзяцца там лубаеды, якія штодня і штоночы несупынна, балюча точаць яе цела.

Яна пакуль што зялёная, так. Але ж гэта не вечна. Яна пакуль што магутная, але ж... Хіба яна не чула, як стагналі, чапляліся галінамі за жыццё маладзейшыя, мацнейшыя за яе дрэвы ў лесе, а ўсё роўна падалі і падалі, падкошаныя без пары няўмольнаю касою смерці. Дык хіба можна казаць на яе — вечназялёная, хіба, ўвогуле можна казаць пра вечнасць? Нічога і нікога няма на зямлі вечнага. Гаспадар калісьці даўно, калі яшчэ быў жывы, але ўжо моцна хворы, сказаў ёй: «Нашто жыць, калі няма радасці? Чалавек павінен мець радасць ад жыцця, іначай усё траціць сэнс. Ты ведаеш,— сказаў ён,— радасць даваў мне толькі лес. Лес быў маім жыццём. Я гадаваў яго для людзей, а не для варвараў. Тое, што каштавала мне ўсяго жыцця, яны знішчылі за тыдзень. І разам знішчылі і мяне...»

Гаспадар памыліўся тады. Яго не знішчылі. Адзіны, хто вечны на гэтай зямлі,— Гаспадар. Без яго зямля быць не можа. Таму й адчыняюцца штораніцы шырокія форткі дзвярэй у хляве, і выводзіць адтуль Гаспадар свайго Гнедага, і ўзрывае ранішнюю цішыню імклівы цокат...

Ёсць вечнасць на зямлі і ёсць смерць. Нядаўна чула яліна жалобную, што, здэцца, ірвала яе старое нутро, музыку. Зусім блізка каля яе людзі пранеслі нязвыкла маленькую труну. За трунoю ішла маладая, заўчасна пасівелая жанчына і горка плакала. Не, яна не плакала, яна стагнала. Так, як стогне смяротна параненае дрэва. Смутак, жуда і

вялікая роспач былі ў тым стогне. І не магла пазнаць яліна ў гэтай прыбітай горам жанчыне тую бялявую смяшлівую дзяўчынку, якая лётала пад ёю на арэлях і шчасліва, звонка смяялася. Не магла яна пазнаць у гэтай жанчыне і тае юнай, у белым плацечку дзяўчыны, што стаяла тут жа, пад ёю, цёплымі летнімі начамі з іхнім Андрэем і ў адказ на яго пацалункі і пяшчоту шаптала яму якіясь бяздумна-шчаслівыя словы. Не магла пазнаць. А можа, пазнаваць не хацела. Толькі шум яе вечназялёнага веццяя стаў яшчэ больш глухі і трывожны.

* * *

Дзьме вільготны паўднёвы вецер. У падталых лужынах, у разорах стаіць наверсе, моршчыцца ад ветру вада, а ўнізе, пад ёю, ссінелаю і халоднаю, ляжыць яшчэ тоўсты, угінасты лёд. Ён не трашчыць, калі нага часам плюхае ў лужыну і слізгае па ім, а толькі глыбока прагінаецца і ўсё ж трымае, не дае праваліцца да глейкага, падталага грунту.

Снег, брудны, наздраваты, ляжыць толькі ў лашчынах, а на пагорках ужо шарэе падсушаная ветрам зямля і сям-там вызіраюць чубкі жывой леташняй травы, што перазімавала, перахавалася пад снегам і цяпер дражніць вока сваім нязвыклым для такой пары зяленівам.

Вакол гола і непрытульна. Стаіць пачатак красавіка, тая няпэўная пара ў прыродзе, калі ўсё яшчэ дужаецца зіма з вясною, калі нечакана, пасля цяпла і веснавой лагоды, можа змяніцца вецер, закінуць раптам з паўночнага боку. І тады прыпаўзуць цяжкія снегавыя хмары і пасыплюць на прыціхлую, знямелую ад неспадзяванкі зямлю шорсткія, халодныя крупы.

«Бог палаці змятае»— жартам кажуць пра гэты апошні снег у народзе.

Цяжка такою парою прыходзіцца пералётнаму птаству. Шыюцца бліжэй да чалавечага жытла жаўранак

і пліска, сядзіць, прыхаваўшыся пад кустом у прыбалатку, нахохліўшы вузкі чубок, кнігаўка.

Варта змяніцца ветру, варта вызірнуць сонцу, як зноў усё ажыве, заварушыцца і першы прывітае цяпло сваім пералівістым цюрлíканнем, высока над зямлёю ўзаўецца ад радасці палявы жаўранак...

Лістанішкі. Жвіранішкі. Казіны рог. Лучка. Вырабак... Дзе вы, астравочкі маленства? Чыстае поле, без адзінага кусціка, без адзінага дрэўца. Непрытульна дзьме вецер, хоць і паўднёвы, на гэтай прасторы пранізвае да касцей, і ад яго слязяцца вочы, туманіцца позірк.

Лістанішкі... Жвіранішкі... Не ўгледзець вас, не ўбачыць. Дзьме вецер, засцілае слязою вочы, і над полем звоніць і звоніць жаўрук. Як і дзесяць, як і дваццаць, як і шмат гадоў назад. Дзе тыя людзі і дзе тыя дрэвы, што слухалі твой срэбны званочак, мілая пташка? Няма іх. І ніякая плёнка не зафіксуе ўжо нават аднаго-адзінага імгнення з іх жыцця. Астаецца памяць...

Андрэй ішоў па ўскрайку разбітай трактарамі дарогі. Адсюль была добра відна іх хата на пагорку, высокая цёмная елка канцы хаты, воддаль шарэў садок. На захадзе, якраз над садком, ярка чырвеніла неба.

Андрэй падумаў, што нядаўна па гэтай дарозе везлі хаваць Галінага сына. Наранку маці гаварыла яму то пра сваіх птушак, то пра Вульку, адцягвала гэту сумную навіну. Ён ішоў і думаў пра Галю. Жаласць да яе змагалася ў яго душы з нейкаю незразумелаю злосцю і крыўдаю. На каго, на што? На сябе, на сваё бяссілле перад тым, што ўжо адбылося і чаго ўжо, як бы ні хацеў, як бы ні стараўся, а не паправіш, не зменіш? Упершыню за гэтыя гады адчуў сваю віну перад Галяю. Як бы толькі цяпер зразумеў нешта намнога важнейшае, большае, чым звыклая крыўда на яе, якую насіў у сабе ажно з таго дня, калі даведаўся, што яна выйшла замуж.

Нядаўна сюдою везлі яе сына, яе Андрэя. Дзве глыбокія, пакінутыя цяжкімі коламі каляіны былі запоўнены мутнаю

вадою. Спрабаваў уявіць усё тое і не мог. Перад вачыма паўставала далёкае халоднае прадвесне тысяча дзевяцьсот шэсцьдзесят сёмага года, калі па гэтай дарозе везлі хаваць дзеда Паўлюка. Везлі канём. Труна стаяла на возе, засланым чырвонаю, у чорныя дробныя клетачкі, дзяругаю, убраная, абтыканая з бакоў маладымі елачкамі.

Тады гэтаксама, як цяпер, моршчылася ад ветру ў глыбокіх разорах каля дарогі вада, гэтаксама пахла падталым снегам і свежаю сырою зямлёю.

Вецер матляў высокія пратэсы, якія разам з новым шырокім крыжам неслі паперадзе пліскаўскія мужчыны. І рваўся на ветры, адлятаў у поле, асіплы ад доўгага плачу, матчын голас. Яна ўвесь час гладзіла рукамі жоўтае, з цёмнымі вочкамі прасмаленых сучкоў, века труны, без перасціху вылічала. Да Андрэя пасля яшчэ доўга вярталіся тыя мацерыны словы, мучылі сваёю безвыходнасцю і жалем: «Ах, татачка, татачка, а ў якую ж доўгую дарожку ты выбраўся?! Азірніся ж хоць на сваю хатку, яна ж пусценькая без цябе асталася. А скора ж вяснічка прыйдзе, а наш лясок не зазелянее, і зязюлька ў ім не закувае, гадкоў табе не палічыць...»

Андрэй азіраўся тады ўвесь час на сваю хату і не пазнаваў яе. Без лесу, на голым пагорку яна здавалася чужою. Стаяла адзінока, сіратліва пазірала ўслед бліскучымі — адбівалася ў шыбах сонца — вокнамі. І толькі старая елка каля яе цяжка махала сваімі шырокімі цёмнымі галінамі...

Пустка за хатаю палохала пасля яшчэ вельмі доўга. Гэтак, як і сама хата — маўклівая і няўтульная без дзеда, без яго глухаватага голасу, без звыклага свісту гэбліка, без духмяных, пухнатых горбачак стружак у куце, на якіх Андрэй любіў сядзець...

Цяпер, ідучы, Андрэй раз-пораз прыпыняўся, пазіраў туды, дзе быў лес, як бы хацеў угледзець яго, але ў вачах паўставалі толькі асобныя куточкі і дрэвы, якія ўбачыў нядаўна на здымках свайго настаўніка Антона Антонавіча Тамашэвіча. «О, лес мой, лес мой залаты, прысніся зноў, прысніся ты...»

Перад Андрэем, як кінуць вокам, ляжала рабое, заворанае на зіму поле, і над полем узлятала і зноў рэзка апускалася ўніз, шырока махаючы крыламі, кнігаўка. Крычала. Чым бліжэй ён падыходзіў, тым настойлівей і трывожней птушка дапытвала: «Чый-вы?, чый-вы?, чый-вы?»

Андрэй ішоў напрасткі, не разбіраючы дарогі, і на левым звыкла прыпаднятым плячы яго вісеў «Зеніт», якога ён за гэту сваю вандроўку так ні разу і не адкрыў.

Пад самы вечар яны рэзалі з мацераю сечку. Хутка шахаў навостраны нож, лёгка хадзілі змазаныя шасцерні і круцілася рудое кола старой ангельскай сячкарні.

З-пад нажа пырскалі сухія, вострыя ражончыкі канюшыны.

Андрэй, учапіўшыся за гладкі, адпаліраваны рукамі тронак, круціў кола, а маці падавала сена ў скрынку.

Сена, як заўсёды напрадвесні, курэла: у адчыненыя дзверы цягнула зеленаваты гаркавы пылок. Ад яго пяршыла ў горле, і яны стараліся не размаўляць.

Але вот маці падняла з тока апошні ахапак, падала яго ў скрынку, і праз колькі хвілін нож шаргануў па жалезе, кола спынілася.

Маці зірнула з-пад запыленых павек на Андрэя:

— Адпачынь, сынок. Я адгарну, перамяшаю сечку.

Ён адышоў убок, прысланіўся да сцяны, глядзеў, як маці горне маленькімі, на два ражкі, вілцамі сечку з-пад сячкарні і, адгарнуўшы яе, перамешвае па колькі разоў у куце. Потым скінулі з тарпа яшчэ сена. Андрэй залез на палаці, зняў пару ахапкаў канюшыны.

Ізноў шахаў нож, круцілася рудое кола старой сячкарні.

Прымінаючы ў скрынцы шорсткае сена, нечакана азвалася маці:

— Гэта што я хацела спытаць у цябе, сынок...

— Ну? — Андрэй не адымаў рук ад тронка, толькі ўзняў вочы. Маці глядзела на яго гэтаксама дапытліва, неспакойна, як глядзела яшчэ ў хаце, калі расказвала пра Галіну бяду.





— Ты ж Антона Тамашэвіча, настаўніка свайго, помніш?

— Ну...— Андрэй мацней сціснуў гладкі, цёплы ад рук тронак, апусціў вочы.— Помню, чаму ж...— сказаў ціха, як самаму сабе.

— Дык во, прыязджаў ён сюды, у Пліску, тыдні два назад. Заходзіў да нас, пра цябе ўсё распытваў: дзе робіш, кім?

— Ну, як ён, Тамашэвіч, нічога, трымаецца? — Андрэй адчуваў на сабе ўважлівы матчын позірк.

— Анічога, як быў сівы, так і астаўся.— Маці засмяялася сарамліва, ціха, як дзяўчына. Андрэя нядобра кальнуў яе смех. Як тады ў маленстве, у тым залітым вадою алешніку.— Ды я спытаць хацела, ці палучыў ты фотаздымкі ад яго, бо казаў, што вышле, адрас браў...

— Якія фотаздымкі? — нечакана вырвалася ў Андрэя, і ён зноў учапіўся за тронак. Сам не ведаў, чаму так спытаў...

— Лесу нашага. Ён тады ж усё фатаграфаваў, як ты цяпер. Возьме фотаапарат і ходзіць...

«Ага, якраз як я...»

— Не, не палучаў,— Андрэй сказаў гэта хутка, адрывіста. Атрымалася як бы злосна.

Маці змоўкла.

Хутка, рэзка шахаў па шорсткім сене шырокі востры нож, усё хутчэй круцілася рудое цяжкае кола: шах-шах, шах-шах. Пырскалі ў бакі кароткія сухія ражончыкі. Лез у рот і ў вочы горкі зеленаваты пыл.

— А я думала, што ты прывязеш тыя картачкі, глянуць хацелася.— Маці гаварыла так, як бы за нешта прабачалася перад ім ці ў нечым апраўдвалася.— Хоць і помню ўсё чыста, дрэва кожнае, здэцца, помню. Бывае, калі ляжыш уночы, успомніш і лес паўстане перад вачыма, як жывы. Здэцца, й шум яго чуеш за хатаю, здэцца, раніцаю прачнешся і пойдзеш па ім...— Маці крыху памаўчала, ма-

быць, уяўляючы, як бы яна пайшла па лесе, шамотала на таку сенам.— Але хацелася глянуць на тыя карткі...

У Андрэя запяршыла ў горле. Ён закашляўся, адпусціў тронак, адышоў да дзвярэй...

У хаце, шукаючы на гарышчы свае старыя гумовікі, Андрэй выпадкова адкрыў запыленую, з іржаваю акантоўкаю валізку, з якою калісьці прыехаў у Пліску яго бацька Афанасій Валуеў, і сярод кніг і розных непатрэбных квітоў неспадзявана агледзеў свой самаробны блакнот з дзіцячымі запісамі. Запісаў было няшмат. Уверсе над кожным стаяла дата — толькі чысло. Ён, не падымаючыся з каленяў, проста над валізкаю перагарнуў звільгатнелыя, што рэзка пахлі тухлінаю, старонкі.

«12 студзеня.

Пілуюць лес. З нашага падворка чутно, як крэкчуць і падаюць дрэвы. А сёння я бачыў, як уцякалі з лесу вавёркі. Іх было шмат. І яны беглі да нас — рыжы шнур цягнуўся праз садок да яліны, а потым з яе сукоў і галінак, праз акенца, вавёркі залазілі на гарышча. Цяпер яны тупацяць там, скачуць і лушчаць сушаныя грушы-дзічкі. Я пастпаўся на гарышча па драбінах і сам бачыў. Шкада іх. Дзед Паўлюк кажа, што вавёркі не выжывуць, бо цяпер зіма, а іхнія грыбы і арэхі асталіся ў разбураных дуплах і гнёздах. Іх, пэўна, пазабіралі лесарубы...»

«17 студзеня.

Лес пілуюць ужо каля хаты. Шкада найбольш бяроз на бялявіне. Яны такія высокія, белыя і прыгожыя.

Дзед Паўлюк зусім не хоча злазіць з печы, і ўчора я бачыў, як ён плакаў. Мама таксама плача. А мне найбольш шкада вавёрак і бяроз на бялявіне.

А з тых спілаваных бяроз
Не пойдзе сок ужо ніколі.
А мне шкада, шкада да слёз,

Што з тых спілаваных бяроз
Не пойдзе сок ужо ніколі».

(Некалькі лісткоў з блакнота вырваны. Што там было напісана, Андрэй цяпер не памятаў)...

«18 студзеня.

Сёння да нас прыходзіў Макун. Сеў на лаве, падняў палец угору і кажа: «О, чую, у вас каўняры на гарышчы скачуць...» А мама: «Якія каўняры, Антак?» А ён: «Рыжыя. Пушыстыя».

Я адразу здагадаўся, што ён пра вавёрак, і вельмі спалохаўся. Тоўсты гэты Макун, чырвоны і ўсё пыхкае: пых, пых.

Дзед пачуў і з печы яму: «Якое табе дзела, хто ў мяне па гарышчы скача. Ты ў сябе глядзі...»

Макун яшчэ болей пачырванеў, запыхкаў: «Мне ўсюды дзела, я ўсюды магу паглядзець...»

А дзед тады: «У адным месцы паглядзі, ясна?»

Мяне смех разабраў.

А Макун усхапіўся і кажа: «Для сябе беражэш вавёрачак? Адзін скарыстаць хочаш? Не выйдзе. З лесам не выйшла. І тут не выйдзе».

А мама тады дзверы адчыніла і кажа яму: «Ідзі, Антак, не чапай бацькі».

А Макун надзьмуўся ўвесь: «Хай падзякуе твой бацька, што на печы ляжыць. Мог бы далёка быць».

І з хаты выкаціўся. Мама зачыніла дзверы, глядзела ў акно і маўчала. Дзед кашляў. А я выбег у сені і хуценька залез на гарышча. Вавёркі сядзелі па кутах і глядзелі на мяне сваімі чорнымі вочкамі. Груш у іх асталося ўжо зусім мала».

«19 студзеня.

Мы з Мішкам Крыўцом, іхнім Ромкам і Антоськам Рубцом гулялі ў «партызан». Я падгаварыў хлопцаў, мы падкраліся да бярозы, каля якой стаялі пілы, і, пакуль

рабочыя грэліся каля кастра, ухапілі гэтыя пілы, адбегліся і схавалі іх у снезе. Хай пашукаюць...»

«23 студзеня.

Сёння ў Галі Драздзюковай дзень нараджэння. Ёй заўсёды спраўляюць гэты дзень. Да іх прыходзяць дарослыя госці, усё больш калгасныя начальнікі. З імі дружыць яе бацька, дзядзька Селівон. І мы прыходзім таксама.

Нам ставяць асобны столік, але там усё, як у дарослых. Нават гарэлка. Цётка Алена, Галіна маці, кажа, што гэта, каб быў апетыт.

А мінулы год Антоська Рубец выпіў тры чаркі і п'яны пабіў у сваёй хаце ўсе вокны. А я выпіў адну, прыйшоў дахаты, і мяне вырвала. Мама плакала, баялася, каб я не памёр. А дзед назаўтра дастаў з-пад бэлькі дубец і даў мне на закуску «бярозавай кашы».

Сёння мяне могуць не пусціць туды. Але дзед хворы. А маму я як-небудзь упрашу.

Мне трэба напісаць Галі вершы. Ад усіх нас, ад хлопцаў. Але вершы я ўмею пісаць толькі пра лес».

«24 студзеня.

Учора ў Галі быў дзень нараджэння. Я ўсё ж напісаў ёй невялічкі вершык. І прачытаў. Усе пляскалі ў далоні і хвалілі мяне. Толькі дзядзька Селівон сядзеў надзьмуты, як гусак. Я чамусьці баюся яго. Галя была давольная. Учора яна была вельмі прыгожая ў новай зялёнай сукенцы.

Аказваецца, у яе і вочы зялёныя, а ў вершыку я напісаў: «Твае сінія вочы». Таму, пэўна, дзядзька Селівон быў злы і назваў мяне лыгуном.

Потым ён паклікаў мяне да свайго стала і сказаў, што за вершык хоча пачаставаць мяне мёдам. І падаў вялікую лыжку. Я, як той дурань, хапануў яе адразу ў рот. У мяне закаціўся дух і палезлі на лоб вочы. Я пляваўся і плакаў, а ўсе рагаталі. У лыжцы была гарчыца...

Пілі ўчора ўсе шмат. І мы за сваім столікам таксама.

І мне зусім не было блага. Не тое што мінулы год.

Чамусьці ўчора ўсе абдымаліся. Дзядзька Селівон абдымаў нашага старшыню Бучка і так ляпаў яго па плячы, што той ажно ўгінаўся. Бучок маленькі, а дзядзька Селівон вунь які граміла.

Антоська Рубец нечакана абняў Галю, і мяне гэта раззлавала. Мы з ім пабіліся. Мішка ледзьве разбараніў. А Галя глядзела на нас і смяялася.

І мне чамусьці было сорамна. Вершыкаў я ёй больш пісаць не буду. Хай піша Антоська...»

Андрэй загарнуў блакнот. Дзіўна, але ён даўным-даўно забыў пра існаванне гэтых наіўных дзіцячых запісаў. А, па сутнасці, з іх пачыналіся яго, Андрэевы, творчыя пакуты.

Ён потым пісаў Галі шмат вершаў, але яна заўсёды аставалася да іх раўнадушная, а можа, хацела здавацца такою...

У верасах грыбы збіралі,
У верасах гублялі дні.
Рабінаў жоўтыя каралі
Свяцілі з цёмнай глыбіні.

Чытаў ён натхнёна, злёгку прыплюшчыўшы вочы, а яна нечакана абрывала яго і пачынала дапытваць, што значыць: «у верасах гублялі дні»? І заўсёды смяялася: «Дзіўны ты, Андрэй. Праўду бацька кажа: выдумшчык і лыгун. Але я цябе ўсё роўна люблю».

Андрэй стрымліваў сябе, каб не раззлавацца і не нагаварыць ёй дрэннага пра яе залішне разумнага бацьку...

Але аднаго разу яны ўсё ж пасварыліся.

Тады была позняя восень. Улетку ён паступаў на журфак, зрэзаўся на экзамене па замежнай мове і вярнуўся дахаты. Аднакласнікі раз'ехаліся з Пліскі. Мішка Крывец паступіў у сельгасінстытут, вучыўся на агранома, Антоська Рубец падаўся на БАМ, Віцька Ігнатаў ужо служыў на граніцы, а ён пакуль не ведаў, куды прыткнуцца. У армію яго павінны былі прызваць толькі вясною.

Галя вучылася ў тэхнікуме на ветурача, але прыязджала дахаты кожныя выхадныя. Прыязджала дзеля яго. Сустрэчы з ёю былі тады Андрэю адзіным паратункам. І яшчэ — вершы. Ён тую восень пісаў іх шмат...

А бярэзнік — задзьмутыя свечкі,
Парафінавы пах над зямлёй,—
Да апошняй маёй асечкі
Будзе бегчы і бегчы за мной.

І таму не здаецца мне вечным
Твой азораны шэпт у цішы,
Што бярэзнічак белыя свечкі
Па маёй ужо ставіць душы.

Чытаў Андрэй трагічным голасам, а Галя смяялася. Яна проста рагатала, залівіста, весела, і праз смех пытала: «Ты што, паміраць сабраўся? Ну, прыдумаў». Яны тады першы і апошні раз пасварыліся.

— Ты нічога не разумееш у паэзіі,— сказаў ён пакрыўджана.

— Дзе ўжо мне. Я буду ўсё жыццё лячыць каровак і свінак,— яна ўсё яшчэ ўсміхалася.

— Вот-вот, каб круціць кароўкам хвасты, паэзіі не трэба.

Яна таксама пакрыўдзілася. Заблішчэлі зялёныя, як агрэсціны, вочы. Сказала ціха, сур'ёзна:

— Навошта ты так, Андрэй? Гэта вельмі адказна — лячыць жывёлу.

— Тожа мне лекарка знайшлася,— ён здзекліва зарагатаў.

Яны былі квіты і тут жа лёгка памірыліся. Але нешта ўсё ж адбылося з імі. Галя перастала ездзіць кожныя выхадныя дахаты, а ён ніколі больш не чытаў ёй сваіх вершаў.

Толькі аднойчы, ужо з арміі, сумуючы па ёй, напісаў:

Час лечыць,
Адлегласць лечыць.
Ростань лечыць.
Людзі імкнуцца быць здаровымі.

Абвяргаю час ва ўсіх яго вымярэннях.
Закрэсліваю адлегласць.
Іду праз ростань.
І больш за ўсё баюся выздараўлення.

Але Галя, як заўсёды, нічога не зразумела. Праз колькі часу Андрэй атрымаў ад яе кароценькі ліст: «Не пішы мне больш. Выходжу замуж. Галя».

Даўно ўжо была ноч. Глухая і цёмная. Андрэй чуў, як глыбока, цяжка дыхае ў сне маці, як трывожна шуміць за хатаю старая елка, і, не могучы заснуць, неспакойна варочаўся на ложку. Яму здавалася, што ніколі яшчэ так, як гэту ноч, не шумела старая елка, ніколі так цяжка не дыхала ў сне маці.

Ён уяўляў, як ляжыць яна ў гэтай пустой хаце такімі вось доўгімі цёмнымі начамі, і страх за яе, і адчуванне свае віны перад ёю нядобра абзываліся ў душы. Успомніў, як перад сном маці ні з таго ні з сяго загаварыла пра старых Гардзевічаў.

Андрэй недалюбліваў згорбленай, што заўсёды падслепавата мружылася, Гардзевічыхі. Яна, колькі ён памятае, была як прыдзяцінеўшы. Нават перад імі, перад дзецьмі, калісьці магла пачаць расказваць што-небудзь непрыстойнае або раптам заспяваць дурнаватую прыпеўку: «Дзед боб малаціў, баба падсявала...» Яны, хлопцы, звычайна гыгыкалі, а дзяўчаты чырванелі і пазбягалі Гардзевічыхі. Стары Гардзевіч усё жыццё біў яе, душыў работаю і душыўся сам.

Адзіны іх сын быў нашмат старэйшы за Андрэя. Служыў спачатку ў марфлоце, потым вучыўся ў Маскве ў інстытуце, ажаніўся там і астаўся працаваць пры нейкім міністэрстве. Да бацькоў прыязджаў рэдка і ненадоўга. Андрэй яго гадоў пяць ужо не бачыў у Плісцы.

Вечарам маці, сумна пасміхаючыся, успаміна, што Аленка, калі йшчэ сын толькі пайшоў вучыцца, усё хвалілася перад бабамі на брыгадзе: «Мой Стасючок казаў: пачакай, мама, вот вывучуся, ты ў мяне паняю будзеш.

У горад цябе забяру, нічога рабіць не дам. Прыбяру, і будзеш сабе сядзець на лаўцы...»

Вот і вывучыўся яе Стасючок, і ўжо колькі гадоў прайшло, а Гардзевічыха, як «панавала», так і «пануе». Маці сумна засмяялася: «Зусім дабілася гэта пані, а Стасючок і вачэй не пакажа. Ужо й не помняць, калі быў. Летам з курорту нейкага фотакартку прыслаў: з жонкаю, каля мора. Абое раскормленыя, сытыя, стаяць і смяюцца. Давольныя. Аленка насіла, усім суседзям паказвала, хвалілася.

А ўчора плакала перада мною, калі я ёй тое панства ўспомніла. Казала, што, можа, й хаваць не прыедзе, часу не дабярэ. А стары Гардзевіч, ты ж ведаеш, ганарлівы, не ўпадабаў, што яна гэтак перада мною на сына, як крыкне на яе: «Што ты панімаеш, дурніца? Сынок міністар, калі яму да цябе швэндаць за блізкі свет. Гэта табе не жарты — гасударсцвенны чалавек...»

Маці ўсё пасміхалася, расказваючы, а ён слухаў і думаў, што яна, маці яго, гэтаксама пануе, як і Гардзевічыха, хоць ён і не «міністар»... Старыя Гардзевічы ўвесь час удваіх, а яна адна тут.

* * *

У музеі зноў рыхтавалася нейкая новая выстава, і два тыдні праляцелі амаль незаўважна.

Адзін толькі Раланд па-блазенску пахіхікваў і ўсё часцей дакучаў, нагадваў Андрэю, што даўно пара зазірнуць да Рымы ў «салон». Сёння ўпрошваў асабліва настойліва. Засумавалі яны, бачыце, Андрэй ім спатрэбіўся. Да ўсяго таго — Раланд ажно задаволена жмурыўся — і «Запарожац» пад рукамі, не трэба таўчыся ў перапоўненым аўтобусе.

Ужо ў машыне раптам запытаў, як там, у Андрэя, у вёсцы, але, не дачакаўшыся адказу, разгаварыўся сам.

— Продкі ў мяне вельмі цікавыя людзі. Поўная процілегласць адно аднаму. Ты б пабачыў. Бацька, ён, дарэчы,

на цябе нечым падобны,— крыху збавіўшы хуткасць, Раланд адарваў вочы ад дарогі, зірнуў на Андрэя.— Праўда, праўда. Не смейся. Нават знешне. Такі, прабач, як ты, трохі цельпукаваты. Ну, вясковы, адным словам.

Андрэй не адказаў, толькі хмыкнуў: усе вясковыя, выходзіць, цельпукаватыя.

— А маці — местачковая, але лічыць сябе гарадскою, загрызае бацьку. Я, ведаеш, чым яе даводзіў, як у школу хадзіў? Гразіўся, што пасля школы паеду ў вёску, трактарыстам буду, як бацькаў брат, дзядзька Міхась. А мне, чэсна, трохі падабалася ў вёсцы. Усё там неяк прасцей, чысцей, ці што? Дык вот, калі што якое, ну не купяць мне там чаго ці не пусцяць куды, я адразу: уцяку ў вёску, буду трактарыстам. Маці вар'яцее. На бацьку з кулакамі кідаецца: «Гэта ўсё ты, ты вінаваты. Гены твае. У нас усе гарадскія, ніхто ніколі з радні ў вёсцы не жыў. А ў цябе ўсе калхознікі. Цябе выцягнула за вушы з гразі, дык на табе — сына туды цягне...» А я слухаю іх і ад смеху канчаюся... Так вот яны мне і гэты «Запарожац» купілі. Я ўмову паставіў: ці машына, ці трактар, і вечнае жыццё адзінага сына ў вёсцы пад крылом бабкі Міхаліны і дзядзькі Міхася.

Раланд зарагатаў, рэзка тармазнуў на перакрыжаванні.

— Ну, ты не балбачы, а то зараз пацалуемся з кім-небудзь.

Андрэй балюча выцяўся локцем аб вострую ручку, незадаволена глянуў на вясёлага і сёння, як ніколі, балбатлівага Мышкуна.

— А ты нешта пасля матчыных бліноў другі тыдзень адысці не можаш.

— Матчыны бліны не цешчыны,— буркнуў Андрэй.

— А, ладна, стары. Скора прыедзем да Рымачкі, яна табе настрой падыме...

Яны выехалі на Рыміну ціхую доўгую вуліцу, і Раланд зноў расслабіўся, заўсміхаўся.

— Я табе не расказаў усяго пра сваіх старых. Гэта ж

маці мне імя такое адкапала. Бабе Міхаліне на злосць. Баба хацела, каб мяне Іванам назвалі, як дзеда. А маці — ні туды. Думала-думала і прыдумала: бабка і па сённяшні дзень не можа нікому сказаць, як яе ўнука завуць...

Раланд рагатнуў, памаўчаў, які час уважліва сачыў за дарогаю. Потым зноў ажывіўся.

— Дарэчы, пра Рымачку... Нешта ты хаваешся ад яе. Толькі дарэмна, стары. Я ж бачу, ты ўліп. А ў яе муж і каханак. Ты хоць разумееш, якія ў іх з Вовікам адносіны?

Андрэй бачыў у верхнім люстэрку светлыя, нахабна-насмешлівыя Раландавы вочы і ўсё больш хмурнеў, не абзываўся.

— Ну, што, канешне ж, разумееш, не маленькі. Але ты не губляйся. Яшчэ мудры Ларошфуко сказаў: «Можна сустрэць жанчыну, якая не мела каханкаў, але цяжка сустрэць такую, якая мела толькі аднаго». Улавіў? Так што ў цябе ёсць шанс, не губляйся. А то я гляджу, ты...

— Слухай, спыні, а? — Андрэй не даў Мышкуну дагаварыць, таўхануў у плячо.

Раланд тармазнуў, здзіўлена павярнуў галаву:

— Што такое? Мы амаль прыехалі...

— Не важна. Разумееш, я забыў. Гаспадыня прасіла... Я абяцаў... Адным словам, мне трэба дахаты, на кватэру.

— Ну-ну...— У светлых Раландавых вачах адбіўся недавер.— Як знаеш.

— Ага. Будзь.

Андрэй выцерабіўся з цеснага «Запарожца», ляпнуў дзверцамі. Не азіраючыся, подбегам кінуўся да прыпынку...

Клаўдзя Пятроўна працавала ў другую змену. У кватэры было нязвыкла ціха і пуста. Радуючыся гэтай адзіноце, якая выпадала не так і часта, Андрэй распрануўся і прайшоў у свой пакойчык. На століку пры акне, паверх раскіданых папераў і кніг, адразу ўбачыў ліст ад маці.

Правільна. Усё, як заўсёды. Ён, як заехаў у Мінск, адразу ж напісаў ёй, яна адказала.

Андрэй разарваў канверт, выняў удвае складзены аркуш і здзівіўся, што маці напісала яму нязвыкла шмат. Ліст быў спісаны з двух бакоў.

«Андрэечка. Ты нядаўна быў у хаце, дазнаўся пра бяду ў Галі Драздзюковай. А тут во ўжо другая бяда прыйшла. Толькі ты паехаў, наехалі на другі дзень начальнікі з раёна і нават з вобласці быў адзін. Я дык яго адразу не пазнала, а мне Стэпка Макунова кажа: гэта ж Бучок, старшыня наш былы. Круглы стаў, гладкі, важны такі. Толькі сапе. Ён там у вобласці начальнікам над усёю асушкаю, над міліярацаю гэтаю. Дык от прыязджалі глядзець, кажуць, план ужо складзены, увесь «хвост» нашай Пліскі будуць зносіць. Асушаць будуць тут усе абшары, і Сіняўку нашу спрамляць надумалі. От як, сынок. Не ведала я, што й рабіць, як яны паехалі. Месца сабе не знаходзіла. Хадзіла да Крыўцоў, да Мішкі твайго. Кажа, што я, цётка, зраблю, калі гэта ўсё зверху ідзе. Ён табе ўвечары раз тэлефанаваў на кватэру, але гаспадыня сказала, што ты позна прыходзіш. Дзе ты, сынок, ночаю па тым месці ходзіш адзін?

Не магу спаць я цяпер, усё думаю. Усё жыццё сваё за гэты час перадумала. І ўсё яно выходзіць, з самага пачатку і да смерці, што няма ў гэтым жыцці ні спакою, ні пэўнасці. Усё нейкая вечная мітрэнга. Усё чалавека гэтага штырхаюць з усіх бакоў, дыхнуць не даюць.

Бучок тады падышоў да мяне і кажа: «Шыкуйцеся, хату зносіць будзем». А я ў яго на тым слові і пытаю: «Хіба мала вы за свой век пазносілі? А хату гэту будзеце зносіць, як мяне адсюль вынесуць. Не раней». Не ведаю, сынок, як і што рабіць. Трэба парадзіцца з табою. Старое дрэва, сам ведаеш, не перасаджваюць. Адным словам, бяда такая. От, каб трохі, то забылася б.


У Мішкі Крыўца чацвёрты сын нарадзіўся. Такі ўжо рады. Кажа, Паўлюком назаву. У гонар дзеда вашага...»

* * *

Ні адно дрэва не шуміць так трывожна і глуха, як елка. І ні адна елка не шуміць так, як гэта: старая, пракаветная, разлапістая, што расце канцы Багунцовай хаты. Колькі яна перажыла за свой век, колькі ўсяго бачыла і помніла. Яшчэ з тае свае ярка-зялёнай маладосці помніла. Яшчэ дотык цёплай Паўлюковай далоні. Шчаслівы то быў час, і быў у яліны адзіны сапраўдны Гаспадар...

А зусім нядаўна адчула яна халодны нежывы дотык металу. Як дотык смерці. І здрыганулася ўся, зашумела, шырока і цяжка махаючы амшэлым вечназялёным голлем..

АПАВЯДАННІ



ШЫКУНЫ

Шыкуноў у Чаранях было шмат, амаль паўвёскі. Усе яны даводзіліся адны адным раднёю, але ўжо далёкаю, і самі падчас не ведалі якою, у якім калене.

Старыя Шыкуны амаль усе паўміралі, а дзеці іх і ўнукі не надта тае радні пільнаваліся. І ўсё ж у Чаранях былі Шыкуны адметныя. Нават з выгляду. Рыжаватыя, невысокія, з глыбока пасаджанымі вачыма пад белаватымі, як злінялымі, брывамі. І хадзілі ўсе неяк аднолькава — па-качынаму, смешна перавальваючыся з боку на бок. Былі яны, як адзін, зайздросныя, любілі павыхваляцца і хоць чым, але выдзеліцца ад другіх.

Выдзяляліся ж найперш мянушкамі, якіх кожны меў дастаткова.

У Зміцера Шыкуна мянушак тых было хіба найболей. Адны яму дасталіся ў спадчыну ад дзеда і бацькі, другія

ён прыдбаў за свае сорак сем гадоў жыцця ў Чаранях сам. Але ўсё ж тыя, спадчынныя, былі найбольш ліпучыя. Зміцер з імі даўно ўжо звыкся і не надта крыўдаваў, калі на свае вушы чуў, як яго, да прыкладу, хто-небудзь называў Пісарам. Больш таго, на добрым падпітку іншы раз пачынаў расказваць пра свайго дзеда, які за польскім часам быў як быццам пісарам. «Не быля што чалавек быў — граматны»,— хваліўся, бывала, Зміцер. Але ў сваёй вёсцы не надта ты чым пахвалішся — усе і так лепей за цябе самога ўсё ведаюць. Чаранёўцы рагаталі і патыкалі Зміцеру тым, што бацька яго, Ануфрык, таксама хваліўся калісьці нейкім дзедавым пісарствам.

«Дык дзед ці прадзед усё-такі?» — дапытваў у такіх выпадках Зміцера які-небудзь найбольш уедлівы чаранёвец.

Зміцер цярпець не мог гэтых допытаў, напышліва чырванеў, але не канфузіўся, упарта цвердзіў сваё: «А табе што — дзед ці прадзед, быў пісар Шыкун, і ўсё тут». Ну, быў дык быў. І ці не ад таго пісара перайшла да Зміцера яшчэ адна мянушка — Смалец. Яе Зміцер не любіў і, само сабою, ніколі не згадваў, як і адкуль яна ўзялася. Але ў Чаранях і пра гэта ведалі ўсе, асабліва старэйшыя, і не праміналі ўспомніць, калі гаворка заходзіла пра Зміцера. «Ат, ведама,— казалі,— Шыкуны — яны ўсе такія, з патомства. А Пятрок, дзед яго, помніце, які быў. Бядота ж горкая, а таксама не паддаваўся. У нядзелю, бывала, Петрачыха блінцоў напячэ папалам з высеўкамі, скварачку тую маленечкую, як мыш, на ўсіх падзеліць, каб хаця блінец з аднаго боку пашмараваць было, дык Пятрок як блінец, а бараду сабе затлусціць, каб блішчэла, і гэтак на вёску ідзе. І ходзіць да тае пары, пакуль хто не заўважыць і не скажа: «Пятрок, бараду абатры...» І тады ўжо ён як бы спахопіцца, пачне дзеля вока рукою па барадзе шоргаць і здаволена рагатаць, што гэта ж баба на блінцы смальцу так дала, што аж па барадзе цякло... І ўсё дзеля таго, каб думалі, што яны, Шыкуны, жывуць надта добра».

Так і асталося — Смалец ды Смалец. І калі Зміцер

яшчэ сяк-так мірыўся з гэтым Смальцам, то за апошнюю мянушку, якая дасталася яму ў спадчыну ад бацькі, мог пад гарачую руку і ў бойку кінуцца.

А было ўсё так. Пасеяў калгас упершыню цукровы гарох адразу за вёскаю. І ўрадзіў той гарох на свежым месцы — завідкі бралі. Ад дзяцей не адбіцца было — качаліся цэлымі днямі. І брыгадзір не вытрываў: ратуючы астатні гарох на насенне, паставіў над полем вартаўніка. Але які вартаўнік упільнуе дзяцей? Папаўся ў гаросе Зміцераў бацька, Ануфрык. Ужо тады слабы, нездароўчы, але па-ранейшаму завідны і падкі да чужога. Ануфрык, пакуль яго змеціў вартаўнік, аб'еўся маладога гароху, а разам яшчэ прыпалохаўся не на жарт і неяк адразу злёг, захварэў і ледзь не памёр. Яго, праўда, адхайкалі. Ануфрык паправіўся, але калі потым хто напамінаў яму пра выпадак з гарохам, ён заўсёды казаў: «Струкі, хай яны згараць. З'еў пару, дай ты веры, і падвярнула пад грудзі». Веры ніхто яму не даваў, але ўсе смяяліся з тых струкоў і асабліва, калі Шыкун пастарэў і ўсё не забываў, гаварыў: «Каб не тыя струкі, дай ты веры, яшчэ здароў быў бы, яшчэ пажыў бы...» Так, смеючыся, яго і празвалі Струком.

Ануфрык памёр, пакінуўшы адзінаму сыну ўсе свае мянушкі і старую хату з кустом маладога бэзу на падворку. Зміцера падымала на ногі Ануфрычыха. Яна нашмат перажыла свайго чалавека і цяпер была яшчэ крэпкая, як і раней, злая і вострая на язык.

Зміцер рана ажаніўся, паставіў новую хату на месцы старой, бацькавай, выгадаваў чатырох дачок і трох аддаў замуж. Дзвюх апошніх ужо нават па другому разу паспеў. Ды йшчэ невядома, ці той другі будзе апошнім. Свет цяпер такі — не ведаеш, чаго чакаць ад дзяцей родных. Узяць хоць бы Зміцераву старэйшую, Алю. І вучоная, і не брыдкая, а вунь як здурэла. Увесь Шыкуноў род абняславіла. Зміцер думаў, не перажыве. Тыдзень з пасцелі не ўставаў. А яна — хоць бы што. Цяпер, кажа, модна — маці-адзіночка. Прывязла ў «прыполе», і каб хоць волас з яе ўпаў.

Сядзела на карку, аж пакуль «кааператыў» бацька не пабудаваў. І каб сказаў, саромелася, перажывала. Хадзіла два гады па Чаранях, як прынцэса. А ён, Зміцер, вачэй падняць баяўся, здаецца, скрозь зямлю з-за яе, з-за дачкі, праваліўся б, не мог прычакаць, калі з вёскі з'едзе.

Ды і гэтыя яго, астатнія — няма чым пахваліцца: то сходзяцца, то расходзяцца і адно толькі знаюць, як тыя малпы, адна перад адною выстаўляюцца. Як шыі сабе не павыкручваюць, не ведаюць ува што прыбірацца, што ў вушы чапляць, што на пальцы, як «шпакоўні» свае гарадскія абстаўляць, каб хаця не так, як ва ўсіх, каб хаця лепей, каб мадней. Бацьку хоць ратунку крычы, хоць са скуры вылузніся, а дай, знайдзі, забяспеч, як той казаў. Вось тут і разжывіся, і пахваліся, знайдзі раду.

На што ўжо Зміцер чалавек увішны, рабацяшчы, а і то іншы раз, бывае, да адчаю даходзіць, бо патрэбам тым, як ты ні старайся, канца-краю не відно.

І так во аднаго разу дапяклі яму дочкі, што Зміцер, ледзь не плачучы, сказаў сваёй Зінцы: «Усё, маці. Калі толькі клясці каго давядзецца, нічога благога зычыць не буду, адно скажу: дай табе божа чатырох дачок».

Зінка толькі рукамі ўспляснула: «Здурнеў, дальбог, здурнеў. Грэх такі на душу бярэш — бог даў, бог і забраць можа, калі языком мянціць лішне будзеш». Але тут жа зірнула на свайго збедненага чалавека і зарагатала: «Халера ўжо — чатырох, іх і трох хопіць, каб дашчэнту бацькоў задаіць...»

Ну, каб ужо сказаць надта былі «задоеныя» Шыкуны — не скажаш. Жылі не горш за другіх, стараліся, рабілі, мелі ўсё, што чалавеку трэба. Але ж натура такая: чым больш мелі, тым больш хацелі. Сам Шыкун рабіў на дзвюх работах: удзень на будоўлі, а на ноч ішоў кантору вартаваць. От, ведама, якая там варта — выспіцца, выкачаецца за ноч на ўсе бакі ў праўленні на канапе і рагоча сабе: розніцы няма, Зінку ці кантору вартаваць — ні адна, ні другая нікому не патрэбны. Дык за кантору хоць грошы

плацяць... Ноч, значыцца, у канторы паспіць, а нараніцы падымецца і калі гэта зімою, то йшчэ кафлянкі прапаліць, а калі цяплом, то й адразу дахаты ідзе. А хата — вот яна, побач, недалёчка. Паснедае, Зінцы паможа ўправіцца па гаспадарцы і — на будоўлю. Будоўля, пэўна ж, не старажоўка, там спаць не будзеш, там рабіць трэба.. Але зноў жа Зміцер не скардзіўся. Быў яшчэ не стары, здаровы, дужы, мог і падрабіць.

І ўсё б яно было нічога, як-ніяк, дачок ён ужо «аформіў»: адной на кааператыў даў, другой мэблю справіў, трэцяй на машыну дзве з паловаю тысячы з кніжкі зняў. А самай малодшай найлепей спамог: дом як цацку ў прыгарадзе паставіў. Ужо другі год як пані сабе жыве. І гародчык свой мае, не трэба купляць ні бульбы тае, ні цыбулі. А лета прыйдзе — і радысачка свая, і агурочак, і памідорчык. Садок летась пасадзілі. Яшчэ, праўда, не родзіць, але праз гады два-тры садавіны не абярэшся. І тым тром купляць нічога не трэба будзе, хопіць на ўсіх. Зміцер усё разлічыў, усё абдумаў — крыўды на яго ў дачок не павінна быць. Гэта не тое што яму бацька пакінуў — хатку трухлявую, шашалем з'едзеную і ні рубля за душою. Але хто іх там разбярэ, дзяцей цяперашніх, і дзе ты ім дагодзіш. Яно як на добры толк, то й у вёсцы жыць маглі сённяшнім часам. Зміцер і хацеў, каб хоць адна, хоць бы малодшая гэта, Лена, асталася пры хаце. Нашто было ставіць яшчэ адну хату, калі бацькава навюткая — месца хапіла б. І спецыяльнасць такая — бухгалтар, і ў Васіля ейнага — прарабам робіць. Але дзе табе — малпы гэтыя. Яны толькі браць ад бацькі, а слухаць бацьку — не твой божа. Толькі аказацца варта было — заенчылі ўсе ў адзін голас: «Што мы, горшыя за другіх, усе ў горадзе, а мы тут вам тыраць будзем!» Ну й што ты на гэта скажаш? Калі падумаўшы, то яно так і выходзіць: хопіць, што яны з маткаю прасветлай гадзіны не бачаць.

Зіна яго таксама да работы заядлая. Каторы год ужо на кароўніку, выпетрала чыста. Ён, калі чэсна, іншы раз

у людзі з ёю саромеецца выхіліцца. Як бы яна ні прыбіралася, як бы ні вымывалася, а ўсё роўна здалёк пазнаеш, што на кароўніку робіць. Ужо й духамі, бывае, надушыцца, і тое, і сёе — хоць бы што. А што тыя духі-петухі, калі за жыццё пах гэты ў скуру ўвайшоў...

Праўда, яны нядаўна рашылі з Зінкаю: яшчэ трохі павыструньваюцца, і — баста, хопіць, пачнуць лягчэй жыць. Грошай усё роўна не забярэш, дочкам, колькі ні давай, усё роўна ўсіх мала — трэба ж і пра сябе падумаць. Яно б ужо й цяпер можна было, але ёсць тут адна закавыка. Пайшла ў Чаранях апошнім часам мода на кухні летнія. Мала што дамы адбудавалі і стаяць яны пустыя, вялікія, як адрыны, дык яшчэ й кухні ўманулі ставіць.

І давай: адны перад аднымі, адны перад аднымі. Хто з цэглы, хто з дрэва, хто проста вагонкаю абаб'е, але ж ва ўсіх у дварах, што цацкі — расфарбаваныя, размаляваныя — стой і любуйся.

Яму-то, Зміцеру, кухня тая патрэбна, як дзірка ў мосце, але вот яна, Шыкуніха яго, спаць з-за кухні не можа. Бо як жа гэта стрываць такое — папрыходзяць бабы на ферму і пачнуць адна перад адною выхваляцца: от жа добрая гэта выдумка, кухня летняя. У хаце сабе па-панску, ні табе мух, ні пары, ні бруду. Прапаліў крыху пліту, каб вільгаці не было, і ўвесь клопат, а ўжо якая чорная работа — у кухні. Дый снедаць-абедаць там; не, што казаць, без кухні, як без рук, ужо й не верыцца, што раней абыходзіліся без яе. А калі бяседа якая: вяселле, ці радзіны, ці, не дай бог, смутны які трафунак — парыць-кухарыць — усё там. Не, слоў няма, харошая гэта штука — кухня летняя.

Яны сабе хваляцца, трашчаць, як тыя сарокі, а Зінка што — маўчы, зубы сцяўшы. А ёй, Зінцы Шыкуновай, не было горшай пакуты, як гэта маўчанка. Яна век першая ўсім на свеце хвалілася: і дочкамі, і зяцямі, і Зміцерам сваім, і гаспадаркаю, і нават злою на язык свякроўкаю.

Зінка хоць і не з Шыкуноў паходзіла, але характарам была як дзве кроплі вады падобная да Зміцера. Хлебам

яе не кармі, а дай пахваліцца. А тут — няма як. Ва ўсіх кухні летнія, а яе Шыкун, Пісар гэты, Качар клышаногі, Смалец разлезлы, Струк гэты гарохавы, ніяк не змыкаецца, ніяк часу не дабярэ. Зінку з'ядала зайздрасць. І чаго ўжо ў душы яна не вярнула на свайго чалавека, аслепленая гэтаю чумою чорнаю. Што на зямлі, тое на ім было. І, не дай бог, калі надыдзе такое на яе ў хаце, і асабліва ў выхадны дзень, калі Зміцеру не трэба ісці на будоўлю і ён сабе прыляжа пасля сняданку ў баковачцы.

Зінка тады бярэ ў рукі «пытку» — падэшву ад старога галёша, устаўленую ў расшчэплены з канца кіёчак і замацаваную там цвічком, і пачынае лупіць мух на сценах і на стале, аж трахат ідзе па ўсёй хаце. Б'е мух датуль, пакуль не пачуе, як недавольна крэкча і варочаецца на тапчане Зміцер. Тады ўжо на ўвесь голас пачынае клясці і мух, і Зміцера, і жыццё сваё няшчаснае.

У такія моманты нават свякроўка, старая Ваця, баялася вылазіць са свае каморкі, хоць і рэдка ўсё яшчэ ўпускала мажлівасць паваяваць з нявесткаю, трымаючы заўсёды старану свайго Зміцеркі.

У такія моманты, звычайна, на парозе з'яўляўся сам Зміцер: растармэханы, босы, злы.

Ну й пайшло тады ўжо, паехала. Як счубяцца, бывае, сварыцца — шыбы звіняць.

Гэтак раз сварыліся-сварыліся, аж асіплі абое, пакуль Зміцер кулаком па стале не грукнуў: «Усё. Досыць енчыць. Трэба найперш цэглы расстарацца за зіму, а вясною будзе табе кухня. Кухня не штука, абы матэрыял быў, я табе за тыдзень яе зляплю».

Зінка адразу сунялася, палагаднела, і яны тут жа пачалі дружненька маракаваць, дзе і як можна дабыць тую цэглу. Ну а хто думае, той дадумае. Ды яшчэ з такою галавою, як у Зміцера, ды яшчэ з вокам такім — завідным. Праўду людзі гавораць, вока чалавечае — яма бяздонная.

Цяпер ужо не да сну было Зміцеру. Пуставала мяккая,

улежная канапа ў калгасным праўленні, а сам сторож часова змяніў, як кажуць, фах.

Не браў сон і Зінку. Пасля паўночы, так і не звёўшы вачэй, яна апраналася, ціхенька выходзіла з хаты. Выцягвала з-пад паветкі вялікія самаробныя санкі, ішла да канторы.

Там ужо нецярпліва пераміналася на ганку, зладзеявата азіраўся на бакі Зміцер. Змеціўшы яе, прымыкаў дзверы, і яны моўчкі сунуліся за вёску.

За вёскаю, наводшыбе, стаяў недабудаваны дзіцячы садок. З месяц назад, калі сама прыціснулі маразы і ясна стала, што кладку прыйдзецца прыпыніць, будаўнікі сцягалі цэглу ўсярэдзіну, каб не валялася пад снегам. Цягаў тую цэглу разам з усімі і Зміцер. Цэглы было шмат. Зміцер пасля прыкінуў — тысяч пяць, не меней. А на кухню яму тысячы паўтары, ад сілы — дзве пойдзе. Ну, дык што за бяда, калі ён возьме от зараз дый падзеліцца з калгасам. Калгас не збяднее, жыў будзе — не хопіць гэтай, дадзяжуць яшчэ. А яму, Зміцеру, дзе ўзяць? Не, узяць-то яно можна, канешне. Ну, узяць не ўзяць, а купіць, выпісаць — дзела яснае. Зміцер усю гэту арыфметыку як свае пяць пальцаў ведае: два гады не прайшло, як дачцэ дом будаваў. Навыпісваўся, накупляўся. Але на халеру купляць, выпісваць, калі во тут, пад рукамі, гатовае ляжыць. Дый што там выпісваць — тысячу тую няшчасную? Больш за перавозку заплаціш, як за цэглу. Не ўжо, не скалечыць ён калгас, калі трохі возьме. Нябось і гэтыя разумнікі чаранёўскія, што ўжо раней за яго цагляныя кухні адбудавалі, няшмат думалі. Вунь колькі часу цэгла валялася, пакуль яны за гэты садок узяліся. Проста так, зваленая ў горбу, ляжала з паўгода. Адно брызентам прыкрытая. А што той брызент — адкінуў ды бяры. Вот і бралі. А ён, дурны, тым часам кантору пільнаваў...

Думаў гэтак сабе Зміцер Шыкун, і чым больш думаў, тым больш пераконваўся, што марудзіць нельга. Толькі што нязручна з будынка даставаць — дзверы замкнёныя, трэба лезці праз акно. Але гэта яшчэ нічога, мірыцца можна.

Яны з Зінкаю так прылаўчыліся: ён залазіў праз незашклёнае акно ўсярэдзіну, а яна аставалася пад акном, каля санак. Ён падаваў ёй па цагліне, а яна складала ў мех, што ляжаў тут жа, на санках.

Кожную ноч Шыкуны рабілі па два рэйсы.

А ночы былі марозныя, месячныя. Толькі палазы рыпелі і валёнкі хрупалі па снезе. Хруп-хруп, хруп-хруп. Далёка, халера на яго, чуваць. Але хто там пачуе — спяць усе, цішыня.

Месяц толькі малады, наіўны, глядзеў на Шыкуноў са свае глыбокай вышыні, дзівіўся. Але Шыкунам было не да месяца. Яны й вачэй угору не падымалі. Зіркалі адно на бакі, ці хаця не ідзе хто, і зноў унурваліся сабе пад ногі, запіраліся, аж саплі. Санкі былі цяжкія, наладаваныя як мае быць.

Найбольшы страх браў Шыкуноў, калі праязджалі яны каля хаты свайго суседа, старога языкатага Каўзуліка. У таго — жаба на языку не спячэцца; няхай толькі ўбачыць — хоць зацугляй яго, не ўтрымаеш, усё роўна скажа. Пойдзе адразу ў кантору проста да Бацькі і скажа. (Старшыню ў Чаранях усе звалі Бацькам.) І тады ўжо ўсё — канец. Бацька спуску не дасць, не паглядзіць, хто ты і што ты. Дзесятаму закажаш — і за выпіску, і за перавозку, і за пераноску заплаціш...

Але ўсё ў іх абышлося добра: ніхто як быццам нічога не ўбачыў, ніхто нікому не сказаў. Зміцер з Зінаю цэглы сабе на летнюю кухню расстараліся. А цяпер што, цяпер хай дакажуць Каўзулікі-маўзулікі — ніхто не дакажа. Цэгла ў Шыкуноў у кладоўцы, а чыя яна — на ёй не напісана.

Праўда, на ўсякі выпадак Зміцер падстрахаваўся: з'ездзіў у горад да малодшай дачкі, і зяць Васіль раздабыў яму квіток ад нейкае свае канторы, што, як быццам бы, Зміцер у той канторы выпісаў гэту цэглу.

Нарэшце памякчэў вецер, зліглі маразы. Пад абед прыгравала сонца, са стрэх пачынала капаць.

У кароткія моманты лагоды і спакою Зміцер гаварыў, пазіраючы ў акно: «Нічога, жонка, пацярпі трохі. Вот згоніць снег, адпусціць зямлю, і вазьмуся за падмурак».

Зінку ела нецярпячка: «Невядома яшчэ, калі гэты снег згоніць. Зіма годам стала, абрыдла, як ніколі...»

А на ферме Зінка ўсё ж не ўтрывала. Калі бабы аднаго разу зноў пачалі пра свае кухні (зімою, праўда, пра іх гаварылі менш), Шыкуніха ўпершыню таксама не змаўчала: «Гэта ж, бабачкі, і мой Пісар раскатурхаўся, будзе на весну кухню ставіць. Цагляную».— Пахвалілася, аж задыхнулася ад радасці.

— А дзе ж гэта вы цэглу возьмеце? — цікаўна прыскаліла вока Каўзулікава Мальвіна.

— А ўжо ёсць цэгла,— Зінцы дух перацяло ад неспадзяванкі, але яна тут жа ўзяла сябе ў рукі: — Зяць, Васька, цэлу машыну прыпёр, выпісаў недзе ў сваёй арганізацыі.

— Нешта ж мы не бачылі. Калі гэта ён прыпёр, ноччу, ці што? — Мальвіна не спускала з суседкі недаверлівага позірку.

— А што-та вы пільнуеце? Усё каб яны бачылі, от жа ж і не бачылі, а прывёз.

Мальвіна, адчуваючы, што зараз Зінка разыдзецца — не стрымаеш, адступіла, адвяла позірк, мармытнула сабе: «Можа, й не бачылі, можа, й прывёз...»

Бабы зарагаталі. Усе ведалі, што Каўзуліха, як агню, баіцца Шыкуніхі.

А Зінцы было не да смеху. Яна ўжо праклінала сябе, што раней часу не ўтрывала, пахвалілася. За гэтымі языкатымі Каўзулікамі жыцця няма. Паслаў бог суседзяў.

Прыйшоўшы з фермы дахаты, на ўсякі выпадак сказала Зміцеру:

— Нешта Каўзуліха пра цэглу пытала...

Зміцер падскочыў:

— А скуль яна гэта знае?

— А халера яе ведае. Можа, кладоўка была калі адчынена, дык і ўбачыла са свайго надворка.

— Ага, ужо яна з надворка ўбачыць. Можна падумаць, што яна праз бінокль на цябе глядзіць.— Шыкун недаволь-на скасавурыўся:— Ну й што ты ёй сказала?

— Сказала, што зяць, Васька, прывёз.— Зінка пачырва-нела, адвяла вочы.— І ты, калі будзе пытаць хто, кажы, што Васька. Каб у адно гаварыць.

— У адно, у адно,— Зміцер злосна перадражніў Зінку. Ён ужо напэўна ведаў, што гэта яна не ўтрывала, раз-ляпала на кароўніку пра кухню. Вот чортава насенне, хоць замок на язык павесь, хоць забі, усё роўна не змаўчыць, пахваліцца...

Аднаго разу позна ўвечары, калі Зміцер ужо масціўся спаць на канапе, да яго ў кантору нечакана пастукаўся сусед Каўзулік.

Зміцер адразу прыпомніў нядаўнюю размову з жонкаю, і ўсярэдзіне ў яго пахаладзела: прыйшоў дазнавацца пра цэглу, чорт стары. Ніколі не заходзіў, а гэта прысунуўся...

— Іду, бачу святло ў акне, дай, думаю, зайду,— абіва-ючы ў парозе аб падлогу заляпаныя гразёю боты і хітра скалячы левае вока, гаварыў тым часам Каўзулік.

«І што гэта ў іх за мода такая, у гэтых Каўзу-лікаў, вока левае прыскальваць? І Мальвіна яго, і сам Каў-зулік, і сын гэтак во — заскаляцца і глядзяць. Як бы нешта ведаюць пра цябе такое, чаго ты й сам пра сябе не ведаеш». Зміцера заўсёды раздражняла гэта звычка сусе-дзяў, а цяпер аж нутро перавярнула. Каб мог, то ўзяў бы, здаецца, зараз гэтага касога Каўзуліка і выкінуў бы з канто-ры. Ходзіць толькі, вынюхвае.

А Каўзулік тым часам ужо й усміхаўся на ўвесь свой шчарбаты рот і, як бы ўгадваючы Зміцеравы нядобрыя думкі, жартам апраўдваўся: — А то я да цябе дахаты пару разоў зайшоў, а Зінка твая ўсё адна. Больш ужо й заходзіць баюся — хто ўбачыць, скажа, падходжвае стары Каўзулік да суседкі, покуль Зміцер канторы пільнуе.

— А ты ўжо й спалохаўся,— нарэшце буркнуў, азваўся Зміцер.

Каўзулік тоненька захіхікаў, зноў пастукаў бруднымі вялікімі ботамі аб падлогу:

— Не так каб спалохаўся, але ж, ведаеш, нашто гэта мне, старому чалавеку, звяга лішняя.

— Ага, так яна ўжо да цябе й прыліпла — звяга тая. І Зінка ж не адна, а з маткаю,— падлавіў Зміцер Каўзуліка на яго хітрасці.

Каўзулік зноў захіхікаў:

— А нешта ж я не бачыў Ваці твае. Тыя разы выходзіла, а гэта нешта...

— Спала, можа,— перабіў, не даў дагаварыць Зміцер.

— А як жа ж, нічога йшчэ, трымаецца?

— Трымаецца. А што ёй, спіць сабе ды есць. На ўсім гатовым.

— А есць яшчэ добра?

— Настаяшча. Больш за Зінку ўложыць.

— Няўжо ж? — Каўзулік зноў недаверліва прыскаліў левае вока.— Ну, Ваця, ну, Ануфрычыха, малайчына суседка, значыць, жыць яшчэ будзе.

— А што ёй станецца, будзе...

Зміцер усё яшчэ недавольна пазіраў на Каўзуліка, але ўжо як бы й змірыўся з тым, што суседа так проста не адправіш, і той гэта ўмомант адчуў, прасунуўся з парога да кафлянкі, прымастакоміўся на крэсле.

— Трымаецца, кажаш, есць. А што яна есць найболей?

Зміцер не ўтрываў, засмяяўся:

— Што, таксама хочаш дзевяноста пражыць?

Каўзулік не адказаў, зноў захіхікаў.

— Цукар есць. Па пяць велькіх лыжак адразу з'ядае. Потым толькі святаяннікам зап'е, і хоць бы што.

Каўзулік недаверліва прыскаліўся:

— Во, а ты ўжо й палічыў, колькі з'ядае?

— Хто там лічыў,— Зміцер зноў зазлаваў,— можа, й сем з'есць, я ж не кажу, кажу, што цукар любіць...

— Хэ, цукар.— Каўзулік расчаравана паматаў галавою.— Цукар, кажуць, шкодзіць. Ты б ёй мядку, Зміцерка. Мёд у цябе ж харошы. Ці ты яго ўвесь на рынак вывозіш?

Цяпер ужо Зміцер закіпеў не на жарт і пашкадаваў, што не прагнаў гэтага старога чорта адразу. «Бач, допыт ён мне тут учыніў». Але стрымаўся, сказаў:

— Які там мёд. На лякарства сабе пакінеш, дочкам па слоічку дасі — вот табе й мёд. Ты ж ведаеш, колькі тым летам пчол пагінула...— Гаварыў, як апраўдваўся, і ад таго яшчэ больш злаваў, чуючы, што вяртаецца ў душу ўпартае жаданне ўзяць Каўзуліка за каўнер. І каб чым перабіць гэту ў сабе непрыязнасць, спытаў: — Ты ж, кажуць, да сына ездзіў. Як там Ромак твой жыве?

Спытаў на сваю галаву — лепей бы не пытаў. Шыкун і пра цэглу забыў, і пра сваю асцярогу перад суседам. Развярэдзіў стары Каўзулік Зміцеру душу, ушчэнт развярэдзіў. І так спакою не было ад усялякіх думак, а тут ужо й увогуле не знаходзіў сабе Шыкун месца.

Прасядзеў у яго тады Каўзулік, лічы, аж да раніцы. Выпхнуўся з канторы, як віднець пачынала. Зміцер і не клаўся нават, выправіўшы старога: не да сну было. Запаліў у кафлянках і гэтак швэндаўся з пакоя ў пакой. То падкідваў у печкі брыкету, то проста стаяў нерухома каля акна. А перад вачыма круцілася і круцілася шчарбатая Каўзулікава ўсмешка і яго маленькія вострыя вочкі, што аж блішчэлі ад радасці...

— От жа, Зміцерка, цяпер людзі жывуць, от жывуць. От дачакалі. Мы не пажылі, то хоць дзеткі нашыя. Мой жа хлопец, ну што, каб там сказаў, свіны доктар, скаціну лечыць, кончыў усяго гэты, каб там сказаў, цехнікум. А табе ж павага да яго... Я ж ужо нагледзеўся. А жыве — чыста пан. Дом цагляны, паравое ўсюды, у двары — хлявы, гараж. Машыну мае, матацыкл.

І ў іх у вёсцы — вот аўтобусам едзеш праз вёску, а

вёска велькая, кіламетры са тры, асфальт усюды, каб там сказаў, дзе хату марную ўбачыў,— дамы, што палацы, і што двор, то гараж у дварэ. Гэта значыцца, машыны ўсе маюць. От жывуць, Зміцерка. Калгас, сын казаў, мільянер, старшыня талковы... Яно і ў нас, каб там сказаў, блага — няблага жывуць, але не так... Куды там — не так, не.

...Развярэдзіў стары Каўзулік Зміцеру душу. Слухаў ён суседа — пары з рота не выпусціў. Адно спытаў: «А дзеці ж у сына ёсць?»

Спытаў, хоць і ведаў.

— А як жа ж,— стары нават пакрыўдзіўся.— А як жа ж, сынок расце, Вовік, на другі год у школу пойдзе...

— Адзін?

— Адзін.

— Э, адно дзіця — не дзіця,— хоць тут вырашыў зачапіць суседа Зміцер. Але не надта ты яго зачэпіш, чорта старога.

— Ну, чаго ж не дзіця. Яно бывае, Зміцерка, хоць адно, але ладно,— не прамінуў, пад'еў Зміцера Каўзулік, закрануў у ім самае балючае. Маўляў, што з таго, што ў цябе во аж чатыры. Хто-хто, а Каўзулік ведаў усе Зміцеравы балячкі. Дый ад каго ты што схаваеш у вёсцы. Гэта ж не цэгла — у кладоўцы не замкнеш... Дый што там — хавай не хавай, а ў душы яно ж усё стаіць. Ад каго схаваеш, а самога ўсё роўна грызці будзе. Зміцер нават Зінцы не казаў усяго, а сам у душы крыўдаваў на дачок, не раз сам сабе наракаў на іх: малпы, і ўсё, колькі ім ні давай — усё мала. Як у прорву якую. Дзеўкамі былі — прыбраць не мог: адной сукенку купіш, другой — футра трэба, трэцяя — сотню на боты просіць, у чацвёртай — туфлі знасіліся... Думаў, ну, вырастуць, на свой хлеб пойдуць — лягчэй будзе. Ого, каб жа яно так! Чым далей, тым лепей. Цяпер ужо другое давай: машыны, кааператывы, абстаноўкі, дамы... А там жа ж — унучкі падрастаюць... Ва ўсіх чатырох, як на тое, дзеўкі, ніводнага хлопца... Не, не скінуць Зміцеру да канца дзён сваіх ярма гэтага.

Да якога ўжо тут Каўзуліка дамяркуешся: у таго адзін сын, ды талковы... Не, хай сабе ў Зміцера і не адзін сын быў бы, хай і чацвёра сыноў, і пяцёра. Сыны — гэта сыны: і помач была б, і спакой, і рубель цалейшы... І ў яго, у Зміцера, даўно было б усё — і гараж, і кухня... Што тая кухня, каб яна згарэла,— варта галаву дурыць. Вот гараж...

Зміцер заплюшчваў вочы і бачыў: едзе па іх Чаранях аўтобус, адсюль во, ад канторы і ў той канец на Лупякі. Едзе, людзі ў вокны глядзяць, а каля яго, каля Зміцеравай, хаты — гараж. Ні ў кога няма, а ў яго на падворку — стаіць. Новы, белы, аж свеціцца ўвесь. І забудова ўся харошая, і садок малады, кучаравы, і вулейкі пафарбаваныя вока цешаць, а каля хаты — гараж... Глядзяць людзі ў вокны (аўтобус паволі йдзе), глядзяць і думаюць: во жыве чалавек, усё мае... Хто там ведае, што гараж пусты...

Зміцеру аж горача рабілася, так яно ўсё жыва паўставала перад вачыма, так узрушала яго...

Але ўсе карты, як заўсёды, блытала Зінка. Ведаў, што ад свайго яна не адступіцца і з карка не злезе, пакуль не злепіць ён тае кухні праклятай...

Адным словам, страціў Зміцер спакой. Месца сабе не знаходзіў. І ўдзень на будоўлі цэгла з рук падала: усё пра адно думаў, і ноччу ў канторы — як толькі вочы прыплюшчыць — гараж сніцца. І ўсё адно і тое ж чаўпецца, ні рады. Здэцца, едзе па іх Чаранях аўтобус, адсюль во, ад канторы, і ў той канец, на Лупякі. Едзе, а ўсе да акон папрыпадалі: аж насы расплюшчыліся, глядзяць, а ў яго, у Зміцера, на падворку — гараж... Салодкая, п'янкая радасць пачынала кружыць галаву, але тут жа аднекуль абавязкова з'яўлялася Зінка з «пыткаю» са старога галёша і так пачынала ляскаць ёю, што Зміцер адразу прачынаўся і ўсё ўмомант знікала...

А час ішоў. Ужо й снег сагнала, і зямля стала падсыхаць,

вот-вот з соткамі клопат пачнецца. Тыдзень які больш-менш вольны астаўся, і ўсё...

Неяк прыйшоў Зміцер у кантору раней і засеў адразу за тэлефон. Круціў доўга траскучы, стары дыск, слухаў то кароткія, то доўгія гудкі, нечыя далёкія галасы, аж пакуль не дабіўся да горада і не пазнаў зяцеў вечна чымсьці недавольны голас. Ён і цяпер, яшчэ не ведаючы, хто звоніць, «алёкаў» недавольны ўжо тым, што яму звоняць, што турбуюць. І Зміцер ажно разгубіўся напачатку і ад таго вымаўляў сваё нязвыклае «алё» ў адказ няўпэўнена і ціха, і на другім канцы проваду яго, мусіць, не чулі. Спалохаўшыся, што зяць кіне трубку, ён, што было моцы, закрычаў: «Васіль?! Васіль! Гэта я, бацька, з Чаранёў, з канторы званю...»

Яго нарэшце пачулі. Замест недавольнага «алё» пачулася расчараванае: «А-а, слухаю...»

Але Зміцеру гэта ўжо не абыходзіла. Цяпер яго хвалявала адно: паспець сказаць зяцю пра свой клопат. А там, там нікуды ён, галубок, не дзенецца. Спяшаючы, выклаў зяцю адразу ўсё, што намерыўся, і застыў, чакаючы адказу. Чуў, як Васіль недавольна крэкча, абдумвае, відаць, яго, цесцевы, словы, мыкае-пыкае, маўчыць.

Зміцер нецярпліва заёрзаў на крэсле, зласнавата падумаў: «Пакракчы, пакракчы, ад мяне ўсё роўна не выкруцішся...»

Нарэшце Васіль запытаў-буркнуў:

— На халеру вам тая кухня, у хаце месца хапае...

— Хапае, хапае. Ты матцы гэта скажы: з карка не злазіць...

— Ну, ладна,— Васіль перабіў, не даслухаў.— А колькі мяхоў трэба?

— А ліха іх знае, ты ж лепей павінен ведаць, мяхоў сем, восем.

— Добра, паспрабую дастаць.

— Пастарайся, сынок,— памякчэў Зміцер.— І каб на гэтым тыдні. Можа, там якія адгулы-прагулы возьмеш ды прыедзеш, паможаш трохі?

— Ладна,— зноў буркнуў недзе там, далёка, Васіль, і ў трубцы пачуліся кароткія, частыя гудкі.

Зміцер і пра дачку з унучкаю спытаць не паспеў, і ад Зінкі, ад маткі, паклон не перадаў...

Ён адняў трубку ад вуха, як не верачы яшчэ, пакруціў у руцэ і толькі потым палажыў на рычаг. Але тут жа супакоіўся, сказаў сам сабе: «Вот і добра, вот і дзякуй богу. Усё выходзіць як найлепей. Зінку адпраўлю ў горад, хай паможа Лене, пакуль Васіль тут будзе. Тыдзень ад водпуску астаўся, Бацька адпусціць, нідзе не дзенецца. Васька прывязе цэменту. Дошкі і цэгла ёсць. Жвірку, пясочку сам расстараюся...» Зміцер аж рукі пацёр ад радасці: праз колькі дзён і за работу можна брацца. Нарэшце. Нарэшце ён заткне за пояс усіх гэтых зайздросных чаранёўскіх Шыкуноў. А то над іх няма, без фігі не да носа. Ён ім пакажа кухні-шмухні, ахнуць усе. У гэты момант Зміцер забыў, што й сам ён Шыкун, у гэты момант яму больш за ўсё хацелася быць вышэй, лепш за ўсіх іх: за ўсіх Шыкуноў, за ўсіх Каўзулікаў-маўзулікаў з іх Ромкамі... А чым ён горшы за іх?..

У суботу Зміцер выпраўляў Зінку ў горад:

— Едзь і скажы Васілю, хай не цягне. Скора соткі садзіць, агарод — не адарвешся.

— Але, але, Зміцерка, падганю паеду. А ты ж ужо глядзі тут: каб прасторная кухня была, каб і газавая плітка стала, каб і тапчан які прыткнуць, і стол. А што ж, будаваць то ўжо будаваць — адзін раз гарэць...

— Добра, добра.— Зміцер ухмыляўся.— Не згарым, баба, усё зробім. Прыедзеш — ахнеш!..

Не паспелі за жонкаю зачыніцца дзверы, Зміцер узяўся за справу. Вынес з кладоўкі ўвесь патрэбны рыштунак, узяў заранё прышыкаваныя калкі, скрутак шпагату: трэба было ўсё як след вымераць, прыкінуць, пакуль адзін, сам.

Азірнуўся. За ім праз акно сачыла, упёршы ў шыбу зморшчаны, маленькі, як кулачок, твар, матка. Зміцер па-

дышоў да акна, усміхнуўся ёй, лёгенька пабарабаніў па шкле. Яна радасна засмяялася, адкрываючы ў гэтай усмешцы голыя, з чорнымі гнёздамі ад зубоў, дзясны... І ён як упершыню ўбачыў, якая яна ўжо старая ў яго... «Госць я ўжо, сынок, у вас, а ты крычыш на мяне...» — прыпомніў учарашнія яе крыўдлівыя словы, калі ён ні з таго ні з сяго пасварыўшыся за нешта з Зінкаю, накінуўся з крыкам і на яе... Упершыню за жыццё стала цяпер яму ніякавата за той свой дурны крык, і ён рэзка адвярнуўся ад акна...

Пад вечар, нечакана хутка прыехаў зяць. Зміцер вачам сваім не паверыў: спынілася каля брамы бартавая машына, выскачыў з кабіны маленькі рухавы мужчынка, паступіўся на насочкі, адным махам адкінуў адзін борт, скочыў да другога, задняга. Тады толькі зноў ляпнулі дзверцы кабіны і адтуль з нейкімі паперкамі ў руках выкарабкаўся зяць Васіль.

Зміцер паспяшаў да машыны. Заехаць на падворак нельга было: перашкаджаў разложысты куст бэзу, не даваў адчыніць левую фортку варот. Трэба было скідваць усё з машыны тут, каля плота, а тады ўжо цягаць на падворак. Зміцер акінуў вачыма мяшкі з цэментам, падаў руку зяцю і маленькаму мітуслівому шафёру. Яны былі як бы чымсьці недавольныя, на Зміцерава запытанне, як даехалі, ні адзін, ні другі не адказалі. Шафёр зноў чагосьці аббег вакол машыны, а зяць узяў цесця за плячо, адвёў убок.

— Трэба заплаціць, бацька, гэтаму ханыгу, я ў яго браў цэмент. Загнаў па чырвонцу за мех, зараза. Ды яшчэ па дарозе даішнікі запынілі: куды едзем, што вязем, дзе пуцёўка — ледзьве выблыталіся. Таксама не абышлося так сабе...

Зміцер глянуў зяцю ў твар і, перш чым паспеў штонебудзь падумаць, адчуў, як нядобра і мляўка стала раптам у грудзях. Дрыжачым, не сваім голасам спытаў:

— Колькі трэба?

— Ну, во, лічы — сем мяхоў цэменту ды на лапу, адным словам, сотню нясі...

Зміцер моўчкі павярнуўся, цяжка пасунуўся ў хату. І пакуль даставаў і лічыў грошы, пакуль выходзіў з хаты, стаяла ў душы тая мляўкасць і недабрата. І не тое што грошай было шкода. Не. Зміцер ведаў, што плаціць трэба будзе. Штосьці іншае было прычынаю гэтае раптоўнае прыкрасці. Падалося яму, адразу цюкнула ў галаву, што зяць падмануў яго, абдурыў, адным словам... У чым і як, ён пакуль што не разабраўся, але што гэта так — ведаў напэўна...

Зяць з шафёрам скінулі ўжо цэмент з машыны, і гэты малы мітуслівы чалавечак нервова курыў, насцярожана азіраўся вакол, мусіць, хочучы як хутчэй ад'ехаць.

Зяць нецярпліва ступіў Зміцеру насустрач, згроб у жменю грошы, хутка закалыхаўся да шафёра, засланіў таго, малога, на якую хвіліну ад Зміцера і тут жа адступіў убок.

Шафёр хутка, як заяц, ускочыў на падножку, ляпнуў дзверцамі кабіны. Машына вуркатнула раз, другі, кранулася з месца. Роўна зашумеў матор, клубком выкаціўся з-пад колаў сіні задушлівы дым...

Зміцер ступіў да зваленых у кучу мяшкоў з цэментам, як не верачы сабе, доўга глядзеў на іх. Потым схіліўся, мацнуў адзін, другі і гэтак аж пакуль не перамацаў усе. Здалося, што недзе ён ужо бачыў гэтыя пацёртыя папяровыя мяхі з чырвонымі літарамі. Цэмент у іх быў цвёрды як камень. Відно, што ляжаў не месяц і не два... Заўважыў, што не ўсе яны аднолькавыя: пару мяхоў выдавалі навейшымі, і цэмент быў там мякчэйшы, сыпкі... І раптам Зміцера ажно ўбок павяло. Ён ледзь за ляску ўхапіцца паспеў. У вачах заскакалі чырвоныя вялізныя літары, засланілі свет.

Зміцер пазнаў мяхі. Гэта быў той цэмент, які ён, ён сам, Зміцер Шыкун, даставаў па блату, калі задумаў ставіць дачцэ дом. Дом, у якім цяпер жыве гэты лупавокі нахабнік, гарлахват гэты.

Так, так, гэта былі астаткі таго цэменту. Хай бы яго забілі, ён пазнаў мяхі з чырвонымі літарамі...

Прыкрае недаўменне, бяссілая злосць, крыўда — усё ўмомант сплялося, перамяшалася ў Зміцеравай душы, і працiўная глухата, як бы ён раптам апусціўся на глыбокае дно, абняла ўсяго, заклала вушы. Калі свае, родныя гэтак робяць, то чаго ўжо ад чужых чакаць... А ён жа ім апошняе аддае, крыхою дзеліцца...

Зміцер разагнуўся, перавёў позірк на зяця. Той стаяў воддаль, курыў, на цесця як бы й не глядзеў, але Зміцер ведаў, адчуваў, што ён за ім сочыць, употай назірае. І як толькі Зміцер зноў сагнуўся над мяшкамі, зяць не ўтрываў:

— Ну, што там мацаеш, паразрываліся за дарогу трохі, зараз во зложым на тачку і звозім пад хату. Цэмент не высыплецца, не бойся.

— Не высыплецца, не высыплецца,— Зміцер усё не разгінаўся, адно шаргануў рукою па твары. У вачах, здалося, стаяў яшчэ той цёплы, едкі дымок, якім пыхнула на яго, ад'язджаючы, машына. «Ну, зяцёк, ну, хват, пачакай жа... загнаў нягодны цэмент, за бацькавы грошы куплены, ды яшчэ й скуру злупіў. Ну, пачакай жа, скуралуп, пачакай...» Але ведаў, што нічога ён не зробіць, што нічога нават не скажа зяцю. Не пасмее. І што той, лупавокі, гэта таксама ведае. «Во свет пайшоў, во...» Цяжка разагнуўся, кракатнуў і, не азіраючыся, ні слова не гаворачы, павалюхаў да хаты.


Васіль хмыкнуў, расцёр наском бруднага чаравіка недакурак...

За сталом сядзелі моўчкі. Зяць толькі соп і падкладваў сабе на талерку то адно, то другое. Еў неяк дзіўна, піхаў у рот усё адразу: і сыр, і яечню, і салёны гурок і проста са сподка відэльцам калупаў мёд, спяшаў, пырхаў, быццам баяўся, што ад яго зараз возьмуць і адбяруць, не дадуць паесці.









«І як яго толькі не вырве? — скоса пазіраючы, нядобра дзівіўся Зміцер.— Іш, які лапчывы пры стале, каб жа да работы такі падкі быў — дак не. Распух, як жаба. А малады ж яшчэ... Ленка, дачка, вунь якая, што нацїна. Нічога, кажа, не памагае ў хаце. Прыйдзе з работы, нажарэцца і спіць. Што ён тут мне паможа, гультай такі. Толькі кармі яго... Але й адзін чорта ўправішся. Хоць раствору падасць — і то ладна...»

Адчуваючы, што крыўда на зяця так сабе не пройдзе, што, наадварот, яшчэ больш пачынае круціць нутро злосць, падняўся з-за стала, дастаў з шафкі графінчык...

І калі ўзялі па «маленькай» і паўтарылі яшчэ па адной, калі трохі пацяплела ў грудзях, тады толькі Зміцер загаварыў:

— Гэта ж во, не сказаў табе... задумаў я, ведаеш, гараж ставіць...

— Гара-аж? Як г-гараж? — Васіль папярхнуўся, адсунуў ад сябе талерку.

— А так во, гараж...

— А к-кухня? Вы ж к-казалі, м-матка ж к-казала,— раптам пачаў заікацца зяць...

— Потым кухню, паспее матка з козамі на торг,— перабіў яго Зміцер.

— Так, так...— зяць забарабаніў відэльцам па стале, і Зміцер убачыў, што вочы ў яго павільгатнелі, затуманіліся. Васіль неяк адразу зніякавеў, сядзеў прыціхлы, разгублены, смешна, па-дзіцячы міргаў раз-пораз вейкамі.

«А во, галубок, а так во табе. Нябось дух закаціўся ад зайздрасці. Думаеш, дзе бацька грошы на машыну ўзяў. Пакруці, паламай свой цабэрак, памаракуй. Няхай пагрызе цябе гэта трохі, няхай памучыць. Ты, брат, цесця голымі рукамі не возьмеш, не на таго напаў...»

— А машыну ж якую браць надумалі? — нарэшце ачомаўся, спытаў Васіль.

— А самую лепшую, чаго ўжо там! — не разгубіўся Зміцер.

5—1305

— «Волгу», ці што? — у лупаватых зяцевых вачах мільгнуў недавер.

— Можа, й «Волгу», там відаць будзе.— Зміцер хітра падміргнуў, устаў з-за стала...

— А я, каб там сказаў, заняты быў — не, і на работу во не хаджу, а ўсё часу ніяк не дабраў, каб да вас захіліцца. Гной пакуль вывернуў з хлява, гарод пакапаў...

Каўзулік, прыскаліўшы левае вока і здзіўлена прыадкрыўшы рот, стаяў у Шыкуноў на падворку, «гарадзіў» абы-што, а сам усё намагаўся зразумець, што ж гэта Шыкун будуе. Усе Чарані гаварылі, быццам Зміцер кухню летнюю ставіць. Мальвінка казала, што бабы на ферме трашчаць без перасціху, Зінцы зайздросцяць: у горадзе сабе як пані сядзіць, а мужык во і па гаспадарцы ўпраўляецца, і кухню будуе. Вот табе, маўляў, і Шыкун... Шыкун то Шыкун, але якая ж гэта кухня, халеры?

Каўзулік задзіраў голаў, нецярпліва таптаўся, заходзіў то з аднаго боку, то з другога і нарэшце зразумеў: гэта ж яны гараж ставяць. Ну, чыста як у Ромкі яго. Во там, ззаду, відно, спусклівы будзе, а тут во, ад падворка — праём для дзвярэй шырокі. І вокан няма... Каўзулік аж шапку з патыліцы ссунуў:

— А ты патайны, сусед, каб хоць калі пахваліўся, каб намякнуў па-суседску, што машыну купляць сабраўся, каб там сказаў, хоць словам адным... Колькі помню, усё прыбядняўся: дочкі, унучкі задаілі...

Зміцер толькі зірнуў зверху і моўчкі зачэрпнуў кельняю раствору, са злосцю кінуў яго на цагліну. Яму было не да Каўзулікавых жартаў. Аставалася яшчэ рады тры кладкі, а цэглы ў кладоўцы — кот наплакаў. Магло запраста не хапіць. Зміцер загрызаў сябе, што не «пазычыў» тады, зімою, у калгасе болей. Паленаваўся, падла, а цяпер во...

Каўзуліку, падміргнуўшы ў цесцеў бок, весела адказаў Васіль:

— Ён у нас такі, куркуль. Усё прыбядняецца, а сам на «Волгу» нацэліўся...

Каўзулік ажно языком прыцмокнуў:

— А ўжо ж, на «Волгу»? А я, каб не Мальвіна, не ведаў бы нічога, не выбраўся б зайсці да вас. Яна, баба мая, выправіла. Жыць не давала, схадзі ды схадзі, глянь, якую там Зміцер кухню ставіць...

Васіль зарагатаў:

— Кухня што нада, дзядзька!

— Ага, я, каб там сказаў, тыя разы з падворка свайго ўсё бачу, што ў вас робіцца, а тутака во бэз ужо зазелянеў, разлапушыўся — нічагуткі не відно. Сцены белыя толькі трошачкі прасвечваюць. Замаскіраваўся, кажу Мальвінцы, сусед, пайду гляну... А ты — у-унь яно што надумаў...

Каўзулік плёў яшчэ нешта, але Зміцер яго ўжо не чуў. Злез з хісткага падмостка і, моўчкі памінуўшы суседа, хутка выйшаў за вароты, адышоўся і аслупянеў. Нават зблізку не было відно, што робіцца на падворку і што там стаіць: гараж, кухня ці яшчэ якая трасца.

«А тваю такую, з гэтым кустом... Свет увесь засланіў... Памяць бацькава...— прыпомніў нядаўнюю размову з маткаю,— па-амяць, хіба што, ашчаслівіў бацька, памяць пакінуў — бэзу куст... Ну, пачакай жа, хай пойдзе гэты балбатун стары з падворка, я ўміг разбяруся з гэтай «памяццю»... Абрыд ужо — ні варот не адчыніш, ні свету не ўбачыш. Пацвіце трохі, а потым сядзіць карчом цэлы год. Дый стары ўжо, даўно пара ссекчы. Парастак які пакіну, хопіць памяці гэтай».

Надвечар збіраўся ад'язджаць Васіль. Папрацавалі яны гэты тыдзень — нічога не скажаш. Гараж зладжылі — стой і любуйся. Накрыць толькі асталося, але гэта ўжо — лічы, нічога. Зміцер сам справіцца. Галоўнае, цэглы хапіла. Ледзь-ледзь, але хапіла. І пабітая, патрушчаная — уся пайшла. А на кухню не хапіла б. Як ні круці, мала было б цэглы на кухню.

Так што няхай выбачае Зінка. Зяць во паедзе і скажа ёй: так і так, матка, меркавалі з бацькам, прыкідвалі і нічога не асталося, акрамя як гараж ставіць... Адным словам, адпадала патрэба спавядацца перад жонкаю, і гэта таксама радавала Зміцера...

Зноў, як і ў дзень Васілёвага прыезду, сядзелі яны за сталом на кухні, бралі па «маленькай», але цяпер між імі былі згода і разуменне.

Зміцер даравау зяцю той падман з цэментам, разважыўшы, што кожны цяпер круціць, як можа, і цягне, дзе можа, і што, зрэшты, не чужому ён даў тую сотню — свайму. Цяпер, падагрэты чаркаю, нават ганарыўся зяцем: умее жыць хлопец, не прападзе. І дачка за ім, як за мурам. І працаваць можа, калі захоча. А што ў хаце не памагае — не мужчынскі гэта клопат. Абы грошы прыносіў... Не, што там казаць, усё было добра, як найлепей было ўсё, і муляў Зміцеру толькі стары, разложысты куст бэзу... Тое, што ён рашыў ссекчы яго — гэта факт. І ссячэ, сёння ж. Дакучала не тое. Ён і дзівіўся ў душы з сябе: гэта ж трэба, каб на матку старую гледзячы, сам прыдзяцінеў. Лезла ў галаву чортведама што, круцілася цэлы дзень, трывожыла. Раней дык аказацца старой не даваў, што б ні гаварыла — рагатаў, а цяпер прыпаміналася тое ўсё сур'ёзна, не давала спакою. Ён ужо й зяцю наважыўся расказаць, але саромеўся. Моўчкі, засяроджана жаваў і думаў. Летам матцы споўніцца дзевяноста. Гэту зіму старая ледзьве перакідалася, думалі, вясны ўжо не прычакае. А ёй у голаў адно ўбілася: кажа, я, сынок, перазімую, паглядзіш. Мне, кажа, наш бэз сніцца, усё бачу, што расцвіў ён, і пах яго, здаецца, чую. Гэта знак мне такі: прычакаю, значыцца, вясны, пасяджу на лаўцы пад бэзам. Гэта ён мяне трымае — бэз, памяць Ануфрыкава. Бацька сам замалада памёр, а мне сілу сваю пакінуў...

Тады ён рагатаў з яе, расказваў Зінцы, і тая смяялася: здзяцінела маці, што ты з яе возьмеш... А цяпер, як толькі надумаў бэз ссекчы, глупства тое адразу ў голаў палезла...

Зміцер адмахнуўся ад недарэчных, дакучлівых думак, глянуў на расчырванелага зяця. Той стараўся, націскаў на закуску. Пасміхнуўся паблажліва: малады, здаровы, хай есць. Цяпер ужо не дзівіла і не раздражняла, што зяць есць яечню з салам і з мёдам. Хай есць як хоча...

Думалася пра іншае. Пра тое, што Каўзулік ужо недзе разнёс па вёсцы навіну: Шыкун гараж ставіць, машыну купляць надумаў. Заўтра ў Чаранях толькі й гаворкі будзе, што аб гэтым, дый сёння ўжо недзе не адзін хто локці кусае ад зайздрасці... Тоненька заныла, затрымцела пад самаю лыжачкаю радасць: ні ў кога няма гаража, а ў яго ёсць. І машына будзе — пачакайце, каўзулікі-маўзулікі... Зміцер, здаецца, убачыў яе, сваю белую «Волгу». Убачыў, як стаіць яна, мілая, на падворку і аж пераліваецца на сонцы... Але зноў, як бяльмо на воку, з'явіўся куст бэзу, засланіў і падворак, і гараж, і «Волгу». Зміцер ажно галавою рыжаю пакруціў і вочы пацёр. Злосць закруціла нутро, і ў душы паднялася ўсё тая даўняя, яшчэ хлапечая, крыўда на бацьку. «Памяць пакінуў... Мянушак цэлы мех і бэзу куст...» Хлопцам быў, праходу ў вёсцы не давалі, то Пісарам, то Струком, то Смальцам — ніхто ніколі па-чалавечы не назваў; на ногі ледзь падняўся — рук не было за што зачапіць, абаперціся не было на што. Гаспадарка — тры курыцы і карова перадойка, хата — трухлё адно і яшчэ во гэта: міжволі ўзяўся рукою за левую шчаку, на якой чырванела радзімая пляма... І гэта таксама бацькава памяць... Колькі напеn`ражываўся Зміцер у маладыя гады з-за плямы гэтай, колькі пакуты яна яму прынесла. Здавалася, найгоршы ён, найбрыдчэйшы. На танцах, бывала, толькі па цёмных кутах аціраўся, да дзяўчат падысці не мог... Але не быў бы ён Зміцерам. Усё перасіліў у сабе: упарты, злы быў, хітры... Адкуль што й бралася. І жонку, дай бог, адхапіў. У Чаранях тады надзівіцца не маглі, што Зінка Палуянава (адзіная дачка ў такіх слаўных бацькоў) ідзе за Зміцера Шыкуна. Ніхто не знае, як яно было ўсё. Не знае і не дазнае. А ён тады пастанавіў сабе: Зінка будзе яго, і ўсё тут. Так яно й выйшла. А якім дзівам — гэта ўжо яго клопат.

І ўсё ж абдзеленасць, крыўда мучылі Зміцера. Як стрэмка якая сядзела ў яго ўнутры і пастаянна ныла, ныла. Чым і як было яе выцягнуць, не ведаў Зміцер...

Прыпомнілася тая вясна, калі хавалі бацьку. Тады таксама цвіў бэз, і вялікія букеты стаялі ўсюды, іх неслі на магілкі замест вянкоў... Прыпомнілася тая нечаканая бацькава споведзь перад смерцю яму, Зміцеру... Ні тады, ні цяпер, ні яшчэ раней, у маленстве, Зміцер не любіў бацьку. Чаму? Хто яго ведае. Можа, таму, што быў Ануфрык слабы, вечна нездаровы, а таму заўсёды злы, бурклівы. Можа, таму, што ўсе ў вёсцы з яго падсмейвалі і калі падрос Зміцер, насмешкі тыя перакінуліся й на яго.

Цяпер, вяртаючыся да таго, даўняга, нядобра, здзіўлена падумаў: а глядзі ты, гадкі стары быў, зайздросны... Стажкі яму Каўзулікавы спакою не давалі. Другі красці пайшоў бы, а ён — не. У мяне няма, няхай і ў цябе не будзе. Узяў і падпаліў стажкі тыя ноччу. Гарэлі, казаў, як свечкі. Усе чаранёўцы беглі тушыць. А дзе ж ты іх атушыш. Матка якраз ім, Зміцерам, хадзіла грубая, у адной кашулі з хаты выскачыла, ад страху за твар рукою ўхапілася... Вот і асталася плямка радзімая ў сына на ўсё жыццё... Прызнаўся бацька тады, перад смерцю, ва ўсім, а Зміцеру яшчэ цяжэй стала, яшчэ большая крыўда на старога ў душы занялася. І тут ён вінаваты...

Ва ўсім, кругом вінаваты, а матка пра памяць нейкую вярзе... Не ўжо, хопіць... Забыўшы, дзе ён і што, Зміцер з усяе сілы па стале кулаком грукнуў, талеркі падскочылі.

Зяць здзіўлена ўзняў вочы, перастаў жаваць:

— Што, бацька?

— Нічога, сын. Ты — еш, гэта я так, пра сваё здумаў...

Дрэва было мяккае, падатлівае. Маленькая, вострая сякерка толькі пазвоньвала, і адляталі ўбок зялёныя, вузлаватыя галіны з цёмнымі шышкамі яшчэ стуленай квецені. Але вакол ужо саладкава, тонка пахла ёю, і пах гэты нечым даўнім, забытым трывожыў Зміцераву душу. Не

адыходзіў з памяці бацька, прыпаміналася то адно, то другое. Але ўсё яно было горкае, невясёлае, і гэта паддавала злосці. Не прыкмеціў, як ссек куст дачыста, каля самай зямлі. І калі ўжо адкінуў апошні сучок, тады ўбачыў, што не асталося нават галінкі, парастка нават. А хацеў жа пакінуць якую атожылу, каб расла. Ад прыкрасці ажно крактануў: «А, чорт, залёг дык залёг...» Адкінуў сякерку, павёў вачыма на хату. Баяўся, не хацеў бачыць у акне матку... Але вокны глядзелі на яго пустымі, цёмнымі вачніцамі. Не заўважыў, калі на дварэ сшарэла. Матка, пэўна, ужо спала. Стомлена апусціўся на лаўку, дастаў цыгарэты...

Прыпомніў, як сядзеў тут, на гэтай лаўцы калісьці даўно з Зінкаю і яна, маладая, сарамлівая, шукала ў бэзавай гронцы «шчасце» — кветку на пяць пялёсткаў. «Калі знайду, то буду шчаслівая за табою...» Не мог цяпер успомніць, ці знайшла...

А ноччу, на шырокай канторскай канапе прыснілася Зміцеру страшнае. Звечара ён доўга не мог заснуць: варочаўся, уставаў, піў ваду; і толькі пад раніцу прылёг, задрамаў, і прысніўся яму бацька.

Худы, босы, у расхрыстанай белай кашулі, здаецца, ішоў па іх падворку і шырока, займіста махаў касою. Ішоў проста да гаража, каля якога стаяў ён, Зміцер. Набліжаўся хутка, толькі каса жыхала: жых-жых, жых-жых. І ўсё пад ёю падала, рушылася, увесь падворак поўніўся страшным грукатам. Вось-вось і бацькава каса зойме новы, белы гараж...

Ад страху Зміцер заенчыў і сеў на канапе. Грукат не перасціх. Нехта ламіўся ў дзверы, тузаў за ручку, і яна ляскала, бразгацела. Як мага скаціўся з канапы, прыпаў да цёмнага акна. І толькі тады зразумеў, што дзверы рве моцны вецер...



БАГАМАЗ

Больш за ўсё на свеце не любіў Базыль гэтых нечаканых, як бяда, вечароў і начэй глухой восені.

Толькі во, здаецца, было светла, толькі што яркі акравак сонца вісеў, зачапіўшыся за галіны, і па бярэзніку разлівалася такая зыркая чырвань, быццам недзе за лесам адчынілі засланку ў вялізнай напаленай печы. А ўжо ўмомант ссутонела, зрабілася шара і непрытульна. Наперадзе, праўда, віднеліся між дрэў светлыя лапікі; дарога выхілялася на прастор. Аднак трэба было спяшаць, бо ён ведаў, што зараз цемень шараю ваўчыцаю выпаўзе з лесу і тады ўжо не абмінеш яе, не абыдзеш.

Не любіў Базыль гэтых цёмных вечароў і начэй позняй восені. Неўзлюбіў іх даўно, яшчэ з таго часу, калі над іх Панятоўкаю чорнаю хмараю завісла бяда...

Самымі страшнымі тады, у саракавым, былі ночы. Глухія, трывожныя, з задушлівым сабачым брэхам, з тым нязвыклым, чужым вуркатам машыны на вуліцы, ад якога зві-

нелі ў вокнах шыбы і халадзела нутро: спыніцца ці, бог дасць, міне хату.

Ночы тыя здаваліся бясконцымі.

Спаць клаліся ў адзенні, дый сну не было: ляжалі і слухалі. Напята, трывожна. У куце, звязанае ў вандзэлак і прыкрытае дзяружкаю, ляжала ўсё самае неабходнае, прышыкаванае на горкі выпадак. Штовечара Базыль клаў туды свае алоўкі і фарбы...

Лісце ў бярэзніку шахаціць так, быццам нехта нябачны крадзецца следам і зараз акрыкне нечакана, спатэйку. Страшней за ўсё — сам гук чалавечага голасу сярод цёмнага лесу. Базыль толькі ўявіць яго і адразу ўвесь здрыганецца, пахаладзее, спыніцца...

Ужо хутка год, як ходзіць ён па сваёй зямлі быццам бы і вольны, без нагляду і без канвою, але страх, халодны і слізкі, што слімак, затаіўся недзе пад самаю лыжачкаю і не-не дый пакажа свае рожкі...

Слі́мак, слімак, покаж рожкі,
дам тры грошы на піражкі...

Цьфу ты, вярзецца абы-што. Во, зачапіўся за нешта. Каб трохі, пацалаваў бы бярозу ў белае каленца...

Нарэшце пасвятлела. Базыль мінуў апошнія, рэдкія канцы лесу, дрэвы, і толькі цяпер адчуў, як было там цёпла, што ў хаце. А на прасторы шалеў вецер. Шорсткаю даланёю як відзіш абцёр з ілба пот: калючы, марозлівы, дужы, піхнуў раз і другі ў грудзі, абкруціў усяго, абняў, падшыўся ледзянымі пальцамі пад вынашаны, тонкі бурнос.

Базыль паспрабаваў глыбей нацягнуць на лоб пацёртую малаватую шапку. Але ўсё цела яго зноў праняў холад. Цяпер найбольш, наймацней хацелася цяпла і прытулку.

За гэтыя вандроўкі Базыль знябыўся, хадзіў ужо даўно прастуджаны, амаль заўсёды галодны і халодны. Тое, пра што ён марыў усе доўгія гады на чужыне, цяпер неяк незаўважна адсоўвалася ўсё далей. Ён пачаў ужо заўважаць, што, малюючы, думае не пра тое, што робіць, а што і колькі за-

робіць. А заробкі былі мізэрныя, выпадковыя. Людзі маліліся паўсюль на кавалак хлеба, абразы заказвалі рэдка і неахвотна. Часцей за ўсё, каб паесці, Базылю прыходзілася забываць пра фарбы, станавіцца і рубаць дровы, браць у рукі касу і вілы. Гэта знясільвала, адцягвала ад галоўнага, і ён усё часцей і часцей думаў, што трэба вяртацца ў сваю Панятоўку, у сваю пустую хату.

«Родная хатка, як родная матка,— прытуліць і абагрэе». Так казала яму цётка Настазя. Але тады, мінулай восенню, вярнуўшыся праз трынаццаць гадоў на радзіму, ён не паслухаў цёткі і не астаўся. Пазней ужо зразумеў, што ўцякаў ад успамінаў і думак, якія нахлынулі на яго адразу ж, як толькі пераступіў бацькоўскі парог... Хацеў ураташаць ад болю душу. А чым і як ты яе ўратуеш, калі болю ўсюды поўна — не свайго, дык чужога... Нахадзіўся, наглядзеўся, напоўніўся ім да краёчкаў — дна не відно. І неяк ужо й прыцярпеўся да ўсяго, абвыкся, думаў аб усім спакайней, і нават сваё ўспаміналася таксама спакойна і абыякава. Гэта палохала, бо грозіла небыццём, грозіла смерцю. Рука рабілася вялаю і абыякаваю. Хрыстос, якога найчасцей маляваў, быў такі ж нежывы, бяздумна суровы. А праз яго, праз Хрыста, хацелася расказаць людзям аб пакутах сваіх і бацькавых...

У такія моманты глухога адчаю ён звычайна даставаў з кішанька пажоўклы здымак, на якім былі зняты ўсе яны ў тым апошнім годзе перад бядою. Маці, бацька, брат Вацак і ён сам, шчаслівы, усмешлівы гімназіст. Углядваўся ў родныя аблічча, чуючы, як тужліва пачынае нешта ныць усярэдзіне, як ажывае душа, і тады ліхаманкава хапаў пэндзаль, фарбы, прыпадаў да палатна... Праз колькі часу, знясілены, спустошаны, зноў бязвольна апускаў рукі. На яго, як і раней, безнадзейна, сурова глядзелі вочы Хрыста. Чужыя. Незразумелыя...

Стаяла сухая і позняя восень. Моцныя маразы ўдарылі нечакана, па галашчоку, і ад таго было асабліва холадна

і непрытульна. Храпістая, разбітая калясьмі яшчэ да маразоў дарога агінала шырокі абшар заінелай руні.

Базыль прыпыніўся. Скалелаю рукою сцёр з вачэй слязу і ў дальняй купцы голых дрэў згледзеў чужое вастраверхае гумно і рог хаты. Пастаяў, прыглядаючыся, паправіў за плячыма лёгкую торбачку з фарбамі, пайшоў.

Ён ішоў паволі, хоць і было холадна. Ішоў, роздумна азіраючыся. Нібыта ўсё яшчэ сумняваўся: а ці туды ідзе. Але колькі ні азіраўся, нічога, акрамя гэтага хутара, угледзець не мог. Вёска, пра якую яму гаварылі, відаць, была дзесьці далей. Тут жа, перад ім, мёртва ляжала скаваная холадам рунь, цямнеў збоку вострь зубец маладога ельніку. І невядома куды і да каго вяла гэтая пустая, вымеценая скавышом дарога. На нейкую хвілю Базылю зноў зрабілася непамысна і страшна. У грудзях пачынаў шкрэбаць прыступ сухога кашлю. Ён затаіў дыханне: думаў так падмануць, перасіліць кашаль. Зрабілася, і праўда, трохі лягчэй, але папранейшаму не ішоў з душы страх. Праціўна шавяліўся пад самаю лыжачкаю, адбіраў і без таго кволую надзею на свае сілы.

Было дзіўна, але гэты страх ён пачаў адчуваць ужо тут, на радзіме. Ніколі раней, хоць прайшоў праз такое пекла, не знаў яго. Можа, таму, што нялюбае ўсё было яму на чужыне і нямілае сэрцу, што не даражыў ён там анічым і вельмі часта хацеў памерці...

Базылю прыпомнілася пустая, халодная адрына на канцы вялікага сібірскага сяла, белыя ад намаразі сцены, вузкая, абслізлая бэлька, за якую ён, залезшы на торп свежай і таксама слізкай саломы, спрабаваў зачапіць дзягу...

Было тое праз дзевяць дзён пасля бацькавай смерці.

Цяпер Базыль успомніў, як сядзеў тады на настылай саломе, як глядзеў праз дзіравую стрэху, праз цёмныя рабрыны крокваў на далёкія халодныя зоркі і перабіраў у памяці напаследак усю сваю жытку. Бачыў Панятоўку, родную хату каля маладога ельніку, вузкую, зарослую бабком і сівымі драбінцамі сцежку, высокі камень каля сцежкі. Дзіў-

ны такі, акурат як зграбна завершаны стажок. Здаля ён так і выдаваў: унізе шырокі, а падверх усё вузейшы і роўны з усіх бакоў, як бы яго і праўда хто скідаў ды яшчэ й харашэнька абгладзіў і аправіў.

У лагчынцы каля каменя рос куст шыпшыны. Ён тады ўбачыўся Базылю ўвесь асыпаны зоркамі квету, калыхнуўся перад вачыма, як жывы. І ўжо сам не разумеючы, што з ім робіцца, Базыль шухнуў уніз з высокага, слізкага тарпа, балюча выцяўся каленьмі аб ток і што меў сілы кінуўся прэч...

Потым стаяў каля якогась старога дрэва, прыціснуўшыся тварам да шурпатага ствала, і ўпершыню за ўсе пакутныя гады плакаў... Чуў, як паступова папускае свае страшныя абручы нянавісць, як робіцца лягчэй дыхаць...

Праз колькі дзён яго, знясіленага, змарнелага, нарэшце знайшла пасылка з Панятоўкі ад цёткі Настазі. Пасылка была даверху запоўненая сушанымі яблыкамі і сухімі, прыморшчанымі ягадамі шыпшыны.

...Базыль акінуў вачыма наваколле, прыкмеціў кожны кусточак пры дарозе і кожны камень.

«Краю мой, краю...» — шаптаў, паўтараў сам сабе непрытомна і часта. І мацней, чымся гэты марозлівы вецер, яго апаліў нечаканы дакор: «Ідзеш, каб схавацца ад холаду, шукаеш цяпла і прытулку, наракаеш на лёс, баішся смерці... А куды дзецца ёй, гэтай знямелай ад стыласці руні, куды схавацца? Яна мусіць цярпець, мусіць знесці холад, каб выжыць і закаласіць вясною, каб даць табе хлеб. Во то сіла... во то, вучыся, дзядзька...»

Збочыў з дарогі, прыгнуўся і рукою крануў настылае, пацямнелае ад холаду зяленіва. Адчуў яго прэсны пах і з болем падумаў, што цэлая вечнасць аддзяляе яго ад усяго, што было калісьці звыклым.

«Во то... трынаццаць гадоў мінула...»

Ішоў тысяча дзевяцьсот пяцьдзесят трэці год.

Базыль дайшоў да хутара, калі добра сцямнела. Доўга хадзіў каля плота, шукаў брамкі. Не знайшоў, пераступіў

праз паламанае перавясла і апынуўся на цесным падворку. Бачыў, што ў хаце няма агню, і заране сцінаўся ад думкі, што нікога тут не застане. Ісці куды-небудзь далей не меў сілы.

Тузануў дзверы. Яны былі заваленыя знутры. Там, за імі, нешта натужна рыпела і шоргала. Базыль пастукаў, і шоргат адразу сціх. За дзвярыма, відаць, слухалі. Ён пастукаў яшчэ і яшчэ, і тады пачуліся крокі. Малады жаночы голас ціха спытаў: «Хто?» Адказаў: «Багамаз». Так звалі яго ўсе, не пытаючы звычайна ні імя, ні прозвішча.

Забразгала засаўка. Толькі цяпер недзе каля гумна ляніва яўкнуў і сціх сабака. Наляцеў парывісты вецер, сарваў з блізкага сліўняку жменю лісця, шпурнуў Базылю пад ногі...

Дзверы нарэшце адчыніліся, і Базыль ступіў у прасторныя сені.

У куце, насупроць парога, вісела на дроце газоўка, асвятляючы невялікія жаронцы пры сцяне і бялявага шчуплага хлапчука ў доўгім жаночым сачыку. Хлапчук стаяў на высокай калодцы, трымаўся рукою за гладкі млён, з насцярогаю глядзеў на прышлага.

Базыль зноў адчуў прэсны пах руні, і перш чым зразумеў, што пахне гэта свежая мука ў жорнах, у яго моцна закружылася галава. Паплыў кудысьці ўбок бялявы хлапчук, балюча і ярка загайдалася перад вачыма лямпа. Ён паспеў прысланіцца да сцяны, моцна сцяў зубы. Млосць адышла. Тут жа, зусім блізка, убачыў вялікія цёмныя вочы, якія трывожна глядзелі на яго з-пад густых, прыцярушаных пылком веяў, слаба ўсміхнуўся.

— Вам нядобра?

Ён не адказаў, і жанчына хуценька адчыніла дзверы ў цёплую, невялікую хату.

Базыль кінуў у парозе лёгкую торбу, сцягнуў з галавы шапку і, як быў, у бурносе, прайшоў да лавы, сеў. Высока, да сцяны, адкінуў галаў, прыплюшчыў вочы. Сядзеў гэтак нерухома і доўга, чуючы, як у цяпле зноў пачынае балюча

шкрэбаць у грудзях сухі кашаль. Хацеў стрымаць яго, але не змог. Кашляў доўга, праз слёзы, вінавата пазіраючы на гаспадыню. Яна хуценька махнулася да печы, выцягнула невялічкі закураны гаршчочак і тут жа падала Базылю кубак з цёплым адварам маліннікў.

Кашаль як накаціўся, так нечакана і аціх. Базыль піў гаркавы духмяны адвар і адчуваў, як цяпло паволі разліваецца па ўсім целе, як самі сабою закрываюцца вочы.

Ноччу выпаў снег. Прачнуўшыся пад раніцу, Базыль ажно здумеўся: у хаце было светла. Падхапіўся і сеў: няўжо дзень, а ён так доўга спіць у чужых людзей? Але тут жа зразумеў, супакоіўся — вакол было светла ад снегу.

Ён зноў лёг, глыбей падшыўся пад гладкую парцяную дзяружку, але спаць ужо не хацелася. Перад вачыма калыхаўся белы морак, і Базылю здалося, што ляжыць гэта ён у роднай хаце і во зараз падхопіцца, выбежыць на засыпаны чыстым снегам двор і ўсё перажытае знікне, як дрэнны сон...

Божа, як ён любіў некалі той першы снег на родным падворку. На гумнішчы, на хаце, на маладым садку, на ніцых старых бярэзінах, на блізкім ельніку... Як часта пасля прагла душа яго хоць на міг вярнуць роднае акенца з ружовым водсветам агню ад печы, з імклівым матчыным ценем...

Бывала, ён раней за ўсіх выбягаў з хаты, прыпыняўся насупраць таго маленькага акенца, і адразу ж пачыналася казка. Святочная, таемная, як усе казкі на свеце, і зусім рэальная, блізкая. Знаёмыя гукі і пахі паступова поўнілі ранак... Лёгкі, амаль нячутны шорхат сняжынак і шэры слупок дыму над страхою, ціхі рып хатніх дзвярэй і звон вёдзер каля студні. Чырвоны вугельчык бацькавай цыгарэты і пах тытуню, што мяшаўся з пахам свежага снегу і салодкім водарам мурагу з расчыненага гумна... Усё гэта кружыла галаву і працінала п'янкім прадчуваннем шчасця.

Але вось ужо наступаў дзень, вылазіла з-за хмар блед-

нае, заспанае сонца, і святочны настрой змяняўся вярэдлівым неспакоем. Дарэмна даставаліся з гарышча самаробныя ясеневыя лыжы, дарэмна выцягваліся з-пад паветкі санкі з іржавымі палазамі. Свята канчалася. Снег асядаў, мяшаўся з гразёю, і ўсё вакол рабілася зноў будзённым і шэрым. Вечарам Базыль браў скрыначку з фарбамі, якія прывёз яму з Вільні Вацак; і ўжо на паперы з'яўляліся аснежаныя бярозы, хата з роўным слупком сіняга дыму, ружаватае акенца і гэтакі ж ружовы снег насупраць яго...

Базыль ляжаў, шырока расплюшчыўшы вочы, закінуўшы за галаву рукі. Думаў пра тое, што нічога вечнага няма ў гэтым свеце, што ўсё яно такое ж нетрывольнае, як той першы снег у маленстве. Ён думаў, што цяпер і снегу гэтага, ні першага, ні апошняга, ужо не любіць. Увогуле, не любіць зімы, бо яна агоркла, спракудзела яму ў Сібіры. Бо і цяпер зіма, акрамя бяды-клопату пра цяпло і начлег, анічога яму не нясе...

І ўсё ж Базыль дзівіўся, што пачынае ўжо думаць і ўспамінаць не адно аб горкім і сумным. Думкі ўпарта вярталіся да ўчарашняга вечара, і яму ўспамінаўся трывожны пагляд вялікіх цёмных вачэй, ціхі глыбокі голас, якога ён не чуў ніколі, але па якім так спадкаемна, сам таго не знаючы, сумаваў...

Ён абводзіў позіркам хату і ў белаватым прысмерку бачыў усю яе, невялікую, звыклую, але не па-вясковаму чыстую, утульную, скрозь застаўленую вазонамі. Чуў спакойнае жаночае дыханне, зусім блізка, за невялічкаю шафаю... Праз усю ноч, здаецца, адчуваў ён лёгкі дотык маленькай цёплай рукі да свае скроні, да лба, да прыплюшчаных павек.

Здалося, што яна зноў паднесла яму кубак з цёплым пахкім маліннікам і адным толькі нясмелым спагадным дотыкам вярнула яго з цяжкага забыцця, зняла з вачэй стому...

Усё зноў і зноў вярталася да Базыля: і падсіненая, трывожная бель далёкага, ажно з маленства, ранку, і тое акенца

з цёплым водсветам агню ад печы, і бела-ружовыя зоркі шыпшыны ў яркай раскошы зяленіва, і пацямнелая ад холаду рунь пры дарозе... Ён не вытрымаў: усхапіўся і сеў. Ведаў, што трэба было тут жа, неадкладна браць у рукі фарбы і пэндзаль, але ў хаце стаяў усё яшчэ мутны, белаваты морак. Ад бяссілля і роспачы Базыль ажно застагнаў. І тут жа нечакана ўявіў, убачыў усе свае абразы, якія маляваў за кусок хлеба ў такіх во хатах, зашаптаў горка, зняважліва: «Багамаз! Ба-га-маз...» Роспачна прыпаў гарачаю шчакою да сцяны. «Табе боты б шыць, а не Хрыста маляваць... Раменік!»

Базыль адчуў, як варухнуўся зноў у душы той слізкі, агідны слімак страху і сумнення. Толькі на нейкі час схаваў ён свае рожкі, затаіўся, чакае моманту, каб зноў кальнуць. Балюча, нядобра. І тады адразу паблякнуць, пагаснусь у вачах фарбы, і аціхнуць у душы гукі, і амярцвее, і стане вялаю рука...

Даўкая крыўда, быццам надкусіў незнарок зялёную грушу-дзічку, здушыла горла... Чаму ўсё так? І ў чым віна яго? У чым бацькава віна і братава, за што так адпакутавала матка і чаму, за якія грахі павінны бацькі ляжаць у чужой, халоднай зямлі? Чаму тут, на радзіме, ён павінен туліўцца, як чужак, як вораг?.. Каму і што яны зрабілі нядобрага? Бацька з маткаю прасветлай гадзіны не бачылі, працавалі з ранку да вечара, каб яны з братам вучыліся. Багацеі такія... Вечна пазычалі жыта да новага...

За што загінуў Вацак? Такі чэсны і шчыры... У трыццаць восьмым яго забралі ў польскае войска. Дык хіба на тое была яго воля ці ў тым была яго віна?.. Пекла на вайне зазнаў, з палону ўцёк, дахаты прыйшоў.

А хата — пустая. Як яму было ва ўсім разабрацца, у каго спытаць, дзе праўда?

Цётка Настазя расказвала і плакала.

«Прыйшоў уночы. Паглядзеў, што хата свая на замку, і да мяне, сюды. Цераз парог не паспеў пераступіць, адразу: дзе нашыя? Ну, што тут скажаш? Не ўтоіш, не схаваеш.

Няма, кажу, вашых, сынок. На «камары» вывезлі... А ён стаіць, бедны, і без таго спакутаваны, змарнелы, толькі вочы блішчаць, і анічоганькі не разумее. Куды, на якія «камары»? Пасадзіла я яго і давай, як магла, тлумачыць. Хапун, кажу, быў тут у саракавом, чатыры сям'і з Панятоўкі забралі... За што, хто забраў, куды? А каб я ж ведала, за што і куды. Ад цябе ж, Базылёк, з Сібіры ліст атрымала ажно праз дзесяць гадоў...

Нічога я яму толкам так і не магла сказаць. А ён месца сабе, бачу, не знаходзіць. А тут у вёсцы малодшы Валатовічаў хлопец якраз быў. Гарачы такі, урвіс, адчайны. Іх сям'ю адразу неяк пасля вас вывезлі. І Цеслюкоў Антось. Яго бацьку толькі ўхапілі. Антось з маткаю ў Вільні якраз былі, у матчынай сястры. Ну, вот праз колькі часу спрагліся яны ўтрох. Усё тут во, у мяне ў хаце па вечарах збіраліся, шыхалі... А тады аднаго разу Вацак аднекуль прыходзіць і кажа: «Цётка Настазя, я ведаю, хто нашых згубіў. Дольскі крывы, ганучнік. Ён на ўсіх даносы пісаў...»

А ўсе ж мы гэтага Дольскага, Ёсіпа, як аблупленага ведалі. Ведалі, што ён і палякам служыў. Не адну душу прадаў. Бывала, што ж там, усе ў вёсцы між сабою па-свойму гаварылі, а ён, дзе табе, не іначай як па-польску лупу крывіў.

А як у трыццаць дзевятым Саветы толькі зайшлі, адразу «рускім» зрабіўся. Бывае, дабрыдзень дасі, а ён як не чуе. Сам усё — «здрастуй», «пажалуста», «спасіба». Дабра ўсякага меў. Схрон за хатаю зрабіў, усё закапаў, а наверсе копчык насыпаў і крыж паставіў. Гэта, кажа, я панскую Польшчу пахаваў... Праўда, знайшоўся нехта дападны і раскапаў тую «магілку». Казалі, й сукна там было, і золата, і ўсякай халеры...

А не паспелі немцы аб'явіцца, ужо гледзімо, ганучы з воза вытрас і ідзе па вёсцы з стрэльбаю за плячыма ды з павязкаю белаю на рукаве...

Ну, вот. Сказаў мне Вацак пра Дольскага, яшчэ пару дзён пабыў, а потым кажа: усё, цётачка, адпачыў у вас, абагрэўся, трэба цяпер пра даўгі падумаць. Набралася іх

шмат, жыць не даюць. Трэба, кажа, сяму-таму і за «камароў», і за «мух» заплаціць.

Я тады ў плач: а дзеткі, прашу яго, анікога ж не асталося з нашых, а ты ж адзін у мяне, паберажы сябе...

Чула мая душа, што ідзе ён ужо назаўсёды... На каленях за ім да парога паўзла, не ўтрымала. І не відзела яго больш. З іх толькі Валатовічаў Віцька ацалеў. Але адразу па вайне выехаў адсюль. Адно магілку Вацючкову паказаць паспеў...»

Базыль прыадкрыў вочы. У хаце было ўжо светла. Усёткі заспаў. Во то, дзядзька, патолю сабе даў, як госць дарагі.

— Ці ты слухаеш, мама?.. Сказала чытаць, а сама барабаніш патэльняю...

Лёнік, усё ў тым жа матчыным сачку, сядзеў на покуці за сталом, уткнуўшыся ў нейкую паперку, смешна шавяліў прыпухлымі вуснамі. Нешта сам сабе разбіраў. Потым адкінуў з вачэй пасму доўгіх светлых валасоў, глянуў кудысьці за прыпек.

— Слухаеш? Надта дробныя літары. Паволі буду кумэкаць...

«Предупреждение № 41 от 25 ноября 1953 года гражданину Кандрушевич Анелии Антоновне...»

«Ага, значыць, Анелія Антонаўна». Базыль усміхнуўся, прыпомніўшы, як учора вечарам яны знаёміліся і яна коратка назвала сябе: Анэля. А ён, дурань: а па бацьку? А яна ажно разгубілася: што па бацьку?

— Ну, вас як па бацьку зваць?

Яна так шчыра здзівілася, і ў цёмных вачах заблішчалі іскрынкі смеху:

— А вы што ж, нетутэйшы? У нас век моды такой не было — па бацьку...

Лёнік чытаў. «По врученному вам обязательству № 8962 вы обязаны были сдать государству к первому ноября тысяча девятьсот пятьдесят третьего года мясо, молоко, яйцо. Кроме того, за вами числилась недоимка сто девяносто

семь кг мясо, пятьдесят девять лит. молоко, сто семьдесят шт. яйцо... На основании постановления Совета Народных Комиссаров Союза ССР от 24-го ноября 1942 года № 1882 «Об ответственности за невыполнение обязательных поставок сельскохозяйственных продуктов государству колхозными дворами и единоличными хозяйствами» предупреждаю вас, что ■ случае несдачи числящейся за вами недоимки ■ десятидневный срок от настоящего числа, т. е. до 5-го декабря 1953 года...— Мама, гэта лінейкаю падкрэслена! —...дело о невыполнении вами обязательств по сдаче мясо молоко яйцо будет передано в суд для наложения на вас штрафа в размере до двухкратной стоимости не сданных в срок продуктов, исчисленной по рыночной цене. Предупреждаю вас также о том, что если ■ десятидневный срок, т. е. до 5-го декабря 1953 года не покроете числящейся за вами недоимки, то независимо от передачи дела в суд для наложения штрафа, у вас в погашение недоимки будут изъяты: скот, птица, зерно, картофель, семена масличных культур (ненужное зачеркнуть) в бесспорном порядке».

Ранак быў белы і ціхі. З насупленага, нізкага неба ўсё яшчэ церушыў дробны сухі сняжок, але мароз не адпускаў, і адчувалася, што гэты першы снег заляжа надоўга.

Базыль сядзеў каля акна, на лаве, дзе перад тым сядзеў Лёнік. Лёнік толькі што пабег у школу. Гаспадыня была недзе на двары, уходжвалася, відаць, па гаспадарцы. На стале перад Базылём цёпла курэлася параю шклянка з бура-чырвоным адварам маліннiку. Ён нахіляўся над ёю, глыбока ўдыхаў духмянае вільготнае цяпло, грэў каля шклянкі далоні. Чакаў, пакуль астыне маліннік, і ўсміхаўся. Упершыню за столькі гадоў яму было добра. Добра было сядзець у гэтай чыстай, утульнай хаце, добра было думаць, што нарэшце азяблую, скалелую зямлю прыкрыў мяккі трывалы сняжок, добра было адчуваць, што зараз адчыняцца дзверы...

Дзверы і праўда адчыніліся, і ў хату зайшла Анэля. З парога зірнула на яго і прытоена ўсміхнулася, быц-

цам адразу ўгадала ўсе яго думкі. Потым зняла ватоўку, ссунула з галавы канаплянку, прайшла да стала.

Базыль толькі цяпер, здаецца, убачыў, па-сапраўднаму разгледзеў, якая яна яшчэ маладая. Невялічкая, зграбная, не па-сялянску танклявая ў стане, з далікатным, тонкім тварам, на якім трывожным агнём гарэлі вялікія цёмныя вочы.

— А ўчора вы мне падаліся зусім старым.

— Ну, дзякуй.— Базыль засмяяўся.— А сёння што ж?..

— А сёння бачу, што не зусім...— і таксама рассмяялася весела, доўгім глыбокім смехам.

Прысела насупраць, падперла невялічкім, крэпкім кулаком шчаку, нечакана сур'ёзна спытала:

— Чулі, што мне Лёнік сёння чытаў?

— Чуў. І не толькі сёння, і не толькі ў вас. Наслухаўся ўсякага за свае вандроўкі.

— Ну, вот. Прыйдзецца зноў на лес кабанчыка выганяць.

— Як гэта?

— А так... Хаваць трэба, бо забяруць. А тады што ж — торбу за плечы і жабраваць. Ладна, каб адна, а то ж сын...

Базылю хацелася запытаць, чаму яна адна, чаму толькі з сынам, але Анэля загаварыла пра іншае:

— Учора па палудні збожжа на працадні давалі. Людзей да амбара як на фэст сабралася. Бабы ўсе па пяць торбаў з сабою пабралі. Ну, дзяліць пачалі, па спіску, па брыгадах. Кладаўшчык важыць, брыгадзір спіс чытае. Гляджу, сыплюць: у адну торбу — 100 грам жыта, у другую — 200 грам проса, у трэцюю — 200 аўса, у чацвёртую — 100 пшаніцы, кукурузы і гэтак во ўсё па 100, па 200 грам на працадні.

І смех і грэх. Глядзела я, глядзела на ўсё гэта, і так мне нядобра зрабілася. Год, лічы, адрабілі, зіма йдзе. Жыві тым збожжам, рабі з яго што хочаш... Раззлавалася я, дастала адну торбу: сып, кажу на кладаўшчыка, усё ў адну. А брыгадзір вочы вылупіў: «Ты што, дзеўка, здурнела, усе культуры

разам мяшаць?!» Халера іх бяры, кажу, з тваімі культурамі, не пакусаюцца і ў адной,— хоць несці будзе што...

Анэля ціха засмяялася, хуценька падхапілася з-за стала:

— Бегчы трэба. Зараз брыгадзір прыпрэцца... Мы яго тут Цівуном празвалі. Вёска ёсць такая — Цаюны, дык ён усё, калі што якое: «Я не адсюль, я з Цаюноў...» Як бы ў тых Цаюнах хаты не саломаю, а блінамі крытыя. Дужа важныя яго Цаюны. Як і ён сам... Конна ездзіць. Чуць свет — ужо гарцуе. І па вёсцы, і па хутарах — збавення ад яго няма. Нікому не дасць як след у печы выпаліць. Не дай бог, запозніцца каторая, ён тут як тут. «Ах, ты йшчэ не ўправілася, бедная, у печы не выпаліла. Ну, я табе памагу зараз». І — да вядра з вадою. Зачэрпае кубак — і ў печ. Агонь залье і паехаў. Гэтак раз у нядзелю да мяне ўскочыў і таксама за кубак і да печы. А я тым часам — за другі і ў вочы яму, і ў вочы. Каб не Лёнік, то, пэўна, біцца скочыў бы, а так пабялеў адно, вылаяўся і, абціраючыся, з хаты пасунуўся. Па той раз — як адрэзала. Ніколі больш не зайшоў. З каня нават не злазіць. Пад'едзе пад акно, у шыбу пастукае і далей panёсся...

Базыль зарагатаў, таксама ўстаў з-за стала. Трэба было спытаць, як і што ён мае рабіць сёння. Ці мо спачатку памагчы што па гаспадарцы, ці адразу за сваю работу брацца... Цікава, які б яна абраз хацела? Не ведаў пакуль, што яна скажа, але сам ужо адчуваў: будзе маляваць яе... Ці некага... Але з яе абліччам. З такімі ж цёмнымі, трывожнымі вачыма, з танюткімі стужачкамі чорных броў, з вянком русых валасоў над высокім чыстым ілбом.

Яна нечакана пільна зірнула на яго, але тут жа адвяла вочы. Базыль зноў прыкмеціў лёгкую ўсмешку, што прабегла па яе твары, на кароткае імгненне дзіўна асвяціла аблічча.

Анэля хуценька павярнулася да лавы, узяла ватоўку і ўжо з парога ціха сказала: «Не турбуйцеся ні пра што. Адпачывайце...»

Базыль маляваў цэлы дзень. І цэлы дзень радасць у яго-

най душы перабівалася адчаем. І ўсё-такі перамагла радасць.

З пустога, нядаўна халоднага палатна на яго трывожна глядзелі вялікія цёмныя вочы.

Стомлены, але шчаслівы, ён адлажыў нарэшце пэндзаль, сабраў фарбы... Нечакана позірк яго натыкнуўся на шэрую, спісаную едкім сінім чарнілам паперку пасярод стала. Базыль падсунуў яе да сябе, прачытаў: «Предупреждение № 41 от 25 ноября 1953 года...» Адразу прыпомніўся сённяшні ранак, Лёнік за гэтым сталом, у вялікім матчыным сачку... Прыпомнілася гаворка з Анэляю. Толькі цяпер зразумеў, як старалася яна схаваць адчай за тымі знарок жартаўлівымі аповядамі пра сваю жытку...

Ён зняў з цвіка шапку, бурнос, хутка апрануўся і выйшаў на двор. Быў ужо адвячорак. Ён убачыў, што за дальнім бярэзнікам, праз які ён учора ішоў сюды, садзіцца сонца.

Нанач крапчэў марозік. Было ціха і гэтак, як у маленстве, саладкава, свежа пахла першым чыстым снегам. Снег ляжаў скрозь — лёгкі, падсінены глыбокім небам.

Базыль агледзеўся. Вастраверхае гумно, якое найперш прыкмеціў ён учора, ад надворка свіцілася голымі кроквамі. Палова страхі была чамусьці здзёрта. На зямлі, прысыпаная сняжком, ляжала вялікая куча саломы. Толькі цяпер зразумеў, што гумно пачалі раскідаць. Ён бачыў ужо не раз, як разварочвалі гумны, часам зусім яшчэ новыя, крэпкія, і яго заўсёды нядобра дзівіла такая дурнота. Чалавек будаваў, траціў час, сілы — і на табе: перажытак мінулага, кулацкія элементы... «Асабліва тут, у гэтай во гаспадарцы»,— падумаў Базыль і нявесела ўсміхнуўся. Ён акінуў вачыма ўвесь падворак і ўсю небагатую забудову. Нават шчодры сняжок не мог схаваць даўнюю ва ўсім занядбанасць.

Невялікая, крытая саломаю хата, нахіленыя платы, гумно гэта з садранаю напалову страхою, нізкі хлевушок і амаль пустая дрывотня з кучкаю альховага пацапнякý...

Базыль доўга шукаў сякеру. Знайшоў яе ў гумне ў застаронку. Сякера была не для жаночых рук. Цяжкая, з даў-

гім нязручным тапарышчам, тупая і ўшчэнт павыбіваная. Там жа, у гумне, у драўлянай скрынцы агледзеў напільнік...

Потым, скінуўшы бурнос, рубаў на дрывотні сырыя альховыя дровы. Рубаў лёгка, чуючы ў сабе нечаканую сілу і дужасць, а разам і шчырую ахвоту зрабіць як мага больш, як найболей паспець... Рэзкі прыступ сухога кашлю сціснуў грудзі, закалаціў усяго, прыгнуў да зямлі.

У хаце Базыль дастаў з печы гаршчочак з цёплым маліннікам, доўга піў. Знясілены, адразу аслабелы прайшоў за шафу, прылёг на ложак...

Снілася Базылю, што ён малюе. Ніколі ў жыцці ён так не маляваў. Рука, лёгкая, паслухмяная, кідала на палатно мазок за мазком. Фарбы выходзілі нечакана смелыя, густыя, яркія. І ўвачавідкі ажывала на палатне казка яго далёкага маленства: падсіненая бель першага снегу, акенца з ружовым водсветам агню ад печы, з імклівым матчыным ценем, шары слупок дыму над страхою, яркі вугельчык бацькавай цыгарэты...

І жывы быў брат Вацак, і не было ў душы Базылёвай страху, а была радасць.

Ён адчуваў лёгкі дотык маленькай цёплай рукі да свае скроні, да вачэй і ўпарта шаптаў, паўтараў: «Ёсць вечнасць. Ёсць. Вечнасць — гэта Любоў».



ПАХ МУРАГУ

Ужо трэці раз лічыла Ульяна грошы і ніяк не магла далічыцца: выходзіла ўсё не тое, што мелася быць. Ад хвалявання кабеце зрабілася нядобра. Яна адсунула грошы на сярэдзіну стала, зняможана апусцілася на ўслон. Адчула, як дробна лекацяць ногі і ўкрываюцца халодным потам парэпаныя далані рук. «Ну, вот табе. Маеш. Не дадаў Мазюк сотні. А што цяпер, га? Што ж цяпер?»

Гарачая млявасць, роспач і ўтрапенне звіліся ў такі цесны клубок, што на нейкі момант Ульяне здалося — канчаецца свет з гэтай страчанай сотняй і няма ўжо выйсця, а самае галоўнае — танчэе, танчэе і вось-вось лопне, парвецца тая нітачка надзеі, што як прамень пранізала, сагрэла яе нутро. І ўжо ратуючы яе, гэту надзею, яна зноў прысунулася да стала, падгарнула да сябе кучку скамечаных, пацёртых паперак, узялася лічыць. «Калі й цяпер не сыдзецца, то ж напэўна не дадаў. Сама ні рубельчыка не брала. Але ж як, як не дадаў, калі на вачах, пры ёй лічыў і яна настолькі пэўная была, што нат не пералічыла, калі пайшоў.

Што ж гэта за насланнё, га?» І не верачы ўжо сабе, зноў пачала раскладваць, разгладжваць паперкі, выбіраючы большыя — дваццацьпяткі, складваць па сотні. І як урэшце палажыла апошнюю — дух адкаціўся. «Во здурнела баба дык здурнела. Усё рубель у рубель. На чалавека такое падумала. Гэта ж трэба».

Стала так прыкра і сорамна, што Ульяна адчула, як зноў прылівае гарачыня і млявасць. «Што значыць рэдка пры такіх грошах быць даводзіцца»,— мільганула як апраўданне. Акуратна сабрала іх, злажыла ў чыстую насоўку, заціснула пляскатым вузлом, апусціла за пазуху: «Во як — Саколка мая ў насовачку ўмясцілася». І, успомніўшы перажытую прыкрасць, аж скаланулася.

«І хто толькі гэтыя грошы прыдумаў, каб яны па ўсім свеце звяліся». Хуценька паднялася, пачала апранацца. Ужо прымкнуўшы хату, апомнілася — трэ за адно свінчаці ўкінуць, спакайней будзе. Вярнулася, узяла вядро з цестам, выйшла на вуліцу. Яшчэ было шара, вёска спала. Толькі сям-там пракідаліся агеньчыкі. Прыгледзелася, пазнала бліжэйшы: у Крыцкіх, на ферме робяць. Асцярожна ступаючы, каб не паслізнуцца, патэпала да хлява.

З ночы трымаўся марозік, было не па-восеньску ціха і зорна. Падумала, што добра гэта, прымаразкі такія на хлюпату: снег па сухому пойдзе. Успомнілася, як да пенсіі ўставала кожнае раніцы вось так, зацемна, і, не чакаючы світанку, бегала да хлява, уходжвалася, карміла жывёлу, тупала ў хаце ля печы — пякла блінцы, цэлую гару. Пульхных, духмяных — звечара расчыняла на сыроватцы, будзіла сыноў. І як адчула на якісь момант у сабе тую маладую сілу, ненатольную прагу жыцця, што, як стала помніць сябе, жыла ў ёй і прымушала рабіць, здаецца, неверагоднае — працаваць і ў калгасе і дома за траіх. Ніхто спрастацца не мог — бабы, бывала, у баразне побач стаць баяліся: запарыць Ульяна...

Пачуўшы гаспадыню, у хляве сонна азваўся парсюк, і яна, адмыкаючы, загаварыла да яго па сваёй даўняй звыч-

цы размаўляць з усім жывым, што было ў яе невялічкай цяпер гаспадарцы. І толькі як расчыніліся цяжкія створкі дзвярэй, як дыхнула з хлява нязвыкла халодным і ад таго, здалося, пустым — нядобра стала на сэрцы. І як толькі што за сталом, калі ніяк не магла палічыць грошы, зрабілася цяпер горача, млосна. Апусціла на гной вядро з мяшанкаю, дзеля чагосьці мацнула за пазухай — адчула цвёрдае, хрусткае, бы ад гарачага, хуценька адхапіла руку. Справа, абвыклымі ў прыцемку вачыма, убачыла расхрыстаныя вароты пустой вялікай загарады. І ўрэшце канчаткова зразумела, паверыла: няма Саколкі. І тое, што прыснілася сёння, што падняло сярэдначы — працяг учарашняга, рэальнага. Адчула, як становіцца расхрыстана-пустой і халоднай душа, бы гэта вялікая загарада. Які з час стаяла, апусціўшы рукі, утрапёна ўглядвалася ў карэлыя ляскі, у цёмнае бярвенне сцен, слухала, як на хляве ў леташняй пацярусе шамотаюцьскігічуць мышы.

Страціўшы цярпенне, караскаўся пярэднімі нагамі, лез на вароты кармляк, ценька верашчаў. Ульяна спахапілася, апомнілася, чаго прыйшла сюды, падняла вядро, перагнуўшыся, углядвалася, шукала вычыма карыцік, прыгаворвала: «Есці хочаш, разбойнік, а міску сваю схаваў нябось. Пацярпі крышачку, ува што ж табе вылью?» Урэшце знайшла, прысунула плыценькі, з паабгрызанымі краямі, чаўначок, адвёўшы рукой віславухага, выліла з вядра, які час пастаяла, слухаючы, як смачна той лэхае, пайшла.

На двары паступова віднела. Радзелі на пасвятлелым небе зоры. На ўсходзе займалася чырвань. У настылым вецці старога клёна ўздыхаў, прачынаўся вецер. Раз-другі холадна дыхнуў ёй у твар, як гуляючы адхапіў з-пад хусты сівую пасмачку валасоў, затрапаў па дробным, у зморшчынках, твары, заказытаў тонкія вусны. Не зважаючы на свавольніка, засяроджаная на сваім, неадчэпным, шпарка выйшла з двара, пайшла па вуліцы.

Вёска прачыналася. То тут, то там жоўта ўспыхвалізагараліся вокны, з камінοў роўнымі слупамі ўставалі дым-

кі, цягнулі ў неба. «На пагоду»,— падумала. У душы, невядома адкуль узялося, заварушылася раптам няяснае, кволае адчуванне трывогі. Ульяна не хацела яго заўважаць, старалася думаць толькі аб тым, што рашылася зрабіць, дзеля чаго йшла. Але трывога расла, і Ульяне здалося, што ідзе яна ад гэтых ажыўшых акон, ад гаркавага паху сівых дымоў і яшчэ нечага, няўлоўнага, да болю знаёмага. Старая прыпынілася, на поўныя грудзі ўдыхнула празрыстае, ранішняе паветра... Забіваючы ўсе пахі, заказытаў ноздры, паплыў, здавалася, у самае нутро саладжавы пах свежага мурагу. Ёй здалося, што плыве ён адусюль, сцякаецца, ціснецца да яе ў грудзі, калышацца там і яна вось-вось захлынецца ім, салодкім, вязкім. Адчула, як цесна становіцца ў грудзях сэрцу, як яно, не месцячыся, тугім, гарачым клубком падкацілася к горлу, трапечацца, не дае дыхаць. Нічога не бачачы, спатыкаючыся, пайшла па храпістай, няроўнай дарозе.

* * *

Тое, што гэту восень ёй сена не будзе, Ульяна зразумела без слоў, як глянула толькі на цыбатага мітуслівага Шурку, што размяраў на працэнты апошні клінок Заброддзя. Не карыстаючыся меркаю, шырока вымахваючы доўгімі нагамі, бегаў туды-сюды, раз-пораз згінаўся, каб піхнуць у зямлю надпісаны, завостраны калочак.

На Ульяну не глянуў, не павітаўся, толькі яшчэ шпарчэй замахаў нагамі. Хоць па гэтай яго няўвазе і адчула, што ёй не намераў ні соткі, усё ж рашылася падысці, запытаць. І калі перастаў той урэшце матляцца па сенажаці і папраставаў на мяжу, да матацыкла, пайшла напярэймы. Дайшла першая, чакала. Падышоў засопшыся, счырванелы, гледзячы ўбок, коратка кінуў:

— Што скажаш, цётка?

— А ты не ведаеш, што скажу? — адказала таксама запытаннем.— Дзе намераў мне, Іванавіч, і колькі, знаць хачу.— Дарма старалася заглянуць яму ў вочы, ён упарта

адводзіў свае, хаваў іх, як намагаючыся штось выгледзець на тым клінку, што толькі-толькі размераў. Які з час маўчаў, урэшце глянуў на яе, сказаў цвёрда, як адрэзаў:

— Нідзе не намераў, цётка. Няма цябе ў спісках сёлета. Пенсіянерам даём толькі тым, хто буракі браў. З вясны цябе папярэджваў. Не паслухала. Не ўзяла.— І адвярнуўся, даючы зразумець, што размова скончана, нахіліўся над матацыклам, зашоргаў нагою, спрабуючы завесці.

Яна стаяла як аглушаная гэтымі яго довадамі і слухала, як паўстае ў душы крыўда, нязгода, як хочацца ёй спыніць яго, даказаць яму сваю праўду. Перасільваючы ўтрапенне, праганяючы даўкі камяк крыўды, загаварыла адрывіста, рэзка:

— Стой. Паслухай. Паслухай мяне цяпер. Да якой жа ж пары буракі табе браць буду, га? Каторы гадочак на пенсіі ўжо. Пакуль рукі не злажу, во гэтыя — глядзі,— адарвала ад матацыкла, тырканула ў самы твар — худыя, спрацаваныя, учарнелыя. Ад нечаканасці Шурка адхіснуўся, чамусьці шэптам прамовіў:

— Здурнела баба. Дальбог. Я не... Я ні пры чом. У кантору ідзі. Да начальства. Што ж... Там рашаюць... Я...

Яна ўжо не слухала. Адвярнулася, пайшла паволі, напрасты, па някошаным, адно чуючы, як падступае, падкочвае к самаму горлу той пякучы і даўкі камяк і рэжа, засцілае вочы гарачыня. Як ладна ўжо адышлася, пачула — залапатаў, панёсся па мяжы матацыкл.

Здалося, цяпер зноў вярнулася да яе тое цяжкое, дасюль не даказанае, прыплыло з таго цёплага дня ранняй восені разам з салодкім пахам мурагу, вярнула ў душу горкую крыўду. Тут жа падумалася, што каб тады, восенню, намераў ёй Шурка хаця з пяць сотак сена, то астатняе яна абавязкова расстаралася б, па жмені, а сабрала б на карову. Не, дык прыкупіла б які дзесятак пудоў. А так што ж. Рукі апусціліся, упершыню за жыццё адчула няпэўнасць у сабе, у сваіх сілах. Хадзіла як сама не свая. Душа ні да чаго на свеце не гарнулася. Пакуль акрыяла, людзі ўсё павысяноўвалі,

і каб хацела, то ўжо жмені нават нідзе не ўкасіла б. Змірылася неяк тады з думкаю, што прадасць Саколку, што зробіш. Жывуць жа людзі і без каровы, і нічога... здэцца.

Ульяна схамянулася, убачыла, што стаіць ужо катора пара пасярод вуліцы, і толькі наважылася ісці далей, як змеціла, што сцежкаю з загумення нехта ідзе сюды. Прыгледзелася. Шырока ў бакі раскідваючы ногі і рукі, так, што, здавалася, дастае імі да платоў, глыбока на вочы насунуўшы шапку, моцна сутулячыся, проста на яе шыбаваў Мазюк. Ульяна адразу адчула, што ён нечым моцна разнерваваны, саступіла ўбок, стала чакаць.

Мазюк параўняўся ўжо з ёю, але не падняў нават галавы, як не бачыў. Тады яна зачапіла яго сама:

— Паўлюк, пастой...

Ён, як натыкнуўшыся на што, аж хістануўся наперад, прыпыніўся:

— Ну...

— Куды ты так размахаўся?

— Куды, куды,— ён укалоў яе злым позіркам невялікіх, глыбока пасаджаных вачэй, што ваўкавата выблісквалі з-пад памятага брыля старой шапкі.— З кароваю трасца нейкая. Каторы дзень во да жолаба не падходзіць. Вады й тае не п’е.

— З каторую? — Ульяна падступіла бліжэй да яго.

— З каторую, з каторую...— Паўлюк раздражнена перасміхнуў яе.— З тою, што ў цябе купіў.

— А божачка,— кабета рукамі сплясну́ла.— А Паўлючок ты мой, а я ж гэта сярэдначы падхапілася, як душа чула. Прыснілася яна мне сёння.

— А-а-а,— Паўлюка аж закалаціла, і калючыя вочы яго зноў нядобра пранізалі Ульяну.— То ж бо я і думаю, што ж бо магло стацца. А яна — на табе — сніць, шкадуе... Цьфу, каб ты згарэла — снілася. Ужо карова сніцца.

— Паўлючок, пачакай. Чаго ты распырхаўся, паслухай,— Ульяна кранула яго за гладкае, зашмальцаванае рукаво старой ватоўкі.— Паўлючок...

— Паўлючок, Паўлючок... Звяжыся з дурною бабаю,— ён рэзка крутануў локцем, адкідаючы Ульяніну руку: — Пусці во, пайду скарэй, каб дактароў захапіць на ўчастку, хай падыдзе каторы, паглядзіць. Калі нічога рады не дасць, то хоць на мяса здам. А то лясне тысяча, жартачкі табе.

Ізноў скрывіўся, пісклявым голасам перадражніў: — «Паўлючок, снілася...»

Ульяна, як не чуючы гэтай знявагі, раптам захвалявалася, крапчэй ухапіла Мазюка за рукаво:

— Пачакай, Паўлюк. І праўда, баба дурная: казала ж, да цябе іду... Гэта ж ці ведаеш...

Пачала непаслухмянымі, адубелымі рукамі расшпіляць ватоўку, залезла за пазуху, пашамоталася там і нарэшце выцягнула тугі, хрусткі вузельчык, торкнула ў вялікія, разгублена-нерухомыя Паўлюковы рукі:

— Во, тут усе 950 і яшчэ 10 накінула, што карміў-паіў гэтыя дні.

Паўлюк, не могучы, відаць, зразумець, што да чаго, стаяў і толькі лыпаў усё яшчэ злымі, няўцямнымі вычыма. Пасля нарэшце датумкаў і моцна сціснуў грошы, як спалохаўся, што Ульяна раптам перадумае, забярэ іх назад. Але ўсё стаяў, нерашуча перамінаўся з нагі на нагу, спрабаваў нешта мармытаць, як усё роўна апраўдваўся:

— Дык яно, ведаеш, неяк не так выходзіць, дак...

Яна нецярпліва-радасна перабіла яго:

— Ды што там, Паўлючок. Што там. Так яно ўсё добра выйшла. А то во я йшла і не магла прыдумаць, як гэта падступіцца да цябе, каб угаварыць, каб Саколку ты назад аддаў... Іду як не сваімі нагамі. І так і гэтак маракую. Знаю, што нядобра раблю: прадала, усё як мае быць. Думаю, скажуць людзі, здзяцінела. А тут так яно якраз выйшла... Не ад хваробы гэта, Паўлюк. Жывёла, яна таксама, ведаеш, смуткуе...

— Ну, прыдумала,— Паўлюк недаверліва, скоса глянуў на Ульяну. Памаўчаў, ніякавата кашлянуў, задумаўся.

Змоўкла і Ульяна, але ўжо доўга маўчаць і чакаць не магла: рупіла хутчэй пайсці да Мазюкоў, забраць сваю Саколку і дахаты. Як і што яно будзе ў хаце без жмені сена — не думала. Выкруціцца неяк. Пойдзе ў кантору, будзе прасіць. Паслухаюць, дзе яны дзенуцца. Дадуць які з воз, а рэшту — купіць. Не прападуць з Саколкаю...

Тым часам Паўлюкоў настрой рэзка змяніўся. Тая першая радасць, што збудзе з галавы клопат, аддаўшы Ульяне хворую карову, прайшла. Падумаў, што, можа, й праўду кажа старая — не прывыкла скаціна да новага месца. Смуткуе... Цьфу, але ж і выдумае. А зрэшты, трасца яе ведае, можа, й смуткуе, можа, й праўда не варта спяшацца. Аддасі, а тады цягайся па рынках, шукай. А на рынку надта ты купіш добрае што. Гэта тут, у сваёй вёсцы, пры хаце, бачыш, што купляеш, а там... Хто хоча прадаць, ніколі не прызнаецца, што дрэнную продае. Ва ўсіх добрыя.

Паўлюк аж шапку з патыліцы ссунуў, галаву пачухаў:

— Ну, задала ты мне задачу. Чыста рак ты, Ульяна. То плакала нядаўна, што не насенавала, то ўжо раптам...

Нечакана раззлаваўся, зноў залапатаў, запырскаў слінаю:

— І прадавала, пэўна, шкадуючы, вот і не пайшла рукою...

— Паўлючок,— Ульяне аж дух забіла ад крыўды,— пабойся бога. Ці ж я дурная, ці малая — не ведаю, не першы ж гадок гаспадыняю. Колькі ўсяго за свой век перапрадала і ад людзей благога слова не чула. Ведаю, што, барані бог, шкадаваць нельга. І не шкадавала. А вот што яна мне гэтак прыснілася... Як бачу, стаіць пад ганкам і, ці паверыш, голасам чалавечым кажа: «Нашто ты прадала мяне, Ульяна? Пражылі б мы з табою, пракарміліся б неяк...» І так, ты знаеш, за душу мяне ўзяло, што, не думаючы, схапілася сярэдначы і во, додніцы, да цябе.

Паўлюк заўважыў, як пачырванелі раптам Ульяніны вочы, адвярнуўся: вот баба дурная, яй-бо, як выдумае што...

— Дальбог жа, Паўлючок, за душою нічогенька злога не мела.

Голас у яе задрыжаў, яна змоўкла, махнула рукою, мусіць, вырашыўшы, што сказала ўсё сваё.

Паўлюк маўчаў таксама.

Падняўся моцны вецер, глуха зашумеў у старых бярэзінах, якімі скрозь была абсаджана вясковая вуліца. Па небе, засцілаючы чырвоную палосу ўсходу, пайшлі нізкія, шэрыя хмары.

«Снегавыя. Скора стане зіма»,— зазначыў сабе Паўлюк і заўважыў, што ўжо й развіднела як след, пакуль яны так важдаліся. Раптам нейк па-другому, зусім цвяроза падумаў, што дарма ён тут лапоча сам і слухае гэту старую, толькі час дарагі траціць. Рашуча засунуў руку ў кішэнь, выцягнуў адтуль Ульяніну насоўку з грашыма:

— На, баба, і галавы не дуры. Пайду барзджэй на ўчастак, знайду раду...

Ульяна, адчуваючы, як становіцца ёй раптам горача на гэтым пранізлівым ветры, рэзка адхіснулася:

— Не, не вазьму. І не думай. Цвёрда сказала. Не пайшла табе карова мая. Забяру я яе, Паўлюк. Яшчэ, не дай бог, траціцца — косці мае праклянеш.

І не зважаючы больш на яго, звярнула на загуменне, пайшла напрасткі да нізкай і доўгай Мазюковай хаты. Чула, як гулка бухаюць ззаду па голай, адубелай зямлі Паўлюковы кірзовікі, і ўсё прыбаўляла хады. Не хацела, каб дагнаў яе, нядобра пра яго думала: «Чорт ненажэрны... Удваіх з жонкаю і каб дзве каровы трымаць. Шурку ўсё лецечка ў гарэлцы мачыў, калгаснае начамі вашкаваў, як не кончыўся, а як прасіла напрамілы бог, каб хоць воз сена прадаў з восені — дзе там! Ну, то во, маеш. Забяру Саколку на чым бы то ні стала».

І ўжо калі ступіла на Мазюкоў надворак, каля самага хлява, здалося, зноў пачула саладжавы, з гаркавінаю, пах свежага мурагу.







КАСЦЫ

Касілі ўтрох. Першы, пускаючы касу на ўсе рукі, шырока і грузка ставячы ногі, ішоў Павал. Ледзь паспяваючы за ім, задыхана-часта жыхаў круглы, таўставаты Вінцусь. І ўжо неяк асобна, астаўшыся далёка ззаду, няспешна клаў роўны пракос Мамонаў Яська.

Мужчыны касілі супольна.

— Глядзі ты, не спяшыць Мамон, ледзь ківаецца, думае, нехта за яго выкасіць, а ён гатовае возьме,— засіпеў Вінцусь, як толькі Павал прыпыніўся мянціць касу. Павал паволі павярнуў галаву: увесь чырвоны, як абвараны, Вінцусь стаяў за спінай і злосна лыпаў малымі круглымі вочкамі. Павал паволі сагнуўся, грабануў з пракоса жменю травы, выцер касу. Дастаў з кішэні мянташку, тады адказаў:

— Вы, брат, абое рабое. Ён ледзьве цягнецца, а ты лапочаш тут во, без толку, траву псуеш.— І, падцісnуўшы кассё пад паху, павёў колькі разоў мянташкаю, спрабуючы лязо, глянуў назад: метраў сто за імі, здавалася, не ішоў — плыў па лузе шчуплы, невысокі Яська.

Павал усміхнуўся, зноў глянуў на Вінцуся:

— Ты не сіпі, як гусак, а давай мянці во, а то глядзіш, Яська дагоніць — пяты абрэжа.— І павярнуўся да пракоса, лёгка, як гуляючы, пусціў касу паўкругам. Вінцусь, зніякавелы ад нечаканых Паўлавых слоў, стаяў нейкі час нерухома, а пасля апусціў касу, забыўшы памянціць яе, і, яшчэ больш злуючы, што не бярэ, пасунуўся следам.

Яська і праўда адстаў-такі ад мужчын, мала ўжо й бачыў іх з-за высокай, яму, малому, па пахі, травы. Штосьці дзіўнае рабілася з ім у гэтую раніцу. Ён і сам добра не разумеў сябе, адно пасміхаўся разгублена, слухаючы, як трапеча, шчасліва заходзіцца ў грудзях сэрца ад усяго, што бачаць вакол вочы. Мокры па шыю, у высокай роснай траве, яшчэ больш шчуплы ад таго, што шыракаватая, вайсковага крою кашуля і галіфэ шчыльна абліпалі цела, без шапкі, з рэдкімі рудаватымі пасмамі мокрых валасоў, Яська раз-пораз спыняўся, даставаў з глыбокай кішэні мянташку і застываў так, трымаючы яе ў выцягнутай руцэ.

З-за маладога алешніку ўставала сонца. За ровам, за гэтым цыбатым алешнікам, чуў Яська, прачыналася выспа. Недзе ў самым глухім куточку яе, у ельніку, таемна застагнаў лясны голуб; мусіць, абуджаная ім, нездаволена рэзка затрашчала сарока, гулка пераклікнуліся між сабою дразды.

Востра запах валяр'яннік. Сонца разам з расою ўзнімала, цадзіла над лугам церпкі, аж кружыла галаву, водар. З высокай травы, з-пад самых Яськавых ног, шэрымі камячкамі пырхала, разляталася ў бакі дробнае птаства.

Асцярожна, як баючыся парушыць цнатлівае хараство наваколля, апускаў Яська касу. Пакорліва паддаваліся, падалі ружовыя, трапяткія маланкі, падатліва-мякка слаўся ў пракос духмяны, у зялёных, што маладыя гуркі, стручках аер, купчаста клалася густая, як сцягнуць касою, балаціна, пахла свежаю рыбаю, рачным глеем, водарасцямі.

Яська зноў нерашуча спыняўся, зноў стаяў нерухома, глядзеў, слухаў. У нейкі момант са здзіўленнем адчуў,

як нараджаецца, вырастае ў душы нязгода з настойлівым цягам Паўлавай мянташкі, што адбівала касу ўжо на другім канцы лугу, з няўмела-паспешлівым, прагавіта-жадобным гукам Вінцусёвай, якая пляскала недзе зусім блізка, за круглым лазовым кустом. З'явілася ў душы неадольнае жаданне спыніць іх, крыкнуць: «Чакайце, хлопцы. Пастойце. Гляньце, хараство якое!» Але тут жа ўявіў неўразумелы Паўлаў пагляд, рабы, насмешлівы Вінцусёў твар — не варухнуўся.

Нечакана прыйшло і працяло ўсю істоту вострае адчуванне імгненнасці гэтае прыгажосці. Ён нeяк бездапаможна азірнуўся, бы хочучы знайсці абвяржэнне гэтаму адчуванню, убачыў доўгія роўныя стужкі пракосаў. Трава там была яшчэ свежая, але сонца ўзнімалася ўсё вышай, промнямі цягнулася да пракосаў, пачынала сушыць. Тут жа ўсцешна падумалася, што ўсё так і павінна быць: выспелыя травы гінуць, каб даць месца новым, так на Зямлі ад веку, такі непарушны закон існасці ўсяго жывога на свеце. І ўсё ж здзіўлена заўважыў, што, зусім не супакоеная гэтай развагай, пачынае аціхаць, бляknуць у ім тая, амаль дзіцячая радасць, якая так урачыста гучала ў душы цэлы ранак. Толькі зараз адчуў, як п'яніць, расслабляе цела першая стома, і, не хочучы паддавацца ёй, зноў рашуча апусціў касу...

Сонца хілілася на захад, калі мужчыны адбівалі пакос ад рова. Было ціха і душна. Прыпарвала. Плоймаю насіліся ў паветры камары, стогалоса звінелі, смоллю лезлі ў вочы, цялі ў спіну, блыталіся ў валасах. Не было ратунку. «Пэўне, на дождж,— падумалася Яську,— і расы во ні кроплі. Трэ не ўпусціць, дапільнаваць, як будзе садзіцца сонца. Яно і дождж не пашкодзіць. Хай бы прамыў траву. На сырую нічога...» Недзе на другім баку рова пачынаў дзерціся драч, па завонях заводзілі сваё вячэрняе кумканне жабы, за лугам, над поплавам, трывожна крычаў бакас, зманьваў, адводзіў кагось ад гнязда.

Зусім побач, траха не над вухам, лопнула, шаматнула крыламі птушка. Яська прыпыніўся. З-за рова пераляцела

дзікая качка, апусцілася на пакосе, каля лазовага куста, пасля хуценька прабегла колькі крокаў, схавалася за купінаю. Яська сачыў за ёю краем вока, баючыся павярнуць галаву. Які з час птушка пастаяла там, стаіўшыся, толькі раз-пораз вытыркала галоўку, цікавала за чалавекам.

Пасля, мабыць, упэўненая, што нічога не грозіць, сцярожка падала голас: «Крэ». Крыху счакаўшы, яшчэ і яшчэ. З куста, як пароль, пачулася такое ж сцярожка-ціхае: «Крэ-крэ». Качка яшчэ раз азірнулася і хуценька нырнула ў куст. Адтуль зараз жа данеслася радаснае, нецярплівамаладое крэканне, якое марна старалася суняць асцярожнаразважлівае, самавітае.

«Вывадак»,— па-дзіцячы радасна падумаў Яська. І тут жа, бы тая качка, пудліва павёў галавою, азірнуўся: ці чуў яшчэ хто. Убачыў, як спыніўся, услухоўваючыся, Вінцусь, як перастаў касіць і запытальна глядзеў у бок куста Павал. Трывожнае прадчуванне прайшло па душы. Ён узняў касу, знарок звонка пачаў мянціць яе, а пасля як ні ў чым не бывала сагнуўся над пракосам. Пачуў, як зазвінела Паўлава каса, супакоіўся. Але тут жа здрыгануўся ад гучнага шлэпання. Ззаду, чапляючыся за купіны цяжкімі, літымі гумовікамі, бег Вінцусь.

— Вы што, паглухлі, не чуеце — качкі дзікія ў кусце,— закрычаў здаля, не дабегшы.

«Сам ты дзікі»,— роспачна падумаў Яська, але сказаў іншае, спакойна-абыякавае:

— Якія тут качкі! Малыя зусім. Паляваць няможна. Хай растуць.

Вінцусь з лёту спыніўся, няўцямна лыпаў круглымі, бліскучымі вочкамі, а пасля грэбліва махнуў рукою, не зважаючы на Яську, зароў да Паўла:

— Паўлюк, сюды давай. Смажаніна будзе.— І дзе толькі спрыт узяўся — загіцаў па купінах да лазняку.

Яська бачыў, як няспешна выцер касу Павал, як азірнуўся вакол сябе, шукаючы што пад руку, не знайшоў, торкнуў касу ў зямлю, пачэкаў да куста.

Дзіўную спустошанасць адчуў раптам у сабе Яська, адчуў як становіцца чужою, абыякаваю да ўсяго, душа. Ён нейкі час стаяў нерухома, як не верачы, прыслухоўваўся да сябе і страпянуўся толькі, калі нечакана пачуў ціхае крэканне. Ратуючыся ад бяды, старая качка вяла між куп'я качанят да рова. Яны смешна валюхаліся, хуценька беглі за ёю, выцягвалі ўперад доўгія, тонкія шыйкі. Ужо ладныя, сытыя ад багатага навакольнага корму, але яшчэ не апераныя, убраныя ў мяккі шэры пушок. Адчуваючы, як цяплее ўнутры, Яська сцішана засмяяўся: «Абхітрыла ты іх, мілая. Давай, давай, хутчэй хавайся».

Вінцусь с Паўлам трыбушылі лазняк. Чуваць было, як трашчала ламачча, як бурчаў нездаволена Павал і бажыўся, апраўдваўся перад ім Вінцусь. Урэшцеываліўся адтуль, скочыў на купіну, бы каршун, абмацваў вачамі куп'ё, шукаў здабычу. Нічога не ўгледзеў, крыкнуў:

— Ну, што там, Ясь? Мо выйшлі яны, га? Няма ў кусце, як скрозь зямлю праваліліся.

— Дзе там выйшлі! Не відно нідзе. Шукай далей. Пэўне, у лазняк зашыліся.— Як пацвярджаючы свае словы, Яська колькі крокаў ступіў туды, да лазняку, але Вінцусь яго ўжо не слухаў. Ён сам тут жа ўбачыў, як узбіраліся качаняты на бераг рова і там, за кустамі, плюхалі ў ваду. Бы сарваўшыся з навязі, Вінцусь рынуўся за імі. Сцігаў па куп'і, гіцаў так, што ўзляталі з-пад ног камякі гразі, скакалі вышэй галавы. Літыя гумовікі, здавалася, не паспявалі за тоўстымі сцёгнамі. Вінцусь зачапіўся за купіну, з маху хістануўся да зямлі, але ўтрымаўся. Коратка мацюкнуўся, пабег далей. Яська глядзеў, як падскоквае на купінах цяжкі Вінцусёў азадак, і адчуваў, што зноў вяртаецца ў душу тая ранейшая спустошанасць і робіцца страшэнна непрыемным і гідкім гэты круглы, як мяшок, чалавек. Ён адвярнуўся і ўбачыў, што проста да яго, пасміхаючыся, размерана пачэкваючыся, крочыць Павал. Урэшце параўняўся, як апраўдваючыся, сказаў:

— Збеляніўся чалавек. Мяса запрагнуў. Пайшлі, паможам. Хай наесца.

Яська не варухнуўся. Ён бачыў, як колькі разоў, ідучы да рова, азірнуўся на яго Павал, на момант прыпыніўся, бы раздумваў, начэкваў, а потым усё ж пашыўся ў лазняк. Чуў, як ужо там, у лазняку, дзіка залямантаваў, быццам палявалі на яго самога, Вінцусь і як у адказ на гэты лямант у душы зноў калыхнулася і асела гідкасць. Але ён стаяў па-ранейшаму нерухомы, апёршыся на касу, як не могучы варухнуцца, здранцвеўшы.

Паволі заходзіла сонца, сядала за хмару і, ужо нябачнае, кацілася ўніз, хавалася недзе за высокім гарбом далёкага поплаву. Яська сачыў за ім, утрапёна лавіў гукі, што далятаці з рова, чуў, як трашчыць там сухое ламачча, як плёхае, б'е крыламі па вадзе качка, ратуе дзяцей. Раз-пораз сюды, да яго, далятала, рэжучы цішыню адвячорка, яе адчайнае, адзінокае крэканне, і тады адчуваў: штосьці пякучае праходзіла па душы, штурхала да рова. А ён, як не мог выбіцца з утрапення, усё стаяў, апёршыся на кассё, слухаў. Раптам, заглушаючы ўсе гукі, зноў заенчыў на рове Вінцусь: «Не шкадуй, Паўлюк, не шкадуй. Малаці. Каля цябе ж недзе. Пад ваду пайшлі. Да дна даставай...» Як толькі цяпер дайшоўшы да памяці, як толькі цяпер уразумеўшы штось для сябе неабходнае, Яська рэзка рвануў з твані касу, завярнуў яе за плечы і рынуўся туды, адкуль даносіўся крык і плёскат. «Я табе зараз дастану. Я цябе зараз накармлю». Лазняк чапляўся за касу, не даваў бегчы. Ён кінуў яе, ухапіў тоўсты альховы сук, пабег далей. Паляўнічыя былі недзе недалёка, ён ясна чуў іх крыкі і шматгалосае качынае крэканне. Раптам нешта ў тым баку гулка плюхнула, адчайна заенчыў Вінцусь, зноў моцна захлюпала ў рове вада, бы варочаўся там хтось вялізны і няўклюдны, затым зрабілася так ціха, што чутно было, як звіняць камары. Але тут жа, рвучы гэту цішыню, над лугам панёсся рогат. Рагатаў Павал. Яська ўрэшце выцерабіўся з лазняку і ўжо мінаў алешнік, калі рогат нечакана аціх. Яська зрабіў яшчэ колькі порсткіх крокаў і траха не наляцеў на Паўла, які стаяў за густым калінавым кустом. Ледзь пераводзячы дух, Яська коратка кінуў:

— Дзе?

Павал моўчкі павёў вачамі. За некалькі крокаў ад іх, шырока расставіўшы ногі, недарэчна растапырыўшы рукі, стаяў Вінцусь. З адзення сцякала ў шырокія халявы гумовікаў рыжая балотная вада, твар, густа залеплены тванню, быў чорны. Ён заўважыў Яську, варухнуўся насустрач, падняў такую ж, да локця, чорную руку. За ружовую лапку Вінцусь трымаў мёртвае качанё.

Тут жа ўскінуў яго на далоні, загаварыў хутка, апраўдваючыся:

— Самае здохлае папалася. Тыя ўцяклі. Ну, нічога. Мае будуць. У суботу швагра прывязу. У яго двухстволачка і ганчак ёсць. Прыхопім. Хітрыя. Без сабакі не возьмеш.

Яська моўчкі адвярнуўся. Праз лазняк, напрасткі пайшоў да пакосу.

Шарэла. Па лузе, над рэдкімі завонямі, цёпла курэў туман. Трывожна крэкала на рове, склікала распуджаных дзяцей старая качка. Спакойна, натомлена ляжаў скошаны луг, толькі ў самым куце сіратліва цямнеў пакінуты чуб травы.

Мужчыны вярталіся дамоў кожны па сабе.



МУРЗА

Стары Мурза добра памятаў сваю маці — высокую, худую, брудна-шэрай масці, з рыжымі падпалінамі па баках, з доўгімі вушамі, што навісалі на самыя вочы і амаль закрывалі іх, пакідаючы толькі чырвоныя куточкі-кропелькі. Ён памятаў, як маці асцярожна брала яго, паднімала з пацёртай, сапрэлай за зіму саломы і выносіла з цёмнай нізенькай будкі на сонейка. Вынесшы, доўга тапталася, круцілася, выбірала месца, куды б яго палажыць, а пасля апускала на цёплыя, сухія трэскі, параскіданыя каля тоўстай, пашчапанай калоды, на якой гаспадар сек дровы. Мурза, хістаючыся, уставаў на крывыя дрыжачыя лапы, доўга жмурыўся, пырхаў ад казытлівых праменьчыкаў — прывыкаў да сонца. Маці насцярожана сачыла за ім чырвонымі куточкамі-кропелькамі з-пад навіслых вушэй, а пасля падыходзіла і пачынала гладзіць-лізаць шурпатым мокрым языком. Мурза тоненька павіскваў, яшчэ больш жмурыўся і гыркаў. На гэты раз ад матчынай ласкі.

То была яго першая вясна на гэтай зямлі, былі першыя і

апошнія шчаслівыя імгненні жыцця. Абарваліся яны зусім нечакана, калі прыйшлі аднаго разу чужыя людзі, забралі ад Мурзы маці, павялі яе некуды з падворка. І ніколі ніхто больш не лашчыў яго, увесь свой век сядзеў ён на цяжкім ланцугу, пільнуючы сялібу старога хрыпатага Юзюка...

Мурза памятаў сваю маці. Яна з'яўлялася перад ім, калі даводзілася асабліва горка ў ягоным жыцці, з'яўлялася такой, якой запомніў яе з тых сонечных дзён шчаслівага маленства. Нячутна, як прывід падыходзіла, вывернуўшы доўгі чырвоны язык, гладзіла па галаве, а ён ціхенька так павіскваў, зусім як шчанюк, заплюшчыўшы моцна вочы і ўсім нутром адчуваючы гэты мокры язык на сваёй зношанай, збітай поўсці. Вось і цяпер здалося яму, што падышла ледзь чутна старая і глядзіць-глядзіць насцярожанымі куточкамі-кропелькамі... І робіцца Мурзу чамусьці сумна і цяжка. Мо ад таго, што раптам разумее ён: гэта толькі здань, а маці павялі чужыя людзі туды, адкуль ужо не прыходзяць ніколі. Тоненькі енк, як усхліп, вырываецца знутры раз, пасля яшчэ і яшчэ, перарастаючы ў суцэльны тужлівы матыў. Абрывае яго хрыплы голас гаспадара. Юзюк, моцна ляпаючы брамкаю, заходзіць на падворак. Ён не адзін. За ім, грабучы нагамі снег, сунецца яшчэ нехта. Чужы. Яго чуе Мурза па кіслым паху пракуранага адзення, па ўдушлівай вязкасці густа наваксаваных ботаў. Мурза не падымаецца, не паварочвае галавы, не разнімае прыплюшчаных павек. Ён слухае.

— Сляпы, кажаш?— чуе незнаёмы, нейкі занадта ўжо тонкі і прарэзлівы голас.

— Ага, сляпы, браток. Што крот,— сіпіць у адказ гаспадар.

— І як-та, ад прыроды, ці што?

— Дзе табе. Ад старасці, мусіць. Трасца яго ведае. Ужо з год як... Але чуткі, халера — уся сіла ў вушы перайшла. Браток ты мой, чужога за вярсту бярэ... кхэ-кхэ-кхэ-кхэ,— і зайшоўся, захрыпеў, прысядаючы, душачыся кашлем. Штосьці нядобрае чуецца Мурзу ў гаспадаровым кашлі, ён

крышачку разнімае павекі, бачыць тупыя насы ботаў Чужога, бліскучыя галёшы Юзюка, што вытыркаюцца з глыбокага, яшчэ не ўбітага нагамі снегу, увесь сцінаецца.

— Гі-гі-гі,— нечакана весела, перабіваючы гаспадароў кашаль, гігіча Чужы.— То якога ты ражна хочаш, хай і быў бы сабе, што ён табе, буквар чытаць будзе, ці што? Сляпы, ну й сляпы, абы чужога браў... Ды, можа, яшчэ й не сляпы. Скуль ты там знаеш? На каго яму тут глядзець у цябе? Гі-гі-гі. Дрэмле во сабе, ды ўсё.

І зноў загігікаў тонка, віскліва. І ад гігікання гэтага, бяздумна-вясёлага, цяпло разліваецца па застылым, сцятым у нядобрым чаканні нутры,— Мурза ўжо хоча расплюшчыць вочы, падняць галаву, бліжэй падсунуцца да гэтага кіслага, вісклівага, але, па ўсім відаць, добрага чалавека, як над вухам зноў нездаволена, сіпла бухае Юзюк:

— Та браток ты мой, казаў жа ж ужо табе. Бяды тае было б, хай бы яшчэ з год які пабыў, так сын жа вунь паспяшыў, з горада маладога прывалок, купіў, кажа, пяцёрку аддаў. Ферму ж, браток, разводзіць не буду. Карміць жа іх трэба, як ты думаеш? Парсюка ўтрымаў бы на тым месцы. Не жартачкі.

Мурза зноў сціскаецца, халадзее.

— А, ну тады другое дзела!— гігікае зноў Чужы. І Мурзу ўжо зусім не хочацца прытуліцца да гэтага чалавека. Хочацца хутчэй зашыцца ў сваю будку, каб не бачылі, не дасталі. Але ён не рухаецца, ляжыць, як і раней, вялікі, сівы, выцягнуўшы дужыя лапы, утуліўшы голаў.

— Тады другое дзела,— паўтарае Чужы,— тады я зараз, толькі шратовачку з печы дастану, як відзіш, яхнуць не паспее...

І ўжо ўраз ажыўляецца, весялее Юзюк:

— Ага, ага, браток ты мой. Век не забуду. Рашы ты ўжо ж гэту, так сказаць, трудную задачу. Я ўжо, браток, і так і сяк думаў, трасца яго ведае. Рашыў паляўніка якога клікнуць, як хадзіць дзе тут будзе. Яны ж, кажуць, б'юць сабак, у іх план там нейкі на шкуры сабачыя, ці што? Чорт іх, ад-

ным словам. А ў гэтага ж поўсць якая, паглянь, хоць на каўнер, падлу. Разлёгся, воўчае мяса,— як нежывога ўжо, піхнуў Мурзу ў бок,— але чорта там звязвацца з паляўнікамі, ты во якраз накруціўся, то й ладна, падыдзі, як кажаш, з гэтаю сваёю шратовачкай, кхэ-кхэ-кхэ...

— А гэты, малады, што сын прывёз, дзе ж ён у цябе, ці хоць вартае што?— зноў пісклява кінуў Чужы.

Мурза насцярожыўся.

— Ат, да часу ў гумне прыпёр. Навязаць няма дзе. За гэтым во,— зноў тыцнуў пад бок галёшам.— Паджары такі. Ладны ўжо. Зараз пайду, выпушчу — глянеш.

Матляючы доўгімі рукавамі ватоўкі, Юзюк пайшоў да гумна. Неўзабаве выскачыў адтуль рыжы, як ліс, шчанюк. Гыркаючы і нюхаючы, пёр проста да Мурзы. Мусіць, баючыся, каб не ўкусіў, Чужы адсунуўся за плот, ляпнуў брамкаю. Крыху не дабегшы да Мурзы, шчанюк прыпыніўся, нецярпліва агледзеўся назад, пачакаў, калі падыдзе гаспадар. Затым колькі разоў весела аббег вакол Юзюка, заскакаў высока ўгору, стараючыся дастаць да рук, прылашчыцца. Юзюк паблажліва завуркатаў нешта сабе пад нос, прыціснуў Рыжага да сябе, пагладзіў рукою па загрыўку і, як саромеючыся гэтае свае нечаканае ласкі, сказаў да Чужога:

— Глядзі ты, які ліслівы, падла, гаспадара чуе...

Як штосьці зрушылася раптам у сцятым, схаладзелым нутры ў Мурзы. У шырока расплюшчаных вачах, якімі пільна сцярог кожны рух шчанюка, было столькі крыўды і болю, что Рыжы, нечакана наткнуўшыся на гэтыя вочы, нерашуча застыў, які час с недаверам глядзеў на яго. А Мурза паволі, не зводзячы вачэй, падымаўся на пярэднія лапы, здавалася, ледзьве стрымліваў сябе, каб не кінуцца да гэтага маладога нахабніка. І ўсё ж нерашучасць у Рыжым перамагла зялёная шчанячая цікаўнасць. Ён весела гіцнуў да Мурзы, весела, як гуляючы, тыцнуўся ружовым языком у абвіслае вуха. Мурза нават не варухнуўся, толькі касіў вачамі, па-ранейшаму сцярог шчанюка, і дзесьці глыбока

ўсярэдзіне яго заклекатала, забурчала пагрозліва, злосна. Але Рыжы ўжо не звяртаў увагі, зусім асмялеўшы, гойсаў вакол яго, весела гыркаў, тыцкаўся пыскаю ў сівую доўгую поўсць, спрабаваў яе пацягваць сюды-туды, тузаць і ўрэшце такі не вытрываў: добра цяў вострымі маладымі зубамі. І было гэта як сігнал, як тая апошняя кропля, што перапоўніла чашу цярпення. Са страшным рыкам, ірвучы цяжкі ланцуг, Мурза кінуўся на шчанюка і ўраз падмяў яго. Не чакаючы такога павароту справы, баючыся, што Мурза хутка расправіцца са сваім наступнікам, адборна мацюкаючыся на ўвесь падворак, Юзюк марна стараўся ўхапіцца за ланцуг, адцягнуць Мурзу. Перабіваючы яго, верашчаў з-за плота Чужы:

— Юзюк, дурны, чаго ты, гі-гі-гі, чаго ты, няхай, не руш, пачакай, паглядзімо хаця. Гі-гі-гі.

Усё яшчэ мацюкаючыся, Юзюк паслухаў, адступіўся ад жывога клубка, што шалёна круціўся, вірыў у яго пад нагамі.

Мурза ж усё больш і больш насядаў на шчанюка, ужо добра такі ціснучы таго да зямлі, адчуваў, як спружыніць пад ім маладое, пруткае цела, стараючыся вырабіцца, як у адказ на гэту маладую сілу і гнуткасць усё больш і больш разгараецца ў ім лютая злосць, якой ніколі раней не знаў у сабе, булькоча, кіпіць. Не месцячыся ўнутры, страшным рыкам ірвецца з яго, пенаю валіць на збэрсаны лапамі снег. Яму трэба было перамагчы. Абавязкова перамагчы гэтае маладое, страшэнна нахабнае, ненавіснае, што круцілася, вірыла пад ім і таксама гыркала, вуркатала, балюча драла яго старое цела не на жыццё, а на смерць. Апчэранай зяпаю ён шукаў горла, у якое мусіў упіцца. І ўжо знайшоў, ужо ўпіўся, ужо адчуў, як пачаў слабець, распрамляцца пад ім Рыжы, ужо злы, пераможны рык вырваўся аднекуль знутры, як раптам глухі ўдар па спіне нечым тупым і цяжкім апусціўся раз, пасля яшчэ і яшчэ нешта цяжка і глуха біла і біла яго, я ён усё не расшчамляў зубоў, не адпускаў тонкага гарачага горла свайго праціўніка. І толькі хрыплы

і страшны голас гаспадара, што ўрэшце дайшоў да яго, прымусіў расслабіцца, скарыцца. Ён разняў знямелыя зубы, адпусціў лапы.

Жывое, мокрае цела выслізнула з-пад яго, атрасаючыся, пасунулася ўбок. А ён стаяў, прылёгшы на пярэднія лапы, яшчэ ўсё ашчэрыўшы зубы, утуліўшы голаў, як чакаючы тых тупых, балюча незаслужаных удараў. Але іх не было. Толькі цяжка і злосна соп над ім гаспадар і нечаму па-дурному радаваўся-гігікаў за плотам Чужы.

Мурза паволі апусціўся на зямлю, палажыў галаву на выцягнутыя лапы. Пакляванай калінай стыла на снезе кроў. Ён бачыў гэтыя чырвоныя круглыя кроплі на белым снезе, адчуваў іх пах. На момант здаліся яны тымі куточкамі-кропелькамі матчыных вачэй, якія так добра памятаў. Чырвоныя кроплі расплываліся ў вялікія чорныя плямы, падступалі да самых вачэй, клаліся на зрэнкі пякуча, невыносна пякуча. Мурза круціў галавою, нават колькі разоў спрабаваў падняць цяжкую, нерухомую ў самых кіпцях лапу, спрабаваў правесці ёю па вачах, гэтак, як, бывала, улетку адганяў назойлівых мух, але лапы яго не слухаліся. Мурза паволі апускаў павекі. Прападала, адсоўвалася кудысьці пякучая, невыносная гарачыня, насоўвалася халодная, нямая ноч.



ЛЁГКІ ХЛЕБ

— Ты чуў, стары? Гэлька Камарыха гармонік купіла,— яшчэ не пераваліўшыся цераз парог, сказала Антосю яго кабета.

— Ну?— не адрываючыся ад сталяркі, азваўся Антось.

— «Ну». Табе ўсё «ну»,— зачыніўшы дзверы і скідаючы ватоўку, папікнула Алена.

— Каму купіла?— Антось чэркнуў апошні раз па дошцы алоўкам, падняў ад варштата галаву.

— Каму, каму. От пень стары, сабе купіла, каму ж яшчэ! Камарыхі не ведаеш?

Антось няўцямна паглядзеў на сваю бабу. Яна ж, бачачы, што да яго ўрэшце дайшло, зарагатала, аж закалыхаліся вялікія, пад бараду, грудзі. І ўжо праз смех вымавіла: «Музыкантам будзе. Па вяселлях хадзіць. Хлеб, кажа, лёгкі: і пап'еш, і паясі, і грошы заплацяць...»

Не ўтрываў, засмяяўся і Антось, добра ўявіўшы малую, худзенькую Гэльку пад цяжкім, як паваладаць, гармонікам.

— О, і трэба ж гэта, ты толькі падумай,— адсмяяў-

шыся, разважала Алена.— Паехала сёння ў горад і прыпёрла. Вялізны такі, сіне з чырвоным. Кажа, усе грошы аддала. Трыста рублёў, ці што? Дастала з нейкага чамаданчыка такога чорнага, знарок пад гармонік, усцягнула на калені і давольная сядзіць, аж свеціцца. Бяды тае, кажа, што граць не ўмею, заўтра вучыцца буду. Пакруціла, пагладзіла гармонік гэты і ўзваліла на ложак.

Антось зноў засмяяўся, высока закідваючы белую, вялікую, што качан, галаву:

— А, каб цябе з бабаю. А хто ж яе вучыць будзе?

— Сама, кажа. Як бацька калісьці, Камар стары — праз сябе. Галасы падбіраць. І на гармонік тут жа.

— Хіба як бацька.— Антось нечакана спахмурнеў, зазлаваў.— Рабіць ёй няма чаго. Бульбу вунь капаць зачалі, а яна зноў выдумкамі займаецца. Людзей усё жыццё смешыць. І не абрыдне бабе! Гады ўжо, сівець пачала, а горш дзіцяці. Цьфу ты!— Сплюнуў злосна, звёў сівыя, кусцістыя бровы, схіліўся зноў над варштатам.

Алена як анямела ад нечаканай мужавай злосці, але тут жа апомнілася, напусцілася на яго крыўдліва, абурана:

— Табе што? Табе чаго баліць гэта? Хай смешыць. Сваячка яна табе, ці што? Абыходзіць яна табе ўсё жыццё, смыліць табе стрэмка гэтая.

Антось не абзываўся, як не чуў. Угнуўшы голаў, круціў у руках абгабляваную дошку, прыкідваў на вока, ці роўна адрэзаў, чэркаў па краі алоўкам. Алена не адыходзіла, тапталася ззаду, цяжка дыхала, перакідвала, соўгала па пліце гарнушкі, знарок моцна ляпала засланкаю.

Ён нечакана павярнуўся да яе, спакойна, як і не было злосці, сказаў:

— Шкода яе, Алена. Якое там сваяцтва, жывём лічы што разам з малых гадоў. На вачах усё. Жыццё ў яе, знаеш сама, не зладзілася...

Алена стаяла застыўшы, няўцямна моргала круглымі, без веек, вачыма, толькі паторгваліся моцна сцятыя вусны. Антось не дагаварыў, змоўк, адвярнуўся. І тады яна як

апомнілася, заверашчала тонка, захліпіста, не разабраць:

— То ж праз цябе ў яе не зладжылася, праз цябе! Усе ж ведаюць. Чаму ж, чаму ж ты ёй не злажыў? Курыцы гэтай чорнай, абшчыпанай. Стрэмцы гэтай сухой, каб яна ўшчэнт высахла, як душу яна маю каторы ўжо гадочак сушыць. Чаму ж не прыняў ты яе, як прыходзіла да цябе сярэдначы, у кашулі сподняй, чаму ж не прыгрэў, не пашкадаваў, як цяпер шкадуеш? Адправіў, за мяне ўхапіўся. За багатую. На зямельку маю паквапіўся. Ажно не спатрэбілася. Саветы зайшлі. Не пацешыўся. Нуда цябе ела, бачыла я, сэрца маё чула, што даравацЬ ты сабе не можаш. Усё жыццё песні яе слухаць выходзіў...— І зайшлася ад крыўды, закалыхалася — мажная, высокая, у злосці сваёй непрыступная.

...Тое, што Гэлька Камарыха купіла гармонік, да вечара стала вядома ўсёй невялічкай Гаранёўцы. Бабы, згаладалыя па навінах, закідаліся да яе то што-небудзь пазычыць, то аднесці пазычанае, а ўсё з тым, каб на свае вочы пабачыць той гармонік і найпершае — даведацца, на якую ж патрэбу прыдбала яго Камарыха. Няўжо такі й праўда ў музыкі пойдзе пад старасць?

Сама Гэлька ні ад каго не хавала свае радасці, з ахвотаю тлумачыла цікаўным кабетам усе выгоды свайго новага занятку.

— Вот, бабачкі мае, зажыву...— казала нараспеў, пабліскваючы чорным вокам то на адну, то на другую суседку.— Гэта ж вяселлі во як пойдуць, а музыкантаў у наваколлі мала, толькі й будуць гадзіць мяне... А што ж, я вунь у пляменніцы свае гуляла на вяселлі, дак там маладзіца адна на цымбалах, каб чулі, як хораша. За душу бярэ.— І крыху перадыхнуўшы, Гэлька кідала свой апошні козыр, перад якім, ведала добра, гаранёўскія кабеты не ўстояць: — Гэта ж во, за адно вяселле, любкі мае, сотні паўтары заграбеш. Месяц на кароўніку таптацца трэба, каб такія грошы мець. Дак не раўняць жа, што на вяселлі ў людзях пабыць, а што на ферме гной мясіць...

Петрачкова Маня, якая рабіла даяркаю, не стрывала:

— Ну, ну, разышлася, мілая, нагуляеш ты па вяселлях, як кінуць усе гной мясіць.

— Я ж не пра ўсіх, Манечка,— лагодна не згадзілася Гэлька,— я ж пра сябе талкую. Цябе ў гарманісты не заву, з фермы не пераманьваю, не бойся, трэба ж некаму й гной мясіць...

Гэльцы не дала дагаварыць, разважліва падтрымала Маню старая маўклівая Адаміха:

— Праўда, Манечка, праўда. Дзе-та, дзетачкі, відана, каб баба хадзяйства кідала і ў свет з гармонікам ішла. Я дак такога шчэ на сваім вяку не бачыла.

— Ат, цётка, шмат там цётка чаго бачыла,— зноў не сцярпела Гэлька.— За гаранёўскім лесам і то не была. Пражывеш во так, як на свінні праедзеш, нічога людскага не ўбычыш, не аглянешся — паміраць пара. Дзеля чаго жыў, дзеля чаго біўся як рыба аб лёд, сам не ведаеш. Не хачу я так, хоць напаследак пажыць трэба як чалавек, у людзях пабываць, людзей і сябе павесяліць. А грошы... Халера з імі. Няма дзеля каго мне панчоху набіваць.— Гэлька задзірыста зарагатала, акінула бабаў чорным бліскучым паглядам, весела, адчайна махнула маленькаю рукой.

Адказаць Гэльцы ніхто не паспеў. Цяжка сапучы, у хату ўвалілася Антосева Алена. Спынілася ў парозе і, як чаго шукаючы, вадзіла па хаце вачыма. Урэшце згледзела на ложку гармонік, крута павярнулася да Гэлькі, якая ўсё яшчэ весела блішчала вачыма і неяк неўразумела, здзіўлена глядзела на раз'ятраную суседку.

— Гармонічак, кажаш, купіла, пяюха, цешышся ўжо? — Алена не гаварыла, а сіпела, як сытая гуска, і ўсё бліжэй падступала да Гэлькі.— Любошчы мінулыя прыпомніліся? Вечарыны гаранёўскія вярнуць зажадалася?.. Думаеш, як пры бацьку, хвастом круціць будзеш, гэтак выспеўваць і вытанцоўваць, галовы чмурыць гэтай сваёй,— Алена раптам крутанулася да знямелых бабаў і, засланіўшы Гэльку шырокаю, як лава, спінаю, завяла нечакана тонка, з надрывам: — «Канарэ-е-чка, дробна пта-а-шачка...» Гэта ж, бабачкі,

колькі я з-за «канарэечкі» тае слёз выліла — ніхто не знае. І глядзі ты, зноў пачынаецца, зноў яна за сваё ўзялася. Ну, не. Дудкі. Цяпер-та я ўжо плакаць не буду. Калі што якое, то як хаплю музыку гэту — трэскі пасыплюцца. Мінулася бабіна лета,— Алена пагрозліва ступіла да ложка, але тут жа раздумала і зноў, трацячы голас, засіпела:

— Да каб жа ж праўда яна пра рубель той дбала ды дзеля заробку гармонік гэты купіла. Хата ж во ад ветру ледзь не валіцца,— Алена павярнулася да змярцвелай у нерухомасці Гэлькі, дадала ўжо спакойна, упэўнена: — Глядзі, заверне калі з гармонікам разам — не піснеш нават. Хоць на падпоры зарабі, весялуха. Досыць ты ўжо людзей павесяліла...

На які час усталявалася ў хаце цішыня. Было чуваць, як надаедліва звінела, білася аб шыбу галодная асенняя муха. Бабы ніякавата маўчалі, а пасля ўсе разам заварушыліся, бы толькі-толькі ўспомніўшы нейкі неадкладны клопат, хуценька зазбіраліся з хаты. Упершыню за гэты дзень не знайшла што сказаць Гэлька. Прыбітая Аленінай злосцю, моўчкі глядзела ў акно, чуючы, як перасядае ў горле даўкі камяк, не дае дыхаць...

Даўно ўжо сшарэла. На небе адна за адной успыхвалі зоркі, насупроць акна выплываў з-за хмары ціхі месяц. На зямлю апускаўся светлы асенні вечар. А Гэлька ўсё сядзела здранцвеўшы, нерухома, усё слухала тыя злыя Аленіны словы, што як вогнік варочаліся ў душы і пяклі яе крыўдаю. Усё жыццё ненавідзіць яе Алена, усё жыццё не можа дараваць Гэльцы таго даўняга маладога яе пачуцця да Антося. Божа, ды калі было тое? Калі былі тыя шумныя вечарыны пад бацькаў гармонік, пад яе «канарэечку», на якіх адчула яна, што кахае Антося? Калі было тое і што там было? Адно што й асталося ад адзінае ў іх жыцці, такой во асенняе, светлае начы — горкі пах вікі ў Антосевых сенцах, дзе яна, Гэлька, роспачна гаварыла яму пра каханне, ды сорам той, што засцілаў вочы, як ішла ад яго, ішла назаўсёды. Калі было тое і што там было! Нікому няўцям,

што й цяпер яно ёсць, што й цяпер яе мучыць. I аднеслі су-
адна Алена здагадваецца пра гэта... [illegible]устою і

Нерухома сядзела Гэлька. Забыта, моўчкі ляжаў на [illegible]упаў ку новы блішчасты гармонік. Яна нечакана ўспомніла пр[illegible]лі яго, устрапянулася, падышла да ложка. Як жывое, ласкава, лёгка пагладзіла, паставіла на калені. Адчула, як кранула сэрца пяшчота, як неадольна захацелася раптам пачуць яго голас. Яна адпусціла раменьчыкі, ціхутка пацiснула гузікі і ўздрыгнула ад тонкага, адзінокага голасу, што вылецеў з-пад пальца, прарэзаў цішыню. Яна пачала асцярожна перабіраць, кратаць белыя, чорныя гузікі, услухоўвацца ў бязладнае шматгалоссе і ўжо, здавалася, чула ўім тую, адзіную мелодыю, якая гэтулькі год жыла ў душы, не давала спакою. Ужо, здавалася, бачыла, як выходзіць адвячоркам са свае хаты Антось, задуменна апіраецца на нізенькі плотчык і слухае, слухае гэту мелодыю...



СВЕТЛАЯ РУНЬ

Стэфка адышла пад раніцу. Свяціў на двары бледны месяц, і якраз у акно на яе глядзела адзінокая буйная зорка.

Цяпер, калі Міхал думаў пра астатняе жончына імгненне, ён найперш бачыў гэту зорку. Не Стэфчын зменены, раптам адмаладзелы твар, не вінаватую ўсмешку, што так і асталася на яе вуснах, а гэту зорку. Можа, таму стаяла яна ў вачах, што быў пэўны: яе бачыла Стэфка ў астатнюю сваю хвіліну. І зорка гэта адна бачыла, як развітвалася Стэфка з жыццём, як адыходзіла з гэтага свету. А ён, Міхал, не бачыў. І цяпер не мог сабе дараваць, што не бачыў, што пакінуў яе адну перад смерцю. Усю ноч сядзеў, а пад раніцу, як на той грэх, сон наваліўся. І ён не ўтрываў — пайшоў на кухню, прылёг на тапчане. Потым неяк раптам прахапіўся, як што тузанула яго, выйшаў на хату. Зорка праз акно проста на ложак, на Стэфку глядзела. Але Стэфка ўжо нічога не бачыла...

Яе пахавалі праз тры дні, дачакаўшыся з далёкай

Поўначы старэйшага сына. Справілі памінкі, аднеслі суседзям сталы, і хата раптам стала нязвыкла пустою і вялікаю. Міхал баяўся ў яе заходзіць. Ён усё больш тупаў на двары, знаходзячы сабе розны занятак, і толькі калі выходзіў на ганак сын і клікаў яго палуднаваць, апускаў галаву, пакорліва ішоў дахаты. Не распранаючыся, адно сцягнуўшы з галавы шапку, як чужы, збоку падсядаў да стала. Віця выносіў з каморы запацелы графін з гарэлкаю, наліваў у чаркі:

— Давай, тата. Па кроплі. За матку. Хай ёй зямля пухам...

І неяк адразу перакульваў усю чарку ў рот, сядзеў які з час моўчкі, апусціўшы галаву, не дыхаў. Тады ўжо браў кусок хлеба, доўга яго нюхаў, падсоўваў пад сябе міску с халодным...

Міхал не піў. І есці яму не хацелася, хоць калом пры. Ён глядзеў, як смачна чаўкае Віця, і думаў, што маладому ўсё лягчэй: і гора пераражыць, і забыць, і неяк усё абдумаць, рашыць. А старому, вот як бы й яму цяпер, хоць жывому ў зямлю лезь. І каб хто падумаў, што ўсё так будзе, што згарыць Стэфка так хутка, так нечакана. Скарэй на яго, Міхала, думалі. Аперацыю перанёс нядаўна, ды і слабейшы за яе быў, старэйшы нашмат... Думаеш адно, а выходзіць другое. Нічога ў чалавечым лёсе не сплануеш, як ты ні плануй. Стэфцы ўжо адно — ляжыць там пад хвойкамі сабе спакойна, а ты тут, чалавеча, думай думку. Рашай, як і што рабіць, як жыць далей. Яшчэ як жонка жывая была і ён на аперацыю клаўся, гаварылі яны, меркавалі, што ёй будзе рабіць, калі, не дай бог, ён не выкараскаецца. Рашылі тады, што да малодшага сына пойдзе. Хату гэту на Зэнака апіша. Хай што хоча ён з ёю робіць: ці прадае, ці як лецішча сабе трымае. Хата ж новая, што шклянка. І садок во, і двор харошы, і забудова ўся. Ад горада блізка, паўгадзіны язды.

А яно во як усё павярнулася...

— Тата, ты не гаруй. І на Зэнака, тата, не абіжайся.

Гэта яна ўсё. Краля яго. Гэта не яму ты, ёй ты не нужон.— Віця паспеў ужо прапусціць пару стограмовак, і цяпер яго цягнула пагаварыць. А гаварылі яны з бацькам каторы дзень пра адно і тое ж. Пра Зэнака і ягоную Галю. Дакладней, гаварыў Віця, Міхал або слухаў, або проста сядзеў, думаючы пра сваё, часам зусім не пра тое і не так, пра што і як гаварыў старэйшы сын. У бацькі былі свае думкі і была свая, бацькоўская, крыўда на малодшага. Бо на Зэнака яны з Стэфкаю толькі й спадзяваліся. Яму памагалі, астатні грош аддавалі, пра Віцю, пра старэйшага, не дбалі так. Занесла, думалі, на край свету, хай сам сабе раду дае. А вот Зэначак... Не, што там Віця на Галю гаворыць. Нявестка — не дачка. Усё роўна чужая. Але ж ты сын, і каб гэтак... Міхала адразу, як толькі згадваў пра ўсё, пачыналі душыць слёзы...

У той вечар, як пахавалі Стэфку і асталіся ў хаце толькі свае, Міхал сам завёў гэту гаворку. Яшчэ за сталом сядзелі. Зэнак з Галяю, Віця і ён, Міхал. Сам пачаў. Бо што ж адкладваць. Аднаму яму ўсё роўна не дажыць, няма сілы.

— Ну, што, дзеці, з бацькам рабіць будзеце? — спытаў як бы між іншым, бо ведаў, што тут адно выйсце — да Зэнака прытуліцца, пры ім дажыве. Але спытаў, каб ужо напэўна, каб болей да таго не вяртацца. Сказаў так і падняў вочы на Зэнака. На Віцю й не глядзеў, што Віця. Сёння тут, а заўтра яго толькі й бачылі.

А Зэнак — ні слова. Як бы й не яго датычыла. Віця тады азваўся. «А што рабіць, тата, што доўга думаць. Пойдзеш во да Зэнака, ды ўсё. Сюды сабе, у вёску, як на дачу будзеце ездзіць». І тут нечакана, што падсмаленая, узвілася Зэнакава Галя:

— А можа, ты сабе гэту дачу возьмеш і бацьку заадно? Ашчаслівіў — на дачу будзеце ездзіць,— непрыгожа скрывілася, перасміхнула Віктара.— У маіх вунь старых такая самая дача. Іш ты, распарадзіўся раз-два: да Зэнака. А ты што, не сын?

— Сын! — Віця кулаком па стале грукнуў — чаркі зазвінелі: — Сын! Але папытай, ці захоча да мяне бацька за блізкі свет, калі вы пад бокам. Кватэру сваю маеце!

— А ты папытаў? — гэта ўжо Зэнак на Віцю вызверыўся.

У Міхала пацямнела ў вачах. Ён падняўся, моўчкі выйшаў з хаты...

— Ты, тата, не думай.— Віця торкаў відэльцам у талерку, не могучы папасці ў скрылік кілбасы.— Не думай, тата. Мая Аня не такая. Харошая мая Аня, душэўная. Не яго краля. Ты не трусь. Ерунда, што далёка. Цяпер — усёды блізка. Нам да Масквы глаўна, а там — самалётам. Не трусь. У мяне там — ха-ро-мы. Усё ёсць. Не абіжу цябе. Папомніш слова, не абіжу...

* * *

Ночы над Роўнічамі стаялі месячныя, зорныя. Пачынала патроху марозіць, і зямля нанач бралася грудамі. З раніцы на жухлай траве, на апалым скурчаным лісці доўга трымалася шэрань. Але ўставала з-за туману сонца, угравала зямлю, і ўсё адходзіла, вільготнела.

Міхал ішоў цярэспаля. Упершыню за жыццё не думаючы, што ідзе па руні, што топча ў адталую ўжо зямлю жыта. Ён вяртаўся з могілак. Раненька, додніцы, хадзіў да Стэфкі. Мусіў сказаць ёй пра ўсё, што надумаў, параіцца.

Дайшоў да краю поля, стомлена апусціўся на высокі бераг поплаву, дастаў цыгарэты. Ён і раней любіў пасядзець тут. І калі на трактары рабіў — араў ці засяваў гэты клін, і калі проста, бывала, хадзіў блізка. Сядаў во так, курыў, думаў. Зямля заўсёды супакойвала, адцягвала, здымала з душы непатрэбны цяжар, вяртала зноў да жыцця. Міхалу й цяпер хацелася пабыць аднаму, супакоіцца, усё як след абдумаць. Але чамусьці думалася зусім не пра тое, што так мучыла, гняло яго ўвесь час, як пахаваў Стэфку. Ён глядзеў на поле перад сабою, на яркую, маладую рунь і думаў пра гэта поле. Успомніўся той год,

калі ў Роўнічах арганізаваўся калгас і во гэты іх, Маргуновічаў, клін таксама далучылі да калгаса. Зямля тут спрадвеку была добрая. Бацька не раз, бывала, хваліўся: «Зямля ў мяне на клінку што масла, хоць бяры на хлеб маж». Нялёгка было старому аддаваць гэту зямлю. Ну, але што ж... Памеркаваў бацька тады, падумаў і ці не адным з першых у Роўнічах падаў у калгас заяву. І вот помніцца Міхалу той год, калі ўжо ўсе землі аб'ядналі, засеялі. На гэтым кліне пасеялі пшаніцу. І ўрадзіла ж тады яна. Бацька не мог надзівіцца: колькі гаспадаром быў, а такога ўраджаю не меў. Усё да поля хадзіў, цешыўся.

Урадзіла той год не толькі на іхнім кліне: збажына стаяла сцяною на ўсіх палетках. І даспела, як на бяду, таксама на ўсіх адразу. А тады што ж, сярпамі жалі — адразу ўсюды не ўхопіш. Бабы спінаў не разгіналі да захаду сонца, і ўсё роўна не ўпраўляліся. Жалі спярша на грудзе, за могілкамі, а клін усё стаяў. Ужо й колас ламацца стаў, зерне на зямлю церушылася, прападала. Бацька да поля больш не хадзіў: глядзець не мог. Але аднаго разу ўсё ж не ўтрываў, пайшоў. Надвечар дахаты вярнуўся. Лёг і ўжо болей не ўстаў...

Міхал курыў і думаў, што ўсё перамянілася з таго часу. І жыццё і людзі. І зямля гэта, хай самая найлепшая, не трымае яна ўжо чалавека так, як раней. Абыякавы нейкі, раўнадушны стаў да яе чалавек.

Вот хоць бы ўзяць яго хлопцаў. Выраслі тут, з маленства рабіць усё памагалі, з трактара ягонага не злазілі, а як толькі сталі на ногі, дык і ў белы свет. Старэйшы невядома куды заехаў. А чаго? Каб сказаў работу якую асаблівую меў там — дык не, звычайны шафёр. Хіба нельга было тую самую баранку ў сваім калгасе круціць...

Малодшы зноў жа — на трактары робіць, але не ў вёсцы, а ў горадзе, на заводзе. З цэха ў цэх соўгаецца, жалеза перавозіць.

І ці толькі сыны яго. Амаль усе маладыя пайшлі з вёскі. А сюды, на зямлю, шэфаў з горада возяць. І хоць

разумее Міхал, што не абысціся калгасу ўжо без тае шэфскае дапамогі, а не мірыцца душа з усім, што бачаць вочы. Не можа ён глядзець, як шэфы гэтыя робяць. Чужыя, абыякавыя ў іх рукі: не такія зямлі патрэбны. Палову ўсяго на палях астаецца. А яны — абы дзень да вечара, абы-як. Можа, і не ўсе гэтак, пэўна ж не ўсе, каторы то й стараецца, робіць як трэба, але ўсё роўна, не выйсце гэта.

Баліць у Міхала душа, і часта думае ён, што і сам вінаваты ў нечым. Не змог утрымаць сваіх хлопцаў каля сябе, каля зямлі. Не змог...

Міхал дакурыў, але лягчэй і спакайней не стала. У грудзях, недзе пад самаю лыжачкаю, аж млела нутро, жывым клубком варочалася трывога. Ён падняўся з поплаву, агледзеўся. Дзень, як і ўсе гэтыя дні позняй восені, меўся быць сонечны, цёплы. Спакойнае, шырокае ляжала перад ім поле. Міхал сам яшчэ засяваў яго. Якраз перад аперацыяй. Тады, у верасні, таксама стаялі во гэтакія цёплыя, харошыя дні. Ён не злазіў з свайго «Беларуса». Добра засеяў. Роўна. Рунь кусцілася перад ім яркая, светлая. Міхал адчуў, як на хвіліну адышла, адпусціла душу трывога, заспяшаў дахаты...

Віця ўжо ўстаў. У верандзе на газавай пліце сіпеў чайнік, на кухні патрэсквалі ў печы дровы, пахла параналю бульбаю. Сын быў цяпер у хаце за гаспадыню. У Міхала пацяплела на сэрцы. Падумалася раптам, як бы добра было, каб астаўся Віця пры ім назаўсёды. Прывёз бы Аню сваю, дзетак. Сам бы сеў на яго, бацькаў, трактар ці на якую машыну, і Ані работа знайшлася б... Спрабаваў неяк гаварыць з сынам пра гэта — слухаць не хоча. Маштабы, кажа, бацька, не тыя. Маштабы...

— Ну, дзе ты ходзіш пры раніцы?

Віця сядзеў за сталом, курыў. На стале ўжо стаялі графін, дзве чаркі, на скаварадзе скаврчэла яечня.

— Да маткі хадзіў, сынок, на параду...

Віця здзіўлена ўзняў чорныя, калматыя, як у бацькі, бровы:

— На могілках быў?

Міхал не адказаў, выйшаў на хату. Дастаў з шафы чыстую сарочку. Падумаў, што яшчэ Стэфчыны рукі мылі і прасавалі яе, прытуліў да твару, пастаяў гэтак, потым зняў з вешака выхадны цёмна-сіні касцюм. Паднядзелены, адразу памаладзелы зноў зайшоў на кухню.

Віця здзіўлена прысвіснуў:

— Ого, ці не ў сваты?

— А што? Яшчэ можна было б, праўда?..— Сумна ўсміхнуўся.— Да радні схаджу, сын. Трэба ж патроху ўжо развітвацца. Дый, можа, нарадзяць, каму карову, парасё прадаць. Тады адразу ўсяго не ўхопіш...

— Правільна, тата. О, гэта разгавор.— Віця ажывіўся, падышоў да яго, паляпаў па плячы.— Я ж казаў: нада дзелам заняцца, лягчэй стане. Правільна.

І ўсё ж Міхал адчуў, што сын не паверыў яму і нездарма загнуў пра гэтыя сваты. Ужо выйшаўшы на ганак, сам сабе падумаў, што і праўда, каб дзе якая кабеціна адзінокая знайшлася, то не было б патрэбы чортведама куды перціся, дажыў бы з ёю як-небудзь. Каторы раз за гэтыя дні ўспомніў Калюшкаву Вольгу, што адзінока жыла на далёкім хутары і да якой ён некалісьці кавалерам трохі заходжваў. І тут жа адчуў, што як бы засаромеўся гэтага свайго прыпаміну. Не, да Вольгі ён не пасмее. Праз усё жыццё носіць Міхал у сэрцы вінаватасць перад ёю. Калі падумаць, то й прычыны, здаецца, няма на гэта. Ці мала да каго ходзіш у маладосці. І ўсё ж... Міхал раптам зазлаваў на сябе: знайшоў пра што думаць, пень стары. Спусціўся з ганка, рашуча пайшоў у бок праўлення.

* * *

Кабінет старшыні быў шырока адчынены, і Міхал, яшчэ не пераступіўшы праз парог, убачыў яго самога. Яшчэ малады, чырванатвары, але з салідным ужо, круглым,

як гарбуз, жывоцікам Парушкевіч стаяў каля стала і на хаду, відаць, разглядаў нейкія паперы.

Міхал узрадаваўся, што хаця застаў яго, з парога павітаўся.

Парушкевіч не адказаў, адно незадаволена глянуў, ізноў апусціў галаву.

— Я да вас, Феліксавіч.— Міхал не праходзіў, нерашуча пераміналўся ў парозе.

— Бачу, што да мяне. Пачакайце, Маргуновіч. Зараз.

Гэтае афіцыйнае «Маргуновіч» нядобра кальнула Міхала. Звычайна старшыня зваў яго па-свойску дзядзькам Міхалам або Сцяпанавічам. «Не ў гуморы нешта»,— падумаў Міхал і раптам адчуў, як прападае, адыходзіць з душы жаданне гаварыць з Парушкевічам, а тым болей прасіць яго аб нечым. Ужо хацеў ціхенька выйсці з кабінета, але ўсё ж затрымаўся, прысеў з краёчку доўгага рада крэслаў, што стаялі ўздоўж сцяны.

Рэзка затрашчалі на стале адразу два тэлефоны, але Парушкевіч як не чуў, не браў трубкі. Урэшце кончыў чытаць, падсунуў да сябе каляндар, чыркнуў там нешта алоўкам. Тады ўжо толькі павярнуўся да Міхала:

— Чуў, ад'язджаеце? Што з хатаю вырашылі: прадаваць будзеце ці малодшаму пакідаеце?

Міхал разгубіўся. Не пра гэта ён ішоў гаварыць.

— Ды вот не знаю, Феліксавіч. Сам не знаю...

Парушкевіч нецярпліва перабіў:

— А хто знае? Я ж не проста так, дзеля цікаўнасці.— Падышоў да вешака, сцягнуў куртку, збіраючыся апранацца.

Міхал падняўся, нерашуча камячыў у руках шапку. Раптам выскачыла з галавы ўсё тое, пра што думаў, калі ішоў сюды.

— Я панімаю, Феліксавіч...

— Ну, вот. Хата ў вас харошая, калгас яе ў вас купіць.

У Міхала перахапіла дыханне: «Вот што яго хвалюе. А ты, стары дурань, спадзяваўся, што ён цябе трымаць

будзе, угаворваць, каб не ехаў, астаўся. Паможа табе сына пераканаць, каб дахаты, у свой калгас вярнуўся. А як жа. Патрэбен ты яму, стары ды хворы».

Парушкевіч заўважыў Міхалаву разгубленасць, зразумеў яе па-свойму:

— Вы не хвалюйцеся, камісія ўсё ацэніць, падлічыць, усё будзе ўзгоднена з вамі...

Міхал маўчаў. Аднекуль здалёку даходзіў да яго голас Парушкевіча:

— Тут да нас з Караганды кабета прыбілася. Чулі ж, пэўна, даяркаю робіць. Двое дзяцей малых. Кватэра патрэбна...

Міхал болей не слухаў. Глыбока, на вочы, нацягнуў шапку, пайшоў з кабінета.

* * *

Маргуновічы ад'язджалі праз тыдзень. У Віці канчаўся водпуск, і колькі ні прасіў яго Міхал хоць трохі яшчэ затрымацца, сын не згаджаўся: «Няма чаго, бацька, цягнуць ката за хвост. Усё роўна нічога не зменіцца і ехаць табе са мною прыйдзецца...» А Міхал усё яшчэ ў душы спадзяваўся, што пераменіцца нешта, не можа быць. Не можа быць, каб яму прыйшлося некуды ехаць. Не месцілася гэта ў сэрцы, не ўкладвалася ў галаве. Як жа так: пражыў чалавек жыццё на гэтай зямлі, усё аддаў ёй, а паміраць некуды ў свет трэба ехаць...

Але дні ішлі, і нічога не мянялася. Ад'езд набліжаўся. За гэты час Міхал яшчэ больш асунуўся, учарнеў, хадзіў паволі, згорблены, ціхі.

Роўніцкія жанкі, шкадуючы яго, казалі, што гатоў не даехаць Міхал да тых сынавых харомаў.

Хату і ўсю забудову адкупіў у Маргуновічаў калгас. Міхал не хацеў прадаць хаты, казаў, хай стаіць пакуль, суседзі наглянуць, а прадаць Віця заўсёды паспее. Але сын раптам заўпарціўся, зазлаваў, і бацька здаўся: рабі як

хочаш. У душы з крыўдаю падумаў, што сыну тых пару тысяч важней за ўсё, але не сказаў нічога. Усё роўна ўжо.

У панядзелак паабедзе пад'ехала крытая калгасная машына, і Віця павыносіў і зладаваў у яе рэчы. Да цягніка аставалася яшчэ болей гадзіны, але Міхал апрануўся, выйшаў з хаты. Звыкла, як выходзіў ненадоўга, прымкнуў веранду, павесіў на сцяне ключ, пайшоў з надворка.

Унутры ў яго ўсё як скамянела. Вочы былі сухія і гарачыя. Віця падышоў, крануў бацьку за плячо, паказаў вачыма на машыну. Але Міхал пакруціў галавою: «Час ёсць, сынок. Пайду пешкі: да маткі па дарозе захілюся. А ты едзь». Бачачы, што сын усё стаіць, растлумачыў: «Адзін хачу пабыць». І калі завуркатала, ад'ехала ад хаты машына, выйшаў з надворка, прычыніў веснічкі. Пачуў, што яны зноў адчыніліся за ім, вярнуўся, зашчапіў на кручок. Паволі пайшоў па вуліцы. Убачыў, што з вокнаў на яго глядзяць, зняў шапку і гэтак ішоў праз усю вёску.

Было ўжо добра папалудні. Свяціла, як і ўсе гэтыя дні, сонца, і недзе там, каля хвойніку, да якога ішоў Міхал, трымцела, пералівалася паветра.

«Як вясною», —падумаў здзіўлена і быццам упершыню ўбачыў, якое хараство вакол, якая сумная і ўрачыстая краса роднай зямлі перад ім. Вочы не маглі нацешыцца ёю, грудзі не маглі надыхацца яе водарам.

Міхал не спяшаў. Як бы й не ён гэта павінен быў зараз ад'язджаць адсюль...

У хвойніку было ціха. Толькі недзе глыбей, у дрэвах, ценькалі нябачныя сініцы.

Міхал ішоў вузкаю сцежкаю між магіл, пазнаваў іх, і тыя, яшчэ даваенныя, з амшэлымі, урослымі ў зямлю крыжамі, і нядаўнія — з прыгожымі мармуровымі помнікамі, і зусім свежыя — з высока насыпанымі грудкамі жоўтага пяску. Ішоў да Стэфчынай. Яна бачылася здаля, абстаўленая з усіх бакоў яшчэ яркімі, не выцвілымі ад дажджоў і сонца вянкамі. Ён падышоў да яе, апусціўся на калені.

Побач было знарок пакінута вольнае месца — для яго.

Ён прасіў аб гэтым мужчын, калі тыя ішлі капаць дол. Хацеў, як памрэ, побач са Стэфкаю легчы. Цяпер яно яму непатрэбна. Невядома цяпер, дзе яго месца...

На вочы навярнуліся слёзы. Ён па-дзіцячы расцёр іх кулаком, азірнуўся. З суседніх помнікаў, з круглых зашклёных фотаздымкаў, здалося, глядзелі на яго твары аднавяскоўцаў. Як і нядаўна, калі ён ішоў праз вёску, Міхал нечакана востра адчуў іх еднасць. Мёртвых і жывых. Іх непарыўную, кроўную повязь. Яны былі ўсе разам. Былі заадно. Яны аднолькава на яго глядзелі. Гэта быў адзіны ланцуг жыцця. А ён, Міхал Маргуновіч, выпадаў з гэтага ланцуга. Выпадала звяно. Ланцуг разрываўся. Таму і ў вачах жывых, і ў маўклівасці мёртвых Міхал адчуў асуджэнне. Цяжар ягоны быў невыносны...

І гэта поле, і гэта светлая рунь пад сонцам — яны таксама глядзелі на яго. Праз ствалы дрэў і праз крыжы прабіваліся зіхоткія лапікі прасторы — іх вочы. Глядзеў на Міхала праз густыя зялёныя кроны чысты блакіт асенняга неба: запытальна, маўкліва...

Ён падняўся. Не атрасаючы з каленяў пяску, не азіраючыся і ўсё ж спіною адчуваючы насцярожана-запытальныя позіркі, пайшоў да поля. Як і туды, назад ішоў паволі, толькі неяк адразу распростаўся, паспакайнеў. Ногі ставіў упэўнена, цвёрда. Пачуў, як недзе ўдалечыні коратка гукнуў цягнік. Міхал стаў, прыслухаўся: да станцыі падыходзіў хуткі, «маскоўскі». Той, на якім павінны былі яны ехаць.

Ён раптам захваляваўся, зірнуў на гадзіннік і тут жа з палёгкай уздыхнуў: спяшацца ужо не было куды.



БЕЛЫЯ БРАДЫ

Чаму яны белыя, брады? Белыя-белыя. І чаму брады? Звычайнае балотца, перарэзанае раўчуком і пабітае скрозь, як барадаўкамі, высокімі купінамі калючай асакі.

Над раўчуком — купчасты лазняк, у маленькіх завоінах нерухома стаяць цыбатыя чараты, а па берагах скрозь расце круглатвары бэзавы валяр'яннік.

Звычайнае балотца, нізіна, самае падножжа ўзгорыстага, камяністага поля.

Балотца браліся асушаць, калі толькі паднялася ўся гэта кампанія з асушкаю. А пасля імпэт у калгаснага начальства чамусьці прапаў, і справа так і не была даведзена да канца. Балотца па краях узаралі, якраз датуль, дакуль даходзіў трактар, засеялі травамі, а да рова так і не дабраліся. І было там усё, як і раней: кусціўся лазняк, цвіў валяр'яннік, выпускалі свае аксамітныя рыжыя таўкачыкі высокія чараты.

Чаму ж тады ўсё-такі брады?

Нават не брод, а брады. Колькі іх: два, тры, колькі? І ка-

лі яны былі тут, за якім часам? А раз былі брады, значыць, была глыбіня. Была вузкая і глыбокая-глыбокая рака. Няйначай. І праз яе ў гэтым месцы якраз хадзілі і ездзілі. Праз брады на той бок, у тую калінавую цяністую лагчыну ганялі некалі коней.

Вось так і бачыцца Сашку: раскручаны сувой ранішняга густога туману над рэчкаю і рыжыя коні, пфыркаючы, нахіляюцца да чыстай вады і паволі-паволі ідуць на той бераг.

Сашку яно часам і сніцца: белыя брады і рыжыя коні трасуць густымі доўгімі грывамі. І здаецца яму, што праз сон ён чуе іх ціхае, самотнае ржанне. Штосьці трывожнае і светлае нараджаецца тады ў Сашкавай душы і рана-рана будзіць яго, падымае з цёплай пасцелі. Ён падхопліваецца і яшчэ доўга слухае тое дзіўнае трымценне ў сабе, але яно паступова аціхае, каб потым зусім знікнуць і пусціць у душу штодзённы, абрыдлы клопат, які цалкам зойме Сашку, паглыне з галавою на ўвесь спякотны і доўгі ліпеньскі дзень.

Сашка тут жа ўспамінае пра свой стары, дабіты трактар, пра шэрае мора перастаялай цімафееўкі, якую яны ўжо другі тыдзень косяць учатырох. Успамінае Міколу Бруха, Сямёна Касарыка, Селівона Грака, і настрой яго канчаткова псуецца.

Якія ўжо там белыя брады, якія рыжыя коні, калі гэтыя «чарнільшчыкі» сёння зноў будуць ганяць яго па «чарніла», а пасля будуць піць да абеду, а пасля спаць дзе-небудзь, зашыўшыся ў цянёк, і толькі надвечар раскатурхаюцца, возьмуцца за работу. І будуць стракатаць да самага цямна — гнаць норму. І Сашка з імі.

Штовечар, кладучыся спаць, Сашка дае сабе слова, што заўтра — от жа напэўна — з саменькай раніцы ён не паслухае іх, не пабяжыць у магазін. Няхай самі ідуць. А ён выедзе адразу ў поле і пачне касіць. І няхай як хочуць. А то бачыш ты, прывыклі: Сашка схадзі, Сашка прынясі, Сашка падай. Служка ў лапцях, а я босы. Не пайду болей!

Не, Сашка з імі не п'е, гэта — факт. І піць не будзе. А вот

рабіць, рабіць без іх не робіць. Так закамандаваў адразу, як толькі Сашку далучылі да іх, Мікола Брух. Сказаў, што ўсе яны — адна брыгада і рабіць павінны толькі разам.

Нядобра ўсё гэта. Сашка ўжо й брыгадзіру казаў, прасіў: перавядзіце мяне на другі ўчастак. А той толькі пасмяяўся. Ты малады, кажа, зялёны шчэ, а тут — вопытныя механізатары. І Мікалай Мікалаевіч, і Сямён Іванавіч, і Селівон Патапавіч. Вучыся, пераймай вопыт.

А як жа — вопытныя, навучаць... Сказаў бы Сашка пра іх вопыт. Але каму і што казаць, калі ўсе самі ўсё ведаюць.

Дый норму мужыкі даюць. Даюць, не падкапаешся. А маглі б і дзве, і тры даваць, каб рабілі як след. Вунь, ва ўсіх трох трактары новенькія, не тое што яго — Касарыкаў спадак.

Старшыня распарадзіўся: табе пакуль што новага даверыць не можам. Папрацуеш — паглядзім. Ну, што ж, Сашка не крыўдуе. Нічога, пакуль і на старым можна. А там — відаць будзе. Адно крыўдна, што гэтыя «вопытныя» так на новых робяць, як ён на старым. Ім адна халера. Хоць самалёт дай.

* * *

— Дак кажаш, белыя брады? А яны й сінія бываюць, не бачыў? Бываюць. Вясною ранняю. Калі лёд толькі кранецца і вада паверсе пойдзе, затопіць усё. Выйдзі калі на самы грэбень поля, глянь на іх зверху. Яны сінія-сінія... І жоўтыя бываюць. Калі цяпло сапраўднае стане, сонейка прыгрэе і лотаць кругом зацвіце. Падзівіся ў такую пару. Жоўтыя яны. А ты кажаш, белыя...

Старая Люця хітравата прыжмурыла вочы, усміхнулася. Яна толькі што абрывала ў картоплі зелле, ужо, відаць, стамілася і цяпер была рада разагнуцца, пагаварыць з Сашкам.

Дзіўная яна, Люця. Колькі яе Сашка ведае, з маленства самага, а яна ўсё такая, не мяняецца і, здаецца, зу-

7 — 1305

сім не старэе. Усё такая ж, як і тады, калі яны, вясковыя падшыванцы, рабілі часам налёты на яе садок. А яна, пачуўшы, як барабаняць, сыплюцца на зямлю цвёрдыя, яшчэ зялёныя грушы, выходзіла з хаты, стаяла на ганку і з-пад рукі, засланяючыся ад сонца, глядзела на іх. Яна ніколі іх не лаяла і не ганяла. Але варта было каму-небудзь з хлопцаў заўважыць яе і шапнуць адно толькі слова: «Люця», як усе яны, што тыя грушы, мігам аблятalі з сукоў і рассыпаліся хто куды. І ўжо ў канцы саду даганяў іх, бывала, яе доўгі, вясёлы смех.

Дзіўная яна, Люця. Галава ўся як снегам зацярушаная, твар у драбнюткіх зморшчынках, а вочы чорныя і гарачыя. І бровы таксама чорныя і тонкія, як у дзяўчыны. Можа, таму й завуць яе ўсе неяк па-маладому, коратка: Люця.

А Сашка дык часта і ўяўляе яе маладою: з цяжкаю цёмнаю касою на спіне. Люця сама неяк хвалілася: «Каса ў мяне харошая была, што пранік, плечы адбірала...»

— І што ты ўгледзеўся на мяне? — Люця смяецца, злавіўшы на сабе ўважлівы Сашкаў позірк.— На дзевак трэба глядзець, а не на бабу старую.

Сашка бянтэжыцца, маўчыць, адно пунсавеюць яго вялікія, неяк дзіўна выцягнутыя ўверх вушы. За гэтыя вушы хлопца дражняць у вёсцы Зайцам.

— Чуеш ці не, што кажу?

— Чую, чую,— Сашка ніякавата ўсміхаецца.

— Ну, во. А то ўгледзеўся.

Люця зноў схіляецца над баразною, паднімае ладнае бярэмца прывялай макрыцы з бярозкаю, падціскае зелле пад паху.

— Хадзем ужо адсюль, з гэтага поля. Хоць крышачку ў цень які — зварыцца можна.

Пазвоньваючы пустым бітончыкам, Сашка ідзе за ёю. Яны выходзяць з лапушыстага, цёмнага бульбоўніку на абмежак, вузкаю сцежкаю ідуць дахаты.

Сашка ўжо й так забавіўся тут, загаварыўся з Люцяю, а мужыкі там чакаюць не прычакаюць яго. Пайшоў, ду-

маюць, і прапаў. «Нічога, не памруць,— супакойвае сам сябе Сашка.— Дрыхнуць недзе пад кустом, ды ўсё...»

Стаіць высокі ліпеньскі дзень. Не дыхне, не шалохне вецер, не наплыве на неба хмурынка. Яго блакітны паркаль выцвіў, аблез ад яркага штодзённага сонца, здаецца празрыстым. Цішыня і спякота. Чутно толькі, як сонна гудуць над бела-ружоваю дзяцелінаю пчолы і недзе за пагоркам, нябачны адсюль, туркоча на брадах трактар. Гэта Мікола Брух зноў думае абхітрыць начальства — не глушыць свайго лапатуна. Ён хітры, гэты Брух. Сашка яго хіба найбольш не любіць і пабойваецца. А, ды чорт з ім, з Брухам. Вот бы ў рэчку якую цяпер бултыхнуцца. Смаліць дык смаліць.

— Другі тыдзеньчык так пячэ неміласэрна,— як бы чуючы Сашкавы думкі, падхоплівае іх Люця.— Усё пагарыць. Без хлеба астанёмся. Сама колас налівацца стаў. Перамяшалася, перакруцілася ўсё ў свеце.

— Нічога не перамяшалася, цётка,— Сашка ідзе за Люцяю і на хаду выцірае едкі, гарачы пот, што залівае вочы.

— Ну? — Люця прыпыняецца, паварочвае галаву, недаверліва прыжмурвае свае чорныя вочы.

— Праўда, праўда. Гэта здаецца так. Вот нам настаўнік казаў, гісторык. Разумны дзядзька. Казаў, што і ў мінулыя вякі ўсяго хапала. Ну, у 19-м ці ў 17-м стагоддзі, напрыклад. І засухі, і залевы — усяго было. Проста мы не ведаем пра гэта, і нам здаецца, што ў наш час найгорай.

— А хто яго, дзеткі, ведае. Можа, й так.— Люця мацней прыціскае зелле, раздумліва паўтарае: — Можа, й так. Але чалавек другі стаў цяпер. Ніколі не быў такі разбэшчаны чалавек. Ніколі. Ці то ад таго, што гора жаднага не бачыць, ці то ад дабра лішняга. Не ведаю. От ты кажаш, твае «чарнільшчыкі» ўжо п'яныя ляжаць.

— Што цапы́,— усміхаецца Сашка.

— Ну, во, бачыш. А дзе-та калі было такое, каб у касавіцу ці ў жніво гаспадар піў. Калі на ўсю ваколіцу, на ўсе пяць вёсак і знаходзіўся які недалэнга, то яго ж за ча-

7*

лавека не лічылі, пальцам людзі паказвалі на такога.— Памаўчала.— А ты кажаш, настаўнік твой. Хай ён мне гэта вытлумачыць... От хоць бы й Мікола Брух. Хто на яго пальцам пакажа? Ніхто. Ці вазьмі ты Касарыка, ці Селівона таго? Да сівых валасоў дажылі, дзяцей павыгадоўвалі. Хто да іх што мае? П'юць, ну й п'юць. А хто сёння не п'е?

— Хворыя.— Сашка зноў вышчарыў дробныя, вострыя, што ў ваўёркі, зубы.

— Хворыя. Вот бачыш. Бабы ж вунь п'юць. Адэльку ўчора ў краме спаткала. Чырвоная як рак. Толькі вачыма лыпае. Да мяне — абдымацца, цалавацца: цё-ётушка ты мая. А ад самой, што з бражніка. Узяла піва і проста каля прылаўка, з бутэлькі. Мужыкі стаяць смокчуць, і яна з імі. Хоць бы што, як гэта так і трэба... Ну, хадзем, хадзем ужо. Што пра тое гаварыць.

Хутка зашлэпала босымі нагамі па сцежцы і ўжо болей не спынялася да самай хаты, маўчала.

Загаварыла зноў, калі адчыняла веснічкі і ўпускала яго на падворак.

— Ты ідзі да студні, чэрпай сабе ваду, а я зелле парсюку ўкіну.

...Харошы ў Люці падворак. Прасторны, з высокімі старымі вязамі каля плота. Тут і ў спёку цянёк, і дыхаць адразу становіцца лягчэй. Нізенькая студня з амшэлымі, вышчарбленымі па краях бітонамі стаіць якраз пад раскідзістым вязам. На яе круглым драўляным вечку, як увосень, насыпана жоўтага лісту. Сохне, аблятае ад спёкі. Сашка змахвае яго, падымае вечка. Студня надзіва глыбокая, і вядро доўга ляціць у цёмную прорву, пакуль гулка плёхнецца аб ваду.

Сашка дастае яго, паўнюткае, ставіць на зруб, нахіляецца і п'е, п'е, не могучы напіцца. Вада тонкімі струменьчыкамі б'е з маленькіх, праетых іржою дзірачак, і Сашку асабліва прыемна адчуваць гэтыя ледзяныя, пякучыя змейкі на сваім разгарачаным целе.

Ён урэшце наталяе смагу, узнімае ад вядра галаў. Люця

ўжо ўправілася аднесці зелле і цяпер стаіць, апёршыся на плотчык, глядзіць на яго.

Сашка налівае бітончык.

— Панясу, а то дойдуць там без вады.

— А няўжо ж, гарачыня такая.

Сашку здаецца, што Люця ведае, чаго ён прыходзіў. Ведае, што вада — гэта так, зачэпка. Бо навошта было дзеля гэтага зваць яе з поля, мог бы і сам зачэрпаць. Люця ж студні не замыкае. Значыць, не такая «вада» яму трэба. Вунь і пустая бутэлька адцягвае глыбокую Сашкаву кішэнь. Ён міжволі праводзіць рукою па калашыне, нерашуча пераміная ецца, адчуваючы, як зноў загараюцца, чырванеюць вушы. Стаіць які час, баючыся ўзняць вачэй, не ведаючы, што ж рабіць.

І варочацца да мужыкоў без гарэлкі няма як. Брух усё роўна не даруе, у магазін пашле. А магазін вунь як далёка, цэлых пяць кіламетраў. Дый на брыгадзіра нарвацца можна. Ён сам часцяком заходзіць у магазін піва папіць. Што тады скажаш, паслалі? А ён скажа: у цябе што, свае галавы няма?

Не, трэба ўсё ж папрасіць. Гэта ж не так, не дарма, за грошы. І тройка скамечаная разам з бутэлькаю ў кішэні ляжыць...

Але ў тым і бяда, што не можа Сашка сказаць Люці пра гарэлку. Не можа, і ўсё. Хоць ты што.

А Мікола наказваў, калі выпраўляў: «Ты ж там папрасі старую харашэнечка. Калі будзе аднеквацца, гаварыць, што няма, скажы: можа, на карэньчыках у вас дзе асталася? Мужыкам палячыцца трэба...» А як жа, палячыцца ім. Хітры гэты Брух, нябось сам не пайшоў... На карэньчыках...

Сашка зноў нахіляецца да вядра, зноў п'е. А потым паднімае галаву, бярэ бітончык.

— Ну, то пайду ўжо. Дзякуй вам, цётка, за ваду.

— На здароўе, дзеткі.— Люця прымружвае вочы, пазірае на яго, і ён заўважае ў яе чорных вачах прытоеную, хітраватую ўсмешку...

* * *

Скошаная і ўжо насохлая цімафееўка ляжыць роўнымі шарымі радамі, і рады гэтыя цягнуцца, паўзуць на пагорак. На самым яго ўзлобку разрываюцца кароткімі выгарынамі, а крыху ніжэй зноў пачынаюць шарэць на зялёнай пожні і ўжо ў самай даліне гарбацяцца ладнымі густымі пракосамі. Трава ў гэты засушлівы год добрая толькі там, у даліне, за якою пачынаюцца брады.

Сашка ідзе напрасткі ад Люцінай хаты, пераступаючы праз вузкія шнуры пракосаў.

Колькі дзён яны касілі гэты кавалак? Дзён пяць, напэўна. Цяпер асталося няшмат. Да нядзелі ўправяцца. Сашка пазірае на пракосы і пазнае, дзе чый. Гэта на першы погляд усе яны здаюцца аднолькавымі, а прыгледзеўшыся, адразу пазнаеш.

Во гэты, выразаны з зямлёю, Селівонаў. Ён і касою гэтак косіць, Сашка бачыў. І трактарам. Пускае касілку каля самай зямлі.

А гэты во, каля Селівонавага, няроўны, віхлясты — Касарыкаў. Косіць і спіць разам. Ён усё гэтак робіць, сплючы.

Міколаў пракос з шырокім захватам, з высокімі чубамі пакінутай травы. Брух усё баіцца наскочыць на камень і, дзе трэба, дзе не трэба, падымае нажы.

Каля Брухавага, па-вучнёўску роўненька, сцелецца Сашкаў. «Таксама высакавата бяру,— думае Сашка,— трэ было б ніжэй».

Падняўшыся на самы грэбень поля, Сашка бачыць у даліне сінія трактары. Яны купкаю стаяць каля невялічкага чубка цемналістага алешніку. Недзе там, у кустах, зашыўшыся ў халадок, ляжаць мужыкі. Сашка прыспешвае крок...

* * *

— Як гэта няма ў хаце? Куды ж яе чэрці панеслі ў такую спёку? Можа, дзе ў гародзе корпаецца, не глянуў?

— Глянуў, няма.

Сашка стаіць, апусціўшы голаў, і вушы яго гараць, як макаў цвет...

Брух, седзячы ў высокай траве, знізу недаверліва зазірае Сашку ў вочы.

— А бутэльку куды дзеў? — гэта ўжо Касарык умешваецца ў допыт.

— Там, каля плота, пакінуў.

— Ты лянь, а? Каля плота... Яна табе што, дармовая?

— Чакай, Сямён. Правільна зрабіў, што пакінуў. Яшчэ раз сходзіць. Што пустую цягаць сюды-туды.

Брух адводзіць недаверлівы позірк ад Сашкі, выцягвае з-пад куста апошнюю бутэльку віна, зрывае зубамі бліскучую галоўку. Густое і цёмнае, што бычыная кроў, яно булькае, льецца ў шклянку.

— Сядай, чаго мнешся? На во, глыні. Хоць вады прынёс, і то ладна. Зя-цёк.— Мардаты, чырвоны, як распалены цвік, Мікола здаволена, п'яна рагоча.

Сашка апускаецца на калені, але шклянкі не бярэ.

— Ну, ну, не ламайся. Наліваюць — пі. Старэйшых, брат, слухаць трэба.

— Не буду.— Сашка ўвесь натапырваецца, уцягвае галаву ў плечы. Светлыя, адпушчаныя за лета валасы мякка кладуцца на каўнер вылінялай, заношанай кашулі.

— Давай, давай. Не затрымлівай. Мужыкі вунь чакаюць.

— Сказаў, не буду,— Сашка адсунуўся ўбок, адвярнуўся.

— Не лезь ты да хлопца, Мікола. Уцягнецца шчэ, паспее,— нечакана ўступіўся за Сашку маўклівы, дзюбаносы Селівон Грак.— Давай я вып'ю.

— Пачакай, Грак. Па-чакай,— Мікола свабоднаю рукою адвёў Селівонаву растапыраную далонь.— Мне во цікава,

што гэта мой зяцёк сабе думае. Катора пара, а ні разу не раскалоўся. Святога ўдае...

Міколавы лупатыя вочы п'яна ўтаропіліся ў Сашку.

— Гы-гы-гы,— вышчарыўся сонны, з асалавелымі вачыма Сямён Касарык.— Як дзевак упоцемку ціскаць, так не святы, га, Мікола? Ты глядзі, а то дачка, гы-гы-гы, у прыполе скора прынясе. Яны цяпер быстрыя, гэтыя святыя...

— Ну, ты за маю дачку не турбуйся, сваіх глядзі,— агрызнуўся, незалюбіў Мікола.

Сашка адчуў, як чырвань ад вушэй паўзе на твар, туманіць вочы. У хлопца самі сабой сціскаюцца кулакі, і ён ледзь стрымлівае сябе, каб не кінуцца на гэтага з'едлівага, жаўтавокага Касарыка, на мардатага, самаўпэўненага Бруха.

— А, мужыкі, прычапіліся да дзіцяці. Хай як хоча. Мала вам таго, што ён у магазін бегае.— Селівон п'яна дзюбануў доўгім носам.

— Болей не пабягу.

Сашка сказаў гэта ціха, няўпэўнена, але пачулі ўсе трое.

У асалавелых, жоўтых вачах Касарыка мільганула злосць:

— Ты лянь, а? Ты лянь. Канец свету...

— Зай-чык! Ты гэта кінь, Зайчык.— Брух забывае, што называў Сашку толькі што зяцем, пераходзіць на крыўдную для хлопца мянушку.— Ты каму гэта грозіш, га? Цябе хто з рова выцягваў разам з тваім дрындулетам, хто?

— Ну, вы.— Сашка нахохліўся яшчэ больш.

— Вы, вы. То-та ж, Зайчык. То-та ж. А хто гайкі потым памагаў круціць, хто два дні пад тваім недаломкам ляжаў? Маўчыш? Маўчыш, Зайчык. Дык вот і маўчы. А то «не пабягу-у». Пабяжыш, дзе ты дзенешся...

Брух раптам паспакайнеў, ямчэй усеўся, падмяў пад сябе болей травы. Толькі шклянка ўсё яшчэ дробна дрыжала ў яго ў руцэ і віно плёскалася, цякло паміж пальцаў.

— Ты, слухай, дабро не марнуй. Пі або другім давай,— не стрываў, вызверыўся Касарык.

Мікола не адказаў, моўчкі падняў шклянку. Дзве тонкія чырвоныя стужачкі пацяклі па барадзе, на расхрыстаную грудзіну. Брух дапіў, здаволена хакнуў, не закусваючы, наліў зноў поўную шклянку, падаў Селівону.

— На, Грак. Прамый нутро.

Прасачыў, як акуратна, не марнуючы ні кроплі, асушыў шклянку Селівон, з прыхаванаю зайздрасцю падзівіўся:

— Іш ты, і не скрывіўся нават.

— А ад чаго тут крывіцца, ад кампоту гэтага? — Чакаючы свае чаргі і ўсё яшчэ сонна лыпаючы жоўтымі савінымі вачыма, гмыкнуў Касарык.

Мікола наліў і яму, адкінуў убок пустую бутэльку, хрумстка надкусіў белую галоўку маладой цыбулі, укінуў у рот шчопец буйной солі. І ўжо зусім спакойны, улагоджаны зноў павярнуў галаву да Сашкі.

— Эх ты, зяцёк. Заяц ты, адным словам. Каб ты знаў, што ты траціш, гэтак во адмаўляючыся ўзяць чарку, каб ты знаў...— Брух любіў пафіласофстваваць, калі добра выпіваў.— Э, дзе табе, смаркачу такому. От яны — знаюць,— кіўнуў у бок размаранага Касарыка і дзюбаносага абыякавага Селівона.— Яны знаюць. Ты от думаеш, чаго мы п'ём. П'яніцы, думаеш, усё такое. Не, брат.

Сашка сядзіць унурыўшыся, маўчыць. Яму ўжо не навіна слухаць мардатага. Ён ведае, што Мікола будзе гаварыць цяпер доўга і нудна, аж пакуль яго як след не разбярэ выпітае «чарніла».

Сашку нядобра і прыкра. Ён амаль і не слухае Міколаву балбатню, а думае пра сваё. І чым болей ён думае, тым горш яму становіцца. Ён прыпамінае, як толькі што круціўся перад Люцяю, баючыся, каб не здагадалася, чаго прыходзіў, як потым стараўся вывернуцца перад мужыкамі, маніў, што не было яе ў хаце... І чаму ў яго ўсё так выходзіць, чаму?

Як бы й не ён гэта, не Сашка, а нехта другі, такі нерашучы і баязлівы сядзіць цяпер тут і слухае п'яную Бруxаву балбатню. А Сашка, сапраўдны Сашка, назірае за гэ-

тым бледным, даўгавухім, ссутуленым хлапчанём і ненавідзіць яго. Ненавідзіць гэту паслухмянасць, пакорлівасць і нерашучасць у ім. Ну, чаму так, чаму? Ён жа зусім не такі, Сашка. З сабою, напрыклад. Або з мацераю. Там ён дужы і смелы. І даўно ўсё робіць у хаце, даўно і ва ўсім ёй памагае. І параду талковую дасць, зусім як дарослы, і разважыць усё, разбярэцца, што да чаго. Маці так і гаворыць усім: «Мой гаспадар сказаў, мой гаспадар зрабіў». А тут перад гэтымі «чарнільшчыкамі» ці перад тым жа брыгадзірам, пра старшыню ўжо й казаць няма чаго, гэты «гаспадар» ну чыста заяц. Як хто падмяняе яго. Ну, чаго, чаго, каб сказаў, яму баяцца таго ж Міколы Бруха? Падумаеш...

Сашка падымае вочы і натыкаецца на п'янавата-нахабны, насцярожаны Міколаў позірк.

— А ты не слухаеш мяне, Заяц. Не слухаеш,— Мікола хітае галавою, пакрыўджана лыпае вачыма.— А я вот кажу, абрыдла ўсё. Усё абрыдла. І гэты во лапатун смярдзючы, і гэта цімотка, і гарачыня гэта. Сам сабе абрыд, ці паверыш, Заяц? Абрыд. Прасмерг мазутаю — да смерці не адмыюся. А чалавек не стальны, каб ты ведаў. Не стальны. Яны во, стальныя,— матлянуў галавою на трактары,— і то не вытрымліваюць. Ведаеш, колькі я іх за дваццаць гадоў змяніў? Не ведаеш. Яны мяняюцца, а я што? А ты кажаш, п'яніцы...

Мікола змоўк, выцер з чырвонага, разваранага твару буйны пот, зноў заплюскаў вачыма.

Прысунуўся бліжэй да Сашкі, як самую вялікую таямніцу, зашаптаў на вуха:

— А ты ўцякай, уцякай, калі хочаш быць чалавекам. Уцякай у горад, чуеш? Што тут табе, прападзеш. Маткі не слухай. Яна ў цябе цёмная, як піўная бутэлька. Сама век у гнаі праседзела і цябе трымае. Не слухай.

— Ніхто мяне не трымае.— Сашка адхіліў голаў, адвярнуўся.

— Не трымае. Можа, і не трымае, але й парады ніхто

не дасць. Сам сабе гаспадар. А ты малады йшчэ, не панімаеш... Гэта цяпер ты не п'еш, а потым не аглянешся — зацягне.

— Не зацягне.

— Не заця-ягне,— Мікола зноў перасміхнуў Сашку.— Але ж упарты, што ўдод... А Тоня мая... На чорта ты ёй такі, шмаравоз? Яна, брат, кончыць вучылішча і будзе сабе ў белым халаціку за прылаўкам стаяць. Гарадскога знойдзе. А ты хлопец, не скажу, харошы, не п'еш. Пайшоў бы ў горад, пажаніліся б, я б вам машыну купіў...

Бачачы, што Сашка аніяк не рэагуе на яго машыну, сядзіць усё гэтак жа ўнурыўшыся, маўчыць, Мікола ўчапіўся ў вылінялую Сашкаву кашулю, прыцягнуў хлопца да сябе, часта задыхаў у твар:

— Ну, чаго маўчыш? У цябе там шуры-муры з маёю дачкою. Усе ж кажуць.

Гарачыня ад вушэй шуганула Сашку ў галаў. Ён рэзка крутануў плячом, скінуў цяжкую Міколаву руку, падхапіўся на ногі:

— Ладна, хопіць...

— Ну, ну, не злуй. Дзела маладое, сам панімаю.— Мікола пацягнуўся да яго рукою, не змог падняцца, знізу стараўся зазірнуць у вочы.— Сядзь, Заяц, чуеш? Пагаворым. Каму кажу...

Але Сашка яго болей не слухае. Паварочваецца, глыбока засоўвае рукі ў кішэні і, неяк смешна разгойдваючыся ў бакі, пускаючы шырокі, надта для яго шырокі, крок, ідзе да свайго трактара.

* * *

Чаму яны белыя, брады? Белыя-белыя. Сашка рукамі расхінае волкі туман і ідзе, ідзе праз яго, чапляючы нагамі за высокія купіны, адчуваючы, як усяго ахутвае расянае, дрогкае сяйво летняга ранку.

Сашку трэба на той бераг, у тую цяністую калінавую лашчыну. Там ходзяць рыжыя коні: ён чуе іх ціхае, самотнае ржанне. Чаму яно такое самотнае? І як яму перайсці праз гэту глыбокую раку, як знайсці брод? Дзе яны, тыя брады, белыя-белыя?

Стройная дзяўчына ў празрыстым, як тумановы ранак, халаціку, высока падымаючы падол, пераходзіць на той бераг. Цёмная доўгая каса важка ляжыць у яе на спіне.

Вось-вось і схаваецца, знікне яна з Сашкавых вачэй. І як тады знайсці яе, як знайсці яе, як знайсці той брод, па якім прайшла яна?

— То-оня! То-оня!

Сашка не чуе свайго голасу. Але дзяўчына спыняецца, паварочвае галаву. На Сашку глядзяць чорныя, гарачыя вочы, здзіўлена прыпаднімаюцца тонкія бровы.

Люця? Сашка не верыць сваім вачам. Як зачараваны ступае крок, другі да яе. Але глыбокая-глыбокая рака падзяляе іх. І няма таго броду, па якім перайшла яна на той бераг.

Сашка кідаецца ў адзін бок, у другі, разгублена азіраецца.

Дзяўчына нечакана ўсміхаецца яму Тонінаю ўсмешкаю, развітальна махае рукою.

— То-оня!

...Абудзіліся, шчабечуць у вільчыку Сашкавай хаты ластаўкі...



КАНВАЛІІ

Помню тую вясну. Першую гарадскую вясну ў сваім жыцці. Неспадзявана абрушылася яна на горад яркім і шчодрым сонцам, дружнымі капяжамі, нязнанай датуль ажыўленасцю гарадскіх вуліц, вясёлым звонам трамваяў, што раптам неяк шпарчэй і ахвотней забегалі па сваіх гладкіх, бліскучых рэйках.

Помню, як тое ажыўленне і ўзбуджанасць перадаліся і мне, і хацелася бясконца блукаць па вуліцах, назіраць, як хутка, на вачах, мяняецца ўсё. Здаецца, толькі-толькі цурчэлі ўзбоч тратуараў гаманлівыя раўчукі, а ўжо насох, пашарэў і курыць пылам асфальт, і як збавення чакае горад першага вясновага дожджыку. А на рагу амаль кожнага квартала вясковыя бабулі ў плюшаўках трымаюць цэлыя кошыкі павязаных у пучкі разам з яловымі лапкамі пралесак. І так пахне вакол набрынялаю драўнінаю, адталаю зямлёю, і так хмеліць галаў маладое трывожнае чаканне. І ты не знаходзіш сабе месца, апантана кружыш і кружыш па тлумных вуліцах вясновага горада.

Помню тую вясну. Помню, як пацягнула мяне тады раптам дахаты. Гэтак цягне, напэўна, з першым цяплом у родныя мясціны пералётных птушак. І не могучы больш трываць, сярэдначы, я бегла пустымі гулкімі вуліцамі на вакзал і паспела якраз на свой начны цягнік, а нараніцы выйшла з вагона на маленькай лясной станцыі.

Было яшчэ цёмна. Свяціў толькі чырвонымі агеньчыкамі, аддаляючыся, цягнік, і недзе там, куды трэба было ісці, прыветна мільгаў жывы светлячок семафора.

А мне нечакана ўспомнілася сіняя бездань начнога неба. І наш самалёт на нейкай сваёй максімальнай вышыні. І нідзе нічога за круглым пукатым ілюмінатарам. Халодная маўклівая пустыня. І вострае адчуванне свае адзіноты. Як быццам выкінулі цябе ў гэты бязмежны акіян і ты блудзіш, не ведаючы, як і куды выйсці. Холад і адзінота. І раптам недзе далёка, у недасяжнай глыбіні гэтага акіяна, нясмела праклюнулася зорка. Адна. Маленькая. На імгненне здалася яна бяссонным агеньчыкам мамінага акна. І ажыла, пацяплела вакол маўклівая пустыня, папусціла свае жалезныя абручы адзінота. І сагрэла душу надзея, што не дасць заблудзіць і прапасці ў гэтым сінім бязмежжы сусвету жывы мігатлівы агеньчык. Я падумала тады, што дайшла б да яго, дапаўзла б, каб прыйшлося, нават за тысячы міль...

А потым быў дзень. І вясновы вецер гнаў па небе цяжкія, набрынялыя першым дожджом хмары, і хваляваліся пад гэтым ветрам лясы, і недзе ў іх глыбокіх нетрах прабівалі шэрае леташняе лісце сінія вочы пралесак. А ў маленькім гародчыку над лужком выходзілі з зямлі чырванавата-зялёныя, тугія трубачкі ландышаў. Штовесну, па сваёй даўняй завядзёнцы, я хадзіла да таго гародчыка, каб упэўніцца, што ландышы не прапалі, жывуць і прыйдзе час — абавязкова распусцяцца.

У гэты свой прыезд, абуўшы высокія гумовыя боты, я таксама папраставала да былога суседскага селішча. Усе тыя сцежкі, што некалі таптала босыя дзіцячыя ногі,

былі здратаваны і ссунуты бульдозерам у вялізныя бурты яшчэ мінулаю вясною. І цяпер, раз-пораз трапляючы ў нечакана глыбокія выбоіны і апякаючыся ледзяною вадою, што набіралася ў халявы гумовікаў, я адчувала, як холад той працінае ўсё нутро. Але ішла, бо ведала: недзе ў маленькім, пакінутым людзьмі гародчыку ўпарта прабіваюцца з зямлі ландышы.

І не памылілася. За раскіданым, напалову патрушчаным плотам у заваленым смеццем кветніку па-ранейшаму аставаўся лапік жывой зямлі, і на ім, як і даўней, ажывалі пасля зімы ландышы. Але цяпер гэта чамусьці не кранала мяне. Такая глухата і спустошанасць панавалі навокал, што праз іх друз не мог прабіцца на свет той чаканы храсточак радасці. Замест яго ўзнікла ў душы жаданне тут жа павярнуцца і пабегчы назад. Я адчула, як раптам неадольна пацягнула мяне да людзей, да жыцця. Успомніліся шумныя гарадскія вуліцы, сябры, інстытут, і я зразумела, што мне трэба ехаць. Спяшаючы і зноў набіраючы ў халявы сцюдзёную ваду, бегла я назад, дахаты, а надвечар стала хапатліва збірацца ў дарогу.

Тады яшчэ я не здагадвалася, што цяпер так будзе кожны раз. Што душа мая, сама таго не жадаючы, як бы распалавінілася, раздвоілася, і мне суджана гэтак ірвацца заўсёды. І што менавіта г э т а будзе найболей і найгорай мяне мучыць усё жыццё. Дый ці толькі мяне...

* * *

Тою вясною неяк асабліва рана зацвілі ландышы. Яшчэ не паспела як след развінуцца клейкая маладая лістота на дрэвах, яшчэ ў гарадскіх скверах і парках не ўкрыла зямлю трава, а ўжо тыя ж бабулі, што не так даўно прадавалі пралескі, стаялі, трымаючы ў руках далікатныя букецікі ландышаў.

Якраз тою парою адкрылася ў Палацы мастацтваў выстаўка. Добра памятаю гэта, бо ўпершыню зайшла туды з духмяным белым букецікам. Я часта туліла яго да твару,

адчуваючы незвычайна тонкі водар гэтых мілых кветак. Побач са мною быў Віктар. Ён глядзеў на мяне радаснымі вачыма, раз-пораз нахіляўся і шэптам пытаў: «Падабаецца?»

Мне ў той дзень падабалася ўсё. І белыя, цнатліва-чыстыя кветкі, і вясновы сонечны дзень, і вясёлыя, узбуджаныя твары людзей. Я перажывала высокае, ні з чым не параўнанае ўзрушэнне. Здаецца, я ўпершыню была так моцна захоплена, зачаравана мастацтвам. То была мая першая сустрэча з сапраўдным майстрам. Так, так, першая. Не важна, што перад тым былі ўжо ў жыцці Эрмітаж і Траццякоўка, не важна, што з Віктарам мы штомесяц хадзілі ў наш Мастацкі музей «шукаць» натхнення. Усё гэта было не тое, усё гэта было не так. Тут найперш была роднасць, тут найперш было яднанне тваё душы з тым светам, у які цябе нязмушана, але настойліва вёў мастак. Гэта быў твой свет. І было такое дзіўнае адчуванне, што ты калісьці ўжо жыў у гэтым свеце, бачыў і любіў гэтых людзей, але здарылася нейкая непапраўная бяда з тваёю душою, з тваёю памяццю, і ты надоўга забыў гэта ўсё, не думаў, не ўспамінаў яго, жыў з дня ў дзень дробным і мітуслівым жыццём, думаючы, што так і трэба, што гэта і ёсць тое тваё прызначэнне, дзеля якога ты і народжаны на белы свет.

Вялікі, нязнаны дасюль сорам падымаўся ў маёй душы і спапяляў усю істоту. Я пераходзіла ад карціны да карціны, як усё роўна ступала па распаленых камянях мінулага. Яно паўставала перад вачыма — шарачкова-беднае, гаротна-цяжкае, гераічна-мужнае. І тваё, тваё, тваё. Усё да самай кропелькі. Мастак міласціва вяртаў яго тваёй душы, як неразумна і балюча страчаны скарб, без якога і душа твая не душа, без якога і ты не чалавек.

Я памятаю, як выйшлі мы тады з Палаца, як доўга маўчалі. Быў ужо вечар. Ціхі і цёплы. Улеглася дзённая вулічная мітусня, горад адпачываў.

Загаварыў першы Віктар. І словы яго ўпалі нечакана, як халодныя кроплі дажджу. Мне захацелася схавацца ад іх, як-небудзь абараніцца. Я ўмольна ўзняла вочы:

— Давай памаўчым, ладна?

Але ён не зразумеў мяне.

— Чаму памаўчым... Ведаеш, ён, канешне, майстра. Нічога не скажаш. Тэхніка, вытанчанасць, усё такое. Але... Усё гэта так патрыярхальна, несучасна, так далёка ад нас. От, каб бабулю маю сюды — ёй бы якраз. А нам, нам ад мастацтва трэба іншае. Ну што хоць бы гэтыя партрэты сялян. Ну тыпы, ну й што. Мне трэба сённяшні чалавек, я хачу яго бачыць.

«А што значыць сённяшні?» — парывалася запытаць я, але не запытала, бо заранё ведала, што ён адкажа.

Нечакана захацелася астацца адной, і я паспяшала развітацца. Ён пакрыўджана кіўнуў галавою, не азіраючыся пайшоў па вуліцы. А я стаяла, чуючы, як горка пахнуць у маіх руках, прывялыя без вады, ландышы...

З таго часу я штодня, як толькі канчаліся ў інстытуце заняткі, адна ішла ў Палац мастацтваў...

* * *

Вы, напэўна, памятаеце тую выставу. Ну, канешне ж, яе нельга не помніць. Памятаеце, там цэлую доўгую сцяну займалі партрэты беларускіх сялян? Амаль пад кожным стаяла імя або прозвішча. Як пад фотаздымкам.

Я прыходзіла і сядала насупраць. І глядзела. І заўсёды лавіла сябе на тым, што гэтак я гляджу фотаздымкі сваіх продкаў, калі прыязджаю дахаты. Пажоўклыя ад часу, тыя здымкі збераглі родныя і незнаёмыя абліччы...

Так, гэта ўжо былі не проста партрэты, напісаныя таленавітым мастаком. Я ўглядвалася ў твары сваіх продкаў. У кожную іх рысачку. Я пазнавала іх. Мудрых, стомленых жыццём і працаю, але ўчэпістых, цягавітых, з неспатольнаю прагаю жыцця ў спакойных славянскіх вачах.

Я забывала ў такія хвіліны пра ўсё на свеце. Пра свой інстытут, пра тое, што заўтра ў нас практычныя заняткі і да іх трэба яшчэ рыхтавацца, пра Віктара, які заўсёды

цярпліва чакаў мяне, прысланіўшыся да падаконніка, насупроць нашага пакоя.

Я тады забывала пра ўсё. Нічога не існавала ў свеце, акрамя выставы. Я сядзела там, пакуль не падыходзіла нарэшце ветлівая хударлявая жанчына і не папярэджвала, што да закрыцця астаецца дзесяць хвілін. Яна так спагадліва глядзела на мяне, як глядзіць здаровы чалавек на хворага. А я і праўда як захварэла. Маё ўяўленне малявала адно і тое ж. То быў вобраз пажылой кабеты, сялянкі. Ага, ага. Менавіта пажылой. Не крывіцеся, шаноўныя...

Гэта карціна, дакладней партрэт, стала тады мараю майго жыцця. Мне трэба было браць фарбы і маляваць. Я бачыла кожную рысачку «свае» жанчыны, кожны няўлоўны рух яе твару. Яна мне снілася, не давала спакою. Я яе ведала. Нікога і нічога я так добра не ведала і не адчувала, як яе. Яна ўвасобіла ўсё лепшае, што было ў маёй і яшчэ ў нечай бабулі, што жыло ў нашых мацярках, і што гены перадалі нам таксама, і што мы насілі ў сабе, хаваючы ад саміх сябе, баючыся як-небудзь праявіць гэта, не разумеючы, што на гэтым і трымаецца яшчэ свет і ўсё лепшае, што ёсць у свеце. Мы, вясковыя, наіўныя дзяўчаткі, няўдалыя гараджанкі, больш за ўсё баяліся не выдаць сваю вясковасць, сваю чысціню, сваю замілаванасць усім родным, стараліся як маглі быць сучаснымі. Не здагадваючыся нават, што самае сучаснае ў нас — ад нашых бабуль і мацярок, бо яно ў нас самае лепшае.

Мне тады захацелася сказаць пра гэта. Захацелася сказаць усім такім, як сама, тым, хто пачаў забываць, хто ён і адкуль.

«Мая» жанчына, «мая» бабуля жыла ўжо не толькі ў маёй душы. Яна глядзела на мяне з гэтай сцяны, займала сваё месца сярод партрэтаў. Якраз побач з партрэтам «Старога з люлькаю». Яна глядзела на мяне. Круглатварая. Прыкметна выдаваліся сківіцы. Гэта ад таго, што ўжо немаладая, хударлявая. Твар пад тонкаю вуалькаю зморшчын. Злёгку прымружаны цёмныя вочы. Пажылыя людзі ўсе

так глядзяць — з прымружам. Высокі лоб і гладка, на прамы прабор зачасаныя валасы.

Спакойныя, спрацаваныя рукі далікатна сціскаюць букецік белых маёвых кветак. Ландышаў. На маленькіх пяшчотных званочках зіхцяць кроплі буйной расы. Раніца...

Што яшчэ я магла, павінна была расказаць пра яе ў сваёй карціне. О, колькі яшчэ ўсяго. Паслухайце. Я паспрабую зрабіць некалькі эскізаў да яе партрэта.

Эскіз першы

КАНВАЛІІ

Гародчык быў з ценявога боку ад хаты. Штовесну, у маі, зацвіталі там ландышы. Баба Валінка называла іх — канваліі.

Маленькі бела-зялёны астравочак яснеў у самым кутку гародчыка каля старога амшэлага плота. Ландышы пераходзілі за плот, вытыркаліся скрозь з маладой травы і нават перабіраліся на другі бок вузкай пакручастай сцежкі. Але зацвіталі гэтыя «перабежчыкі» чамусьці заўсёды пазней, красавалі нядоўга і былі нейкія дробныя і кволыя. Як быццам дзічэлі і выраджаліся, пакінуўшы ўлюбёнае месца сваіх продкаў.

Гародчык быў невялікі і, мабыць, зусім не прыдатны ні для якіх іншых раслін. Бо панаваў там вечны цень і ад блізкага лужка было надта сыра.

У процілеглым кутку яго, пад чэзлым старым бэзам, стаяў пусты вулей з адбітым лятком, пасярэдзіне расла адна-адзіная яблыня папяроўка, і на плот апіраліся сухімі лёгкімі сукамі даўно незраджайныя слівы.

Ніхто, акрамя бабы Валінкі, на заходзіў туды. Нават мы, малыя, найчасцей заглядвалі праз шчыліны паміж ляскамі і забягалі хіба толькі, калі гулялі ў хованкі.

Дзіўны быў той гародчык. Нейкая свая, не разгаданая нікім таямніца жыла за сівымі амшэлымі ляскамі. Была яна

ва ўсім: у тым халадку і паўзмроку, што заўсёды панавалі там, у апусцелым вуллі пад чэзлым кустом бэзу, у тонкім водары ландышаў. І найбольш хіба ў гэтым водары.

Я й цяпер, праз многія ўжо гады, калі пачую раптам незвычайны пах мілых, цнатліва-чыстых кветак, пачынаю міжволі хваляваецца. Як бы душа мая дакранецца незнарок да нечага таемнага і светлага. І заўсёды тады бачу я бела-зялёны астравочак у самым ражку цяністага гародчыка і бабу Валінку. Яна часта заходзіла туды і нізка схілялася да кветак. Я не помню, каб яна іх ірвала, каб ставіла ў букеты. Але я помню, як выходзіла яна з гародчыка, нейкая адразу памаладзелая, усмешлівая і гаварыла заўсёды адно і тое ж: «Канваліі зацвілі». І мы ведалі, што зараз яна пойдзе рабіць нейкую сваю работу і будзе спяваць. І песня тая, журлівая і светлая, разальецца па ўсім наваколлі, і нехта, таксама робячы нешта сваё, разагнецца раптам, распростаецца і, пасвятлеўшы душою, пазнае, скажа: «Валінка спявае».

Эскіз другі

ПЕСНЯ

І зноў успамінаецца май. Маладая зяляніна вакол. Усё такое жаўтава-зялёнае. Вы, пэўна, заўважалі, калі распускаецца лес, здалёк ён выдае жаўтава-зялёным. А калі яшчэ зацвітуць цёплыя ласкавыя коцікі на лазовых кустах, калі высыпле на лужку маладая кволая травіца, калі выпырсне скрозь яркая лотаць і ўстане над усім гэтым шчырае веснавое сонца, то ўсё і праўду выглядае залаціста-зялёным, па-маладому вясёлым і светлым.

А ў неглыбокім лужку вада прагрэецца да самага дна, стане цёплая, што луг. Баба Валінка такою парою першы раз выпусціць з хлява каровы. Дастане з-за абраза сухі вярбовы дубчык і будзе лёгенька так пасцёбваць ім па худых баках, нешта сабе нашэптваць, прыгаворваць, выганяць змарнелую за зіму жывёлу на волю. Каровы разыдуцца па лужку, будуць скубці мяккую лугавую травіцу, а баба Ва-

лінка адхіліцца ад іх, пойдзе па выспе, і зноў тады народзіцца песня. Светлая і трапяткая, як гэты высокі вясновы дзень, як гэта зялёная маладая зямля.

Праз гады я чую яе, тую песню, і мне кожны раз здаецца, што гэта спявае сама зямля, праз гады бачу, як нястомна нагінаецца да гэтай зямлі мая старая суседка.

Помню, я неяк не вытрывала, сустрэўшыся з бабуляю, наіўна спытала: «Што гэта вы ўсё нешта як шукаеце, усё схіляецеся, усё выглядаеце нешта?..» Яна не здзівілася, узняла голаў, блізка-блізка зазірнула мне ў вочы, як бы хацела ўпэўніцца, ці сур'ёзна я гэта пытаю, а як упэўнілася, то тут жа загаварыла: «А гэта, дзеткі, як хто. Адзін чалавек усё жыццё праходзіць па зямлі, галаву ўгору задраўшы, пад ногі сабе ніколі не гляне. Спытай у такога, ён табе ніколі не скажа, па якіх сцежках ходзіць, якую траву топча. Цяпер жа чалавек мала на зямлю глядзіць, яго гэты космас цягне. А мяне ўсё зямля не адпускае. З маладосці гэтак. Мне ўсё здаецца, што кожная травінка просіць ёй пакланіцца, прыгледзецца. Здаецца, чую, як шэпча: «Глянь на мяне, разгледзь як след, а можа, прыдамся я табе на якую патрэбу».

Помніцца мне летні адвячорак. Ціхі і светлы. Вялікі круг поплаву, атулены нізкім алешнікам, пляскатыя цёплыя валуны, параскіданыя скрозь па поплаве, і раскоша размаітых траў кругом. У самай сіле яны, у самай квецені. Праз колькі дзён — купалле. Цішыня і ўрачыстасць. Гармонія ў свеце. І як гімн гэтай гармоніі — песня. Я заўсёды знаходзіла бабу Валінку па гэтай песні. Ішла здалёк на яе чысты і моцны голас.

Помніцца мне той адвячорак. Каровы, адчуўшы нарэшце халадок, павылазілі з алешніку і цяпер стараюцца, скубуць, скубуць травіцу. А баба Валінка ходзіць у прыбалатку, схіляецца над зямлёю, выбірае сярод гэтага разнатраўя патрэбныя зёлкі, раз-пораз раскрывае сваю шэрую палатняную торбачку.

Цяпер яна раскрыла яе перада мною і зноў блізка-блізка зазірнула ў вочы. «А во там, на ўзлеску,— ківае на

высокі груд,— чабору набрала, а тут во на балоці — бабку. Ад пярэпалаху надта добра. А то во — сардэчнік. Бачыш, ружовы — то нам, кабетам, піць, а гэты во, фіялетавы — мужчынам».— Вымае і зноў кладзе ў торбачку далікатныя фіялетавыя і ружовыя гроначкі.

«І дзевяцяранкі ўзяла,— дастае пучок яркіх жоўтых кветачак, нанізаных на зялёныя галінастыя лапкі.— Гнёздамі ўсё, гнёздамі расце. І святаяннік вунь каля камянёў, бачыш? Але яго пакуль не трэба чапаць. Ён толькі зацвітае, хай развінецца, пакрасуе ўволю, моцы набярэ, і, як толькі адцвітаць стане, тады ўжо збіраць яго можна. У пучкі вязаць і пад стрэху, у цянёк, каб даходзіў».

Помню белы палiваны збаночак, што заўсёды стаяў на паліцы ў хаце ў бабы Валінкі. Уся сям'я піла з таго збанка гаркавы цёмна-зялёны ўзвар, які яна штодня гатавала...

Не ведаю, як мне падступіцца да свайго трэцяга эскіза. Як назваць яго? Назаву яго проста — жыццё.

Эскіз трэці.

ЖЫЦЦЁ

«Да школы я не хадзіла. Да школы хадзілі малодшыя сястра і брат. Бацька не мог усіх нас вучыць. А мне так хацелася навучыцца чытаць. Упрасіла сястру, паддобрылася да яе, і яна мне пачала паказваць тую грамату. А я на ляту ўсё схоплівала. І навучылася. І па-польску, і па-руску, а потым ужо, сама праз сябе, і па-беларуску. Найболей вершыкі люблю. Ці ведаеш ты гэтакі во: «Здароў, марозны, звонкі вечар...»

О, тыя марозныя вечары. Мы штовечар хадзілі з мамаю да бабы Валінкі. І казалі заўсёды так: «Пойдзем да Валінкі на вечаркі».

Помняцца мне тыя вечаркі. Баба Валінка, начапіўшы акуляры, у завязанай «назад» хусцінцы, мажная, спакойная, сядзіць каля стала і, аддаліўшы ад сябе кнігу, чытае. Тут сабе, у хаце, гавораць хто пра што, бо зайшоў яшчэ нехта з су-

седзяў, тут мы, дзеці, валтузімся, а яна чытае. І ўсміхаецца сама сабе, і хмурыцца. А потым усё ж не вытрымлівае, узнімае галаў, ссоўвае ніжэй акуляры, аглядае ўсіх нас, дзяцей, і строга так кажа: «Ну, ціха, бэйбусы. Паслухайце троха». І пачынае чытаць услых. Помню, так чытала яна нам з тонкай, пажоўклай кніжачкі вершы Багдановіча, з тоўстай, у цёмным вішнёвым пераплёце з залатым цісненнем Міцкевіча і заўсёды па памяці шчымлівае някрасаўскае: «Поздняя осень, грачи улетели». Чытала Някрасава неяк дзіўна, вымаўляючы ўсе гэтыя «о», выдзяляючы іх сваім моцным, усхвалёваным галасам.

А пасля, калі мы ўжо падраслі — тры яе ўнучкі і я,— прасіла чытаць нас.

Помню цяпло белай, добра напаленай кафлянанчкі, шырокую цяжкую табурэтку каля яе і гэткую ж цяжкую, растрэсеную, зачытаную да немагчымага кнігу «Братья Гримм. Сказки». І калі хто з нас чытаў, то яна ўжо не сядзела склаўшы рукі, даставала з печы наўлечку з пер'ем або бралася прасці кудзелю.

Ціха турчэў калаўротак, а яна слухала і ўсміхалася. Колькі святла ў маёй душы ад вашых усмешак, баба Валінка, ад вашых вершыкаў, песень і казак...

Знаю, што расказваю не бог ведае што. Знаю, што, прачытаўшы гэту маю невялічкую навелу, амаль кожны зможа згадаць такую сваю бабулю. Яны вечныя на гэтай зямлі, як вечны наш народ, як вечныя яго душа і слова.

* * *

Мінулай вясною, у маі, бабе Валінцы было дзевяноста. Я цяпер рэдка бачу яе. Іх сям'я даўно выбралася з тае маленькай хаткі на выспе. Зяць паставіў у вёсцы новы харошы дом. А на былым селішчы цесна спляліся кронамі старыя здзічэлыя яблыні, і ў маленькім гародчыку штовесну ўсё яшчэ зацвітаюць ландышы.

Даўно перайшла жыць у новую хату баба Валінка. Яна

пастарэла за гэты час. І ходзіць цяпер, нізка прыгнуўшыся да зямлі, не толькі таму, што нечым на ёй цікавіцца, а таму, што ўжо не можацца інакш. Але ўсё па-ранейшаму клапоціцца, усё тупае па гаспадарцы, пагадаваўшы ўнукаў, памагае гадаваць праўнукаў. І цяпер ім чытае вершы і казкі. Але ўжо не спявае. Аслабеў, амаль зусім прапаў голас...

Мінулаю вясною ёй было дзевяноста. Сабралася ўся іх вялікая сям'я. Прыехалі з горада тры яе ўнучкі з мужамі і дзецьмі. І быў накрыты багаты стол, і сядзела за тым сталом на сваім звыклым месцы баба Валінка. Ёй налівалі яшчэ добрую чарачку, і яна не адмаўлялася, паднімала яе. Паслухаўшы тост, моўчкі выпівала гарэлку. Усе вакол здзіўлена ахалі, мітусліва падсоўвалі да яе закусь, але яна не спяшала закусваць. Сядзела нейкі час нерухома, глядзела на ўсіх прасветленымі вачыма і толькі потым ужо ўсміхалася, казала: «Нічога, нічога, дзеткі, хай папячэ...»

Мінулаю вясною бабе Валінцы было дзевяноста. У той святочны дзень, нараніцы, ёй прынеслі з роднага селішча, з цяністага гародчыка, свежы букет ландышаў. Яна ўзяла яго, пяшчотна прытуліла да твару, як калісьці, ціха сказала: «Канваліі зацвілі...»

* * *

Я цяпер часта ўспамінаю тую першую студэнцкую вясну, вялікую выставу ў Палацы мастацтваў, Віктара, і тая даўняя мара ўсё больш і больш хвалюе мяне, не дае спакою.

Я так часта думаю пра вас, канваліі... Ваша святло ў маёй душы. Чысціня ваша ў сэрцы маім. Я бачу: над вамі схіляецца баба Валінка, мая старая суседка. Я ведаю, чаму так нізка яна схілялася над вамі, ведаю, чаму такая мудрая і светлая душа ў яе.

Так часта я ўспамінаю і думаю пра вас, канваліі. Думаю пра той запаветны куточак, які нараджае і стварае нас, які запальвае ў нашых сэрцах агонь вялікай любові.



ЮЛЬКА І СОНЦА

> Сонца толькі кранаецца вачэй дарослага,
> але пранікае ў вочы і ў сэрца дзіцяці.
>
> *Ралф Эмерсан*

— Сіротка, сіротка... От, божа ты мой, божа, каб яны па ўсім свеце звяліся, бацькі такія. Ён жа як прыехаў тады, першы раз, мы глянулі толькі, адразу сказалі: адпраўляй назад, хай едзе — круцяшчы і за водкаю ўпадае. У чужых людзях, а стрымацца не можа, смокча, што вуж. У нас моды такой няма, каб так піць. А яна — дзе ж табе, не паслухала, упанаравіла надта. Свету за ім не відзела. Ну, то вот і асталося дзіця сіратою пры жывым бацьку. Года не пабыў тут, валацуга. А што ўжо выробляў, што выробляў... Яна грубая хадзіла, а ён, як кавалер, па танцах, па чужых вёсках. І начаваць, бывала, не прыйдзе. Ёй потым пераказваюць: то ў тае начаваў, то ў тае... Вядома ж, вёска каля вёскі, усе адны адных знаюць... Яна плача, яму выгаворвае, а ён дзівіцца, сабака: «Аткуда ты ўсё знаеш?..» От, каб ты здыхаты свае не знаў!

Юльчына баба, худая, маленькая, у доўгім, па пяты,

андараку, у белай, насунутай на лоб вострым дзюбам хустцы, стаіць, прываліўшыся грудзьмі на вароцечкі, а на другім баку плота, упёршы рукі ў бокі, шырока расставіўшы тоўстыя ногі, уся таксама тоўстая, растармэханая, як тая калода, што ў іх на дрывотні, топчацца чужая баба — Ганця. Яна жыве вунь там, на пагорку. Яе маленькая хатка хаваецца ў густых зарасніках бэзу.

Яны стаяць ужо катора пара і ўсё пра Юльчынага бацьку пераліваюць. Гэта, выходзіць, Юлька ў іх сіротка... А Юлька, каб магла, здаецца, то во гэтага малачаю горкага, з якога вянок пляце, сваёй бабе ў шчарбаты рот напхала б. Якая яна сіротка? У яе ёсць мама. Маладая, прыгожая, самая лепшая на свеце. А бацькі няма і ніколі не было. Юлька яго не бачыла і бачыць не хоча.

А гэта во баба Юльчына — ніякая яна не Юльчына, бо яна мачыха маміна. І гэта яна толькі прыкідваецца, што шкадуе Юльку: сіротка, сіротка... А сама як астанецца з Юлькаю, то й крычыць на яе, і дубцом б'е, і лае ўсяляк, і ў садок не пускае. Толькі — сюды, зберажку, пад яблыняю пасядзець. А далей — ні кроку.

А мама ёй за гэта яшчэ хусткі купляе.

Бабы гавораць яшчэ доўга. Юлька і адзін вянок спляла, і другі пачала, а яны ўсё вохкаюць і вохкаюць каля плота, і ўсё пра Юльчынага бацьку.

О, зноў Юльчына худая баба затарахцела, як пустая тачка:

— І пісьмо ж прыслаў адразу, як яна на аліменты падала. Грошы, піша, мае табе на карысць не пойдуць. Ты яшчэ і мяне, і грошы мае прыпомніш... Чула, Ганцечка?

Баба азіраецца па баках, як усё роўна збіраецца сказаць вялікую таямніцу. Юлька ўся насцярожваецца.

— Яна пісьмо тое палучыла і ўсё плакала, а нам не паказвала. А мая Нюра знайшла і прачытала...

Нюра — Юльчына цётка, бабіна дачка. Худая, як і баба, і непрыгожая. З доўгім носам і маленькімі, як у блыхі, вочкамі. Прыйдзе да іх у хату, а хаты іх на адным падворку

стаяць, вокны ў вокны, прыйдзе і ўсё вынюхвае. Усюды нос свой доўгі ўсуне. І накрыўкі з каструляў падыме — у кожную зазірне, а калі няма дома Юльчынай мамы, шкафчык адчыніць і хоць што, але возьме. Такая ўжо яна, Нюра гэтая. І пісьмо ў мамы знайшла і прачытала. Але што гэта за пісьмо і чаму Юлька яго не бачыла ні разу? Выдумала, мусіць, баба ўсё. Яна вечна выдумляе. І на Юльку ўсяго ўсякага маме нагаворвае: Юлька і тое, Юлька і гэта. Але мама яе не слухае...

— А вох, як ты кажаш? — гэта ўжо здзівілася, сіпла завохкала баба Ганця.— Грошы на карысць не пойдуць?

— А няўжо ж, так во і піша: ты яшчэ мяне і грошы мае прыпомніш. Во, бандыт, як грозіць...

— А што ж ты думаеш — грозіць! Прыедзе калі,— цяпер ужо баба Ганця азірнулася вакол і зашаптала моцна, мацней, чым толькі што гаварыла,— прыедзе і заб’е, што яму верыць... Цяперашнім светам за грошы матак родных забіваюць, а тут — што яму, лічы, чужыя. Калі ён не пашкадаваў яе, маленькай, кінуў, то што такому значыць...

— А няўжо ж, а няўжо ж,— заківала Юльчына баба,— ці чула ж ты, што ў Забыўца́х тым летам было?..

Што было ў нейкіх там Забыўцах, Юлька не слухае. Яна сядзіць пад яблыняю ў маладой цёплай траве, і пальчыкі яе ўтрапёна сціскаюць хрусткае, ажно выступае белае малачко, сцябло жоўтага малачаю.

І раптам бачыць яна чужога высокага дзядзьку ў цёмных акулярах і ў чорных вялізных пальчатках. Дзядзька худы-худы і высокі-высокі. Ён усміхаецца і нахіляецца да Юлькі. У дзядзькі вялікія рэдкія зубы. Юлька моцна зажмурвае вачаняты і цясней туліцца да яблыні...

Яна чуе, як нечага сіпла рагоча баба Ганця і крадком, адплюшчыўшы спачатку адно вочка, потым другое, пазірае туды. Бабы як стаялі каля плота, так і стаяць там. І ніякага дзядзькі нідзе няма. Толькі сонца, якое нядаўна так весела смяялася і ўсё пазірала на Юльку, цяпер чамусьці схавалася за пухнатую шэрую хмару.

...З таго часу неспакойным калючым звярком пасяліўся ў Юльчынай душы страх. Ён аціхаў і нават знікаў зусім, калі яна гуляла на двары, калі ярка свяціла сонца, але затое адразу выпускаў свае вострыя кіпці, як толькі Юлька адна заходзіла ў хату. Яна хуценька, чуючы, як часта і гулка тахаціць у грудзях сэрца, зазірала пад ложак, цікавала за печ і ў падпечак, тузала замкнёныя дзверцы шафы, нарэшце, хапала тое, што ёй трэба было, і як мага выбягала з хаты. І ўжо на падворку заўсёды даганяў яе бабін траскучы голас: «А ці чула ж ты, што ў Забыўцах тым летам было?..»

Сонца такое вялікае і чырвонае, што Юлька не можа на яго глядзець. Яна стаіць, паступіўшыся на лавачку каля хаты, і чакае, пакуль яно спусціцца трохі ніжэй, вунь за макаўку тае высокай бярозы ў іх за хлявом.

А сонца не спяшаецца. Як усё роўна дражніцца з Юлькаю. Маруднае, натомленае, умасцілася сабе сярод мяккіх хмарак і пазірае, як яна нецярпліва перамінаецца на лавачцы.

Так яны штодня глядзяць адно на аднаго і чакаюць, хто першы не вытрывае. Перамагае заўсёды Юлька. Сонца паглядзіць, паглядзіць і пачне спускацца. Усё ніжэй і ніжэй. А яна чакае, пакуль яно зусім не закоціцца за лес. І не паспее яшчэ міргнуць Юльцы на развітанне яго апошні прамень, яна саскоквае з лавачкі і бяжыць з надворка. Яе цёмная макаўка спачатку мільгае каля агарода, а пасля амаль хаваецца ў высокай траве каля садка, толькі раз-пораз вытыркаецца над белымі парасончыкамі дзікага кмену.

Юлька бяжыць сустракаць маму. Іншы раз яна зусім стоміцца і задыхаецца, пакуль на вузкай сцежцы ўгледзіць светлую маміну сукенку.

Мама, змеціўшы Юльку, таксама пачынае бегчы ёй насустрач, шырока, радасна разнімае загарэлыя рукі. Так яны бягуць і смяюцца, і Юлька не заўважае, як, заміраючы, умомант аказваецца ў мамы на руках. Высока-высока. Над самаю высокаю травою.

Яны ідуць дахаты. Дакладней, ідзе толькі мама. А Юлька сядзіць у яе на руках, моцна абдымае за шыю і нешта шчабеча і шчабеча без перасціху. А мама толькі смяецца і ўсё паўтарае: «Пташачка ты мая родная. Засумавала за дзень. Чарнічка ты мая мурзаценькая...»

Вечарам да іх заходзіць Нюра. Яна хуценька азірае ўсё, што стаіць у іх на стале, і мама, як заўсёды, кажа ёй: «Можа, з'ясі што?» Нюра адразае кусок белага сыру і есць. Крышачы на падлогу сыр, Нюра гаворыць: «Чарніцы паспелі. Тося Іванкава сёння цэлы збан несла».

«Ах, шкода, часу няма. Да выхадных не выберуся...»

«Ага, будуць яны цябе чакаць да выхадных. Панясуць іх яшчэ зялёныя...»

«Пэўна ж. А так чарніц хочацца. Нічога так не люблю, як чарніцы з малаком».

Мама смяецца, а Юлька ляжыць у сваім ложку і бачыць цэлыя кісціны буйных чорных ягад. Яны так зваблівa пазіраюць на яе з-пад зялёных лісточкаў, як усё роўна завуць: «Хадзі да нас, ну чаго ж ты?» Але аднекуль чуецца траскучы бабін голас: «А ці чула ж ты, што ў Забыўцах тым летам было?..» І, засынаючы, Юлька моцна ўздрыгвае.

Сонца высока-высока. На яго цяпер аніяк не глянеш. Цяпер сонца глядзіць на Юльку. Яно абдымае і лашчыць яе сваімі цёплымі мяккімі прамянямі, і Юльцы так добра ісці па сцежцы сярод высокай травы і кветак. Юлька спяшаецца. У адной руцэ, ажно нямеюць пальчыкі, яна моцна трымае вялікі сіні кубак. Юлька ідзе ў блізкі лясок па чарніцы. І пакуль яшчэ той лясок, ельнік той, цямнеецца наперадзе, яна больш глядзіць па баках. Тут гэтулькі ўсяго цікавага. Буркатлівыя пухнатыя чмялі гайдаюцца на духмяных галоўках бела-ружовай дзяцеліны. Пстрыкаюць проста па нагах, скачуць з аднаго боку сцежкі на другі зялёныя конікі, пырхаюць каля самага Юльчынага твару яркія размаітыя матылі. Але Юлька нават не прыпыняецца. Яна ўся ва ўладзе дакучліва-неспакойных думак. Вот-вот

сцежка прывядзе яе да лесу. Раней, з мамаю, Юлька была ў ельніку і бачыла, як там цёмна. Туды амаль не зазірае сонца, і чарніцы хаваюцца ажно пад самыя яловыя лапы.

Маленькі калючы звярок са страху выпускае свае кіпці. Юлька бачыць доўгую вялізную руку ў чорнай пальчатцы, якая цягнецца да яе з-пад яловай лапы. Юлька халадзее і азіраецца. Хаты ўжо не відно. Вакол высокая трава і кветкі.

І над усім стаіць высокае і ласкавае сонца. Яно саграе і супакойвае Юльку. І яна ўжо зусім разважліва, як дарослая, думае: «Можа, й праўда, пачакаць тых выхадных ды пайсці па ягады разам з мамаю?» Але насатая Нюра крывіцца і гаворыць: «Ага, будуць яны цябе чакаць да выхадных. Панясуць іх яшчэ зялёныя...» Як могуць «панесці» ягады яшчэ зялёнымі, калі яны ўжо спелыя, Юлька не разумее. Зноў нешта не тое сказала гэта Нюра, і што яе слухаць?..

Юлька яшчэ і яшчэ азіраецца, нерашуча топчацца на сцежцы. Там, адкуль яна ідзе, аж зіхаціць усё ад сонца. А наперадзе, ужо зусім блізка, таямніча і непрыветна цямнее ельнік. Але ж у ельніку чарніцы. Іх там, пэўна, шмат, бо вунь Тося Іванкава ўчора ажно цэлы збан назбірала. А Юлька хіба не набярэ гэты сіні кубачак? Набярэ. І, можа, нават зусім блізенька, з самага берага...

«Нічога так не люблю, як чарніцы з малаком»,— чуе Юлька мамін голас і больш ужо не раздумвае.

Яна заходзіць у ельнік і радасна заўважае, што разам з ёю заходзіць туды сонца. Праменьчыкі яго скачуць паперадзе, і цёмны лапнік ажно зіхаціць і пераліваецца ад прыветнага вясёлага святла. З-пад дробных лісточкаў зялёнага чарнічніку хітра пазіраюць на Юльку цёмныя вочкі першых, толькі абкураных сінім пылком, ягад. Юлька прысядае і ямчэй ставіць на мох яшчэ пусты кубачак.

ЗМЕСТ

АПОВЕСЦЬ

Лес 3

АПАВЯДАННІ

Шыкуны 109
Багамаз 136
Пах мурагу 152
Касцы 161
Мурза 168
Лёгкі хлеб 174
Светлая рунь 180
Белыя брады 191
Канваліі 205
Юлька і сонца 217

Лялько Х.

Л 97 Світанак над бярозамі: Аповесць, апавяданні: Для ст. шк. узросту / Маст. В. І. Валынец.— Мн.: Юнацтва, 1989, 223 с. 4 л. іл.

ISBN 5-7880-0065-3.

Памяць няўмольна вяртае маладога героя аповесці лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі Х. Лялько «Лес», фатографа Андрэя Багунца, у дзіцячыя гады, якія супалі з цяжкім, часам драматычным перыядам калектывізацыі ў беларускай вёсцы.

У лёсах герояў апавяданняў псіхалагічна пераканаўча адлюстравана наша сучаснасць.

Л $\frac{4803120200-096}{М\ 307(03)-89}$ 68—88 **ББК 84 Бел 7**

Издание для детей и юношества

ЛЯЛЬКО Кристина Алексеевна

РАССВЕТ НАД БЕРЕЗАМИ

Повесть. Рассказы

Минск, издательство «Юнацтва»

На белорусском языке

Выданне для дзяцей і юнацтва

ЛЯЛЬКО Хрысціна Аляксееўна

СВІТАНАК НАД БЯРОЗАМІ

Аповесць. Апавяданні

Загадчык рэдакцыі *В. М. Новік.* Рэдактар *У. А. Марук.* Малодшы рэдактар *Г. Д. Зінчанка.* Мастацкі рэдактар *В. І. Кліменка.* Тэхнічны рэдактар *Г. Ф. Дуброўская.* Карэктар *І. П. Васілеўская.*

ІБ № 638

Здадзена ў набор 13.04.88. Падпісана да друку 24.05.89. АТ 04175. Фармат 70×108 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура Тып Таймс. Высокі друк з ФПФ. Ум. друк. арк. 9,80+0,35 укл. Ум. фарб.-адб. 10,50. Ул.-выд. арк. 12,55+0,28 укл. Тыраж 12 000 экз. Зак. 1305. Цана 80 к.

Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.